МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БРЕСТСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

Л. Ю. МАЛЫХІНА
У. М. МІХНЮК

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ЛІТОЎСКА-БЕЛАРУСКАЙ ССР

Брэст 2005

УДК 93/94:01(476)(474)
ББК 63.1(4Бел)(4Лит)
М20

*Рэцэнзенты:*

**Коршук Уладзімір Канстанцінавіч**, доктар гістарычных навук, прафесар Беларускага Дзяржаўнага універсітэта

**Здановіч Уладзімір Васільевіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры Гісторыі Беларусі БрДУ імя А.С. Пушкіна

**Малыхіна Л. Ю., Міхнюк У. М.**

**М20 Гістарыяграфія Літоўска-Беларускай ССР / Манаграфія.**
Брэст, 2005. – 119 с.

ISBN 985-493-029-7

У манаграфіі абагульнены творчыя напрацоўкі айчынных і замежных гісторыкаў у даследаванні асноўных праблем гісторыі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі. Чытач знойдзе пераканаўчыя адказы на важнейшыя пытанні: чаму і калі была абвешчана рэспубліка, час яе існавання і матывы ліквідацыі. У асобных главах паказана, як выкладаецца гісторыя ЛітБела ў падручніках і дапаможніках для сярэдняй і вышэйшай школы Беларусі, разгледжана гістарыяграфія расійска-літоўскага дагавора ад 12 ліпеня 1920 г., з якім доўгі час гісторыкі звязвалі факт юрыдычнага спынення існавання "рэспублікі двух народаў".

Кніга адрасуецца выкладчыкам і студэнтам, навуковым супрацоўнікам і аспірантам-гісторыкам, якія цікавяцца перыпетыямі станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

УДК 93/94:01(476)(474)
ББК 63.1(4Бел)(4Лит)

© Малыхіна Л. Ю., 2005
© Міхнюк У. М., 2005
© Выдавецтва БДТУ, 2005

ISBN 985-493-029-7

# УВОДЗІНЫ

У апошнія гады ў беларускай гістарычнай навуцы некалькі ўзрасла цікавасць да гістарыяграфічных даследаванняў, да праблем метадалогіі, што само па сабе сведчыць аб высокім узроўні яе развіцця і самаарганізацыі. Рыхтуюцца і абараняюцца кандыдацкія і доктарскія дысертацыі па гістарыяграфіі розных праблем айчыннай і ўсеагульнай гісторыі, на іх аснове апублікаваны шэраг навуковых артыкулаў у зборніках, матэрыялах канферэнцый і часопісах. З'явіліся першыя гістарыяграфічныя публікацыі па такіх традыцыйна актуальных сюжэтах айчыннай гістарычнай навукі, якімі з'яўляюцца праблемы нацыянальнай дзяржаўнасці беларускага народа. Аднак у гэтай серыі даследчыцкіх вынікаў відавочным з'яўляецца адсутнасць гістарыяграфічных работ па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР, якая была абвешчана ў лютым 1919 г. Між тым па гэтай праблематыцы апублікавана значная колькасць манаграфічнай літаратуры, раздзелаў у абагульняючых працах, артыкулаў у зборніках і часопісах, энцыклапедычных выданнях. Даследчыкі паспрабавалі высветліць прычыны і ўмовы абвяшчэння рэспублікі, вызначыць тэрмін яе існавання і матывы ліквідацыі, паказаць роль яе ў жыцці беларускага і літоўскага народаў і іншыя аспекты гісторыі ЛітБел ССР. Відавочна, што абгрунтаваны і пераканаўчы адказ на гэтыя пытанні мае прынцыповае значэнне для поўнага і ўсебаковага раскрыцця станаўлення і ўмацавання беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове, дазваляе больш упэўнена растлумачыць дыпламатычныя акцыі РСФСР, накіраваныя на ўстанаўленне міру з Польшчай і Літвой у 1919 – 1920 гадах. У гістарычных і гісторыка-прававых даследаваннях з розных метадалагічных і ідэйна-палітычных пазіцый, а часам і з налётам нацыянальных поглядаў, трактуюцца важнейшыя пытанні дзяржаўнасці беларускага і літоўскага народаў. У апошняе дзесяцігоддзе такога роду палажэнні і вывады, развагі і ацэнкі змяніліся на супрацьлеглыя тым, якія замацаваліся ў савецкай гістарыяграфіі. Сярод іх сустракаюцца амбіцыёзныя заключэнні, якія не пацвярджаюцца ні гістарычнымі фактамі і аргументамі, ні логікай і пераканаўчымі доказамі. Шэраг такіх ацэнак і палажэнняў як старой савецкай, так і новай айчыннай гістарыяграфіі некрытычна, як навукова ўстаноўленныя, ісцінныя паўтараюцца ў вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вышэйшай і сярэдняй школы.

Разам з несумненнымі і значнымі творчымі поспехамі ў навуковай літаратуры сустракаюцца спрэчныя, непераканаўчыя і нават імправізаваныя

заключэнні, палажэнні і ацэнкі. Пагэтаму навуковую літаратуру, якая маецца па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР, належыць усебакова прааналізаваць з тым, каб падвесці вынікі шматгадовай даследчыцкай работы, высветліць спрэчныя пытанні і вызначыць тыя аспекты, якія патрабуюць далейшага паглыбленага вывучэння. Такое даследаванне, на наш погляд, паспрыяе інтэграцыі навуковых ведаў, узгадненню ці абагульненню пазіцый, вывадаў і ацэнак даследчыкаў. І тым самым яно будзе садзейнічаць трансфармацыі выверанных навуковых ведаў у абагульняючыя працы, энцыклапедычныя даведнікі і вучэбную літаратуру.

Навуковая актуальнасць і практычная значнасць распрацоўкі пастаўленай праблемы абумовілі вызначэнне мэты навуковай манаграфіі – правесці ўсебаковы і грунтоўны гістарыяграфічны аналіз навуковай літаратуры, у якой непасрэдна ці ўскосна закранаюцца розныя пытанні ці аспекты гісторыі Літоўска-Беларускай ССР. Для паспяховага дасягнення мэты аўтары імкнуліся рэалізаваць наступныя даследчыцкія задачы:

– паказаць працэс назапашвання і ўзбагачэння навуковых ведаў па праблемах гісторыі Літоўска-Беларускай ССР, акумуліраваць станоўчыя вынікі даследчыцкай работы ў гэтым накірунку з тым, каб можна было больш эфектыўна ўключыць іх у падручнікі для вышэйшай і сярэдняй школы, абагульняючыя працы па гісторыі Беларусі і энцыклапедычныя выданні;

– раскрыць дынаміку ўдасканалення вывадаў і змянення ацэнак па розных аспектах гісторыі ЛітБела, да якіх прыходзілі даследчыкі ў той ці іншы перыяд развіцця савецкай і айчыннай гістарычнай навукі;

– прааналізаваць спрэчныя і памылковыя погляды і вывады, якія маюцца ў гістарычнай навуцы па розных аспектах гісторыі Літоўска-Беларускай ССР, і выказаць свае меркаванні і пазіцыі з улікам гістарыяграфічнай традыцыі і сёняшніх магчымасцей гістарычнай навукі;

– з улікам усебаковага аналіза гістарыяграфіі праблемы сфармуляваць некаторыя прапановы па далейшаму паглыбленаму яе вывучэнню з прыцягненнем новых архіўных крыніц;

– выявіць, сістэматызаваць і класіфікаваць навуковую літаратуру па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР і скласці найбольш поўную яе бібліяграфію, якая прыведзена ў манаграфіі.

Прадметам нашага даследавання з'яўляецца ўся даступная літаратура па тэме: доктарскія і кандыдацкія дысертацыі, манаграфіі, абагульняючыя працы і энцыклапедыі, дакументальныя зборнікі, мемуары, матэрыялы "круглых сталоў" і канферэнцый, а таксама вучэбныя падручнікі і дапаможнікі па гісторыі для вышэйшай і сярэдняй школы, навуковыя публікацыі ў перыядычным друку.

У манагафіі прааналізавана навуковая літаратура па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР, якая выйшла ў свет у Беларусі, Расіі, Украіне, Літве і Польшчы з 1919 г. па 2004 г. уключна. Гістарыяграфічна разгледжаны і асэнсаваны важнейшыя аспекты гісторыі ЛітБела, якія ў той ці іншай ступені знайшлі адлюстраванне ў навуковых працах.

У пяці главах манаграфічнага даследавання ўпершыню ў гістарычнай навуцы грунтоўна прааналізаваны ўсе важнейшыя аспекты гістарыяграфіі Літоўска-Беларускай ССР: апублікаваныя крыніцы па гісторыі ЛітБела; прычыны падзелу БССР і аб'яднання яе з Літоўскай ССР; высветлены час прыняцця вышэйшым палітычным кіраўніцтвам РСФСР рашэння аб утварэнні

"рэспублікі двух народаў" і юрыдычнага яе абвяшчэння; абагульнены сведчанні навуковай, энцыклапедычнай і вучэбнай літаратуры па пытаннях аб тэрыторыі і колькасці насельніцтва ЛітБел ССР; раскрыты пытанні аб перыядзе існавання Літоўска-Беларускай ССР, прычынах і матывах яе ліквідацыі; гістарыяграфічна асэнсаваны пытанні сацыяльна-эканамічных і культурных пераўтварэнняў у рэспубліцы; сістэматызаваны выказванні і ацэнкі гісторыкаў аб значэнні і ролі ЛіБ ССР у жыцці беларускага і літоўскага народаў. У асобным раздзеле паказана гістарыяграфія расійска-літоўскага дагавора ад 12 ліпеня 1920 г. Па ўсіх гэтых пытаннях выказаны аргументаваныя ці матываваныя ўласныя аўтарскія пазіцыі і думкі.

Вынікі манаграфічнай работы могуць выкарыстоўвацца практычна ў якасці даведніка для навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў, выкладчыкаў і студэнтаў, якія цікавяцца перыпетыямі станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Атрыманыя вывады і абагульненні дазваляюць гісторыкам-даследчыкам і выкладчыкам лепш арыентавацца сярод шматлікіх публікацый, каб выбарачна ўжываць фактычныя сведчанні ў навуковай дзейнасці, метадычных распрацоўках і лекцыях.

Наглядная карціна ступені распрацаванасці тэматыкі дазволіла вылучыць далейшыя магчымыя накірункі даследавання дзяржаўна-палітычнага генезісу краіны ў пачатку XX стагоддзя. Нам уяўляецца, што палажэнні, вывады і ацэнкі, якія маюцца ў кнізе, узбагачаюць гістарыяграфічную традыцыю айчыннай гістарычнай навукі.

Вывады манаграфіі могуць стаць падмуркам для далейшай паглыбленай распрацоўкі гісторыі Літоўска-Беларускай ССР.

# ГЛАВА 1

## ГІСТАРЫЯГРАФІЯ, КРЫНІЦЫ, МЕТАДАЛОГІЯ І МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

### § 1. Гістарыяграфія гістарыяграфіі праблемы

Гістарыяграфія гісторыі Літоўска-Беларускай ССР пачала фарміравацца разам з станаўленнем савецкай гістарычнай навукі. Пагэтаму вывучэнне праблем ЛітБела ішло ў агульным рэчышчы яе развіцця. У фарміраванні і ўдасканаленні гістарычнай навукі ў БССР гістарыёграфы выдзяляюць тры асноўныя перыяды. Першы перыяд – 1917 – 1920-я гады (станаўленне марксісцка-ленінскай канцэпцыі гісторыі Беларусі); другі – 1930-я – першая палова 1950-х гадоў (марксісцка-ленінская метадалогія з'яўлялася асновай усіх прац па гісторыі); трэці – другая палова 1950-х – першая палова 1980-х гадоў (пераадоленне гісторыкамі дагматычных установак сталінізму); чацвёрты – другая палова 1980-х – нашы дні (адмаўленне ад надуманых або недастаткова аргументаваных канцэпцый).[1] Мы ж прытрымліваемся наступнай перыядызацыі беларускай гістарычнай навукі ў XX ст. Першы перыяд: 1919 г. – да сярэдзіны 1950-х гадоў; другі – другая палова 1950-х – 1980-я гады; трэці перыяд беларускай гістарыяграфіі адлічваем з пачатку 1990-х гадоў, калі Рэспубліка Беларусь стала незалежнай і суверэннай дзяржавай. Станаўленне і развіццё навуковых ведаў па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР арганічна ўпісваецца ў гэты варыянт перыядызацыі беларускай гістарычнай навукі.

Кожны з вызначаных перыядаў мае выразныя, адметныя рысы. Так, для даваеннага часу развіцця гістарычнай навукі характэрны малалікасць прафесійных кадраў, жорсткая ідэйна-палітычная барацьба за ўсталяванне марксісцка-ленінскай метадалогіі ў асвятленні мінулага. Навуковыя публікацыі былі нешматлікімі, пераважалі артыкулы мемуарнага характара. Пры іх

---

[1] Петрыкаў П. Ц. Перыядызацыя гісторыі гістарычнай навукі ў БССР // Весці АН БССР. Сер. грамад навук. – 1990. – № 6. – С. 64-65.
У апошнія гады прадпрымаліся спробы даць новую перыядызацыю гістарычнай навукі Беларусі ў XX ст. Так, В. А. Астрога выдзяліў аж "сем асноўных перыядаў і дзевяць дадатковых унутраных этапаў" (Гл.: Астрога В. А. Беларуская гістарыяграфія найноўшага часу: праблемы перыядызацыі // Гістарычны альманах. – 2002. – Т. 7. – С. 11-19). П. Ц. Петрыкаў у новым артыкуле скарэкціраваў сваё бачанне перыядызацыі гістарычнай навукі, якую прапанаваў раней. Цяпер ён дае наступную перыядызацыю 1920 – 1930-я гады; другая палова 1940 – 1980-я гады; навейшы перыяд прапаноўваецца адлічваць з канца 1980-х гадоў. (Гл. Петрыкаў П. Ц. Асноўныя этапы гістарыяграфіі Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 4. – С. 34-42).

напісанні мала выкарыстоўваліся архіўныя дакументы і матэрыялы з-за закрытасці архіваў і бібліятэк. Супрацоўнікі Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б і Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі, якія пачалі дзейнічаць у 1929 г., пераважную ўвагу ўдзялялі вывучэнню праблем рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і замежнай узброенай інтэрвенцыі. Праблемы дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі ў той перыяд практычна не вывучаліся, а толькі асобныя моманты ўскосна закраналіся ў артыкулах і кнігах В. Г. Кнорына, У. М. Ігнатоўскага, Дз. Ф. Жылуновіча, А. Р. Чарвякова і В. К. Шчарбакова.[2] Гэтыя публікацыі ўтрымліваюць мала канкрэтных фактаў. У артыкулах і кнігах, якія ўбачылі свет у канцы 30-х гадоў, сустракаюцца толькі імёны І. В. Сталіна, У. І. Леніна, Я. М. Свярдлова, В. С. Міцкявічуса-Капсукаса і некаторых іншых удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны на Беларусі. Гэта здарылася таму, што амаль усе партыйныя і дзяржаўныя дзеячы "ленінскай гвардыі" па ідэйна-палітычным матывам былі рэпрэсаваны і фізічна знішчаны, а іх імёны, як ворагаў народа, выкрэслены з усіх публікацый і ў першую чаргу па гістарычнай тэматыцы. Іх творы (1-2 экзэмпляры) былі надзейна схаваны ў "спецхранах" і надоўгі час аказаліся недаступнымі для даследчыкаў. У навуковай літаратуры відавочны недахоп фактаў і аргументаў кампенсаваўся ідэалагічнымі клішэ, бязмежным усхваленнем асобы і ролі І. В. Сталіна ў рэвалюцыі і грамадзянскай вайне, разгроме замежнай ваеннай інтэрвенцыі. У шэрагу выпадкаў скажона, нават вульгарызавана, паказвалася дзейнасць палітычных апанентаў бальшавіцкай партыі, і перш за ўсё рэпрэсаваных, а таксама дзеячоў беларускага нацыянальнага руху. Яскравым прыкладам такой вульгарызацыі ў гістарычнай навуцы з'яўляюцца некаторыя фрагменты з першай вялікай публікацыі аб гісторыі ЛітБела, аўтарам якой з'яўляецца М. А. Карнатоўскі. "Класавыя ворагі пралетарскай дыктатуры, нацыяналісты і агенты польскай разведкі, якія адзелі на сябе ў мэтах палітычнай маскіроўкі маскі фарысеяў, крывадушнікаў, двурушнікаў, змаглі пралезці ў кіруючыя органы савецкага апарата ў Літве і Беларусі (З. Жылуновіч, былы старшыня Часовага рэвалюцыйнага ўрада Беларусі, А. Чарвякоў, былы народны камісар асветы, І. Рэйнгольд, былы народны камісар фінансаў і інш.)" і быццам бы зрывалі планы бальшавіцкай партыі па дзяржаўнаму будаўніцтву ў Беларусі і Літве.[3]

Такія эпатажныя ацэнкі актыўных дзеячоў бальшавіцкай партыі і савецкай дзяржавы першых гадоў яе існавання, а таксама ўдзельнікаў беларускага нацыянальнага руху і стваральнікаў БССР тыражыраваліся ў гістарычнай навуцы амаль да канца 1950-х гадоў.

У публікацыях гісторыкаў 1930-х гадоў значная ўвага ўдзялялася вывучэнню гісторыі грамадзянскай вайны 1919 – 1920 гадоў.[4] Але пытанні беларускай дзяржаўнасці, у тым ліку і абвяшчэння ЛітБела, даследчыкамі нават не закраналіся.

---

[2] Кнорин В. Г. Пять лет: Краткий конспект истории КП(б) Б. – Мн., 1922; ён жа. Заметки к истории диктатуры пролетариата в Белоруссии. – Мн., 1934; Ігнатоўскі У. М. Вялікі Кастрычнік на Беларусі // Беларусь. Нарысы гісторыі эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. – Мн., 1924. – С. 195-214, Жылуновіч З. 1-е студзеня – рэвалюцыйна-гістарычнае свята Савецкай Беларусі // Полымя. – 1922. – № 1; ён жа. Будаванне Савецкай Беларусі // Маладняк. – 1925. – № 6; ён жа. За дваццаць лет: Успаміны // Полымя. – 1929. – № 5; Чарвякоў А. Р. За Савецкую Беларусь. – Мн., 1927; Шчарбакоў В. К. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі і белапольская акупацыя. – Мн., 1930 і інш.

[3] Корнатовский Н. А. Литовско-Белорусская ССР (1919 г.) // Учёные зап. ЛГУ. – 1940. – Вып. 7. – № 67. – С. 147

[4] Падрабязней гл.: Михнюк В. Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919 - 1941 гг.). – Мн., 1985. – С. 257-271.

Аднак трэба адзначыць, што даваенны перыяд развіцця навуковых ведаў па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР увянчаўся грунтоўным артыкулам М. А. Карнатоўскага, які, як можна меркаваць, быў падрыхтаваны да 20-годдзя абвяшчэння "рэспублікі двух народаў".[5] Ён быў напісаны на падставе апублікаваных рашэнняў партыйных і савецкіх органаў і розных публікацый з газет "Жизнь национальностей", "Северная комунна", "Звезда", "Известия ВЦИК", часопісаў "Пролетарская революция" і "Историк-марксист", а таксама работ І. В. Сталіна. У гэтым артыкуле ўпершыню выкладзены кароткі агульны нарыс абвяшчэння Літоўска-Беларускай рэспублікі. Але танальнасць і пафас навуковага твора адпавядалі духу часу, на што мы ўжо звярталі ўвагу.

У гады Вялікай Айчыннай вайны вывучэнне гісторыі Беларусі амаль не праводзілася. Толькі пасля вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў гістарычная навука пачала адраджацца. Ужо з другой паловы 40-х гадоў з'явіліся першыя даследаванні Н. В. Каменскай, у якіх разглядаліся праблемы гісторыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.[6] Да вывучэння гэтай тэматыкі далучыліся і гісторыкі права, у прыватнасці, С. П. Маргунскі, які падрыхтаваў кандыдацкую дысертацыю, а затым і некалькі манаграфій па гісторыка-прававых аспектах станаўлення і ўмацавання беларускай дзяржаўнасці.[7]

У навуковы ўжытак паступова пачалі ўводзіцца новыя звесткі з раней закрытых архіваў і публікацый, якія былі "арыштаваны" у 30-я гады разам з іх аўтарамі і знаходзіліся ў "спецхранах". Пасля палітычнай рэабілітацыі дзеячаў Камуністычнай партыі і Савецкай улады іх прозвішчы сталі аднаўляцца ў навуковых публікацыях. Але ж амаль да канца 50-х гадоў кардынальных, прынцыповых зрухаў у гістарычнай навуцы, у тым ліку і ў вывучэнні гісторыі Літоўска-Беларускай ССР, не адбылося. Асноўныя палажэнні, вывады і ацэнкі ЛітБела, якія былі сфармуляваны ў артыкуле М. А. Карнатоўскага, паўтараліся ў працах даследчыкаў другой паловы 40-х – сярэдзіны 50-х гадоў. Публікацыі стракацелі шматлікімі спасылкамі на творы І. В. Сталіна і цытатамі з іх, якія падаваліся як бяспрэчныя аргументы для "пераканаўчых" доказаў. З канца 50-х гадоў яны практычна зніклі з навуковай літаратуры і гэты вакуум неабходных спасылак на класікаў марксізма-ленінізма быў запоўнены шчодрым цытаваннем У. І. Леніна. У тагачаснай літаратуры яшчэ паўтараліся рэцыдывы вульгарызатарскіх характарыстык беларускага нацыянальнага руху і яго актыўных дзеячоў. Для навуковых прац тых гадоў быў характэрны дагматызм. Яскравай ілюстрацыяй такога становішча ў савецкай гістарычнай навуцы, састаўной арганічнай часткай якой была і беларуская гістарыяграфія, з'яўляецца манаграфія А. М. Андрэева "Борьба литовского народа за советскую власть 1918 – 1919 гг.", выдадзеная ў Маскве ў 1954 г. У ёй, напрыклад, таварылася: "Пры абмеркаванні ЦК КП Літвы пытання аб пасылцы літоўскай дэлегацыі на Першы Усебеларускі з'езд Саветаў нацыяналісты выступілі супраць аб'яднання з Савецкай Беларуссю і патрабавалі ўключэння ў склад Літоўскай Савецкай Рэспублікі тэрыторыі Гродзенскай губерні.

---

[5] Корнатовский Н. А. Указ. соч.

[6] Каменская Н. В. Образование Белорусской Советской Социалистической Республики: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – М., 1945; яна ж. Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. – Мн., 1946; 2-е выд. дап. і выпр. – Мн., 1948; яна ж. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР. – Мінск, 1954.

[7] Маргунский С. П. Образование Белорусской Советской Социалистической республики и её первая Конституция: Автореф. дис.... канд. юрид. наук. – Мн., 1951; ён жа. Государственное строительство Белорусской ССР на первом этапе её развития. – Мн., 1953; ён жа. Создание и упрочение белорусской государственности (1917 - 1922 гг.). – Мн., 1958.

У Беларусі супраць аб'яднання з Савецкай Літвой выступалі вяліка-дзяржаўныя шавіністы. Яны пасылалі ў ЦК РКП(б) тэлеграмы з патрабаваннем перагледзець рашэнне аб выдзяленні са складу БССР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў. а таксама спрабавалі даказаць "немэтазгоднасць" аб'яднання Беларусі з Савецкай Літвой і т. п."[8]

Другі этап у развіцці савецкай гістарычнай навукі і ў даследаванні гісторыі Літоўска-Беларускай ССР адкрыўся пасля XX з'езда КПСС, на якім быў развянчаны так званы культ Сталіна. Ва ўмовах дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў Савецкім Саюзе гісторыкі змаглі ў значнай ступені адыйсці ад дагматычна абсалютаванага і нярэдка вульгарызаванага асвятлення гісторыі Беларусі савецкай эпохі. Зніклі цытаты з твораў І. В. Сталіна, у навуковы ўжытак сталі ўключацца новыя звесткі з архіўных крыніц, доступ да якіх быў дазволены даследчыкам. Пачалі друкавацца зборнікі дакументаў і матэрыялаў аб барацьбе за Савецкую ўладу ў Беларусі і Літве, у якіх прыведзены шэраг фактаў і аб нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве.[9]

Пачалася сістэматычная падрыхтоўка навуковых кадраў, якія абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі па розных аспектах гісторыі Беларусі 1918 – 1921 гадоў і сталі спецыялізавацца па вузкай праблематыцы, у тым ліку і па гісторыі нацыянальнай дзяржаўнасці. У сувязі з гэтым значна пашырыўся тэматычны спектр навуковых даследаванняў, якія праводзіліся на грунтоўнай аснове разнастайных крыніц і ў першую чаргу архіўных. Прыкметна ўзрос навукова-тэарэтычны і метадалагічны ўзровень гістарычных даследаванняў. З канца 1950-х гадоў пачалі выдавацца першыя абагульняючыя працы па айчыннай гісторыі і Кампартыі рэспублікі, гісторыі дзяржавы і права Беларусі, а таксама па гісторыі Літвы і Кампартыі Літвы, у якіх у агульнай форме закраналіся пытанні дзяржаўнага будаўніцтва суседніх краін.[10]

У другім перыядзе развіцця беларускай гістарыяграфіі асноўнымі формамі навуковай прадукцыі сталі манаграфіі і артыкулы, якія рыхтаваліся на аснове кандыдацкіх даследаванняў ці для абароны доктарскіх дысертацый. Па гісторыі ЛітБела ўпершыню была апублікавана спецыяльная грунтоўная манаграфія Я. Н. Шкляр[11], а таксама буйныя манаграфічныя даследаванні І. М. Ігнаценкі, Н. В. Каменскай, В. А. Круталевіча і С. П. Маргунскага.[12] У навуковых працах з'явіліся гістарыяграфічныя публікацыі, у тым ліку і па гісторыі ЛітБела.[13] Паказчыкам высокага ўзроўню гістарычнай навукі сталі

---

Андреев А. М. Борьба литовского народа за Советскую власть 1918 – 1919 гг. – М., 1954. – С. 105.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918 – 1920: Сб. документов и материалов. В 2-х т. – Мн., 1968 – 1971; Борьба за Советскую власть в Литве в 1918 – 1920 гг.: Сб. документов. – Вильнюс, 1967.

Гісторыя Беларускай ССР. У 2 т. – Т. 2. – Мн., 1958; История Белорусской ССР: В 2 т. – 2-е изд., доп. – Т. 1. – Мн., 1961; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. – Ч. 1. Изд. 2-е. – Мн., 1961; 2-е изд. – Мн., 1968; История государства и права Белорусской ССР: В 2 т. – Т. 1 (1917 – 1936 гг.). – Мн., 1970; Гісторыя Беларускай ССР у 5 тамах. – Т. 3. – Мн., 1973; Очерки истории Коммунистической партии Литвы. – Т. 1 (1887 – 1920). – Вильнюс, 1973; История Литовской ССР (с древнейших времен до наших дней). – Вильнюс, 1978.

Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919 – 1920 гг.). – Мн., 1962.

Маргунский С. П. Создание и упрочение белорусской государственности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1958; ён жа. Становление и развитие белорусской советской государственности (1917 – 1925 гг.). – Мн., 1969; Каменская Н. В. Белорусский народ в борьбе за Советскую власть (1919 – 1920 гг.). – Мн., 1963; Круталевич В. А. Рождение Белорусской Советской Республики: Провозглашение республики Развёртывание национально-государственного строительства. (Ноябрь 1918 г. – февраль 1919 г.). – Мн., 1979; Игнатенко И. М. Великий Октябрь в судьбах белорусского народа. – Мн., 1987.

Иванов Н. Л. Создание Литовско-Белорусской ССР и современная буржуазная историография // Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов: Матер. межресп. науч. конф., посвящ. 60-летию образ. Литовско-Белорусской ССР. – Мн., 1981. – С. 105-106; Тамашюнас М. В. Исследование проблем по истории социалистической революции 1918 – 1919 гг. в Литве (обзор литературы за 1967 – 1978 гг.) // Там жа. – С. 87-95; Пятраўскас З. В. Юридический статус Литвы в конце 1918 г. – первой половине 1919 г. // Труды АН Литовской ССР. – Сер. А. – 1982. – Т. 2 (79). – С. 13-24; ён жа. О хронологических рамках существования Литовско-Белорусской ССР // Правоведение. – 1983. – № 5. – С. 88-92.

навуковыя канферэнцыі, на якіх абмяркоўваліся актуальныя праблемы яе развіцця. Да 60-годдзя абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР была праведзена спецыяльная навуковая канферэнцыя беларускіх і літоўскіх гісторыкаў. Яе матэрыялы былі надрукаваны асобнай кнігай.[14]

Разам са станоўчымі дасягненнямі беларускай гістарыяграфіі ў той перыяд, якія атрымалі далейшае канструктыўнае развіццё і ўдасканаленне ў наступныя гады, былі і адмоўныя з'явы. Гэта перш за ўсё, як адзначаў член-карэспандэнт Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі П. Ц. Петрыкаў, "непадзельнае панаванне марксісцка-ленінскай метадалогіі, хвалебна-узнёслая ацэнка дзейнасці Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы".[15] Савецкія гісторыкі вымушаны былі панегірычна асвятляць і ўсхваляць любыя рашэнні і дзеянні Кампартыі і кіраўнікоў дзяржавы і пісаць аб тым, што яны заўсёды былі правільнымі і дальнабачнымі, выражалі волю і інтарэсы працоўных. Гэта прыводзіла да апалагетычнага асвятлення савецкай гісторыі Беларусі ў цэлым, і асобных яе праблем, у прыватнасці, у тым ліку і гісторыі Літоўска-Беларускай ССР.

Навейшы перыяд у развіцці беларускай гістарычнай навукі пачаўся пасля развалу камуністычнай сістэмы Савецкага Саюза і набыцця рэспублікай статуса незалежнай і суверэннай дзяржавы. Хаця тыповыя, характэрныя рысы яго яшчэ не сталі яскрава выразнымі, але некаторыя з іх можна выявіць і адзначыць.

**Першае.** Значна вырас у колькасных і якасных адносінах кадравы патэнцыял гістарычнай навукі. Толькі за 1991 – 1999 гады ў рэспубліцы абаронены 34 доктарскія і 136 кандыдацкіх дысертацый. Заметна "амаладзіліся" навуковыя кадры гісторыкаў, якія выходзілі на абарону дысертацый.[16]

**Другое.** Больш рэпрэзентатыўнай стала крынічная аснова навуковых даследаванняў: гісторыкі пачалі выкарыстоўваць дакументы і матэрыялы раней закрытых фондаў дзяржаўных і ведамасных архіваў, у тым ліку архіваў Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства замежных спраў, а таксама навуковую і іншую літаратуру і перыядычныя выданні, якія былі перададзены з "спецхранаў" у адкрытыя фонды бібліятэк. Даследчыкам сталі даступнымі раней закрытыя работы замежных аўтараў і ў першую чаргу беларускіх эмігрантаў. Дарэчы, даследаванні па гісторыі Бацькаўшчыны, якія падрыхтаваны прадстаўнікамі беларускай эміграцыі розных пакаленняў і некаторая частка з якіх перавыдадзена ў нашай рэспубліцы, складаюць самастойны і спецыфічны накірунак ў гістарыяграфіі Беларусі і ён патрабуе спецыяльнага навуковага аналізу.[17]

**Трэцяе.** Красамоўнай рысай новага перыяду беларускай гістарыяграфіі з'яўляецца тое, што радыкальна змяніліся прыярытэты і акцэнты ў тэматыцы навуковых даследаванняў. Увага большасці гісторыкаў (і асабліва маладых) звернута на праблемы, якія раней па розных матывах, перш за ўсё ідэалагічных і палітычных, не распрацоўваліся ў савецкай гістарычнай навуцы. У традыцыйных жа тэмах асвятляюцца новыя ракурсы і аспекты. Гэта тычыцца і праблем гісторыі дзяржаўнага будаўніцтва на Беларусі 1918 – 1922 гадоў, сярод якіх сталі вывучацца і такія сюжэты, як вызначэнне і фарміраванне

---

[14] Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов: Матер. межресп. науч. конф., посвящ. 60-летию образ. Литовско-Белорусской ССР. – Мн., 1981.

[15] Петрыкаў П. Ц. Асноўныя этапы гістарыяграфіі Беларусі. – С. 39.

[16] Міхнюк У. З кандыдацкай дысертацыяй у навуку ўваходзяць, а з доктарскай – выходзяць // Беларуская думка. – 2000. – № 3. – С. 102.

[17] Некторыя аспекты гэтай праблемы закрануты ў спецыяльным артыкуле. (Гл.: Малыхіна Л. Ю. Канцэпцыя беларускай дзяржаўнасці ў даследаваннях савецкіх эмігрантаў Германіі ў другой палове XX ст. // Актуальныя праблемы германскай гісторыі, палітыкі, эканомікі, культуры (17-18 красавіка 2003 г.) – Брэст, 2003. – С. 55-60.

тэрыторыі і граніц БНР і БССР, ролі Брэсцкага (3 сакавіка 1918 г.), расійска-літоўскага (12 ліпеня 1920 г.) і Рыжскага (18 сакавіка 1921 г.) мірных дагавораў у лёсе Беларусі і беларускага народа

**Чацвёртае.** Аб творчым уздыме айчыннай гістарычнай навукі на сучасным этапе сведчыць і той факт, што па розных аспектах гісторыі Беларусі ў рэспубліцы праведзены дзесяткі навуковых канферэнцый ад раённага і ўніверсітэцкага да міжнароднага ўзроўняў. Толькі ў 2000 – 2003 гадах у Мінску і абласных гарадах адбыліся міжнародныя навуковыя канферэнцыі, тэматыка якіх не толькі адлюстравала разнастайны спектр даследчыцкіх пошукаў гісторыкаў Беларусі, але і прыцягнула ўвагу да новых, актуальных праблем айчыннай гісторыі. Сярод іх уяўляюцца значнымі навуковыя форумы, на якіх вялікая ўвага была нададзена асвятленню праблем гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў XX ст. Назавём з іх толькі некаторыя, на якіх прагучалі даклады і выступленні і па асобных аспектах гісторыі Літоўска-Беларускай ССР: "XX стагоддзе ў гісторыі палякаў і беларусаў" (20-21 лістапада 2000 г., Мінск); "Рыжскі мірны дагавор і лёсы народаў Усходняй Еўропы" (16-17 красавіка 2001 г., Мінск); "Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця" (3-4 мая 2002 г., Гродна); "Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя" (18-19 красавіка 2003 г., Мінск); "Нацыянальна-тэрытарыяльны фактар у гісторыі Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы XX стагоддзя і Расія (СССР)" (24-25 красавіка 2003 г., Мінск); "Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі" (28 лістапада 2003 г., Мінск) і шмат іншых.

Разам са станоўчымі, плённымі аспектамі айчыннай гістарычнай навукі на сучасным этапе яе развіцця выявіліся праблемы і адмоўнага характару. Напрыклад, па шэрагу прынцыповых пытанняў беларускай гісторыі радыкальна змяніліся ацэнкі і вывады, але зроблены яны на вузкай крынічнай аснове, са слабай факталагічнай аргументацыяй. Пагэтаму такія "наватарскія" палажэнні з'яўляюцца неправаканаўчымі. Гэта адносіцца і да сюжэтаў гісторыі Літоўска-Беларускай ССР. Парадаксальнасць сучаснай сітуацыі беларускіх гісторыкаў заключаецца ў тым, што для іх адкрыты архівы рэспублікі і суседніх замежных краін – Расіі, Польшчы, Літвы, Украіны, Латвіі, але працаваць у іх яны не могуць з-за адсутнасці фінансавых сродкаў на навуковыя камандыроўкі. Тое ж тычыцца і ўдзелу беларускіх гісторыкаў у навуковых канферэнцыях, якія праводзяцца ў суседніх краінах і кранаюць прынцыповыя пытанні беларускай гісторыі. Гэтае становішча значна стрымлівае творчы патэнцыял айчыннай гістарычнай навукі і прымушае яе "варыцца ва ўласным саку".

І, нарэшце, трэба адзначыць адно цікавае назіранне, якое адносіцца да поглядаў літоўскіх даследчыкаў на гісторыю ЛітБела. Сутнасць яго заключаецца ў тым, што з другой паловы 1980-х гадоў з іх навуковых і публіцыстычных прац пачалі знікаць паняцці "Літоўска-Беларуская ССР", "ЛітБел", "ЛітБел ССР", "Кампартыя Літвы і Беларусі", "КП(б) ЛіБ". Калі ў працах літоўскіх навукоўцаў размова ішла аб літбелаўскім перыядзе гісторыі іх краіны, то яны выходзілі са становішча наступным чынам: не ўзгадвалі аб факце існавання Літоўска-Беларускай ССР. Так, член-карэспандэнт АН Літвы Б. Вайткявічус у артыкуле, надрукаваным у органе ЦК Кампартыі Літвы часопісе "Коммунист", калі гаварыў пра клопаты Савецай улады аб развіцці культуры ў ЛітБеле, ўмудрыўся нават не ўспомніць аб яе існаванні.[18] Тое ж самае мы знаходзім і ў артыкуле Ю. Крылова, надрукаваным у тым жа віленскім часопісе.[19] У тым

[18] Вайткявичус Б. Год 1919-й: забота о духовной культуре // Коммунист (Вильнюс). – 1988. – № 11. – С. 17-23.
[19] Крылов Ю. Свидетели исторических событий // Там жа. – 1988. – № 10. – С. 8-12.

выпадку, дзе размова павінна была ісці пра дзейнасць Кампартыі Літвы і Беларусі ў 1919 г., ён выкарыстоўваў такія выразы і моўныя звароты: "У справаздачы ЦК КП Літвы за сакавік – красавік 1919 г. ...", "ЦК КП Літвы ўдзяляў вялікую ўвагу...".[20] І ні слова пра Літоўска-Беларускую ССР і Кампартыю (бальшавікоў) Літвы і Беларусі! Больш таго, аўтар характарызаваў партыйную работу бальшавікоў не толькі ў Віленскай і Ковенскай, але і ў Гродзенскай і Мінскай губернях. Гэта, напэўна, накіравана на тое, каб у недасведчаных літоўцаў фармаваліся міфалагічныя ўражанні і ўяўленні аб "вялікай Літве".

Такая агульная характарыстыка гістарыяграфіі праблемы здаецца нам неабходнай, каб мець панарамнае ўяўленне аб вывучэнні гісторыі Літоўска-Беларускай ССР у кантэксце развіцця савецкай і айчыннай беларускай гістарычнай навукі.

### § 2. Гістарыяграфічныя крыніцы

Для паспяховага дасягнення мэты і вырашэння задач у манаграфіі прааналізавана шырокае кола гістарыяграфічных крыніц. У сувязі з гэтым адзначым, што гісторыкі актыўна вядуць зацікаўленыя дыскусіі аб тым, што разумець пад гістарыяграфічнымі крыніцамі і як гэтае вызначэнне суадносіцца з такім паняццем, як гістарыяграфічны факт. Мы не будзем высвятляць гэтыя складаныя і слаба распрацаваныя ў навуковай літаратуры метадалагічныя пытанні, а толькі абазначым аўтарскую пазіцыю ў адносінах да іх.

Пад гістарыяграфічнай крыніцай мы разумеем любую тыражыраванную публікацыю, якая ўтрымлівае тую ці іншую інфармацыю і дакладныя навуковыя звесткі па праблеме гістарычнага даследавання, у дадзеным выпадку па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР. Гістарыяграфічным фактам мы называем факт гістарычнай навукі, які ўтрымлівае інфармацыю аб гістарычных ведах і служыць для характарыстыкі развіцця гісторыі гістарычнай навукі ці стану і ўзроўня вывучэння асобных яе праблем. Іншымі словамі, у якой меры гістарычная крыніца цікавіць даследчыка, як носьбіта інфармацыі аб гістарычным факце, так і гістарыяграфічная крыніца цікавіць гістарыёграфа, як носьбіта інфармацыі аб факце гістарыяграфічным. На наш погляд, бясспрэчным з'яўляецца вывад аб тым, што аб'ём і якасць выкарыстаных крыніц, узровень і ступень іх аналіза складаюць адну з важных, вызначальных рыс развіцця як гістарычных, так і гістарыяграфічных навуковых даследаванняў, іх ідэй і канцэпцый.

Пагэтаму для гістарыяграфічнага аналіза мы найбольш поўна выкарысталі комплекс крыніц па вывучаемай праблеме, што забяспечыла рэпрэзентатыўнасць і аб'ектыўнасць вынікаў нашага даследавання. Зразумела, што розныя перыяды развіцця гістарычнай навукі маюць свае спецыфічныя гістарыяграфічныя крыніцы. Іх можна класіфікаваць наступным чынам.

Першая група гістарыяграфічных крыніц – гэта дакументы і матэрыялы, якія апублікаваны ў перыядычным друку і розных зборніках. Сярод іх найбольшую цікавасць і важнасць уяўляюць дакументы, якія ўтрымліваюць рашэнні і пастановы вышэйшых партыйных і савецкіх органаў РСФСР, БССР і Літоўска-Беларускай рэспублікі. Менавіта яны, а таксама даклады, выступленні, прамовы, артыкулы, перапіска іх кіраўнікоў, стэнаграмы пасяджэнняў і справаздачы розных партыйных і савецкіх інстанцый і т. п., на доўгі час вызначылі асноўныя накірункі і аспекты даследаванняў гісторыі ЛітБела і

[20] Там жа. – С. 11-12.

абумовілі прынцыповыя яе ацэнкі і вывады. Гэтыя апублікаваныя дакументы ці, скажам, гістарыяграфічныя крыніцы ў савецкую эпоху ўспрымаліся марксісцка-ленінскімі даследчыкамі не крытычна, як абсалютная ісціна і прадвызначылі фарміраванне ўстойлівай артадаксальнай традыцыі ў вывучэнні праблемы.

Такім чынам, адзначаныя дакументальныя публікацыі з'яўляюцца не толькі гістарыяграфічнымі крыніцамі, якія давалі даследчыкам магчымасць паўней, грунтоўней і аб'ектыўней вывучаць гісторыю Літоўска-Беларускай ССР, але і мелі пры гэтым вызначальную метадалагічную нагрузку.

Вывучэнне гісторыі назапашвання і ўвядзення ў навуковы ўжытак саміх гістарычных крыніц з'ўляецца адной з задач гістарыяграфічнага даследавання. Яно дазваляе ўбачыць уплыў крынічнай базы на фарміраванне новых ідэй і поглядаў, выяўленне наяўнасці ў навуковых працах спасылак на першапачатковае ўвядзенне ў навуковы ўжытак крыніц і г. д. Такім чынам, калі гістарычныя крыніцы могуць быць глыбока зразумелы як у сваёй першаснай (з пункту гледжання іх стварэння і службовай субстанцыі), так і ў другаснай якасці (з пункту гледжання вывучэння іх гісторыкамі), то гістарыяграфічныя крыніцы ўжо выступаюць на трэцім узроўні – іх выкарыстання і інтэрпрэтацыі ў гістарыяграфічнай працы.[21]

Прызнаваючы вялізную, вырашальную ролю крыніц у развіцці гістарычнай навукі ў цэлым і асобных яе праблем, у прыватнасці, па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР, у асобнай другой главе манаграфіі дадзены гістарыяграфічна-крыніцазнаўчы агляд апублікаваных дакументаў і матэрыялаў па тэме даследавання.

Не будзем удавацца ў падрабязнасці праведзенай характарыстыкі, адзначым толькі тое, што такія дакументальныя матэрыялы пачалі друкавацца з 1919 г. – з часу абвяшчэння ЛітБела і з той ці іншай інтэнсіўнасцю публікуюцца да нашых дзён. Найбольшая колькасць дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Літоўска-Беларускай рэспублікі была надрукавана ў 60-я гады мінулага стагоддзя.

Да гістарыяграфічных крыніц па тэме трэба далучыць і дысертацыйныя работы, якія храналагічна ахопліваюць перыяд нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі і Літве ў 1919 – 1920 гадах. Знаёмства з імі адбылося праз апублікаваныя аўтарэфераты. Каштоўнасць дысертацый абумоўлена тым, што яны, і ў першую чаргу кандыдацкія даследаванні, будучы часцей за ўсё не апублікаванымі цалкам, акрамя аўтарэфератаў і серыі артыкулаў, маюць найбольшую ступень навуковай навізны. Да сказанага дададзім тое, што даследчыцкая распрацоўка практычна ўсіх праблем у савецкай і айчыннай гістарычнай навуцы пачыналася і працягваецца з кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Яны складаюць фундамент гістарычнай навукі і найбольш яскрава адлюстроўваюць узровень яе развіцця ў той ці іншы перыяд. Пры аналізе гістарыяграфіі гісторыі Літоўска-Беларускай рэспублікі аўтар звярталася да дысертацыйных прац Э. Гімжаўскаса, Б. Вайткявічуса, С. П. Маргунскага, К. Навіцкаса і іншых беларускіх і літоўскіх гісторыкаў.

Найбольш важную групу гістарыяграфічных крыніц складаюць аналітычныя працы гісторыкаў – манаграфіі, артыкулы ў перыядычным друку і розных зборніках, апублікаваныя выступленні на навуковых канферэнцыях і ў дыскусіях, якія ў той ці іншай ступені тычацца праблем ЛітБела. У дысертацыі выкарыстаны, як гістарыяграфічныя крыніцы, практычна ўсе аналітычныя публікацыі ад першых

[21] Зевелев А. И. Историографическое исследование: методологические аспекты. – М., 1987. – С. 132.

артыкулаў пачатку 20-х гадоў, аўтарамі якіх былі В. Г. Кнорын і У. М. Ігнатоўскі[22], да грунтоўных манаграфічных прац В. А. Круталевіча, У. Ф. Ладысева і П. І. Брыгадзіна, А. В. Ціхамірава, якія выйшлі ў свет у 2003 г.[23]

Да гэтай групы гістарыяграфічных крыніц тэматычна і семантычна адносяцца і рэцэнзіі на асобныя кнігі па даследуемай праблематыцы. Асаблівую цікавасць уяўляюць тыя рэцэнзіі, у якіх уздымаюцца дыскусійныя пытанні і выказаны ўласныя думкі, палажэнні і ацэнкі рэцэнзентаў.[24]

У асобную групу гістарыяграфічных крыніц мы выдзялілі абагульняючыя працы. У іх маюцца адпаведныя раздзелы, у якіх асвятляюцца розныя аспекты гістарыяграфіі праблемы на ўзроўні яе навуковай распрацоўкі на час падрыхтоўкі абагульняючых выданняў. Размова ідзе пра такія працы, як "Гісторыя Беларускай ССР" у двух тамах (Мн., 1954 – 1958, другое выданне: Мн., 1961), а таксама "Гісторыя Беларускай ССР" у пяці тамах (Мн., 1972-1975), "Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии" у двух частках (Мн., 1967 – 1968), "Нарысы гісторыі Беларусі" у двух частках (Мн., 1994 – 1995). Да гэтых прац прымыкаюць абагульняючыя выданні гісторыка-прававога характару – "Очерки по истории государства и права БССР" (Мн., 1958), "История государства и права Белорусской ССР" у двух тамах (Мн., 1970 – 1976) і інш. Названыя працы ў гістарыяграфічным сэнсе цікавыя тым, што ў іх былі лаканічна акумуляваны ўсталяваўшыяся ў гістарычнай і гісторыка-прававаой навуцы погляды і ацэнкі і стрымана адлюстраваны тагачасны ідэалагічны афіцыёз.

Асобныя пытанні гісторыі Літоўска-Беларускай рэспублікі паказаны і ў некаторых энцыклапедычных выданнях, якія складаюць чарговую групу гістарыяграфічных крыніц. Такіх, напрыклад, як "Большая советская энциклопедия" (Т. 25. М., 1954), "Советская историческая энциклопедия" (Т. 8. М., 1965), "Беларуская савецкая энцыклапедыя" (Т. 6. Мн., 1972), "Энцыклапедыя гісторыі Беларусі" (Т. 4 Мн., 1997), "Беларуская энцыклапедыя" (Т. 9. Мн., 1999). У гэтых выданнях ёсць артыкулы аб гісторыі Літоўска-Беларускай ССР.

І, нарэшце, адносна новую, спецыфічную групу гістарыяграфічных крыніц па тэме складаюць падручнікі і вучэбныя дапаможнікі для сярэдніх школ і курсы лекцый для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. У гісторыі гістарычнай навукі яны займаюць асобнае месца, паколькі найбольш кансерватыўна фіксуюць узровень яе дасягненняў і трансфармуюць навуковыя веды ў вучэбныя, у тым ліку і па гісторыі беларускай дзяржаўнасці. З-за сваёй спецыфічнасці, але надзвычайнай важнасці, гэтыя крыніцы па тэме даследавання прааналізаваны ў асобнай главе манаграфіі. Пры гістарыяграфічным разглядзе ўзяты пад увагу практычна ўсе вучэбныя дапаможнікі для агульнаадукацыйнай школы і вышэй-

---

[22] Ігнатоўскі У. Камуністычная партыя Беларусі і беларускае пытанне // Полымя. – 1922. – № 1.; ён жа. Сучасная вялікая рэвалюцыя і нацыянальнае пытанне // Полымя. – 1922. – № 1. – С. 4,5; ён жа. Вялікі Кастрычнік на Беларусі // Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху. – Мн., 1924; ён жа. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. – 5-е выд. – Мн., 1992; Кнорин В. Г. Пять лет: Краткий конспект истории КП(б)Б. – Мн., 1922; ён жа. Камуністычная партыя на Беларусі // Беларусь. Нарысы гісторыі эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху.; ён жа. 1917 год в Белоруссии и на Западном фронте. – Мн., 1925; ён жа. Аб рашаючых "дробязях" у вялікім пытаньні // Асьвета (Менск). – 1928. – № 4; ён жа. Да гісторыі дыктатуры пралетарыяту ў Беларусі. – Мн., 1930; ён жа. Избранные статьи и речи. – Мн., 1990.

[23] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – 2-е изд., доп. – Мн., 2003; Ладысеў У., Брыгадзін П. На пераломе эпох: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917 – 1920 гг.). – Мн., 1999; Ладысеў У. Ф. Праблемы станаўлення беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: Матэр. рэспуб. навук. канф. : У 4 ч. – Ч. 1 / Пад рэд. І. П. Крэня і інш. – Гродна, 2003. – С. 59-65; Ціхаміраў А. В. Беларусь ў сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918 – 1921 гг.). – Мн., 2003.

[24] Искров М. В. Исследование по истории Литовско-Белорусской ССР // Вопросы истории КПСС. – 1962. – № 6. – С. 187-191.

шых навучальных установ, якія выдадзены ў Беларусі і якія ўтрымліваюць тыя ці іншыя звесткі аб гісторыі Літоўска-Беларускай ССР.

Так выглядае класіфікацыя і схематычная характарыстыка гістарыяграфічных крыніц па гісторыі Літоўска-Беларускай рэспублікі.

### § 3. Метадалогія і метады даследавання

А цяпер у агульных рысах ахарактарызуем метадалагічныя асновы прадстаўленай гістарыяграфічнай працы. Пры гэтым адзначым, што метадалогію гістарыяграфічнага даследавання мы разумеем (па аналогіі з метадалогіяй гістарычнага даследавання) як сістэму прынцыпаў і метадаў арганізацыі і правядзення навуковага аналізу.[25] У дадзеным канкрэтным выпадку – гістарыяграфічнага вывучэння гісторыі Літоўска-Беларускай рэспублікі.

Для дасягнення мэты і рэалізацыі задач аўтары кіраваліся асноватворнымі навуковымі прынцыпамі аб'ектыўнасці і гістарызма, якія вызначылі галоўныя тэарэтычныя арыенціры падрыхтоўкі гістарыяграфічнага даследавання.

Аб'ектыўнасць у вывучэнні пастаўленай праблемы дасягнута надзвычай поўным, амаль усеахопным выкарыстаннем і аналізам гістарыяграфічных крыніц па тэме, улікам і паказам розных аўтарскіх палажэнняў і высноў, якія ў іх утрымліваюцца. Выкарыстанне прынцыпа аб'ектыўнасці абумовіла ўважлівую і ўзважаную, карэктную пазіцыю аўтараў да поглядаў і ацэнак, якія выказаны даследчыкамі па гісторыі ЛітБела на розных этапах развіцця савецкай і айчыннай гістарычнай навукі. Погляды гісторыкаў сістэматызаваны і абагульнены. Пры гэтым аўтары імкнуліся не толькі высветліць і растлумачыць, аб чым і як пісалі даследчыкі пра ЛітБел у той ці іншы час, але і адказаць на пытанне, чаму менавіта так раскрываліся важнейшыя аспекты гісторыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Такі падыход даў магчымасць мінімізаваць суб'ектывізм ў персанальных ацэнках папярэднікаў.

Пры выказванні ўласных пунктаў гледжання па тых ці іншых праблемах аўтары аргументавалі іх доказамі, абапіраючыся на гістарыяграфічныя факты і лагічныя меркаванні. Такім чынам, рэалізацыя прынцыпа аб'ектыўнасці абумовіла не толькі абгрунтаванасць і фундаванасць манаграфічнай працы, але і дазволіла зрабіць найбольш пераканаўчыя вывады і заключэнні.

Прынцып гістарызма ў гістарыяграфіі ўключае ў сябе групу ўзаемазвязаных палажэнняў. Першае з іх заключаецца ў тым, што падзеі і з'явы гістарычнай навукі аналізуюцца ў кантэксце яе развіцця ў той ці іншы перыяд. Але гістарызм у гістарыяграфічнай працы праяўляецца не толькі ў гэтым. У кантэксце даследавання высвятляецца абумоўленасць пазіцыі гісторыкаў сацыяльнымі, палітычнымі, ідэалагічнымі і іншымі фактарамі. Такім чынам агульна-метадалагічны прынцып гістарызма адкрывае гістарыёграфам магчымасць даследаваць развіццё гістарычных ведаў не толькі ў храналагічнай паслядоўнасці, але і ў іх канцэптуальным адзінстве, узаемнай сувязі і абумоўленасці.

Далей. Прынцып гістарызма дазваляе выявіць прычыны, якія выклікалі пастаноўку і распрацоўку канкрэтных праблем на тым ці іншым этапе развіцця гістарычнай навукі. Гістарыёграф, кіруючыся прынцыпам гістарызма, можа высвятліць, чаму вывучаліся адны сюжэты і пытанні, а іншыя не даследаваліся

[25] У сучасных энцыклапедычных слоўніках **метадалогія** вызначаецца як "сістэма найбольш агульных прынцыпаў, палажэнняў і метадаў, якія складаюць аснову дадзенай навукі". (Социологический энциклопедический словарь. На русском, английском, немецком, французском и чешском языках / Редактор-координатор – академик РАН Г. В. Осипов. – М., 1998. – С. 180).

ці ўвогуле не ставіліся. Прынцып гістарызма з'яўляецца вызначальным у разуменні станаўлення і развіцця навуковых ведаў, іх пераемнасці ў адзіным кантэксце мінулага, сучаснага і будучага. І, нарэшце, прынцып гістарызма арыентуе даследчыкаў-гістарыёграфаў на вывучэнне як асобных гістарыяграфічных крыніц і фактаў, напрыклад, прац канкрэтнага гісторыка, так і працэса назапашвання ведаў у цэлым па той ці іншай навуковай праблеме ці некаторых яе аспектах. Зразумела, што асобныя працы гісторыкаў, іх значэнне і месца ў гістарыяграфіі праблемы могуць быць дакладна ацэнены ў кантэксце развіцця навуковых ведаў у тым ці іншым перыядзе гістарычнай навукі. У гэтым сэнсе заслугі гісторыкаў будуць ацэньвацца не па тым, чаго яны не зрабілі ў параўнанні з сучаснымі патрабаваннямі, а па тым, што яны прыўнеслі новага ў параўнанні са сваімі папярэднікамі.

Пачынаючы характарыстыку метадаў, якія выкарыстаны ў нашым гістарыяграфічным даследаванні, адзначым, што пад метадамі мы разумеем "свядома і паслядоўна прымяняемыя спосабы дасягнення мэты".[26] У дадзеным выпадку размова ідзе пра даследаванне канкрэтнай тэмы айчыннай гістарычнай навукі – гістарыяграфіі гісторыі Літоўска-Беларускай рэспублікі.

Значэнне метадаў для гістарыяграфічнага даследавання надзвычайна вялікае. Складанасць жа гістарыяграфічных аб'екта і прадмета і іх аналіза патрабуюць прымянення розных даследчыцкіх спосабаў і прыемаў. У гістарыяграфічных работах выкарыстоўваецца сістэма метадаў. Іх можна класіфікаваць наступным чынам: агульныя для ўсіх гуманітарных навук метады, якія прымяняюцца з улікам своеасаблівасцей і задач гістарыяграфіі (аналіза і сінтэза, індукцыі і дэдукцыі і інш.); запазычаныя з іншых, і перш за ўсё з сумежных, навук і якія сталі міждысцыплінарнымі метадамі; спецыфічныя метады, якія выкарыстоўваюцца толькі ў гістарычнай навуцы і ў гістарыяграфіі, як яе арганічнай галіне.

У гістарыяграфічных даследаваннях шырока выкарыстоўваецца параўнальна-гістарычны метад. Ён дае магчымасць вывучаць гістарыяграфічныя факты ў арганічнай сувязі з той гістарычнай абстаноўкай, у якой яны ўзніклі, а таксама ў дыялектычным змяненні іх на розных этапах развіцця гістарычнай навукі. Указаны метад дазваляе выявіць не толькі паўтарэнне гістарыяграфічных фактаў, што з'яўляецца характэрным для гістарычнай літаратуры, але і паказаць тое новае ў вывучэнні праблемы (факты, палажэнні і вывады, заключэнні і ацэнкі), што прыўнеслі даследчыкі ў гістарычную навуку на розных этапах яе развіцця, вызначыць іх аўтарскія прыярытэты. Параўнальна-гістарычны метад мае важнае значэнне ў высвятленні прычын пранікнення ў навуковыя працы розных хібаў і недахопаў, памылковых палажэнняў і вывадаў. Гісторыка-параўнальны метад дазволіў супаставіць розныя пазіцыі па праблеме, у прыватнасці, беларускія даследаванні па тэме параўноўваліся з аналагічнымі напрацоўкамі вучоных іншых краін. Метад параўнання дапамог таксама выявіць агульнае і асобнае ў поглядах навукоўцаў на гісторыю ЛітБела.

Распаўсюджаным у гістарыяграфічных даследаваннях з'яўляецца і гісторыка-генетычны метад. Карыстаючыся ім, гістарыёграф разглядае вывучаемыя праблемы ў развіцці, з улікам умоў іх узнікнення і ўзаемаўплыву. Гэты метад дапамагае высветліць канкрэтныя прычыны, якія абумовілі тыя ці іншыя з'явы ў гістарычнай навуцы, у вывучэнні яе актуальных пытанняў. Ён дазваляе ўбачыць, як змянялася тэматычная палітра даследаванняў, як . калі і

[26] Социологический энциклопедический словарь. – С. 177.

пры якіх умовах з'яўляліся новыя тэмы і сюжэты, новыя ідэі і палажэнні, вывады і абагульненні.

Гісторыка-тыпалагічны метад выкарыстоўваўся пры выпрацоўцы структуры дысертацыі і яе ўнутранай архітэктонікі, пры групіроўцы і тыпалагізацыі гістарыяграфічных крыніц.

Гісторыка-сістэмны метад дазволіў выявіць уплыў крынічнай базы на змяненне даследчыцкай праблематыкі, устанавіць функцыянальныя сувязі гістарыяграфічных фактаў па тэме дысертацыі. У цэлым у гістарыяграфічных працах праблематыка разглядаецца як своеасаблівая сістэма з састаўляючымі і ўзаемадзейнічаючымі элементамі – публікацыяй работ гісторыкаў, дзейнасцю навуковых цэнтраў, пашырэннем крынічнай базы і г. д.

Для гістарыяграфічных работ некаторае значэнне мае і рэтраспектыўны метад. Сутнасць яго заключаецца ў вывучэнні гістарыяграфічных крыніц ад апошніх, сучасных да першых публікацый па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР. Адначасова гэты метад дазваляе верыфіцыраваць вывады і заключэнні папярэдніх даследчыкаў навуковымі дадзенымі сучасных гісторыкаў. Выкарыстанне метада рэтраспектыўнага аналіза засцерагае даследчыка ад механічнага пераноса сучасных гістарыяграфічных ацэнак на літаратуру мінулых гадоў.

Значнае прымяненне ў даследаванні атрымаў лагічны метад, на аснове якога быў сістэматызаваны гістарыяграфічны матэрыял і грунтоўна прааналізаваны ў святле пастаўленных мэты і задач нашага даследавання.

Пры падрыхтоўцы гістарыяграфічнай работы аўтары выкарыстоўвалі і шэраг іншых метадаў, у тым ліку і міждысцыплінарныя – перыядызацыі, храналагічны, статыстычны і інш. Іх прымяненне ў сукупнасці стварыла фундамент пленнага вывучэння гістарыяграфіі Літоўска-Беларускай рэспублікі.

# ГЛАВА 2

## ГІСТАРЫЯГРАФІЧНА-КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ АГЛЯД АПУБЛІКАВАНЫХ ДАКУМЕНТАЎ І МАТЭРЫЯЛАЎ ПА ГІСТОРЫІ ЛІТОЎСКА-БЕЛАРУСКАЙ ССР

Першыя публікацыі асобных дакументаў і матэрыялаў па гісторыі ЛітБела з'явіліся ў цэнтральным і мясцовым беларускім друку ў пачатку 1919 г. Гэта былі рашэнні і дэкларацыі па пытаннях прызнання ўрадам РСФСР Беларускай ССР і Літоўскай ССР, рэзалюцыі і пастановы першых з'ездаў Саветаў Беларусі і Літвы аб абвяшчэнні ЛітБела і некаторыя іншыя. Працяглы час даследчыкі і архівісты не звярталіся да праблематыкі гісторыі Літоўска-Беларускай ССР. Толькі ў 1934 г. у Мінску выйшаў ў свет зборнік "КП(б)Б у рэзалюцыях. 1903 – 1921 гг.", які быў падрыхтаваны да выдання супрацоўнікамі Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б) Беларусі. У ім надрукаваны рэзалюцыі Другой канферэнцыі Кампартыі Літвы і Заходняй Беларусі (Вільня, 2-4 лютага 1919 г.) па пытаннях аб'яднання Літвы і Беларусі, аб савецкім будаўніцтве, аграрнаму пытанню і іншыя (С. 131-136), а таксама рэзалюцыі аб'яднанага з'езда Кампартыі Літвы і Беларусі, які адбыўся ў Вільні 4-6 сакавіка 1919 г. (С. 137-156).

Грунтоўная і сістэматызаваная падборка дакументаў па тэме "Да гісторыі барацьбы літоўскага народа за Савецкую ўладу ў 1918 – 1919 гг." была надрукавана ў гістарычным часопісе Галоўнага архіўнага ўпраўлення НКУС СССР.[27] З 41 дакумента 18 былі архіўнымі, а астатнія надрукаваны з газет "Правда", "Известия", "Коммунист", "Жизнь национальностей", "Литовский курьер", "Звезда". Частка з іх, а дакладней 9 дакументаў, адносілася да пытання аб аб'яднанні Літвы і Беларусі, у прыватнасці, рэзалюцыя Першага з'езда Саветаў Літоўскай ССР, які адбыўся 17-21 лютага 1919 г., аб аб'яднанні суседніх рэспублік, Дэкларацыя ЦВК ЛітБела да ўсіх народаў, а таксама шэраг дэкрэтаў СНК Літоўска-Беларускай ССР. Цікава адзначыць, што ў дакументах і каментарыях да іх не названы прозвішчы актыўных палітычных дзеячаў ЛітБела – В. Г. Кнорына, З. І. Ангарэціса, Я. Г. Далецкага, І. І. Рэйнгольда і іншых, якія былі безпадстаўна рэпрэсаваны "як ворагі народа" ў другой палове 30-х гадоў. З апублікаваных у "Красном архиве" дакументаў найбольш цікавым уяўляецца рэзалюцыя Першага з'езда Саветаў Літвы, якая раней была надрукавана ў газеце "Литовский курьер" (1919. 28 февраля). Менавіта гэтым дакументам, як ужо адзначалася, абвяшчалася новая рэспубліка – Літоўска-Беларуская ССР.

---

[27] Красный архив. – 1940. – Т. 5. – С. 3-44.

Напярэдадні Вялікай Айчынай вайны выйшаў у свет першы том зборніка "Документы по истории гражданской войны в СССР" (М., 1941. – 544 с.), падрыхтаваны сакратарыятам галоўнай рэдакцыі "Гісторыі грамадзянскай вайны". У ім надрукаваны прамова Я. М. Свярдлова на Першым Усебеларускім з'ездзе Саветаў, Дэкларацыя аб аб'яднанні БССР з Літоўскай рэспублікай, прынятая на ім, а таксама пастанова Усерасійскага ЦВК аб прызнанні незалежнасці БССР [28]

У пасляваенныя гады працягвалася публікацыя матэрыялаў па гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі, замежнай ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны, сярод якіх сустракаліся і асобныя дакументы па гісторыі дзяржаўнага будаўніцтва ў Літоўска-Беларускай ССР. Але ў большасці гэта былі перадрукоўкі з папярэдніх выданняў, у прыватнасці, з "Красного архива" (1940. Т. 5. С. 3-44). Прыкладам таго з'яўляюцца дакументальныя зборнікі, выдадзеныя ў Маскве і Мінску – "Образование Союза ССР (1917 – 1924 гг.)" (М., 1949. С. 7), "Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. Документы и материалы по истории Белоруссии" (Мн., 1965. Т. 4. С. 461-464), "Съезды Советов Советских Социалистических Республик. Сборник документов 1917 – 1922 гг." (М., 1960. Т. 2. С. 221-222), у якіх у чарговы раз надрукаваны дэкларацыя Першага Усебеларускага з'езда Саветаў аб аб'яднанні Літвы і Беларусі і прамова на ім Я. М. Свярдлова, рэзалюцыя Першага з'езда Саветаў Літвы аб зліцці двух рэспублік.

У 1957 г. у часопісе "Исторический архив", які выдаваўся Інстытутам гісторыі АН СССР з удзелам ІМЛ пры ЦК КПСС і Галоўнага архіўнага ўпраўлення, былі надрукаваны дакументы з ЦПА ІМЛ пры ЦК КПСС пад загалоўкам "Да гісторыі барацьбы Камуністычнай партыі за ўстанаўленне Савецкай улады ў Літве і Беларусі (1918 – 1920 гг.)" (№ 6. С. 6-34). З 32 апублікаваных дакументаў некалькі адлюстроўваюць некаторыя аспекты гісторыі ЛітБела. У прыватнасці, ў часопісе апублікавана тэлеграма Савета абароны Літвы і Беларусі У. І. Леніну аб абароне Мінска (20 мая 1919 г.), зварот Савета абароны Літвы і Беларусі ў ЦК РКП(б) аб устанаўленні ваеннага саюза паміж савецкімі рэспублікамі (31 мая), лістоўкі ЦК КП(б) ЛіБ да сялянаў і салдатаў польскай арміі (ліпень), тэлеграма І. В. Сталіна ў ЦК РКП(б) і У. І. Леніну аб неабходнасці самароспуску Савета Абароны і ўрада ЛітБела (13 ліпеня), запыт па прамому проваду членаў ЦК КП(б)ЛіБ В. С. Міцкявічуса-Капсукаса і Я. Г. Далецкага ў ЦК РКП(б) аб роспуску Літоўска-Беларускай рэспублікі (13 ліпеня), ліст ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі ў ЦК РКП(б) аб мабілізацыі работнікаў ЛітБела ў распараджэнне Рэўваенсавета 16-й арміі (23 ліпеня), выпіска з пратакола пасяджэння ЦК КП(б)ЛіБ аб нелегальнай рабоце (3 верасня), даклад ЦК КП(б) ЛіБ аб нелегальнай рабоце з верасня па снежань 1919 г. (С. 10-19, 25-28).

Важкім дапаўненнем крыніц па гісторыі ЛітБела з'явілася публікацыя трэцяга тома зборніка "Дакументы і матэрыялы па гісторыі Літоўскай ССР", які выйшаў у 1958 г. у Вільні на літоўскай мове. У ім дакументальна раскрываецца гісторыя Літоўскай савецкай рэспублікі 1918 – 1919 гадах, у тым ліку і ЛітБела. Большасць надрукаваных у зборніку матэрыялаў выяўлена ў розных перыядычных выданнях, якія выходзілі ў 1918 – 1919 гадах. На той час публікацыя стала буйным поспехам літоўскіх гісторыкаў і архівістаў.

Новыя цікавыя дакументы, якія пралівалі святло на праблему абвяшчэння ЛітБела, былі ўпершыню надрукаваны ў трэцім томе эпісталярнай спадчыны Я. М. Свярдлова.[29] Гэта тэлеграмы за яго подпісам у ЦК КП(б)Б ад 26 студзеня

---

Па незразумелым прычынам гэтыя дакументы адпаведна датаваны: 4 лютага 1919 г., люты 1919 г. і лютага 1919 г.

Свердлов Я. М. Избранные произведения. – М., 1960. – Т. 3. – 274 с.

1919 г., савецкім урадам БССР і ЛітССР ад 30 студзеня, тэлеграма ўраду Літоўскай ССР ад 8 лютага, якія захоўваліся ў Цэнтральным партыйным архіве ІМЛ пры ЦК КПСС, а таксама прамова старшыні Усерасійскага ЦВК на Першым Усебеларускім з'ездзе Саветаў 2 лютага 1919 г.[30] У першай з іх ЦК РКП(б) пацвярджаў сваё рашэнне ад 16 студзеня таго ж года аб выдзяленні са складу БССР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў, што было "выклікана, – як сказана у тэлеграме, – агульнапалітычнымі меркаваннямі".[31]

У тэлеграме ад 30 студзеня 1919 г. старшыні ўрада Літоўскай ССР В. С. Міцкявічусу-Капсукасу, копія якой была накіравана ўраду БССР, гаварылася: "На з'ездзе Саветаў Беларусі вынесці рашэнне аб аб'яднанні Беларусі з Літвой. Прапанаваць літоўскім таварышам магчыма хутчэй склікаць свой з'езд і правесці там тое ж рашэнне. Цэка лічыць гэта рашэнне найбольш адпавядаючым нашым агульна-палітычным задачам і цалкам адпавядаючым міжнароднай каньюнктуры"[32].

У тэлеграме ўраду Літоўскай ССР Я. М. Свярдлоў прапанаваў выбраць старшынёй СНК ЛітБела В. С. Міцкявічуса-Капсукаса, а яго намеснікам – Дз. Ф. Жылуновіча, былога старшыню Часовага рабоча-сялянскага ўрада БССР[33].

Некаторай дапамогай даследчыкам, і ў першую чаргу літоўскім, служылі і выбраныя творы кіраўнікоў Кампартыі Літвы і Літоўска-Беларускай ССР З. І. Алексы-Ангарэціса і В. С. Міцкявічуса-Капсукаса, якія былі выдадзеныя на літоўскай мове Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КПЛ у 60-я гады, а таксама кніга мемуараў удзельнікаў рэвалюцыйных падзей і ўсталявання Савецкай улады ў Літве "Ветры революции. Сборник воспоминаний о пролетарской революции 1918 – 1919 гг. в Литве" (Вільнюс, 1968).

У 60-я гады быў надрукаваны шэраг дакументальных зборнікаў (як у Маскве, так і ў Мінску) па гісторыі ўсталявання Савецкай улады, грамадзянскай вайны і замежнай ўзброенай інтэрвенцыі, дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі. У некаторых з іх прыведзены дакументальныя сведчанні і з гісторыі ЛітБела. Напрыклад, у другім томе трохтомнага выдання па гісторыі грамадзянскай вайны ў савецкай краіне апублікавана некалькі новых і цікавых дакументаў па літбелаўскай тэматыцы.[34] У прыватнасці, дэкларацыя ЦВК Літоўска-Беларускай ССР ад 2 сакавіка 1919 г. з прапановай дзяржавам свету афіцыйна прызнаць яе і ўступіць з ёю ў адносіны. На старонках гэтага зборніка ўбачылі свет і іншыя архіўныя дакументы – пастанова СНК ЛіБ ССР аб перадачы ўлады Савету Абароны 19 красавіка 1919 г., выпіска з пратакола пасяджэння ЦК КП(б) ЛіБ па пытаннях арганізацыі партызанскіх атрадаў (14 мая 1919 г.) і іншыя.[35] Цікава адзначыць, што ў каментарыях да дэкларацыі ЦВК ЛіБ ССР выказана арыгінальная заўвага-думка: "Стварэнне ЛітБела дало магчымасць аб'яднаць сілы абедзвух рэспублік для барацьбы супраць польскіх захопнікаў і н а н е с ц і ў д а р б е л а р у с к і м і л і т о ў с к і м н а ц ы я н а л і с т а м" [разрадка аўтараў – Л. М., У. М.].[36]

[30] Там жа. – С. 139-146, 159.

[31] Там жа. – С. 139.

[32] Там жа. – С. 143. У цікавым артыкуле Р. П. Платонава і М. С. Сташкевіча ("Тернистый путь к свободе... Образование БССР" // Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции: совместное российско-белорусское исследование. В 3 ч. – Гомель, 1993. – Ч. 2. – С. 130) неправільна ўказана дата тэлеграмы – 20 студзеня і яе адрасат: кіраўнікі літоўскіх камуністаў.

[33] Свердлов Я. М. Избранные произведения. – Т. 3. – С. 159.

[34] Из истории гражданской войны в СССР. – Т. 2 (март 1919 г. – февраль 1920 г.). – М., 1961. – 895 с.

[35] Там жа. – С. 362-363, 365, 366-367, 681, 687-691.

[36] Там жа. – С. 864.

У 1961 г. была выдадзена калекцыя дакументаў і матэрыялаў аб дзейнасці рэвалюцыйных камітэтаў Беларускай ССР у лістападзе 1918 г. – ліпені 1920 г.[37] Акрамя тых дакументаў, якія ўжо былі надрукаваны ў папярэдніх зборніках, у новае выданне таксама ўвайшлі такія крыніцы, як дэкларацыя ЦВК ЛітБела аб знешняй палітыцы, прынятая 28 лютага 1919 г. і надрукаваная у зборніку "Документы внешней политики СССР" (М., 1958. С. 84-85), некаторыя дэкрэты і пратаколы пасяджэнняў СНК, загады асобных наркаматаў, рэзалюцыі, пастановы і адозвы Савета Абароны Літоўска-Беларускай ССР, пастановы і адозвы ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі. Яны былі выяўлены ў фондах ЦДАКР БССР і ЦПА ІМЛ пры ЦК КПСС і давалі ўяўленне не толькі аб намерах уладаў абвешчанай рэспублікі, але і аб тым, у якіх архівасховішчах знаходзяцца тыя ці іншыя дакументы і матэрыялы па гісторыі ЛітБела.

Да 50-годдзя савецкай улады літоўскія гісторыкі і архівісты падрыхтавалі зборнік дакументаў і матэрыялаў, які выйшаў у свет у Вільні на рускай мове.[38] У кнізе апублікаваны шэраг дакументаў з архівасховішчаў Масквы – Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі СССР (ЦДАКР СССР) і Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Савецкай арміі СССР (ЦДАСА СССР), а таксама з Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літоўскай ССР і парт-архіва Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПЛ. У зборніку надрукаваны шэраг дэкрэтаў і пастаноў СНК ЛітБела і кіраўнічых органаў КП(б) ЛіБ па пытаннях ваенна-палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага і культурнага становішча Літоўска-Беларускай ССР. Большасць дакументаў і матэрыялаў, якія тычацца ЛітБела і ўвайшлі ў зборнік, надрукаваны ўпершыню. Несумненна, яны арыентавалі даследчыкаў у далейшых пошуках новых крыніц. Трэба адзначыць, што гэтая публікацыя дакументаў з'яўляецца самай буйной у археаграфіі ЛітБела і важнай вехай у яго крыніцазнаўстве.

Навукоўцы, якія вывучаюць гісторыю Беларусі перыяда Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і ўзброеннай замежнай інтэрвенцыі, не могуць абыйсці ўвагай двухтомны дакументальны зборнік, які падрыхтаваны беларускімі гісторыкамі і архівістамі.[39] Апублікаваныя ў ім дакументы, выяўленыя ў ЦДАКР БССР, ПА ІГП пры ЦК КПБ, ПА ІГП пры ЦК КПЛ, ЦПА ІМЛ пры ЦК КПСС, ЦДАСА і іншых архівах, больш поўна адлюстроўваюць складанае ваенна-палітычнае, эканамічнае і сацыяльнае становішча ў Беларусі з лютага 1918 г. да канца 1920 г. У прадмове да другога тома зборніка яго складальнікі адзначалі: "Новыя дакументы дазваляюць глыбей зразумець склаўшуюся сітуацыю. На іх падставе можна больш упэўнена разважаць аб прычынах і часе ліквідацыі Літоўска-Беларускай рэспублікі».[40] У другім томе, дарэчы, надрукаваны запыт па прамому праваду членаў ЦК КП(б)ЛіБ В. С. Міцкявічуса-Капсукаса і Я. Г. Далецкага ў ЦК РКП(б) аб скасаванні ўрада ЛітБел ССР ад 13 ліпеня 1919 г.[41], які раней быў надрукаваны ў "Историческом архиве"(1957. № 6. С. 16-17). У томе змешчаны адказ сакратара ЦК РКП(б) М. М. Красцінскага на гэты запыт, які выяўлены ў ЦПА ІМЛ пры ЦК КПСС, аб несвоечасовасці роспуска ўрада ССР ЛіБ[42], а таксама вытрымкі з пратакола

[37] Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г. – июль 1920 г.): Сборник документов и материалов. – Мн., 1961. – 460 с.

[38] Борьба за Советскую власть в Литве в 1918 – 1920 гг.: Сборник документов. – Вильнюс, 1967. – 475 с.

[39] Борьба за Советскую власть в Белоруссии в 1918 – 1920 гг.: Сборник документов и материалов. В 2 т. – Т. 1 (февраль 1918 г. - февраль 1919 г.). – Мн., 1968. – 602 с.; Т. 2 (февраль 1919 г. – 1920 г.). – Мн., 1971. – 632 с.

[40] Там жа. – С. 10.

[41] Там жа. – С. 155-156.

[42] Там жа. – С. 157.

пасяджэння ЦК КП(б)ЛіБ аб скасаванні Савета Абароны і часовым спыненні дзейнасці СНК ЛітБела ад 16 ліпеня 1919 г.[43] У томе надрукаваны розныя іншыя дакументы, якія тычацца існавання Літоўска-Беларускай ССР, у прыватнасці, аб дзейнасці Бюро нелегальнай работы пры ЦК КП(б) ЛіБ.

Значнае пашырэнне кола друкаваных крыніц па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР у айчыннай археаграфіі было абумоўлена тым, што да сярэдзіны 60-х гадоў беларускія і літоўскія архівісты правялі карпатлівую работу па пошуку дакументальных матэрыялаў і іх крыніцазнаўчаму вывучэнню. Так, А. В. Вераб`ёў выявіў, сістэматызаваў і правёў крыніцазнаўчы аналіз пратаколаў пасяджэнняў СНК Літоўска-Беларускай ССР з 28 лютага па 19 ліпеня 1919 г.[44] Пры гэтым аўтар грунтоўнага цікавага артыкула прыйшоў да наступнага вываду. "Зусім магчыма, – пісаў А. В. Вераб'ёў, – што пратакол пасяджэння № 14 Б ад 19 ліпеня 1919 г. з'яўляецца не апошнім, хаця на гэтым пасяджэнні СНК ЛітБел прыняў пастанову аб перадачы Мінскаму губернскаму ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту ўсіх спраў народных камісараў".[45] Аўтар выказваў гіпатэтычнае меркаванне, што "дата 25 ліпеня з'яўляецца датай спынення дзейснасці СНК ЛітБел. Зусім верагодна , што ў перыяд з 19 па 25 ліпеня адбываліся пасяджэнні СНК ЛітБела".[46]

Аднак, нягледзячы на такія апрыёрныя "гістарыяграфічныя адкрыцці", артыкул у "Археографическом ежегоднике" каштоўны яшчэ і тым, што ўтрымлівае важную інфармацыю аб фондах ЦДАКР БССР (цяпер Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), у якіх маюцца дакументальныя матэрыялы аб дзейнасці СНК Літоўска-Беларускай ССР як вышэйшага выканаўчага і распарадчага органа дзяржаўнай улады.

У сярэдзіне 60-х гадоў пачало выходзіць фундаментальнае выданне дакументаў і матэрыялаў па гісторыі савецка-польскіх адносін, другі том якога храналагічна ахоплівае літбелаўскі перыяд.[47] У ім таксама змешчаны некаторыя дакументы, якія адлюстроўваюць асобныя аспекты гісторыі Літоўска-Беларускай ССР. Праўда, большасць з іх сведчыць аб захопніцкіх планах Польшчы ў адносінах да ЛіБ ССР, гвалтах польскіх легіянераў над насельніцтвам акупіраваных тэрыторый ЛітБела.[48] У другім томе, у прыватнасці, у каментарыях да ліста наркома замежных спраў РСФСР Г. В. Чычэрына надзвычайнаму прадстаўніку Міністэрства замежных спраў Польшчы аб згодзе савецкага ўрада на правядзенне плебісцыта ў Літве і ў Беларусі ад 24 сакавіка 1919 г., гаварылася, што гэтая прапанова была адхілена ўрадам і сеймам Польшчы. Больш таго, сейм не прызнаў" як выражэнне права на самавызначэнне ні існаванне Літоўска-Беларускай Савецкай Рэспублікі, ні літоўскіх і беларускіх урадаў, утвораных са згоды нямецкіх акупацыйных уладаў".[49]

Трэба адзначыць і новыя дакументальныя публікацыі літоўскіх архівістаў. У прыватнасці, барацьбе з нямецкай і польскай акупацыяй ў літбелаўскі перыяд прысвячаўся збор успамінаў "Ветры революции".[50] Да юбілеяў утварэння Кам-

---

[43] Там жа. – С. 159.
[44] Воробьёв А. В. Протоколы заседаний Совета Народных Комиссаров Литовско-Белорусской Советской Социалистической Республики (1919г.) // Археографический ежегодник за 1966 год. – М.,1968 – С. 276 – 288.
[45] Там жа. – С. 287.
[46] Там жа.
[47] Документы и материалы по истории советско-польских отношений – Т. 2 (ноябрь 1918 г. – апрель 1920 г.). – М.,1964. – 718 с.
[48] Там жа. – С. 129-154, 197-198, 215-221, 228-229, 235-237.
[49] Там жа. – С. 193.
[50] Ветры революции. Сборник воспоминаний о пролетарской революции 1918 – 1919 гг. в Литве – Вильнюс, 1968. – 308 с.

партыі Літвы і ўстанаўлення Савецкай улады ў рэспубліцы былі выдадзены на рускай мове два дакументальныя зборнікі. Размова ідзе аб "Декретах Советской власти Литвы 1918 – 1919 гг." (Вільнюс, 1977), які быў падрыхтаваны Інстытутам гісторыі АН Літоўскай ССР і раскрывае ўтварэнне савецкай дзяржаўнасці ў Літве, а таксама аб кнізе Ю. Крылова "Источниковедение истории Компартии Литвы 1918 –1919 гг." (Вільнюс, 1989), у якой зроблены крыніцазнаўчы аналіз комплекса матэрыялаў КПЛ – яе партыйных з'ездаў і канферэнцый, пратаколаў пасяджэнняў партыйных органаў, справаздачы партарганізацый і г. д.

Новыя дакументальныя зборнікі па гісторыі ўсталявання савецкай ўлады ў Беларусі, абвяшчэння БНР і БССР і іх знешнепалітычнай дзейнасці, якія ўтрымліваюць асобныя матэрыялы і па літбелаўскай тэматыцы, выйшлі ў свет у 80 -- 90-я гады XX стагодзя.[51] Але трэба падкрэсліць, што прынцыпова новых дакументаў і матэрыялаў, якія б пралівалі святло на прычыны скасавання БССР і абвяшчэння ЛітБел ССР і яе ліквідацыі, і адказвалі б на іншыя пытанні дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі ў канцы 1918 – 1920 гадоў, даследчыкамі і архівістамі амаль не апублікавана. На жаль, ніякай новай важнай інфармацыі па гэтых пытаннях не ўтрымліваюць і адпаведныя тамы выданняў твораў У. І. Леніна – галоўнага архітэктара савецкай дзяржавы і адказнага рэжысёра эксперыментаў у яе нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве, а таксама публікацыі, якія дапаўняюць яго так званы Поўны збор твораў. Размова ідзе перш за ўсё пра такое ўнікальнае выданне як "Владимир Ильич Ленин. Биографическая хроника" (Т. 6 (июль 1918 –март 1919). М., 1975. 666 с.; Т. 7 (март - ноябрь 1919). М., 1976. 700 с.), у якім распісаны амаль па днях і гадзінах важныя падзеі жыцця і дзейнасці старшыні СНК РСФСР.[52] Ніякіх сведчанняў па названых пытаннях не ўтрымлівае і другое арыгінальнае выданне – "Политбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б). Повестки дня заседаний. 1919 – 1952 гг. Каталог. Т. 1 (1919 – 1929) " (М., 2000. 832 с.). У гэтыя, ў цэлым грунтоўныя, не маючыя аналагаў у гістарыяграфіі даведнікі, на жаль, не ўключаны нават тыя звесткі, звязаныя з абвяшчэннем і скасаваннем ЛітБела, якія вядомыя па іншых крыніцах – апублікаваных і архіўных. Як на прыклад можна спаслаца на такі факт.

У канцы студзеня 1919 г. ЦБ КП(б) Беларусі, якое не пагадзілася з рашэннем ЦК РКП(б) аб выдзяленні са складу БССР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў, накіравала ў Маскву сваіх прадстаўнікоў Р. В. Пікеля і І. І. Рэйнгольда. У Маскве яны мелі сустрэчу з Я. М. Свярдловым, а затым 29 студзеня былі прыняты У. І. Леніным. Па пратаколу пасяджэння ЦБ 31 студзеня 1919 г. можна меркаваць аб пазіцыі У. І. Леніна ў адносінах да БССР. На той сустрэчы ён сказаў пасланцам з Беларусі: "Рэспубліка буферная і патрэбна пастолькі, паколькі гранічыць з іншымі краінамі; паколькі Смаленская, Віцебская і Магілёўская (губерні) не гранічаць, пастолькі іх можна выключыць".[53]

---

[51] Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии, 1918 –1945: Сборник документов. В 2 ч. – Ч. 1 (1918 – 1928 гг.). – Мн., 1990. – 358 с.; Польско-советская война 1919 – 1920 гг.: Ранее не опубликованные документы и материалы. – М.,1994. – Ч. 1. – 215 с.; Ч. 2. – 222 с.; Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. – Т. 1 (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1997. – 395 с.; Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. – Т. 1. – Кн.1. – 860 с.; Т. 2. – Кн. 2. – Вільня – Нью-Йорк – Менск – Прага, 1998. – 1721 с.

[52] Практычна ўсе звесткі, выказвання і дакументы пра Беларусь, у тым ліку і Літоўска-Беларускую ССР, якія былі апублікаваны ў выданнях твораў У. І. Леніна, і перш за ўсё ў яго 55-томным "Полном собрании сочинений" (М., 1958 – 1965), "Ленинских сборниках" (Т. 1-40. – М., Л., 1924 – 1985), якія выйшлі да таго часу, і ва ўказаных тамах яго біяграфічнай хронікі сістэматызаваў, абагульніў і навукова пракаменціраваў У. І. Беляўцаў (Белявцев В. И. В. И. Ленин и Белоруссия. – М., 1978. – 254 с.).

[53] Круталевич В. А. История Беларуси. Становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1999. – С. 92.

Зразумела, у часы ідэалагічнага манапалізму і дыктату Камуністычнай партыі такія і ім падобныя рэчы не маглі папасці ў афіцыйнае выданне Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС, бо яны ўшчэнт разбуралі міф аб справядлівай ленінскай нацыянальнай палітыцы і праве народаў на нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэнне.

Палітычныя і ідэалагічныя ўмовы, якія прэсінгавалі савецкую гістарычную навуку, кардынальна змяніліся ў пачатку 90-х гадоў, калі рухнула камуністычная сістэма і былыя саюзныя рэспублікі атрымалі нацыянальна-дзяржаўны суверэнітэт. Былі рассакрэчаны раней недаступныя архівы КПСС, у першую чаргу яе вышэйшых органаў – Палітбюро і Аргбюро, Сакратарыята ЦК РКП(б) – ВКП(б), дакументы і матэрыялы партыйнай і дзяржаўнай дзейнасці У. І. Леніна, І. В. Сталіна і іх паплечнікаў, якія актыўна тварылі гісторыю савецкай краіны, у тым ліку і Беларусі ў першай палове XX стагоддзя. Сталі больш даступнымі дакументы і матэрыялы з Архіва знешняй палітыкі СССР, Асобага архіва СССР і, нават, з зусім сакрэтнага архіва ЦК КПСС (цяпер Архіў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі).[54] Але беларускія даследчыкі з-за фінансавых цяжкасцей не змаглі ў поўнай меры выкарыстаць вынікі дэмакратызацыі архіўнай справы ў Расіі.

Тым не менш даследчыцкая работа будзе працягвацца і гісторыкі, несумненна, змогуць больш поўна і абгрунтавана адказаць на шматлікія складаныя і заблытаныя пытанні мінулага нашай краіны і, ў тым ліку, і гісторыі Літоўска-Беларускай ССР. У сувязі з гэтым звернем увагу айчынных даследчыкаў на знамянальную ў такім выпадку публікацыю В. У. Скалабана – "Дакументы па гісторыі Беларусі ў Расійскім цэнтры захоўвання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі".[55] У ёй прыведзены звесткі пра нумары фондаў, вопісаў і спраў, дзе зафіксаваны рашэнні Палітбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б) пра Беларусь за 1919 – 1940 гады (Ф. 17. Воп. 3), а таксама пастановы Аргбюро, Сакратарыята ЦК РКП(б) і яго Бюро за 1918 – 1926 гг. (Ф. 17. Воп. 112, 4 і 84).[56]

Праўда, прыведзеная аўтарам сігнатура архіўных крыніц "глухая", г.зн. не раскрывае назвы архіўных адзінак захоўвання (спраў) і тым больш саміх дакументаў. Але нават тыя асобныя фрагменты некаторых пратаколаў Аргбюро ЦК РКП(б) за 1919 – 1920 гг., якія дадзены ў публікацыі В. У. Скалабана, не могуць не заінтрыгаваць зацікаўленых і руплівых даследчыкаў беларускай гісторыі. Прывядзем некаторыя з іх.

Так, як сведчыць пратакол пасяджэння Аргбюро ад 8 лютага 1919 г., на ім разглядаўся склад урада Літоўска-Беларускай рэспублікі, гэта значыць за тры тыдні да таго, калі ён быў абраны ў Вільні на сумесным пасяджэнні ЦВК Беларусі і ЦВК Літвы. Тады было вырашана: "...старшынёй прапанаваць Міцкявічуса, нам. старшыні Жылуновіча. Тав. Іофе застаецца там для агульнага кіраўніцтва, Мяснікова ва ўрад не ўводзіць" (Ф. 17. Воп. 112. Спр. 1. Л. 16). 19 лютага Аргбюро абмяркоўвала пытанне аб адпраўцы А. Мяснікова на Урал. У пратаколе запісана: "У адказ на просьбу ЦБ Беларусі аб

[54] Назвы цэнтральных архіваў Расійскай Федэрацыі ў 90-я гады некалькі разоў мяняліся. Такія пераіменаванні архіваў працягваюцца і зараз. Напрыклад, Цэнтральны партыйны архіў Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС (ЦПА ІМЛ пры ЦК КПСС) быў пераіменаваны ў Расійскі цэнтр захоўвання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі (руская абрэвіятура РЦХИДНИ), а затым – Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (руская абрэвіятура РГАСПИ).

[55] Вяртанне – 6: Выяўленне, сумеснае выкарыстанне і вяртанне архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў замежных краінах. – Мн., 1999. – С. 288-298.

[56] Пра час утварэння і існавання, функцыі гэтых органаў падрабязней гл.: Политбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б). Повестки дня заседаний. – Т. 1 (1919 – 1929 гг.). Каталог. – М., 2000. – С. 6.

перавырашэнні пытання аб адпраўцы А. Мяснікова на Урал паведаміць, што Мяснікоў усё ж павінен выехаць на Урал" (Там жа. Л. 29). Рашэннем ад таго ж чысла Аргбюро прапанавала "старшынёй ЦВК Літвы і Беларусі правесці тав. Іофе". Пратакол Аргбюро ад 22 жніўня 1919 г. сведчыць аб тым, што на ім разглядалася пытанне "Аб далейшым існаванні ўрада Літвы і Беларусі". А ў навуковай літаратуры і энцыклапедыях замацаваны вывад аб тым, што ўрад ЛітБела ліквідаваўся ці "самаліквідаваўся" ў ліпені 1919 г.

Для даследчыкаў, вывучаючых перыпетыі беларускай дзяржаўнасці ў 1918 – 1920 гадах, несумненную значнасць будуць мець даклады Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б), якія накіроўваліся за час існавання ў Цэнтр. Лісты, дакладныя запіскі і тэлеграмы ўпаўнаважанага ЦК РКП(б) у Беларусі і Літве А. А. Іофе ў Аргбюро і Сакратарыят ЦК бальшавіцкай партыі, У. І. Леніну і Я. М. Свярдлову раскрываюць не толькі механізмы рэалізацыі рашэнняў і дырэктыў вышэйшых органаў партыі і савецкай улады, але і паказваюць іх аўтараў і ініцыятараў, жыва сведчаць аб асабістых маральна-псіхалагічных якасцях тварцоў беларускай дзяржаўнасці, непрыязных адносінах, якія часам складваліся паміж імі і негатыўна ўплывалі на палітычныя справы. Такія дакументы і матэрыялы захоўваюцца, як відаць з публікацыі В. У. Скалабана, у справах Сакратарыята ЦК РКП(б) і яго Бюро (Ф. 17. Воп. 4 і 84), а таксама ў справах Сакратарыята У. І. Леніна (Ф. 5. Воп. 1). У першую чаргу гэтыя фонды, а таксама асабістыя фонды І. В. Сталіна, Я. М. Свярдлова, А. А. Іофе, А. Ф. Мяснікова і іншых пажадана ўважліва вывучыць на прадмет выяўлення ў іх новых дакументальных сведчанняў аб гісторыі беларускай дзяржаўнасці 1918 – 1920 гадоў.

Такім чынам, глыбокі аналіз апублікаваных дакументаў, а таксама выяўленне новых у раней закрытых архівах (і ў першую чаргу Масквы) і ўключэнне іх у навуковы ўжытак, адкрывае перад даследчыкамі перспектыву больш грунтоўнага і ўсебаковага асвятлення гісторыі Літоўска-Беларускай ССР і дасць магчымасць дакладна і ўпэўнена адказаць на спрэчныя і слаба вывучаныя пытанні.

# ГЛАВА 3

# САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ Ў НАВУКОВАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## § 1. Прычыны падзелу БССР і аб'яднання яе з Літоўскай ССР

У навуковай літаратуры па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР пастаўлены шэраг прынцыповых пытанняў, на якія даследчыкі паспрабавалі даць пэўныя адказы. У прыватнасці, навукоўцы задаюцца такімі з іх – калі і пры якіх абставінах, у сувязі з чым узніклі прапановы адмовіцца ад ідэі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў форме БССР, праіснаваўшай непрацяглы час, вывесці з яе складу амаль палову этнічнай тэрыторыі – Віцебскую. Смаленскую і Магілёўскую губерні і ўключыць іх у РСФСР, – а астатнюю яе частку аб'яднаць з Літоўскай савецкай рэспублікай і стварыць штучную дзяржаву з умоўным сінтэзіраваным найменнем з элементамі назваў Літвы і Беларусі? Важным уяўляецца дакладна абгрунтаваны адказ і на такое пытанне – хто аўтар ці аўтары гэтых ідэй.

Ужо вядомыя даследчыкам дакументальныя сведчанні не даюць пэўных падстаў для пераканаўчага адказу на іх. Савецкія гісторыкі, якія ў большасці апалагетычна асвятлялі дзейнасць Камуністычнай партыі, яе правадыроў і кіраўнікоў, розныя ідэі і прапановы ў сферы нацыянальнай палітыкі і нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва, як правіла, прыпісвалі У. І. Леніну, затым у гады таталітарнага рэжыму І. В. Сталіну, а ў 60-80-я гады XX ст. ізноў дойліду савецкай дзяржавы. А паколькі ўсе спробы вырашэння нацыянальных праблем, нават відавочна правальныя эксперыменты, разглядаліся імі як чарговы прагрэсіўны этап у станаўленні нацыянальнай дзяржаўнасці і найбольш поўна адпавядаючымі выклікам жыцця і карэнным інтарэсам тых народаў, якіх яны тычыліся, то ў такіх выпадках аўтарства іх заўсёды прыпісвалася У. І. Леніну. І толькі ў 90-я гады мінулага стагоддзя гісторыкі пачалі больш крытычна ставіцца да таго, што зрабіла арганізацыя прафесійных рэвалюцыянераў са сваім прадвадзіцелем на чале ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва, у прыватнасці, беларускага і літоўскага народаў.

Дык калі, у каго, чаму і для чаго ўзнікла ідэя вывесці са складу толькі што абвешчанай БССР тры губерні з этнічна беларускім насельніцтвам? Вядома, што прынцыповае рашэнне аб абвяшчэнні беларускай савецкай дзяржаўнасці было прынята ў Маскве ў канцы снежня 1918 г. па ініцыятыве, як да гэтага часу сцвярджаюць гісторыкі, У. І. Леніна. А па сутнасці праз два тыдні яно было

адменена і, таксама атрымоўваецца, па ініцыятыве таго ж самога лідэра бальшавіцкай партыі і ў той жа самай Маскве. Так што аб рэвалюцыйнай стваральнай творчасці народных мас у дзяржаўным будаўніцтве, аб чым шмат пісалі і гісторыкі, гаварыць не прыходзіцца. У такім выпадку, калі больш здрава разважаць, то ці першае, ці другое "ленінскае" рашэнне было неправільным, таму што ў адпаведнасці з законамі логікі, два ўзаемавыключныя палажэнні не могуць быць прыняты як ісцінныя.

Думку аб тым, што аўтарам праекта аб'яднання двух савецкіх рэспублік – Беларусі і Літвы – быў лідэр бальшавіцкай партыі У. І. Ленін, упершыню выказаў беларускі гісторык права С. П. Маргунскі ў кнізе, выдадзенай яшчэ ў 1958 г.[57] "Улічваючы пажаданні [?! – Л. М., У. М.] працоўных Беларусі і Літвы, – пісаў ён, – ЦК РКП(б) па прапанове У. І. Леніна прыняў у канцы студзеня 1919 г. пастанову аб зліцці Беларускай і Літоўскай савецкіх рэспублік у адзіную Літоўска-Беларускую ССР".[58] Гэтае заключэнне на доўгі час замацавалася ў навуковай літаратуры. Некаторыя яго аспекты паасобку, ці разам падтрымалі Я. Н. Шкляр,[59] Р. П. Платонаў і М. С. Сташкевіч,[60] П. І. Брыгадзін і У. Ф. Ладысеў[61] і іншыя гісторыкі.

Але паколькі працытаванае палажэнне "шматслойнае" (уключае наступныя пазіцыі: пажаданне працоўных Беларусі і Літвы жыць у адной рэспубліцы, прапанову Леніна, рашэнне ЦК РКП (б) у канцы студзеня 1919 г. аб стварэнні адзінай Літоўска-Беларускай ССР), то кожную састаўную яго разгледзім асобна. Пачнем з высвятлення ленінскага аўтарства ідэі аб'яднання двух навароджаных савецкіх рэспублік.

Прамых дакументальных сведчанняў таго, што ініцыятарам дзяржаўнага эксперымента быў У. І. Ленін, даследчыкі не прыводзяць, а гавораць аб гэтым у сілу гістарыяграфічнай традыцыі, як аб нечым самім сабою разумеючымся. Пры тлумачэнні такога крока ў нацыянальнай палітыцы бальшавіцкай партыі, якім была спроба стварэння ЛітБела, спасылка на ленінскае аўтарства ідэі аб'яднання двух рэспублік з'яўлялася своеасаблівым неадхільным аргументам і прыдавала даследчыцкім вывадам і ацэнкам непахіснасць і пераканаўчасць.

Ускосным доказам ленінскага аўтарства ідэі аб'яднання, на думку некаторых даследчыкаў, з'яўляецца тое, што ў гутарцы з дэлегацыяй ЦБ КП (б)Б у канцы студзеня 1919 г. У. І. Ленін выказаў "цвёрдае меркаванне аб тым, што Беларуская ССР і Літоўская ССР павінны аб'яднацца ў Літоўска-Беларускую ССР".[62]

Аднак гэтую прапанову Ленін мог выказаць не па сваёй уласнай ініцыятыве, а давесці яе прадстаўнікам БССР як рашэнне ЦК РКП (б). Іншыя гісторыкі, напрыклад, М. І. Кулічэнка і В. А. Круталевіч указваюць, што рашэнне ЦК РКП(б) 16 студзеня 1919 г. было прынята толькі пры ўдзеле У. І. Леніна.[63]

---

[57] Маргунский С. П. Создание и упрочение белорусской государственности. 1917 – 1922 гг. – Мн., 1958.
[58] Там жа. – С. 159.
[59] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919 – 1920 гг.). – Мн., 1962. – С. 19-20.
[60] Сташкевич Н. На грани возможного: Идейно-политическая борьба вокруг создания белоруской советской государственности: «белые пятна» // Неман. – 1989. – № 10. – С. 139; Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе... Образование БССР // Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. В 3 ч. – Ч. 2. – Гомель, 1993. – С. 129.
[61] Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. На пераломе эпох: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917 – 1920 гг.). – Мн., 1999. – С. 60.
[62] Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе... Образование БССР. – С. 129.
[63] Куличенко М. И. Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса в 1918 – 1920 гг. – Харьков, 1962. – С. 248; Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1999. – С. 88.

У літаратуры сустракаюцца імёны Л. Д. Троцкага, Я. М. Свярдлова, І. В. Сталіна і нават А. А. Іофэ, як магчымых ініцыятараў аб'яднання Літоўскай і Беларускай ССР. Аналіз апублікаваных матэрыялаў, якія адлюстроўваюць гісторыю ЛітБела, пацвярджае вывад аб тым, што ўсе названыя асобы прымалі актыўны і непасрэдны ўдзел у вырашэнні праблем беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці і практычным іх ажыцяўленні. Але дакументальных сведчанняў аб тым, каму з іх належыць асабісты прыярытэт у ініцыіраванні эксперыментаў у беларуска-літоўскім дзяржаўным будаўніцтве, гісторыкі пакуль не выявілі. Беларускі пісьменнік Э. В. Ялугін, аўтар дакументальна-мастацкай аповесці пра старшыню першага беларускага савецкага ўрада Дз. Ф. Жылуновіча, у адным з газетных інтэрв'ю так пракаменціраваў стварэнне Літоўска-Беларускай ССР: "Справу з ЛітБелам хутчэй за ўсё зрабілі без яго [Леніна. – Л. М., У. М.] і неяк увогуле паспешна. А вось ідэя ці не зыходзіла ад Троцкага, калі ставіць кропкі над "і"? Яго, ведаеце, стыль."[64]

Бяспрэчна, поўнае і дакладнае высвятленне аўтарства праекта дзяржаўнай новабудоўлі будзе садзейнічаць глыбокаму і ўсебаковаму разуменню таго, што планавала і рабіла кіраўніцтва РКП(б) і РСФСР з беларускай і літоўскай дзяржаўнасцю і пралье больш святла на знешнепалітычныя акцыі савецкага ўрада ў канцы 1918 – пачатку 1919 гадоў.

Нягледзячы на важнасць высвятлення аўтарства ініцыятывы аб'яднання савецкіх Беларусі і Літвы, уяўляюцца больш прынцыповымі пытанні аб тым, калі ўзнікла ідэя вылучыць са складу БССР тры ўсходнія губерні, а астатнюю яе тэрыторыю ўключыць у новае дзяржаўнае ўтварэнне, і калі было прынята рашэнне ЦК РКП(б) аб гэтым? Дакладны адказ на такія пытанні дазволіць больш вызначана, прадметна судзіць аб нацыянальнай палітыцы бальшавіцкай партыі, выразана ўбачыць як яна выглядала на словах і што было на самой справе.

Як і на іншыя пытанні, гісторыкі адказваюць на іх па-рознаму. С. П. Маргунскі першым з беларускіх даследчыкаў яшчэ ў 1957 г. пісаў аб тым, што ідэя аб'яднання Савецкай Беларусі і Савецкай Літвы была распаўсюджана сярод партыйных і савецкіх кіраўнікоў ужо ў снежні 1918 г. Так, нарада сялянскіх дэпутатаў Мінскай губерні 12 снежня 1918 г. "выказалася за неабходнасць брацкага аб'яднання Савецкай Беларусі з Савецкай Літвой і ўстанаўлення федэратыўных сувязей з РСФСР". Пажаданне "цеснага аб'яднання рабочых Літвы і Беларусі для паспяховай барацьбы з беларуска-літоўскай буржуазіяй" выразіў у канцы снежня 1918 г. і Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў у сваім звароце да рабоча-сялянскага ўрада Літвы.[65] Даследчыцкія заключэнні аб тым, што ідэя аб'яднання Беларусі і Літвы выспела ў асобных кіраўнікоў партыйных і савецкіх органаў ужо ў снежні 1918 г., падтрымалі В. А. Круталевіч, І. П. Ламака, Я. Н. Шкляр і іншыя гісторыкі. У сваіх публікацыях яны прывялі некаторыя іншыя новыя фактычныя сведчанні аб гэ-

---

[64] Цыт. па: Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе... Образование БССР. – С. 133.

[65] Маргунскі С. П. З гісторыі ўтварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1957. – № 1. – С. 22.

Гэтыя факты прыведзены аўтарам і ў манаграфіі. (Гл.: Маргунский С. П. Создание и упрочение белорусской государственности. 1917 – 1922 гг. – Мн.,1958. – С. 159).

Гл. таксама: Борьба за советскую власть в Белоруссии. 1918 – 1920 гг. Сборник документов и материалов. В 2 т. – Т. 1 (февраль 1918 г. – февраль 1919 г.). – Мн., 1968. – С. 421; По воле народа: Из истории образования Белорусской ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии. Документы и материалы. – Мн., 1988. – С. 81-82.

тым.[66] А І. П. Ламака нават зрабіла, на наш погляд, перабольшаную ацэнку гэтай з'явы: "Думка аб адзіным дзяржаўным утварэнні Літвы і Беларусі была набыткам шырокіх працоўных мас."[67]

Р. П. Платонаў і М. С. Сташкевіч у сваіх артыкулах, якія з'явіліся ў перыядычным друку ў канцы 80-х – пачатку 90-х гадоў, выказалі арыгінальнае меркаванне аб часе ўзнікнення ідэі Літоўска-Беларускай рэспублікі. Яны прыйшлі да вываду, што ўжо ў канцы снежня 1918 г. "прапрацоўвалася канцэпцыя стварэння Літоўска-Беларускай ССР".[68] Такі вывад даследчыкі зрабілі на падставе аналізу тэлефоннай размовы І. В. Сталіна, кіраўніка Наркамнаца РСФСР, і А. Ф. Мяснікова, старшыні Паўночна-Заходняга абкама РКП(б), якая адбылася 25 снежня 1918 г. У той дзень Сталін між іншым паведаміў Мяснікову: "Ковенская і Віленская губерні адыйдуць да Літоўскага ўрада і адпаведнай партыйнай арганізацыі; Мінская, Смаленская, Гродзенская губерні адыйдуць да беларускага ўрада і адпаведнай партыйнай арганізацыі". Мяснікоў задаў яму пытанне: "Куды падзенуцца Магілёўская і Віцебская губерні, аб якіх Вы нічога не сказалі, гэта ж таксама беларускія губерні?" На што Сталін адказаў: "Аб гэтых губернях і аб шмат іншым пагаворым, калі прыедзеце".[69] Аўтары адзначылі, што ў архівах не знойдзена стэнаграма гутаркі Сталіна з Мясніковым пры іх сустрэчы 27 снежня 1918 г. Між тым, яны ўпэўнены, што ўжо тады абмяркоўвалася канцэпцыя Літоўска-Беларускай ССР.[70]

Аднак гэтае меркаванне даследчыкаў аказалася не заўважана ў навуковай і вучэбнай літаратуры. Але нечакана праз дзесяць гадоў яно было падхоплена публіцыстам М. А. Зеньковічам. У сваёй кнізе, якая выйшла ў Маскве, ён адназначна і даволі катэгарычна заявіў ("навейшымі доследамі ўстаноўлена") аб тым, што ідэя абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР нарадзілася ў Маскве яшчэ да таго, калі была абвешчана БССР.[71]

Але, як вядома, тады – у канцы снежня 1918 г. – кіраўніцтва бальшавіцкай партыі і Савецкай Расіі прыняло рашэнне аб абвяшчэнні самастойнай Беларускай ССР у складзе Мінскай, Смаленскай, Магілёўскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў з беларускімі часткамі тэрыторый прылеглых Ковенскай, Віленскай, Сувалкаўскай і Чарнігаўскай губерняў.[72] У сярэдзіне ж студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) зрабіў кардынальны паварот у адносінах да беларусаў і літоўцаў. Яго рашэннем са складу БССР былі вылучаны тры губерні – Віцебская, Магілёўская і Смаленская. І другое – адначасова было прапанавана застаўшуюся частку тэрыторыі БССР аб'яднаць з Літоўскай ССР.

---

[66] Круталевіч В. Пасля абвяшчэння рэспублікі // Полымя. – 1966. – № 9. – С. 136; Шкляр Е.Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР. – С. 19; Ломако И. П. Образование Литовско-Белорусской ССР и борьба трудящихся за защиту Советской власти // Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов: Матер. межреспуб. науч. конф., посвящ. 60-летию образ. Литовско-Белорусской ССР. – Мн., 1981. – С. 62.

[67] Ломако И.П. Образование Литовско-Белорусской ССР...– С. 62.

[68] Сташкевич Н. На грани возможного: Идейно-политическая борьба вокруг создания белорусской советской государственности: "белые пятна" // Неман. – 1989. – № 10. – С. 138; Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе: К вопросу о становлении белорусской национальной государственности // Неман. – 1992. – № 10. – С. 152.

[69] Борьба за советскую власть в Белоруссии 1918 – 1920 гг. – Т. 1 (февраль 1918 г. – февраль 1919 г.). – С. 415.

[70] Сташкевич Н. На грани возможного. – С. 138; Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе: К вопросу о становлении белорусской национальной государственности. – С. 152. У часопісным артыкуле М. С. Сташкевіча гутарка І. В. Сталіна і А. Ф. Мяснікова перададзена не зусім дакладна, з некаторымі мастацкімі імправізацыямі.

[71] Зенькович Н. Чья Белоруссия? Границы. Споры. Обиды. – М., 2002. – С. 293.

[72] Пратакол І з'езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. – Мн., 1934. – С. 33-34.

Трэба зазначыць, што як ні дзіўна, але нават пытанне аб тым, якія губерні былі вылучаны са складу Беларускай ССР рашэннем ЦК РКП(б), аказалася некалькі заблытаным у навейшых публікацыях беларускіх гісторыкаў. Так, у першым томе дакументальнага выдання аб знешняй палітыцы Беларусі са спасылкай на Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, надрукавана вытрымка "З пратакола пленума ЦК РКП(б) аб выдзяленні з Беларускай рэспублікі шэрагу губерняў" ад 16 студзеня 1919 г. У дакуменце дакладна сказана наступнае:

"1. Для агульнапалітычнага кіраўніцтва камандзіраваць у Беларусь т. Іофе.

2. Даручыць яму правесці праз з'езд Саветаў Беларусі выдзяленне з Беларускай Рэспублікі губерняў Віцебскай, Смаленскай, Мінскай, а ў далейшым, у выпадку магчымасці, і Магілёўскай".[73]

Такія ж "фактычныя сведчанні", але ўжо без спасылак на якія-небудзь крыніцы, апублікаваны і ў кнізе Р. П. Платонава.[74]

Прырода гэтай памылкі абумоўлена тым, што яшчэ 9 чэрвеня 1958 г. на запыт Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ з агульнага аддзела ЦК КПСС прыйшла машынапісная копія з пратакола пасяджэння ЦК РКП (б) ад 16 студзеня 1919 г., у якой з-за промаху супрацоўніка архіва ЦК КПСС аказалася запісана тое, што затым было надрукавана ў дакументальным зборніку, а пазней і Р. П. Платонавым.

Пры аналізе навуковай літаратуры па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР нельга не звярнуць увагу на тое, што некаторыя даследчыкі падзел Беларускай ССР у сярэдзіне студзеня 1919 г. тлумачылі як неабходны і мэтазгодны крок, які рабіўся ў інтарэсах беларускага народа. Яны акцэнтавалі ўвагу на тым, што рашэнне аб абмежаванні тэрыторыі рэспублікі было прынята Першым Усебеларускім з'ездам Саветаў, які адбыўся 2-3 лютага 1919 г., а не ЦК РКП(б). Такая мера разглядалася імі як часовая, да канчатковага рашэння пытання аб адміністрацыйным уладкаванні рэспублікі. "Гэтае мерапрыемства савецкай улады, – пісала Н. В. Каменская, – тлумачылася тым, што многія раёны ўказаных губерняў былі ў большасці сваёй населены рускімі, эканамічна цягнуліся да раёнаў РСФСР і неабходна было глыбока вывучыць усе гэтыя абставіны, каб правільней у інтарэсах эканамічнага і культурнага развіцця гэтых губерняў вырашыць пытанне аб іх адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаванні".[75]

Пры высвятленні пытанняў аб часе і прычынах аб'яднання Беларускай ССР і Літоўскай савецкай рэспублікі даследчыкі не маглі не звярнуць увагу на тыя абставіны, што вылучэнне са складу БССР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў і абвяшчэнне ЛітБела ёсць узаемазвязаны і ўзаема-абумоўлены факт гісторыі. Пры гэтым у навуковай літаратуры доўгі час гаварылася аб тым, што ў сярэдзіне студзеня 1919 г. ЦК РКП (б) вырашыў пытанне аб тэрыторыі Беларускай ССР, а ў канцы таго ж месяца выспела і ідэя аб'яднання дзвюх рэспублік. І аб ёй абвясціў 29 студзеня 1919 г. У. І. Ленін прадстаўнікам ЦБ КП(б)Б, якія былі ў яго на прыёме. Гэтую быццам бы нечаканую вестку прывезлі ў Мінск І. І. Рэйнгольд і Р. В. Пікель, якія гутарылі з У. І. Леніным па пытанні аб тэрыторыі БССР. Рабілі гэта савецкія навукоўцы свядома ці не, а можа таму, што не былі знаёмыя з лёсавызначальнымі для Беларусі дакументамі ЦК РКП (б), адказаць на гэтае пытанне складана ці ўвогуле не-

---

[73] Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. – Т. 1 (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1997. – С. 91.
[74] Платонаў Р.П. Старонкі гісторыі Беларусі: Архівы сведчаць. З навуковай спадчыны. – Мн., 2002. – С. 14.
[75] Каменская Н.В. Первые социалистические преобразования в Белоруссии. – Мн., 1957. – С. 200.

магчыма. Адно можна гістарыяграфічна ўстанавіць, што першым з савецкіх гісторыкаў, хто ўбачыў сувязь пытання аб зліцці Беларусі і Літвы з "ажыцяўленнем другога, цесна звязанага з ім мерапрыемства – аб абмежаванні тэрыторыі Савецкай Беларусі", – быў М. І. Кулічэнка, які яшчэ ў пачатку 60-х гадоў апублікаваў грунтоўную манаграфію аб нацыянальнай палітыцы РКП (б) у перыяд грамадзянскай вайны і замежнай узброенай інтэрвенцыі.[76] Менавіта на выпадак новых захопаў Польшчы, – пісаў даследчык, – "пагроза якіх да сярэдзіны студзеня 1919 г. значна ўзрасла, неабходна было абмежаваць тэрыторыю Беларускай савецкай рэспублікі, на якую маглі бы прэтэндаваць польскія захопнікі". У сувязі з гэтым ЦК РКП(б) і прыняў рашэнне 16 студзеня 1919 г.[77] Характэрнай асаблівасцю пастаноўкі пытання аб абмежаванні тэрыторыі Беларускай рэспублікі, – адзначыў М. І. Кулічэнка, – было тое, што яно ставілася ў непарыўнай сувязі не толькі з пытаннем аб зліцці беларускай і літоўскай рэспублік, але і з устанаўленнем цеснага федэратыўнага саюза Беларусі з РСФСР і іншымі савецкімі рэспублікамі.[78] У завяршэнне размовы аб высновах і ацэнках М. І. Кулічэнкі адзначым яшчэ адно яго цікавае назіранне: "Вымушанае абмежаванне тэрыторыі Беларусі вяло да яе аслаблення, што ў значнай меры кампенсавалася зліццём з Літоўскай рэспублікай".[79] Па сутнасці гэтую ж думку праз некалькі дзесяцігоддзяў паўтарыў В. А. Круталевіч. "Скарачэнне тэрыторыі аслабляла патэнцыяльныя магчымасці ССРБ, – пісаў ён, – у ваенным і эканамічным планах. Адсюль вывад: трэба аб'яднаць рэспублікі разам".[80] Парадокс ён і ёсць парадокс – каб узмацніць рэспубліку, трэба яе спачатку аслабіць.

Неабходна падкрэсліць, што думкі і заключэнні М. І. Кулічэнкі грунтаваліся на значнай дакументальнай аснове, фактах і сведчаннях, якія былі ўпершыню ўведзены ў гістарычную навуку з розных архіўных, раней не даступных крыніц. Даследчык на той час сказаў нават больш, чым мог і значна паўней, чым дазваляла тады афіцыйная ідэалогія. Цікава адзначыць, што яго думкі і ідэі былі абыйдзены ўвагай у беларускай савецкай гістарыяграфіі.

У навейшых публікацыях гісторыкаў пытанні вылучэння са складу БССР трох губерняў і аб'яднання астатняй беларускай тэрыторыі ў складзе новай рэспублікі разглядаюцца ва ўзаемасувязі. Але пры гэтым па новаму тлумачацца прычыны своеасаблівага раздзелу БССР. Рашэнне ЦК РКП (б) аб падзеле тэрыторыі Беларускай рэспублікі ў сярэдзіне студзеня 1919 г. гісторыкі тлумачаць некалькімі асноўнымі прычынамі.

Так, Р. П. Платонаў і М. С. Сташкевіч разважалі аб тым, што "вышэйшыя інтарэсы рэвалюцыі ўжо на стадыі юрыдычнага афармлення БССР прадвызначылі яе незайздросны лёс, і яна павінна была спыніць сваё сама-

---

[76] Куличенко М. И. Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса в 1918 – 1920 гг. – Харьков, 1963. – С. 246.

[77] Там жа – С. 248.
Пры гэтым даследчык упершыню спаслаўся на тагачасны ЦПА ІМЛ пры ЦК КПСС (Ф.17. Воп. 2. Спр. 8 Л. 1). Цяпер гэта Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ). Гэты факт сведчыў аб тым, што ў час "хрушчоўскай адлігі" гісторыкі партыі атрымалі доступ да раней закрытых партыйных і дзяржаўных архіваў Савецкага Саюза.

[78] Куличенко М И. Борьба Коммунистической партии... – С. 249.

[79] Там жа.
На гэты факт у свой час звярнуў увагу У. М. Ігнатоўскі, але лічыў яго "адмоўным у сэнсе правільнага выяўлення беларускага палітычнага і нацыянальнага пытанняў". (Гл.: Ігнатоўскі У. Вялікі Кастрычнік на Беларусі // Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху – С. 207).

[80] Круталевич В.А. История Беларуси: Становление национальной державности – С. 93.

стойнае існаванне".[81] "Меркавалася, – развівалі сваю думку даследчыкі, – што ўключэнне ў склад РСФСР Магілёўскай і Віцебскай губерняў, калі б іншыя тэрыторыі захапіла польская дзяржава, у перспектыве сталі бы асновай адраджэння беларускай дзяржаўнасці".[82] Такая думка, бясспрэчна, цікавая, але не больш. Для яе падмацавання аўтары не прывялі якіх-небудзь доказаў і аргументаў. А ўважлівы аналіз навуковай літаратуры і апублікаваных крыніц не дае падстаў для сцвярджэння аб тым, што кіраўніцтва бальшавіцкай партыі і савецкай дзяржавы мела такія далёкаідучыя планы адносна перспектываў беларускай дзяржаўнасці. У гэтым сэнсе развагі Р. П. Платонава і М. С. Сташкевіча адлюстроўваюць ідэалагічныя стэарэтыпы – неяк апраўдаць радыкальны і ў той жа час алагічны крок кіраўніцтва бальшавіцкай партыі і савецкай ўлады ў нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве ў Беларусі.

Між тым гэтае палажэнне з публіцыстычнымі "удакладненнямі" выкладзена і ў кнізе М. А. Зеньковіча ў наступнай рэдакцыі: "Да таго ж ім [кіраўнікам БССР – Л. М., У. М.], напэўна, адкрылі стратэгічныя намеры ЦК РКП (б) – у выпадку захопу палякамі ЛітБела беларускія губерні, якія перайдуць пад юрысдыкцыю РСФСР, стануць асновай для адраджэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці".[83] Прааналізаваўшы пратакол пасяджэння ЦБ КП(б)Б па пытаннях тэрыторыі рэспублікі ад 22 студзеня 1919 г. В. А. Круталевіч прыйшоў да вываду, што рашэнне ЦК РКП(б) аб скарачэнні тэрыторыі БССР для яе кіраўніцтва было нечаканасцю.[84]

Прычыны падзелу БССР у студзені 1919 г. па іншаму тлумачыць у кандыдацкай дысертацыі і аўтарскіх публікацыях С. М. Хоміч.[85] Па яго ўяўленню палітычнае кіраўніцтва Савецай Расіі добра ведала аб агрэсіўных планах захопу беларускіх тэрыторый Польшчай у пачатку 1919 г. І ў тых складаных міжнародных умовах, "маючы магчымасць ахвяравання беларускімі землямі, бальшавікі не хацелі рызыкаваць усімі тэрыторыямі, заўчасна ўключыўшы большую іх частку ў склад РСФСР".[86] Таму, вылучаючы беларускія губерні са складу БССР, – удакладніў уласную думку С. М. Хоміч, – урад Савецкай Расіі вырашаў найперш задачу захавання сваей ўлады на гэтай тэрыторыі.

---

[81] Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе... Образование БССР. – С. 131.
[82] Там жа. – С. 132.
Па сутнасці, такую ж думку, але ў больш мягкай форме ўпершыню выказаў М. І. Кулічэнка ў вышэйзгаданай манаграфіі: "Рашэнне ЦК РКП(б) было выражэннем яго глыбокай заботы аб лёсе беларускага народа, таму што часовае ўключэнне большай часткі заселенай беларусамі тэрыторыі ў склад РСФСР на выпадак пагаршэння абстаноўкі давала ім магчымасць захаваць сваю свабоду і незалежнасць, а ў далейшым пры дапамозе вялікага рускага народа і ўз'яднаць свае землі". (Гл.: Куличенко М. И. Борьба Коммунистической партии...– С. 248.).
[83] Зенькович Н. Чья Белоруссия? – С. 293.
[84] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности. – С. 91.
[85] Хоміч С. Фарміраванне тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі (канец 1918 – 1926 гг.): Аўтарэф. Дыс. ... канд. гіст. навук. – Мн., 2000. – 20 с.; ён жа. Фарміраванне тэрыторыі БССР (1919 – 1926 гг.) // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2000. – № 4. – С. 83-90; ён жа. Асноўныя этапы фарміравання тэрыторыі Беларускай савецкай рэспублікі (канец 1918 – 1926 гг.) // Беларускі гістарычны агляд. – 2000. – Т. 7. – Сш. 2. – С. 351-363; ён жа. Савецкая і беларуская гістарыяграфія пра фарміраванне тэрыторыі БССР у 1919 - 1926 гг. // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця: Матэр. нав. канф., Мінск, 6-7 кастр. 1999. – Мн., 2000. – С. 218-221.
[86] Хоміч С. Фарміраванне тэрыторыі БССР (1919 – 1925 гг.) // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2000. – № 4. – С. 20.
Па сутнасці гэтую ж прычыну скарачэння тэрыторыі БССР у свой час назваў і В.Г. Кнорын, які пісаў аб тым, што ЦК РКП(б) не хацеў "рызыкаваць" старымі савецкімі тэрыторыямі". (Гл.: Кнорын В. Да гісторыі дыктатуры пралетарыяту ў Беларусі // Полымя. – 1929. – № 1. – С. 95).

Астатнімі беларускімі землямі кіраўніцтва Кампартыі было гатова ахвяраваць, каб пазбегнуць вайны з Польшчай.[87]

Другую прычыну абмежавання памераў Беларускай ССР "геаграфічна неабходнымі граніцамі" даследчык бачыў у жаданні ЦК РКП (б) аслабіць у рэспубліцы нацыяналістычныя тэндэнцыі.[88]

Відавочна, што фармуліроўка гэтай прычыны супадае з заключэннем Я. М. Свярдлова, якое ён выказаў 2 лютага 1919 г. на пашыраным пасяджэнні ЦБ КП (б)Б: "...Матывам стварэння адзінай Беларуска-Літоўскай Рэспублікі з'яўляецца імкненне ЦК засцерагчы ад небяспекі гэтыя рэспублікі ад магчымага праяўлення ў іх нацыянальна-шавіністычных памкненняў".[89] Як бачым, у гэтым выпадку даследчыкі часам атоесамляюць прычыны падзелу БССР у сярэдзіне студзеня 1919 г. і прычыны аб'яднання застаўшайся "самастойнай" яе часткі з Літоўскай ССР. Але ў такім выпадку лагічна і справядліва паставіць пытанне, як гэта зрабіў В. А. Круталевіч, "чаму трэба [было] ўрэзваць тэрыторыю ССРБ?"[90]

Калі ж прызнаць першую прычыну падзелу БССР як адпавядаючую рэчаіснасці, а хутчэй за ўсё яно так і было, і з гэтай думкай трэба пагадзіцца, то выходзіць, што бальшавікі маніпулявалі сваёй нацыянальнай палітыкай. Больш таго, яны самі па сутнасці прапанавалі Ю. Пілсудскаму гандаль часткамі беларускай і літоўскай тэрыторый, якія аб'ядноўвалі ў Літоўска-Беларускую ССР, – гэта, маўляў, ваша тэрытарыяльная доля, а тры беларускія губерні, далучаныя да РСФСР, – наша. Тэрытарыяльныя спрэчкі вырашаем за сталом перагавораў і заключаем мір.

Такім чынам, можна зрабіць вывад аб тым, што бальшавіцкае кіраўніцтва Савецкай Расіі сваімі палітычнымі і тэрытарыяльнымі ракіроўкамі справакавала Ю. Пілсудскага на захоп ЛітБела з яго сталіцай Вільняй, якую польскія шавіністычныя колы лічылі інтэгральнай часткай адраджаючайся дзяржавы. У гэтым выпадку паказальнымі з'яўляюцца словы І. С. Уншліхта – наркама па ваенных справах, намесніка старшыні Савета абароны, намесніка старшыні ЦВК Літоўска-Беларускай ССР – аб тым, што "інтарэсы міжнароднага пралетарыяту вышэй за нацыянальныя пытанні і за мір з Антантай можна аддаць Літву і Беларусь".[91]

Прычыны падзелу БССР і далучэння трох губерняў да РСФСР своеасабліва растлумачылі П. І. Брыгадзін і У. Ф. Ладысеў. "Зыходзячы з абставін міжнароднага характару, – пісалі яны ў манаграфіі, – ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб аб'яднанні Мінскай і Гродзенскай губерняў з Літоўскай ССР. Тым самым як бы "здымалася" з парадку дня пытанне аб правамернасці далучэння усходніх этнічных беларускіх зямель да РСФСР".[92]

Яшчэ больш "закруціў" гэтае пытанне ў сваёй новай публікацыі М. С. Сташкевіч. Логіка яго разважанняў наступная. Беларуская ССР стваралася як плацдарм для наступлення савецкіх войск у падтрымку сусветнай прале-тарскай рэвалюцыі. Але ўжо ў ходзе разгортвання нацыянальнага дзяржаўнага

Хоміч С. Фарміраванне тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі (канец 1918 – 1926 гг.): Аўтарэф. анд. дыс. – С. 8.

Хоміч С. Фарміраванне тэрыторыі БССР (1919 – 1926 гг.) // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2000. № 4. – С. 20.

По воле народа. – С. 130.

Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности. – С. 96.

Цыт. па: Хоміч С. М. Савецкая і беларуская гістарыяграфія пра фарміраванне тэрыторыі БССР у 919 – 1926 гг. – С. 222.

Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. На пераломе эпох: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці. – С. 61

будаўніцтва ў Беларусі лідэры бальшавіцкай партыі прыйшлі да вываду, што ролю аднаго з плацдармаў пры наступленні рэвалюцыі і аднаго з буфераў пры магчымым яе адступленні лепш будзе выконваць не асобна БССР, а аб'яднаная Літоўска-Беларуская ССР, і пагэтаму ўнеслі адпаведныя карэктывы ў сваю геапалітычную канструкцыю. Было прынята рашэнне выдзяліць з БССР у склад РСФСР тры губерні – Віцебскую, Магілеўскую і Смаленскую, а застаўшуюся тэрыторыю аб'яднаць з Літоўскай ССР у адным дзяржаўным утварэнні – Літоўска-Беларускай ССР.[93] Гэтыя разважанні ўяўляюцца нам гіпатэтычнымі, не падмацаванымі якімі-небудзь фактамі і аргументамі. Але са свайго боку адзначым, што яны па сутнасці поўнасцю супадаюць з ацэнкамі і вывадамі, якія ў свой час зрабіў адзін з кіраўнікоў Кампартыі Літвы і Беларусі В. Г. Кнорын. У адным са сваіх артыкулаў ён пісаў аб тым, што аб'яднанне Беларусі і Літвы "было стратэгічным манеўрам для прасоўвання рэвалюцыі на Захад, для замацавання дыктатуры пралетарыяту ў Беларусі і Літве".[94]

Для аднаўлення карціны таго, што адбывалася з беларускай дзяржаўнасцю ў студзені – лютым 1919 г. для гісторыкаў было важна высвятліць і такое пытанне: калі ЦК РКП (б) усё ж прыняў рашэнне аб зліцці савецкіх частак тэрыторыі Беларусі і Літвы? Амаль да канца 80-х гадоў, нягледзячы на прынцыпова важнае заключэнне М. І. Кулічэнкі, аб якім ужо гаварылася, гісторыкі аднадушна адказвалі на яго, што такая пастанова была прынята **ў канцы студзеня 1919 г.** [выдзелена аўтарамі. – Л. М., У. М.] і першым з даследчыкаў, хто аб гэтым заявіў, але без якіх-небудзь спасылак на крыніцы, быў А. М. Андрэеў. Праўда, ён не сказаў аб тым, калі дакладна і якім партыйным ці савецкім органам такое рашэнне было прынята.[95] Такой жа думкі прытрымліваліся С. П. Маргунскі, Я. Н. Шкляр і іншыя даследчыкі.[96]

І толькі ў канцы 80-х гадоў у навуковай літаратуры пачынае замацоўвацца ўпамінанне аб тым факце, што пастанова ЦК РКП (б) аб неабходнасці стварэння Літоўска-Беларускай ССР была прынята 16 студзеня 1919 г., гэта значыць адначасова з рашэннем аб вылучэнні са складу БССР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў.[97]

У гэтай сувязі з'яўляецца незразумелай пазіцыя В. А. Круталевіча, які, несумненна, добра валодаў гістарыяграфіяй пытання аб ЛітБеле, але чамусьці не заўважыў прынцыповага факта – рашэння ЦК РКП (б) ад 16 студзеня 1919 г., у якім гаварылася не толькі аб скарачэнні тэрыторыі Беларускай рэспублікі, але і аб аб'яднанні яе астаўшайся часткі з Літоўскай ССР. Скрупулёзны даследчык на час падрыхтоўкі да выдання сваёй грунтоўнай манаграфіі ведаў не толькі публікацыі па тэме М. І. Кулічэнкі, але і І. М. Ігнаценкі, Р. П. Платонава, М. С. Сташкевіча і іншых гісторыкаў, у якіх са спасылкамі на архіўную крыніцу гаварылася аб гэтым, праігнараваў навукова ўстаноўленыя факты. Больш таго, ён сцвярджаў, што "абмежаванне тэрыторыі ССРБ і зліццё ССРБ з Літоўскай рэспублікай – гэта па сутнасці два этапы ў рэарганізацыі

---

[93] Сташкевич Н. С. К вопросу формирования государственной идеологии в Белоруссии // Славянский мир и славянские культуры в европейском мире: место и значимость в развитии цивилизаций и культур (история, уроки, опыт, современность). Матер. междунар. науч.-теорет. конф., 31 октября – 1 ноября 2002 г. – Ч. 2. – Витебск, 2002. – С. 213.
[94] Кнорын В. Да гісторыі дыктатуры пралетарыяту ў Беларусі // Полымя. – 1929. – № 1. – С. 95.
[95] Андреев А. М. Борьба литовского народа за Советскую власть 1918 – 1919 гг. – М., 1954. – С. 104.
[96] Маргунский С. П. Создание и упрочение белорусской государственности. 1917 – 1922 гг. – С. 159; Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР. – С. 19.
[97] У артыкуле М. С. Сташкевіча, які быў надрукаваны ў 1989 г., сказана аб тым, што "ЛітБел стварајся па ініцыятыве У. І. Леніна, на падставе рашэння ЦК РКП(б) ад 16 студзеня 1919 г.". (Гл.: Сташкевич Н. На грани возможного. – С. 139).

дзяржаўнага ладу".[98] Даследчык быў упэўнены ў тым, што аб рашэнні пра аб'яднанне Беларусі і Літвы быццам бы сам А. А. Іофе даведаўся ад С. І. Пясткоўскага – прадстаўніка СНК РСФСР у Літве – у 20-х чыслах студзеня 1919 г. Хаця з навуковай літаратурай, з якой быў добра знаёмы даследчык і на якую ён спасылаўся ў сваёй манаграфіі, было адназначна бачна, што той жа самай пастановай ЦК РКП(б) ад 16 студзеня 1919 г. замацавана рашэнне аб неабходнасці аб'яднання Беларускай і Літоўскай ССР.

Магчыма, што такую інтэрпрэтацыю перыпетый беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці можна растлумачыць толькі зыходзячы з прызнання перманентнасці яе станаўлення і развіцця. Таму што, калі прызнаць, як бясспрэчны факт, беспрэцэдэнтнае рашэнне ЦК РКП(б) 16 студзеня 1919 г. аб падзеле тэрыторыі БССР і як вынік яго аб аб'яднанні застаўшайся часткі Савецкай Беларусі з Савецкай Літвой, то прыдзецца пагадзіцца і з тым, што гэтай пастановай па сутнасці ліквідавалася беларуская дзяржаўнасць. А ў такім выпадку вельмі складана растлумачыць мэтазгоднасць склікання, правядзення і тым больш рашэнняў Першага Усебеларускага з'езда Саветаў (2-3 лютага 1919 г.), на якім была канстытуіравана БССР і адначасова "законным шляхам" ліквідавана пасля прыняцця пастановы аб граніцах рэспублікі і яе аб'яднанні з Савецкай Літвой. З гэтым звязана яшчэ адно непрыемнае пытанне – чаму БССР афіцыйна была прызнана РСФСР толькі напярэдадні работы Першага Усебеларускага з'езда Саветаў, г. зн. тады, калі яна юрыдычна самаліквідавалася? Іншымі словамі, Савецкая Расія прызнала дэ-юрэ Савецкую Беларусь толькі тады, калі яе падзяліла і ўключыла ў свой склад Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні, а вышэйшы заканадаўчы орган рэспублікі пагадзіўся з гэтым і прыняў рашэнне аб аб'яднанні застаўшайся часткі беларускай тэрыторыі з Літоўскай ССР. Такім чынам, юрыдычна прызнавалася дзяржава, якая юрыдычна перастала існаваць. У сувязі са сказаным адзначым, што Літоўскую Савецкую Рэспубліку, якая была абвешчана 16 снежня 1918 г., урад РСФСР прызнаў 22 снежня, праз тыдзень, дэкрэтам, падпісаным У. І. Леніным, а на наступны дзень ён быў зацверджаны Усерасійскім ЦВК.[99]

Думаецца, што менавіта зыходзячы з такой логікі разважанняў В. А. Круталевіч не пагадзіўся з высновамі сваіх калег-навукоўцаў аб тым, што з абвяшчэннем Літоўска-Беларускай рэспублікі нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі было перапынена.[100] Па меркаванню даследчыка гісторыі беларускай дзяржаўнасці яе будаўніцтва ў студзені – лютым 1919 г. не перапынілася, а яно толькі "атрымала іншыя формы, якія адыходзілі ад прынцыпа права нацый на самавызначэнне. Перапыніла дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі польская акупацыя".[101] Акт падзелу БССР у адпаведнасці з рашэннямі ЦК РКП (б) і злучэнне яе з Літвой некаторыя гісторыкі лічаць "крокам назад у станаўленні беларускай дзяржаўнасці".[102] Але якіх-небудзь аргументаў і доказаў у пацвярджэнне гэтага тэзісу не прыводзяць.

Абагульняючы вынікі даследчыцкай распрацоўкі такіх аспектаў гісторыі Літоўска-Беларускай ССР, як прычыны падзелу БССР у сярэдзіне студзеня

---

[98] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности. – С. 92.
[99] Літоўская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // Бел СЭ. – Т. 6. – Мн., 1972. – С. 400.
[100] Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе: К вопросу о становлении белорусской национальной государственности. – С. 155.
[101] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности. – С. 109.
[102] Корнеў П. І., Коршак М. А. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917 – 1920 гг.) // Государственность на Беларуси: генезис и перспективы. Сб. матер. респуб. научно-практич. конф., 30 января 2002 г. В 2 ч. – Ч. 1. – Брест, 2002. – С. 131.

1919 г. і ліквідацыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, а таксама час узнікнення гэтай ідэі і прыняцця адпаведнага рашэння ЦК РКП(б) 16 студзеня 1919 г., падкрэслім наступнае.

З рознай ступенню акцэнтаў гісторыкі сцвярджаюць, што галоўнай прычынай рашэння ЦК РКП(б) аб вылучэнні з яе складу трох губерняў і ўключэнне іх у РСФСР быў міжнародны фактар – непасрэдная пагроза захопу тэрыторыі Беларускай ССР з боку Польшчы. У навуковай літаратуры з пачатку 60-х гадоў замацавалася палажэнне аб тым, што падзел Беларускай савецкай рэспублікі і аб'яднанне яе з Літоўскай ССР – гэта ўзаемаабумоўленыя і ўзаемазвязаныя палітычныя з'явы.

Даследчыкі, якія вывучаюць праблемы дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі, у апошні час падкрэсліваюць , што прычыны падзелу БССР і яе аб'яднання з Літоўскай рэспублікай, азначаўшыя круты паварот у нацыянальнай палітыцы ЦК РКП(б) і Савецкай улады, высветлены недастаткова. Гэта абумоўлена і тым, што нават вядомыя дакументы і матэрыялы як апублікаваныя, так і тыя, што знаходзяцца ў архівах, не заўсёды дазваляюць зрабіць упэўненыя вывады адносна канкрэтных прычын, якія абумовілі новы падыход у нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве ў Беларусі. "Афіцыйныя тлумачэнні прадпрынятых мер лаканічныя, не заўсёды канкрэтныя, – піша ў сваёй грунтоўнай манаграфіі вядомы і найбольш дасведчаны гісторык беларускай савецкай дзяржаўнасці В. А. Круталевіч. – Калі браць пад ўвагу складанае ваенна-палітычнае становішча таго часу, можна меркаваць, што не ўсе абставіны, абумовіўшыя прыняцце ЦК РКП(б) рашэння аб Беларусі, падлягалі публічнай ацэнцы".[103] Аналагічную думку раней выказалі і гісторыкі Р. П. Платонаў і М. С. Сташкевіч: "Утварэнне ЛітБела – амаль недаследаваная старонка, белая пляма ў нашай гісторыі. Складанасць вывучэння звязана з крайняй абмежаванасцю захаваўшыхся дакументальных крыніц, супярэчнасцю сведчанняў удзельнікаў і відавочцаў падзей таго часу."[104] Гэтыя заявы (і дастаткова катэгарычныя і агульныя) зроблены даследчыкамі ў 90-я гады мінулага стагоддзя нягледзячы на значную колькасць манаграфічных і абагульняючых публікацый па гісторыі ЛітБела, у тым ліку і дакументальных, як у беларускай, так і ў літоўскай гістарыяграфіі.

Што тычыцца прычын аб'яднання Беларускай і Літоўскай ССР у адзіную дзяржаву, то адносна іх даследчыкі да апошняга часу ў галоўным былі і застаюцца амаль што аднадушнымі. І гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што прычыны такога кроку былі афіцыйна сфармуляваны ў пастановах і рашэннях ЦК РКП(б), выступленнях старшыні Усерасійскага ЦВК Я. М. Свярдлова і прадстаўніка ЦК РКП(б) у Беларусі А. А. Іофе, якія затым з рознай ступенню імправізацыі паўтараліся ў рашэннях ЦБ КП(б)Б, Першага Усебеларускага з'езда Саветаў, Першага з'езда Саветаў Літвы, выступленнях і прамовах у студзені – лютым 1919 г. старшыні ўрада Савецкай Літвы В. С. Міцкявічуса-Капсукаса, сакратара ЦБ КП(б)Б В. Г. Кнорына і іншых партыйных кіраўнікоў.

Першай галоўнай прычынай аб'яднання ЛітССР і БССР пры абвяшчэнні называлася неабходнасць умацавання абараназдольнасці рэспублік ва ўмовах навісшай пагрозы вайны з Польшчай, а таксама аб'яднання намаганняў у барацьбе "з унутранай буржуазна-нацыяналістычнай контр-

---

[103] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1999. – С. 89.

[104] Платонов Р., Сташкевич Н. Трудный путь к свободе. О ряде важнейших событий 1919 года в истории Беларуси // Советская Белоруссия. – 1991. – 16 июля.

рэвалюцыяй", за ўстанаўленне савецкай улады і абароны заваёў сацыялістычнай рэвалюцыі. Пры гэтым акцэнт рабіўся на неабходнасці стварэння буфера супраць імперыялістаў Антанты, "фарпоста пралетарскай рэвалюцыі на заходняй граніцы Расіі, які быў прызваны перагарадзіць шлях імперыялістычным драпежнікам у цэнтр рэвалюцыі – Савецкую Расію".[105]

Калі прымалася рашэнне, быццам бы ўлічвалася і агульнасць гістарычнага мінулага, эканамічных ўмоў і інтарэсаў абедзвюх рэспублік, іх геаграфічнага палажэння, аб чым гаварылася ў пастанове прэзідыума Усерасійскага ЦВК аб прызнанні незалежнасці БССР, прынятай 31 студзеня 1919 г.[106] На пашыраным пасяджэнні ЦБ КП(б)Б 2 лютага 1919 г. старшыня Усерасійскага ЦВК Я. М. Свярдлоў адзначыў, "што матывам утварэння адзінай Беларуска-Літоўскай Рэспублікі з'яўляецца імкненне ЦК засцерагчы гэтыя рэспублікі ад магчымасці праяўлення ў іх нацыянальна-шавіністычных намераў".[107] У рашэннях Першага з'езда Саветаў Літвы аб прычынах аб'яднання суседніх рэспублік гаварылася наступнае: "Жыва адчуваючы сваю непарыўную сувязь з усімі савецкімі сацыялістычнымі рэспублікамі, з'езд бачыць у зліцці Савецкай Літвы і Савецкай Беларусі толькі першы крок на шляху аб'яднання ўсіх сацыялістычных рэспублік у адзіны дзяржаўны арганізм і даручае рабоча-сялянскаму ўраду Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі неадкладна ж уступіць у перагаворы з рабоча-сялянскімі ўрадамі Расійскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікі, Латвіі, Украіны і Эстляндыі на прадмет утварэння з усіх гэтых рэспублік адзінай Федэратыўнай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі".[108]

Мы прывялі галоўныя матывы і меркаванні, якімі прадстаўнікі ЦК РКП(б) і Усерасійскага ЦВК афіцыйна тлумачылі неабходнасць аб'яднання Беларусі і Літвы напярэдадні яго абвяшчэння.

Вядома, што савецкія даследчыкі, якія асвятлялі гісторыю з марксісцка-ленінска-сталінскіх прынцыпаў і пазіцый Камуністычнай партыі, не маглі крытыкаваць рашэнні высокіх партыйных інстанцый, а толькі апраўдвалі іх мэтазгоднасць і справядлівасць і каменціравалі з той ці іншай доляю апалагетыкі. Больш таго, навукоўцы абавязкова падкрэслівалі, што савецкі ўрад і бальшавіцкая партыя "праводзілі паслядоўную ленінскую нацыянальную палітыку" ці "паслядоўна праводзілі мудрую ленінскую нацыянальную палітыку" у інтарэсах вызваленых народаў. Яны не выказвалі крытычных думак і поглядаў на падзеі, якія "тлумачылі", а толькі развівалі і паглыблялі палажэнні і

[105] Вайткявичус Б. Ю. Борьба трудящихся Литвы за победу социалистической революции (1918 – 1919 гг.): Автореф. канд. дис. – М., 1958. – С. 13-14.

[106] Образование и развитие Союза Советских Социалистических Республик (в документах). – М., 1973. – С. 118.

[107] По воле народа: Из истории образования Белорусской ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии. Документы и материалы. – Мн., 1988. – С. 130.

[108] Съезды Советов Советских Социалистических Республик. Сборник документов 1917 – 1922 гг. – М., 1960. – Т. 2. – С. 221-222.

Адзначым, што па нейкім не зразумелым прычынам гэтая частка рэзалюцыі ў каментарыях да артыкула І. В. Сталіна "Палітыка ўрада па нацыянальнаму пытанню" выкладзена ў іншай рэдакцыі: "Жыва адчуваючы сваю непарыўную сувязь з усімі савецкімі сацыялістычнымі рэспублікамі, з'езд даручае рабоча-сялянскаму ўраду Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі неадкладна ж уступіць у перагаворы з рабоча-сялянскімі ўрадамі РСФСР, Латвіі, Украіны і Эстляндыі на прадмет утварэння з усіх гэтых рэспублік адзінай РСФСР". (Гл.: Сталин И. В. Сочинения. – Т. 4 (ноябрь 1917 – 1920 гг.). – М., 1951. – С. 427).

Па сутнасці гэтае ж заключэнне паўтарыў і А. І. Чысцякоў: "Першы з'езд Саветаў Літвы прыняў рэзалюцыю, якой даручалася адзінаму ўраду Літвы і Беларусі неадкладна ўступіць у перагаворы з савецкімі ўрадамі РСФСР, Латвіі, Украіны і Эстоніі на прадмет утварэння з усіх гэтых рэспублік адзінай РСФСР". (Гл.: Чистяков О. И. Взаимоотношения советских республик до образования СССР. – М, 1955. – С. 72).

вывады сфармуляваныя ў тыхчасовых дакументах партыйных і савецкіх органаў, выступленнях іх кіраўнікоў. Нярэдка такія адвольныя каментарыі межавалі з даследчыцкімі фантазіямі.

Так, пазней ў літаратуры падкрэслівалася, што аб'яднанне "адбылося на аснове такіх непарушных прынцыпаў ленінскай нацыянальнай палітыкі Камуністычнай партыі як дабраахвотнасць зліцця і поўнае равенства аб'яднаўшыхся народаў". Сцвярджалася, што ініцыятыва ЦК РКП(б) аб ўз'яднанні "была цалкам падтрымана як бальшавіцкімі арганізацыямі, так і шырокімі працоўнымі масамі",[109] што "рэкамендацыі ЦК РКП(б) аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР былі пастаўлены ў Літве і Беларусі на шырокі народны рэферэндум". Быццам бы "у гарадах і вёсках адбыліся сходы і мітынгі працоўных, на якіх абмяркоўвалася пытанне аб аб'яднанні Беларусі і Літвы ў адзіную Літоўска-Беларускую ССР".[110] Яно адпавядала "карэнным інтарэсам як літоўскага, так і беларускага народаў, цесна звязаных паміж сабою агульнасцю гістарычнага шляху".[111] Некаторыя аўтары патэтычна выказвалі думку аб тым, што ЛітБел меў "важнае агульнадзяржаўнае значэнне, таму што азначаў пачатак новага этапа ў будаўніцтве савецкай шматнацыянальнай дзяржавы, калі народы Расіі дабраахвотна станавіліся на шлях стварэння адзінага дзяржаўнага брацкага саюза".[112] "Абвяшчэнне Літоўска-Беларускай ССР з'явілася важным крокам на шляху да дабраахвотнага аб'яднання незалежных савецкіх сацыялістычных рэспублік у адзіную дзяржаву – СССР," – пісаў М. Л. Іваноў.[113]

У сваёй грунтоўнай манаграфіі па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР Я. Н. Шкляр з пафасам пісала аб тым, што яе ўтварэнне мела важнае значэнне нават "для ўмацавання рэвалюцыйнага руху ў Польшчы, перамогі там дыктатуры пралетарыята". Літоўска-Беларуская рэспубліка, на думку аўтара, дапамагла распаўсюджванню вопыта сацыялістычнага будаўніцтва на Захадзе.[114]

Аналагічныя думкі і ацэнкі выказвалі і літоўскія гісторыкі. Так, Б. Ю. Вайткявічус, адзначаючы аграмаднае значэнне аб'яднання Літвы і Беларусі, падкрэсліваў, што "яно з'яўлялася пацвярджэннем правільнасці нацыянальнай палітыкі Камуністычнай партыі".[115] Ю. Палецкіс лічыў, што аб'яднанне адбылося "з улікам іх блізкасці, родаснасці і агульнасці мэтаў".[116]

Гэтыя галоўныя тэзісы, якія тлумачылі прычыны абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР, з некаторымі варыяцыямі і не прынцыповымі дапаўненнямі былі замацаваны ў савецкай гістарыяграфіі 20-80-х гадоў XX ст. І толькі з пачатку 90-х гадоў ацэнкі ЛітБела, яе месца і ролі ў гісторыі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва пачалі рэзка мяняцца на супрацьлеглыя. Але гэта

---

[109] Куличенко М. И. Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса в 1918 – 1920 гг. – М., 1963. – С. 257.

[110] Иванов Н. Л. Создание Литовско-Белорусской ССР и современная буржуазная историография // Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов. – Мн., 1981. – С. 113.

[111] Каменская Н. В. Первые социалистические преобразования в Белоруссии (25 октября 1917 г. – июль 1919 г.). – Мн.,1957. – С. 199.

[112] Там жа.

[113] Иванов Н. Л. Создание Литовско-Белорусской ССР и современная буржуазная историография. –С. 114.

[114] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919 – 1920 гг.). – Мн., 1962. – С. 20..

[115] Вайткявичус Б. Ю. Борьба трудящихся Литвы за победу социалистической революции (1918 – 1919 гг.): Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – М., 1958. – С. 14.

[116] Палецкис Ю. Международная интервенция в Литве в 1918 — 1919 гг. // 40 лет пролетарской революции в Литве. Сб. ст. – Вильнюс, 1959. – С. 112.

адбылося і адбываецца без увядзення ў навуковы зварот прынцыпова новых дакументаў і матэрыялаў, якія б маглі пераканаўча іх пацвердзіць ці аргументавана абвергнуць усталяваўшуюся ў гістарыяграфіі канцэпцыю абвяшчэння ЛіБ ССР.

Сучасныя ўмовы і стан развіцця айчыннай навукі дазваляюць даследчыкам свабодна, без ідэалагічных і палітычных зададзенасцей паглядзець на прычыны і матывы аб'яднання двух суседніх савецкіх рэспублік у лютым 1919 г. Гісторыкі адмаўляюцца ад абсалютызаваных вывадаў і ацэнак, ідэалагічных клішэ і штампаў, якія раней замацаваліся ў навуцы. Паспрабуем і мы ў гістарыяграфічным аспекце паразважаць над прычынамі абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР. Пры гэтым адзначым, што з паступовым развіццём гістарычнай навукі і назапашваннем ею новых фактаў надуманасць і не адпаведнасць рэчаіснасці многіх тлумачэнняў прычын аб'яднання Беларусі і Літвы станавілася ўсё больш спрэчнай і цяпер ўвогуле з'яўляецца відавочнай.

Разгледзім іх па парадку. І пачнем з тэзіса аб тым, што галоўнай прычынай аб'яднання двух рэспублік з'яўлялася жорсткая неабходнасць умацавання іх абароназдольнасці з тым, каб вытрымаць узброеннае наступленне Польшчы, спыніць яе агрэсію супраць Савецкай Расіі.

Тэзіс аб тым, што аб'яднанне двух савецкіх рэспублік па прапанове ЦК РКП(б) выклікалася ваенна-абарончымі меркаваннямі не вытрымлівае крытыкі з навуковага пункту гледжання.

Першае. Ні Беларуская ССР, ні Літоўская савецкая рэспубліка не мелі сваіх узброеных сіл і ваенна-стратэгічных рэсурсаў. Тыя не шматлікія вайсковыя фарміраванні, што знаходзіліся на іх тэрыторыях пасля адыходу кайзераўскіх акупантаў і ўступлення Чырвонай Арміі, падпарадкоўваліся яе галоўнакамандаванню. Камандуючыя Заходнім фронтам, створанага ў сярэдзіне лютага 1919 г., прызначаліся вышэйшым партыйна-савецкім і ваенным кіраўніцтвам РСФСР і былі адказныя перад ім. Ваенны камісарыят Літоўска-Беларускай ССР не з'яўляўся кіруючым органам абароны. На гэта, дарэчы, звяртаў увагу яшчэ В. Г. Кнорын у артыкуле "Восемь месяцев Советской Белоруссии", надрукаваным у верасні-кастрычніку 1919 г. у газеце "Звезда". Тады ён пісаў аб тым, што ваенны камісарыят ЛітБела, «не з'яўляючыся органам, які распараджаўся ваеннымі сіламі на фронце, не мог узяць на сябе адказнасці за ход абароны, а потым за цяжкую катастрофу пад Вільняй, якая выявіла ўсе слабыя бакі нашай ваеннай арганізацыі».[117]

Другое. Колькасць штыкоў і шашак на савецкім Заходнім фронце была па сутнасці сімвалічнай. Па дадзеным, якія прывёў Б. Вайткявічус у сваёй манаграфіі "Сацыялістычная рэвалюцыя ў Літве 1918 – 1919 гг. ", суадносіны ўзброенных сіл на Заходнім фронце (у ЛітБеле) былі наступнымі: штыкоў 5:1, шашак 14:1 на карысць польскіх легіянераў.[118] У дакладзе галоўнага камандавання ў Рэўваенсавет РСФСР аб становішчы на Заходнім фронце на сярэдзіну чэрвеня 1919 г. паведамлялася наступнае: "Суадносіны сіл нашых і праціўніка на гэтым участку цяперашняга Заходняга фронта былі, увогуле, не на нашу карысць. Усяго на гэтым фронце мы мелі каля 90 тыс. штыкоў і шашак пры 1 941 кулямётах і 677 гармат, супраць 273 тыс. штыкоў і шашак, каля 2 400 куляметаў і каля 750 гармат у праціўніка".[119] На тэрыторыі ЛітБела ў чэрвені

---

[117] Кнорин В. Г. Избранные статьи и речи. – Мн., 1990. – С. 57.
[118] Vaitkevičus B. Socialistine revoliucija Lietuvoje 1918 - 1919 metais. – Vilnius, 1967. – S. 667.
Гэтыя дадзеныя пацвердзіў і К. Навіцкас у рэцэнзіі на манаграфію Б. Вайткявічуса. (Гл.: Навицкас К. Вклад в советскую историографию // Коммунист (Вильнюс). – 1968. – № 2. – С. 56).
[119] Из истории гражданской войны в СССР. – Т. 2 (март 1919 г. – февраль 1920 г.). – М., 1961. – С. 371.

1919 г. налічвалася ўсяго 17 450 чырвонаармейцаў (пяхоты і конніцы), а ў польскім войску – 96 150 легіянераў.[120]

Яшчэ горшым было матэрыяльна-бытавое забеспячэнне савецкіх войск, якія знаходзіліся на Заходнім фронце. Так, на 1 лютага 1919 г. у войсках фронта запасаў прадуктаў было: мукі – на тры дні, мяса і рыбы – на пяць, гародніны – на шэсць дзён. Яно не палепшылася і ў будучым. 18 ліпеня 1919 г. Савет Абароны Літоўска-Беларускай ССР накіраваў старшыні СНК РСФСР У. І. Леніну тэлеграму наступнага зместу: "Цяперашняе становішча на фронце з прадуктамі вельмі дрэннае. На базах ні фунта хлеба. У часцях – таксама".[121]

Такое нікуды ні вартае забяспячэнне войск Заходняга фронта ўплывала на яго баяздольнасць і маральна-баявы дух. Прадстаўнік ЦК РКП(б) у Беларусі А. А. Іофэ 28 студзеня 1919 г. у лісце Я. М. Свярдлову даводзіў: "...Нашы войскі, якія тут знаходзяцца, па агульнай ацэнцы, ні чорту не вартыя, часткаю выклікаюць боязь, што пабягуць пры першым выстрале", іншыя "настолькі разбэшчаныя, што рабуюць мясцовае насельніцтва горш за татар".[122]

Увогуле ўзброеныя сілы Чырвонай Арміі, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі і Літвы значна ўступалі войскам Польшчы. І гэты факт прызнаюць як беларускія, так і літоўскія гісторыкі.[123]

Але справа была не толькі ў узброенных сілах. Сам урад ЛітБела, як адзначаў у свой час М. І. Кулічэнка, утрымліваўся на грошы Масквы. У адным з дакументаў Наркамата фінансаў Літоўска-Беларускай рэспублікі гаварылася, што з часу яго ўтварэння і да захопу палякамі Вільні 21 красавіка 1919 г. ён атрымаў з РСФСР 200 млн. рублёў, не ўлічваючы сумаў, якія атрымалі асобныя камісарыяты на спецыяльныя патрэбы. Бюджэт ССР ЛіБ зацвярджаўся СНК РСФСР, фінансаванне рэспублікі ажыцяўляла Савецкая Расія.[124]

Далей. Кіраўніцтва РСФСР добра валодала становішчам на франтах грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі. І ў 1919 г. галоўныя сілы Чырвонай Арміі былі сканцэнтраваны на Усходнім і Паўднёвым франтах, на якіх вырашаўся лёс савецкай рэспублікі і бальшавіцкай улады. У тых умовах Савецкая Расія не змагла аказаць больш-менш істотную ваенную дапамогу Літоўска-Беларускай ССР. Ратаваць становішча трэба было, як бачым, іншымі сродкамі. І размова ж ішла, зразумела, не аб інтарэсах БССР і Літоўскай ССР, якія з'явіліся на палітычнай карце Еўропы па рашэнню з Крамля, а аб гамлетаўскім быць ці не быць Савецкай Расіі, Савецкай уладзе. Уся стратэгія і тактыка кіраўніцтва РСФСР была падпарадкавана адной адзінай мэце – усімі сродкамі выратаваць і захаваць сваю бальшавіцкую ўладу. Гэта абумовіла і розныя дыпламатычныя, знешнепалітычныя, нацыянальна-дзяржаўныя і іншыя захады. Адсюль, хутчэй за ўсё, і ўзнікла ідэя стварэння выратавальнага буфера – аб'яднанай дзяржавы ў выглядзе Літоўска-Беларускай ССР.[125] Але для іншых мэтаў, таму што для ўмацавання абароназдольнасці рэспублік, як бачым, не было чаго аб'ядноўваць.

---

[120] История Литовской ССР (с древнейших времён до наших дней). – Вильнюс, 1978. – С. 329.

[121] Селиванов П. А. Укрепление тыла Красной Армии: Деятельность Советов и ревкомов Белоруссии (1918 – 1920 гг.). – Мн., 1987. – С. 115.

[122] Цыт. па: Платонов Р., Сташкевич Н. Трудный путь к свободе // Советская Белоруссия. – 1991. – 16 июля. – С. 2.

[123] Vaitkevičius B. Socialistine revoliuciya Lietuvoje 1918 – 1919 metais. – P. 667, Иностранная военная интервенция в Белоруссии. 1917 – 1920 гг. – Мн., 1990. – С. 195.

[124] Куличенко М. И. Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса. – С. 152.

[125] Буферная дзяржава – звычайна несамастойная і слабая ў ваенных і палітычных адносінах дзяржава, якая знаходзіцца паміж варагуючымі бакамі. (Гл.: Словарь иностранных слов. – 16-е изд. исправл. – М., 1988. – С. 95).

Больш таго, не можа не ўзнікнуць лагічнае пытанне – калі на самой справе размова ішла аб сапраўдным умацаванні абараназдольнасці савецкіх рэспублік на Захадзе Савецкай Расіі, то чаму аб'яднанне было зроблена з урэзанай Беларускай ССР, а не ў поўным складзе? У такім выпадку "буфер" быў бы мацнейшым.

Калі ж "буфер" ствараўся для таго, каб перагарадзіць шлях польскаму наступленню на краіну Саветаў, то навошта ж было сталіцу ЛітБела размяшчаць у Вільні? У ваенна-стратэгічных адносінах на такую ролю больш падыходзіў Мінск, які быў акупаваны польскімі легіянерамі на тры з паловай месяцы пазней, чым Вільня, якая была здадзена захопнікам ужо 21 красавіка 1919 г.

Другой важнейшай прычынай абвяшчэння ЛітБела, на якой, услед за яго стваральнікамі, акцэнтавалі ўвагу і даследчыкі, быццам бы было "імкненне ЦК засцерагчы гэтыя рэспублікі ад магчымасці праяўлення ў іх нацыянальна-шавіністычных намераў" і патрэбнасць інтэрнацыянальнага аб'яднання беларускіх і літоўскіх працоўных у імя "хутчэйшага разгрому белагвардзейскага беларуска-літоўскага ўрада".[126]

Калі дапусціць, што гэта было так на самой справе, то навошта ж было ўрэзваць толькі што створаную Беларускую ССР і па сутнасці яе ліквідаваць?[127] Нацыялістычныя настроі і выступленні такім чынам не падаўляюцца. Наадварот, падобныя акцыі могуць толькі справакаваць рост нацыяналізму, даць новыя імпульсы для ўзмацнення нацыяналістычных успышак сярод нацыянальна свядомай часткі пакрыўджанай і зняважанай нацыі. Уключэнне паловы тэрыторыі Беларускай рэспублікі (Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў) у склад Расійскай дзяржавы, а другой (Гродзенскай і Мінскай) – у склад Літоўска-Беларускай ССР не магло служыць умацаванню даверу беларускага народа да Савецкай улады і бальшавіцкай партыі, якія з-за знешнепалітычных умоў маніпулявалі яго нацыянальна-дзяржаўнымі інтарэсамі і ўжо другі раз пасля Брэсцкага міру падзялілі яго этнічную тэрыторыю. І калі пра такое быццам бы станоўчае значэнне чарговага кроку ленінскай нацыянальнай палітыкі ў дзяржаўным будаўніцтве – стварэнне ЛітБел ССР – і пісалі савецкія гісторыкі, то гэта адпавядала толькі адной з бальшавіцкіх міфалагемаў.

У сучаснай айчыннай і літоўскай гістарыяграфіі, якую мы адлічваем з пачатку 90-х гадоў, такія пункт гледжання і ацэнкі адвергнуты. Даследчыкі падкрэсліваюць, што сама ідэя і тым больш практыка падзелу Беларускай ССР і аб'яднання яе з Літоўскай рэспублікай не адпавядалі і не маглі адпавядаць карэнным інтарэсам ні беларускага, ні літоўскага народаў. Прывядзем некаторыя з такіх выказванняў і заключэнняў. "Абвешчаная ў лютым 1919 г. Літоўска-Беларуская рэспубліка была штучным утварэннем без уліку інтарэсаў як беларускага, так і літоўскага народаў", – першым з айчынных даследчыкаў канстатаваў Я. А. Юхо.[128] "Літоўска-Беларуская ССР, альбо ЛітБел, створаная па волі знешнепалітычных сіл, не была і не магла быць беларускай дзяржаўнасцю", – сцвярджалі Л. В. Лойка і Т. В. Лойка ў сваім артыкуле.[129] В. І. Талкачоў у артыкуле, прысвечаным 75-годдзю Літоўска-Беларускай ССР, назваў яе «штучным дзяржаўным утварэннем" і, нават, "сур'ёзнай памылкай"

---

Съезды Советов Советских Социалистических Республик. Сборник документов. 1917 – 1922. – Т. 2. С. 233.

Дарэчы такое пытанне паставіў В. А. Круталевіч. (Гл.: Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности. – С. 96).

Юхо Я. Фармаванне тэрыторыі беларусаў // Спадчына. – 1991. – № 6 – С. 9.

Лойка Л., Лойка Т. Сучасны погляд на гісторыю Беларусі // Крыжовы шлях. – Мн., 1993. – С. 34.

бальшавіцкай партыі.[130] Утварэнне ЛітБел ССР М. Л. Іваноў назваў «няўдалым бальшавіцкім эксперыментам».[131] У кнізе У. Ф. Ладысева і П. І. Брыгадзіна адзначаецца «надуманасць і нежыццяздольнасць новага дзяржаўнага збудавання". ЛітБел аўтары называюць "аморфнай дзяржаўнасцю". Яны падкрэсліваюць, што «утварэнне Літоўска-Беларускай ССР не з'яўлялася арганічнай патрэбнасцю двух народаў, якія заўсёды былі добрымі суседзямі».[132] В. А. Круталевіч і Я. А. Юхо ў вучэбным дапаможніку для студэнтаў юрыдычных і гістарычных спецыяльнасцей ВНУ утварэнне Літоўска-Беларускай ССР назвалі "яшчэ адным эксперыментам, праведзеным Савецкімі ўладамі над беларусамі і іх дзяржаўнасцю".[133]

Ацэнкі Літоўска-Беларускай ССР у літоўскіх гісторыкаў яшчэ больш скептычна-непрыязныя. Так, Ч. Лаўрынавічус і Р. Мікніс савецкую дзяр-жаўнасць Літвы, створаную па ініцыятыве Савецкай Расіі і яе намаганнямі, разглядаюць "як прыклад фальсіфікацыі дзяржаўнасці ў гісторыі".[134] Абвяшчэнне ЛітБела літоўскія савецкія гісторыкі тлумачылі як часовае мерапрыемства, прадыктаванае неспрыяльнымі міжнароднымі ўмовамі.[135] Но калі гэта так, то чаму не была выбрана форма федэрацыі ці аўтаномнага злучэння беларускіх і літоўскіх тэрыторый? Такая форма дзяржаўнага аб'яднання дазволіла бы захаваць хаця б асяродкі нацыянальнай дзяржаўнасці Беларусі і Літвы. ЛітБел жа была ўнітарнай дзяржавай з адзінай Камуністычнай партыяй і адзінымі дзяржаўнымі органамі. У сувязі з гэтым правамоцна паставіць пытанне: інтарэсам якой нацыі адпавядала стварэнне новай аб'яднанай дзяржавы?

Пры абгрунтаванні неабходнасці і важнасці аб'яднання двух савецкіх рэспублік гісторыкі ў рэчышчы афіцыйнай матывацыі дарэмна паўтаралі выдумку стваральнікаў ЛітБела аб неіснаваўшым белагвардзейскім беларуска-літоўскім урадзе, з якім трэба было змагацца працоўным і бальшавікам. У той час – канец 1918 г. – пачатак 1919 г. – размова магла ісці толькі пра тое, што ў лістападзе 1918 г. у выніку дамоўленасці паміж Віленскай Беларускай Радай і прэзідыумам Літоўскай Тарыбы пры літоўскім урадзе было створана Міністэрства беларускіх спраў, якое ўзначаліў былы старшыня Народнага Сакратарыяту БНР Я. Я. Варонка.[136] І ні больш! Ніякага сумеснага беларуска-літоўскага ўрада не існавала.

Але ж калі такая белагвардзейска-нацыяналістычная здань блукала над Беларуссю і Літвою, то з ёю трэба было неяк змагацца. І як у першым выпадку, калі была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка, бальшавікі ў адказ абвясцілі Белару-

---

130 Талкачоў В. Цяжкі студзень 1919-га... // Беларуская думка. – 1994. – № 1. – С. 69.

131 Іваноў М. Рыжскі мір і эмігранцкі ўрад БНР // Беларусіка=Albaruthenica. – Мн., 1997. – Т. 6. – Ч. 2. – С. 278.
Цікава адзначыць, што значэнне ЛітБел ССР М. Л. Іваноў ацэньваў раней зусім інакш: "...абвяшчэнне Літоўска-Беларускай ССР дазволіла значна ўмацаваць абараназдольнасць рэспублікі і з'явілася дэманстрацыяй перад усім светам паслядоўнага правядзення Камуністычнай партыяй права нацый на самавызначэнне". (Гл.: Иванов Н. Л. Создание Литовско-Белорусской ССР и современная буржуазная историография // Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов: Матер. межресп. науч. конф., посвящ. 60-летию образ. Литовско-Белорусской ССР. – Мн., 1981. – С. 110).

132 Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. На пераломе эпох: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917 – 1920 гг.). – Мн., 1999. – С. 62.

133 Круталевіч В. А., Юхо І. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.). – 2-е выд. – Мн., 2000. – С. 45.
Пад першым эксперыментам, напэўна, падразумевалася абвяшчэнне БССР 1 студзеня 1919 г.

134 Laurzinavičius C. Tarybinio valstybingumo Steigimas Lietuoje. 1918 m. pabaiga – 1919 m. pirmoji puse // Iš Lietuvos istoriyos tyrineimju. – V., 1991. – P. 87-105; Мікніс Р. Літва і Беларусь: супольная аўтаномія // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 3. – С. 5-7; ён жа. Літва і Беларусь: перыпетыі дзяржаўнасці ў пачатку XX ст. // Беларусіка = Albaruthenica. – Мн., 1997. – Т. 6. – Ч. 2. – С. 249-256.

135 Вайткявичус Б. Первая власть рабочих и крестьян в Литве. – Вильнюс, 1988. – С. 179.

136 Падрабязней пра гэта гл.: Дубік С. Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1918 – 1924 гг. // Гісторыя Беларусі ў еўрапейскім кантэксце: Матэрыялы гістарычных семінараў, якія адбыліся ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры ў 2001 г. – Мн., 2002. – С. 53-82

скую Савецкую Рэспубліку, так і ў другім – на "утварэнне беларуска-літоўскага ўрада" яны адрэагавалі абвяшчэннем Літоўска-Беларускай ССР.

Міфалагічнымі тэзісамі ў гістарычнай літаратуры, з дапамогай якіх абгрунтоўвалася мэтазгоднасць і неабходнасць аб'яднання Беларусі і Літвы, таксама былі і сцвярджэнні аб тым, што такое зліццё рэспублік з'яўлялася добраахвотным, пры поўным равенстве аб'яднаўшыхся народаў і яго аднадушна падтрымалі як бальшавіцкія арганізацыі, так і працоўныя Беларусі і Літвы.

Вядома, што такая "добраахвотнасць" ініцыявалася ЦК РКП(б) і вельмі энергічна і жорстка праводзілася ў жыццё яго прадстаўніком А. А. Іофэ праз мясцовыя партыйныя арганізацыі і камуністаў. Але аб тым, што ідэя падзелу БССР і зліцця яе з Літоўскай ССР не была падтрымана ні беларускімі нацыянальнымі дзеячамі, ні бальшавіцкім кіраўніцтвам БССР савецкія гісторыкі доўгі час замоўчвалі ці падавалі гэта вульгарызавана, перакручана. Лепшым узорам класава-ідэалагічнай фальсіфікацыі тых падзей з'яўляецца іх інтэрпрэтацыя ў кнізе А. М. Андрэева, якая ўбачыла свет яшчэ ў гады так званага культу асобы Сталіна.[137] Аўтар падкрэслівае, што "вырашэнне пытання аб аб'яднанні брацкіх савецкіх рэспублік праходзіла ў барацьбе са злейшымі ворагамі народа, буржуазнымі нацыяналістамі, якія прабраліся шляхам абману ў кіруючыя партыйныя і савецкія органы Літвы і Беларусі".[138]

У 60-я гады гэты аспект тэмы Літоўска-Беларускай ССР кранаўся, але ўжо ў больш карэктнай форме. У манаграфіі М. І. Кулічэнкі адзначалася, што ЦБ КП(б)Б не пагадзілася з пастановай ЦК РКП(б) аб вылучэнні са складу БССР трох губерняў і аб'яднанні застаўшайся часткі з Літоўскай ССР і прасіла яго перагледзець сваё рашэнне.[139] І толькі з пачатку 90-х гадоў гэты сюжэт атрымаў больш поўнае і аб'ектыўнае асвятленне ў працах гісторыкаў – Р. П. Платонава і М. С. Сташкевіча, В. А. Круталевіча.[140] У іх даследчыцкіх працах, а затым і ў вучэбнай літаратуры замацавалася ўяўленне аб тым, што ідэю аб'яднання двух рэспублік не прынялі ні прыхільнікі А. Ф. Мяснікова, ні паплечнікі Дз. Ф. Жылуновіча. Яны былі салідарны толькі ў адным, калі выступалі за цэласнасць БССР і пратэставалі супраць яе падзелу. Але матывы ў кожнай з груп былі розныя – барацьба за ўладу, пасады, партфелі. Прадстаўнікі Аблвыканкамзаха выступалі супраць ЛітБела не з-за аб'яднання з Літоўскай ССР Беларускай рэспублікі, а з-за падзела яе тэрыторыі. Яны, як адзначыў М. І. Кулічэнка, абаранялі тэрытарыяльную цэласнасць Заходняй вобласці, а не беларускай нацыі, якую ўвогуле не хацелі прызнаваць.[141]

У сучасных публікацыях гісторыкаў развеяны яшчэ адзін міф савецкай гістарыяграфіі – аб поўным равенстве аб'яднаўшыхся народаў. Ён быў замацаваны ў працах гісторыкаў 50-80-х гадоў. Але дзеля справядлівасці заўважым тое, што яшчэ В. Г. Кнорын у згаданым ужо артыкуле адзначаў, што адразу пасля абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР "Вільня і польска-літоўскія работнікі пачалі адыгрываць кіруючую ролю. Сталі фактычна вызначаючымі палітыку аб'яднанай рэспублікі".[142] Такая ацэнка, відавочна, была заглушана

---

[137] Андреев А. М. Борьба литовского народа за Советскую власть 1918 – 1919 гг. – М., 1954. – 163 с.
[138] Там жа. – С. 105.
[139] Куличенко М. И. Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса в 1918 – 1920 годах. – Харьков, 1963. – С. 250.
[140] Платонов Р. П., Сташкевич Н. С. Тернистый путь к свободе... Образование БССР // Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. В 3 ч. – Ч. 2. – Гомель, 1993; Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1999.
[141] Куличенко М. И. Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса. – С. 250.
[142] Кнорин В. Г. Избранные статьи и речи. – Мн., 1990. – С. 54.

агульным панегірычным хорам савецкіх гісторыкаў, аднадумна і аднадушна ўсхваліўшых "мудрую нацыянальную палітыку" бальшавіцкай партыі.

Рэчаіснасць лютага-сакавіка 1919 г. выглядала зусім наадварот. У кіруючыя органы Літоўска-Беларускай ССР – ЦК КП(б) ЛіБ, ЦВК, СНК, Савет Абароны, наркаматы – беларускія дзеячы практычна не папалі. Самую высокую пасаду ў кіраўніцтве рэспублікі двух народаў займаў выдатны беларус А. Р. Чарвякоў – яму даверылі быць толькі намеснікам наркама асветы Літоўска-Беларускай ССР. "Літоўскія камуністы, заняўшыя кіруючыя пасады ў Літоўска-Беларускай рэспубліцы, – пісаў А. Бурбіс у запісцы "Савецкая ўлада ў Беларусі", накіраванай у 1919 г. у ЦК РКП(б), – цікавяцца непасрэдна Літвой. Беларуская работа ці зусім не вядзецца, ці вядзецца на другім плане. Фактычна ЦК КП ЛіБ без адзінага беларуса".[143]

Персанальны склад урада ЛітБел ССР нават выклікаў часовыя недаразуменні ў некаторых палітычных колах Польшчы. Цэнтральны Рабочы Камітэт ППС (за подпісам М. Недзялкоўскага) 4 сакавіка 1919 г. накіраваў ліст ў ЦК РКП(б), у якім гаварылася аб тым, што савецкі ўрад умешваецца ў справы Польшчы. "Такой спробай, бясспрэчна, – заяўлялася ў ім, – з'яўляецца факт утварэння ў Вільні польскага савецкага ўрада, а таксама і падтрымка, якую аказвае Расія і савецкі ўрад Камуністычнай Рабочай Партыі Польшчы. Мы катэгарычна настойваем на ліквідацыі існуючага ў Вільні быццам бы польскага ўрада, аб якім польскі рабочы клас нічога не ведае і якога ён не заклікаў да жыцця".[144]

Аб "раўнапраўных" адносінах да беларусаў у Літоўска-Беларускай дзяржаве сведчыць і той факт, што ў Вільні, яе сталіцы, выдаваліся газеты і часопісы на літоўскай, польскай, ідыш і рускай мовах. На беларускай мове – ніводнага выдання. Іншымі словамі, у аб'яднанай дзяржаве беларусаў і літоўцаў нічога нацыянальнага беларускага не было.

І ўрэшце аргументацыю аб тым, што аб'яднанне двух савецкіх рэспублік быццам бы выклікалася эканамічнымі і іншымі прычынамі, так сказаць, унутраннымі патрэбнасцямі, – сучасныя даследчыкі не выкарыстоўваюць. Больш таго, В. А. Круталевіч акцэнтаваў увагу на тым, што рашаючай прычынай штучнага стварэння новай дзяржавы былі знешнепалітычныя абставіны і міжнароднае становішча, якое склалася для Савецкай Расіі. Унутраных, так сказаць, іманентных прычын для аб'яднання Беларускай і Літоўскай ССР у студзені – лютым 1919 г. не было.[145]

У сучасных навуковых даследаваннях як беларускіх, так і літоўскіх гісторыкаў больш не паўтараюцца і дэкларатыўныя заявы асобных папярэднікаў аб тым, быццам бы пытанні аб'яднання Беларускай ССР і Савецкай Літвы былі пастаўлены на шырокі народны рэферэндум і праводзіліся мітынгі і сходы працоўных, на якіх яны абмяркоўваліся. Аказаліся пустым гукам і высокамоўныя прапагандысцка-ідэалагічныя штампы аб тым, што стварэнне ЛітБел ССР мела важнае значэнне для ўмацавання рэвалюцыйнага руху ў Польшчы, што яе абвяшчэнне з'яўлялася пацвярджэннем правільнасці нацыянальнай палітыкі бальшавіцкай партыі і "важным крокам у стварэнні СССР". Апублікаваныя ў зборніках і выкарыстаныя ў даследаваннях дакументы і матэрыялы не пацвярджаюць гэтых даследчыцкіх імправізацый.

---

[143] Ракашевіч У. Дзеля чаго і кім была створана Літоўска-беларуская дзяржава? // Звязда. – 1994. – 25 лютага. – С. 2.

[144] Красная книга. Сборник дипломатических документов о русско-польских отношениях с 1918 г. по 1920 г. – М., 1920. – С. 45.

[145] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности. – С. 95-97, 156.

## § 2. Калі была абвешчана ЛіБ ССР?

Перад тым як паказаць розныя трактоўкі такога важнага для гістарычнай навукі пытання, зробім, на наш погляд, істотную заўвагу. Сутнасць яе заключаецца ў наступным. Што адбылося ў лютым 1919 г. – абвяшчэнне ці ўтварэнне Літоўска-Беларускай ССР – адзінай дзяржавы двух народаў? У навуковай літаратуры, энцыклапедычных выданнях і вучэбных дапаможніках звычайна гаворыцца пра ўтварэнне новай дзяржавы. Аб гэтым сведчаць і назвы артыкулаў, раздзелаў і глаў у абагульняючых працах, якія мы будзем называць далей, і праграмах курсаў па гісторыі Беларусі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. Такое аднаназначнае сцвярджэнне нам уяўляецца катэгарычным і не адпавядаючым рэчаіснасці. Калі гаварыць коратка, то Літоўска-Беларуская ССР не была ўтворана і на яе ўтварэнне, як дзяржавы, проста не хапіла часу. Таму што ад 27 лютага 1919 г., калі, як лічыць большасць даследчыкаў, пачала свае існаванне новая дзяржава, да 21 красавіка 1919 г., калі ЦВК, СНК і Савет Абароны рэспублікі пакінулі сталіцу Вільню і пачалі качаваць па розных гарадах, а яе захапілі польскія легіянеры, прайшло толькі каля двух месяцаў. 19 ліпеня спыніў дзейнасць урад ЛітБела. А 27 жніўня 1919 г. польскія войскі ўвайшлі ў апошні гарадскі цэнтр рэспублікі Зарасай. За гэты час не былі створаны дзяржаўны апарат і мясцовыя органы выканаўчай улады; не была дакладна вызначана тэрыторыя рэспублікі і яе граніцы; дзяржаўны новаўтвор не меў канстытуцыі і іншых атрыбутаў дзяржавы, напрыклад, уласных узброеных сіл, судовай сістэмы, мытні, падатковых органаў і г. д. Нарэшце, ЛітБел з'явілася не па добрай, дэмакратычна выяўленай волі беларускага і літоўскага народаў, а наадварот, разрывала іх і іх этнічныя тэрыторыі, частка якіх заставалася адпаведна ў складзе Савецкай Расіі і так званай Ковенскай Літвы, якая знаходзілася пад пратэктаратам Германіі. Больш таго, абвяшчэнне ЛітБела па пастанове Пленума ЦК РКП(б) ад 16 студзеня 1919 г. не мела грунтоўных юрыдычных падстаў. Літоўска-Беларуская ССР не была юрыдычна прызнана ні адной замежнай, у тым ліку і суседняй, дзяржавай. Можна прывесці і іншыя аргументы і факты, якія дастаткова пераканаўча сведчаць аб тым, што будзе правільна гаварыць толькі аб абвяшчэнні Літоўска-Беларускай ССР. Лепшым доказам і сведчаннем таго, што не ўтварылася, не сфарміравалася, не ўсталявалася Літоўска-Беларуская ССР як дзяржава, з'яўляецца і той факт, што яна не адрадзілася пасля вызвалення яе тэрыторыі ад польскай акупацыі ў ліпені 1920 г., хаця былы старшыня СНК ЛітБела В. С. Міцкявічус-Капсукас настойваў на гэтым. Літоўска-Беларуская ССР аказалася нежыццяздольным дзяржаўным новаўтворам. Як штучна рэспубліка была абвешчана, так ціха і непрыкметна яна перастала існаваць. І да цяперашняга часу гісторыкі спрачаюцца аб тым, калі гэта адбылося.

У сувязі са сказанным, важным ўяўляецца і пытанне аб тым, калі і якім вышэйшым прадстаўнічым органам, якім дакументам абвяшчалася новая дзяржава?

Такім дакументам, якім апавяшчалася з'яўленне на палітычнай карце Еўропы новай суверэннай дзяржавы двух народаў, можна было бы лічыць Дэкларацыю ЦВК Літоўска-Беларускай ССР аб знешняй палітыцы, прынятую 28 лютага 1919 г.[89] Яно магло бы так і стацца, калі б у гэтым дакуменце не гаварылася аб тым, што ЦВК "Саветаў рабочых, малазямельных і беззямельных дэпутатаў Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі, выконваючы

[89] Документы внешней политики СССР. – Т. 2. – М., 1958. – С. 84-85; Знешняя палітыка Беларусі. – Т. 1 (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1997. – С. 116-117.

волю з'ездаў Літвы і Беларусі, **паўторна** [выдзелена аўтарамі. – Л. М., У. М.] звяртаецца да ўсіх народаў і іх урадаў з прапановай прызнаць Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі і ўвайсці з ёю ў зносіны".[146]

У сувязі з гэтым узнікае пытанне – калі ЦВК Літоўска-Беларускай ССР першы раз звяртаўся "да ўсіх народаў і іх урадаў з прапановай прызнаць ССР ЛіБ"? У каментарыях да вышэйцытаванага палажэння складальнікі дакументальнага зборніка "Знешняя палітыка Беларусі" (С. 354) адзначалі, што "2 лютага 1919 г. I з'езд Саветаў Беларусі звярнуўся да ўсіх народаў з заклікам прызнаць незалежнасць рэспублікі і ўстанавіць з ёю дыпламатычныя адносіны".[147] І той зварот трэба разумець як першы. Але з такімі развагамі нельга пагадзіцца, таму што Дэкларацыя ад 2 лютага была прынята з'ездам Саветаў БССР, а не з'ездам Саветаў ці ЦВК Літоўска-Беларускай ССР. Гэта, так сказаць, не аднапарадкавыя рэчы.

Першае публічнае ўпамінанне аб новай дзяржаве – Сацыялістычнай Савецкай Рэспубліцы Літвы і Беларусі – з'явілася 16 лютага 1919 г. у "Ноце Часовага рабоча-сялянскага ўрада Літоўскай ССР і Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай ССР польскаму ўраду з прапановай стварыць змешаную камісію для мірнага ўрэгулявання тэрытарыяльных пытанняў."[148] У ёй гаварылася наступнае: "Часовы рабоча-сялянскі ўрад Літвы і Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларусі яшчэ раз падкрэсліваюць, што з іх боку маецца поўная гатоўнасць вырашыць палюбоўна і міралюбіва ўсе спрэчныя тэрытарыяльныя пытанні і пагэтаму прапануюць ураду Польскай Рэспублікі дэлегіраваць сваіх прадстаўнікоў у змешаную камісію, "якая павінна будзе ўстанавіць дзяржаўную граніцу паміж **утворанай** [падкрэслена аўтарамі. – Л. М., У. М.] Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікай Літвы і Беларусі, з аднаго боку, і Польскай Рэспублікай – з другога".[149] Заява гэтага дакумента зусім, канчаткова заблытвае пытанне аб даце абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР і фактычна робіць яго безсэнсоўным.

Асноўнымі юрыдычнымі дакументамі, якія з'яўляліся падставай для абвяшчэння новай рэспублікі, сталі рашэнні Першага Усебеларускага з'езда Саветаў (2-3 лютага 1919 г.) і Першага з'езда Саветаў рабочых, беззямельных, малазямельных і чырвонаармейскіх дэпутатаў Літвы (17-21 лютага 1919 г.).[150]

---

[146] Знешняя палітыка Беларусі. – Т. 1. – С. 116.

[147] Складальнікамі зборніка дакументаў і матэрыялаў, аўтарамі прадмовы і каментарыяў да яго з'яўляюцца У. М. Міхнюк, У. К. Ракашэвіч, Я. С. Фалей, А. В. Шарапа і С. А. Шупа.

[148] Знешняя палітыка Беларусі. – Т. 1. – С. 110-111.

[149] Там жа. – С. 111; Документы внешней политики СССР. – Т. 2. – М., 1958. – С. 76; Документы и материалы по истории советско-польских отношений. – Т. 2 (ноябрь 1918 г. – апрель 1920 г.). – М., 1964. – С. 106.
У каментарыі да гэтага дакумента (у той частцы, дзе размова ідзе аб намеры Беларусі і Літвы "стварыць адзіную Літоўска-Беларускую Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку") прама сказана аб тым, што "**аб'яднанне адбылося 17 лютага 1919 г.** у Вільнюсе ў адпаведнасці з пастановамі, прынятымі ў тым жа месяцы на I з'ездзе Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў Беларусі ў Мінску, а таксама на I з'ездзе Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў у Вільнюсе". (Гл.: Документы и материалы по истории советско-польских отношений. – Т. 2. – С. 106).

[150] Борьба за Советскую власть в Литве в 1918 – 1920 гг.: Сборник документов. – Вильнюс, 1967. – С. 180-182.
Трэба адзначыць, што ў навуковых даследаваннях, зборніках дакументаў і энцыклапедычных выданнях называецца іншая дата работы з'езда – 18-20 лютага 1919 г. (Гл.: Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР: Документы и материалы. – Мн., 1954. – Т. 4. – С. 463-464; Съезды Советов Советских Социалистических Республик. Сборник документов 1917 – 1922 гг. – М., 1960. – Т. 2. – С. 221; Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919 – 1920 гг.) – Мн., 1962. – С. 56; История Литовской ССР (с древнейших времён до наших дней). – Вильнюс, 1978. – С. 319; Советская историческая энциклопедия. – М., 1965. – Т. 8. – С. 736; По воле народа: Из истории образования Белорусской

У дэкларацыі Першага з'езда Саветаў БССР, прынятай 2 лютага 1919 г. гаварылася: "Усвядамляючы неабходнасць хутчэйшага разгрому белагвардзейскага беларуска-літоўскага ўрада і ўлічваючы агульнасць сваіх эканамічных інтарэсаў. Усебеларускі з'езд Саветаў, у поўнай згодзе з намерамі і прапановамі літоўскага савецкага ўрада,[151] пастанаўляе: Прызнаць неабходным неадкладнае зліццё Беларускай Савецкай Рэспублікі з Літоўскай Савецкай Рэспублікай, даручыўшы ажыццявіць зліццё і арганізацыю адзінага ўрада органу ўлады, які выдзяліў з'езд".[152] Прыводзячы гэтую частку Дэкларацыі, трэба адзначыць, што арганізатары і кіраўнікі Першага Усебеларускага з'езда Саветаў былі так моцна напалоханы фактам дзейнасці Рады Беларускай Народнай Рэспублікі і Літоўскай Тарыбы, што нават у такі важнейшы і адказнейшы дакумент, якім з'яўлялася Дэкларацыя аб аб'яднанні савецкіх рэспублік Беларусі і Літвы, уключылі бязглуздую фармулёўку пра не існаваўшы "белагвардзейскі беларуска-літоўскі ўрад", для разгрома якога быццам бы трэба было стварыць новую дзяржаву.

У рэзалюцыі Першага з'езда Саветаў Літвы, які таксама выказаўся за зліццё двух рэспублік, такіх міфалагічных матываў іх аб'яднання не прыводзілася. У ёй было сфармулявана і абвешчана прынцыпова важнае палажэнне: "Пагэтаму, з прычыны ўжо прынятага з'ездам Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў Беларусі рашэння аб зліцці Літвы і Беларусі ў адну рэспубліку, з'езд **урачыста пракламіруе** [падкрэслена аўтарамі. – Л. М., У. М.] стварэнне адзінай сацыялістычнай савецкай рэспублікі Літвы і Беларусі, даручае выбранаму ім Цэнтральнаму выканаўчаму камітэту Саветаў рабочых, беззямельных, малазямельных і чырвонаармейскіх дэпутатаў Літвы зліцца з Цэнтральным [выканаўчым] камітэтам Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў Беларусі і выбраць Рабоча-сялянскі ўрад сацыялістычнай савецкай рэспублікі Літвы і Беларусі."[153]

Такім чынам, творцы ЛітБела лічылі, што справа з "урачыстым пракламіраваннем рэспублікі" адбылася і больш не трэба марнаваць часу на нейкія дробязныя фармальнасці і прынятыя нормы ў міжнароднай практыцы.

І гэтае прынцыповае палажэнне прагучала ў навуковай літаратуры. Першым з даследчыкаў, хто звярнуў на яго ўвагу, быў А. М. Андрэеў. У манаграфіі аб барацьбе літоўскага народа за Савецкую ўладу, ён коратка выклаў канспект абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР і падкрэсліў думку аб тым, што Першы з'езд Саветаў Літвы "урачыста абвясціў аб утварэнні адзінай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі".[154] В. А. Круталевіч у артыкулах 60-х гадоў таксама пісаў аб тым, што ЛітБел была пракламавана 17 лютага 1919 г. Першым з'ездам Саветаў Літвы.[155] Але гэтае палажэнне праігнаравалі даследчыкі гісторыі Літоўска-Беларускай ССР, нават і такія, як С. П. Маргунскі, Я. Н. Шкляр, М. І. Кулічэнка і іншыя, хто больш паглыблена займаўся праблемамі беларускай савецкай дзяржаўнасці. Да гэтай ідэі нечакана звярнуліся аўтары манаграфіі па гісторыі дзяржаўнасці Беларусі ў праграмах

ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии. Документы и материалы. – Мн., 1988. – С. 87 і інш.).

[151] На той час, калі працаваў Першы Усебеларускі з'езд Саветаў, "прапаноў" аб аб'яднанні з боку літоўскага савецкага ўрада яшчэ не было.

[152] Съезды Советов Советских Социалистических Республик. – Т. 2. – С. 233; Знешняя палітыка Беларусі. – Т. 1. – С. 105-106

[153] Красный архив. – 1940. – Т. 5. – С. 35-36; Борьба за Советскую власть в Литве в 1918 – 1919 гг. – Вильнюс, 1967. – С. 180-182.

[154] Андреев А. М. Борьба литовского народа за Советскую власть 1918 – 1919 гг. – М., 1954. – С. 109

[155] Круталевіч В. А. Пасля абвяшчэння рэспублікі // Полымя. – 1966. – № 9. – С. 140.
Аднак у наступных публікацыях аўтар называў іншыя даты абвяшчэння "рэспублікі двух народаў".

палітычных партый.[156] Яны падкрэслілі, што Першы з'езд Саветаў Літвы "узяў на сябе і функцыю абвяшчэння новага дзяржаўнага ўтварэння".[157]

Іншыя даследчыкі працягваюць гістарыяграфічную традыцыю ад У. М. Ігнатоўскага, які яшчэ ў перашай палове 20-х гадоў заявіў, што 27 лютага 1919 г. ЦВК Беларусі і Літвы "на ўрачыстым пасяджэнні вынеслі пастанову і абвясцілі Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі".[158] Гэтага погляду прытрымліваліся С. П. Маргунскі, В. І. Талкачоў, А. Ф. Вішнеўскі і І. А. Саракавік, М. А. Зеньковіч і іншыя беларускія гісторыкі.[159]

Такім чынам, пытанне аб даце абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР ў навуковай літаратуры засталося спрэчным і на яго патрэбны дакладны адказ. Тым больш, што у кантэксце яго прыдзецца адказаць яшчэ на адно важнае пытанне – калі юрыдычна перасталі існаваць Беларуская ССР і Літоўская Савецкая рэспубліка? Большасць даследчыкаў такой датай лічаць 27 лютага 1919 г., калі ў Вільні адбылося сумеснае пасяджэнне ЦВК Беларускай ССР і ЦВК Літоўскай ССР, на якім былі створаны ЦВК і СНК ЛітБел ССР.[160] Але ж усім даследчыкам гісторыі ЛітБела добра вядома аб тым, што на сумесным пасяджэнні ЦВК Беларусі і Літвы ніякіх дакументаў – маніфеста, дэкларацыі, граматы, мемарыяла, пастановы ці рэзалюцыі – якія прэзентавалі бы беларускаму і літоўскаму народам, а таксама сусветнай супольнасці новую дзяржаву з прапановай прызнаць яе і ўстанавіць з ёю дыпламатычныя адносіны, на аб'яднаным пасяджэнні і абраным ЦВК ЛітБела не было прынята ні 27 лютага, ні пазней.

Нам уяўляецца, што ў сувязі са сказаным і тымі вывадамі, якія маюцца ў навуковай літаратуры, ёсць падставы для таго, каб лічыць датай абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР **17 лютага 1919 г.,** г. зн. дзень калі была прынята рэзалюцыя Першага з'езда Саветаў Літвы аб аб'яднанні літоўскай і беларускай рэспублік і ўрачыста пракламіравана новая дзяржава.

## § 3. Тэрыторыя, граніцы і насельніцтва ЛітБела

Важнымі аспектамі гісторыі ЛітБела, якія разглядаліся ў навуковай літаратуры, але і да гэтага часу засталіся спрэчнымі і да канца не высветленымі, з'яўляюцца пытанні аб складзе тэрыторыі, граніцах і колькасці насельніцтва рэспублікі. На іх спрабавалі адказаць у той ці іншай ступені практычна ўсе даследчыкі, якія імкнуліся больш-менш усебакова раскрыць гісторыю савецкай рэспублікі двух народаў.

Тэрытарыяльны аспект аб'яднання Беларусі і Літвы ўскосна закранаўся ўжо ў публікацыях В. Г. Кнорына і У. М. Ігнатоўскага.[161] Але ў той час яны не імкнуліся дакладна вызначыць тэрыторыю Літоўска-Беларускай ССР.

---

[156] Государственность Беларуси: Проблемы формирования в программах политических партий / В. К. Коршук, Р. П. Платонов, И. Ф. Романовский, Е. Г. Богданович. – Мн., 1999. – С. 72.

[157] Там жа.

[158] Ігнатоўскі У. М. Вялікі Кастрычнік на Беларусі // Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху. – Мн., 1924. – С. 206.

[159] Маргунский С. П. Государственное строительство Белорусской ССР на первом этапе её развития. – Мн., 1953. – С. 38; ён жа. Создание и упрочение белорусской государственности (1917 – 1925 гг.). – Мн., 1958. – С. 160-161; Талкачоў В. І. Цяжкі студзень 1919-га... Да пытання аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР // Беларуская думка. – 1994. – № 1. – С. 69; Вішнеўскі А. Ф., Саракавік І. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Некаторыя пытанні і адказы. – Мн., 1997. – С. 70; Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. На пераломе эпох – С. 61; Зенькович Н. А. Чья Белоруссия. – С. 232; ён жа. Тайны ушедшего века. – М., 2003. – С. 296

[160] У навуковай літаратуры памылкова сустракаецца і дата 28 лютага 1919 г. (Гл.: Гісторыя Беларускай ССР. – Т. 2. – Мн., 1958. – С. 118; История Белорусской ССР. – Т. 2. – Мн., 1961. – С. 118; Круталевич В. А. Рождение Белорусской Советской Республики. Развёртывание национально-государственного строительства. (Ноябрь 1918 г. – февраль 1919 г.) – Мн., 1979. – С. 325)

[161] Кнорин В. Г. Пять лет: Краткий конспект к истории КП(б)Б. – Мн., 1922. – 14 с.; Ігнатоўскі У. Вялікі Кастрычнік на Беларусі // Беларусь. Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. – Мн., 1924. – С. 195-214.

У. М. Ігнатоўскі, напрыклад, пісаў аб тым, што "Беларусь злучылася з Літвой толькі ў складзе Мінскай і Гродзенскай губерняў".[162] В. Г. Кнорын у сваей працы, якая была напісана ў 1922 г. амаль па свежых слядах з улікам асабістага вопыту і ўспамінаў аб дзяржаўным будаўніцтве ў Беларусі, своеасабліва тлумачыў тэрытарыяльны аспект аб'яднання суседніх савецкіх рэспублік. "Гэтае аб'яднанне было тым больш важным, – пісаў былы сакратар ЦК КП(б) Літвы і Беларусі, – што цэлы шэраг тэрыторый з'яўляліся ў нацыянальных адносінах спрэчнымі і што абедзве арганізацыі[163] аднолькава прэтэндавалі на свой уплыў на занятую немцамі і палякамі Гродзенскую губерню".[164]

А. М. Андрэеў у кнізе, якая выйшла ў першай палове 50-х гадоў, гаворачы пра тэрыторыю ЛітБел ССР, асцярожна адзначыў, што ў канцы студзеня 1919 г. у складзе БССР заставалася Мінская, частка Віленскай (Віленскі, Ашмянскі і Дзісенскі паветы) і некалькі паветаў Гродзенскай губерні. Літва ж аб'ядноўвала Віленскую і вызваленныя паветы Ковенскай губерняў.[165] Вось такім фарматам ён прыблізна пазначыў тэрыторыю Літоўска-Беларускай ССР.

Тэрытарыяльныя памеры ЛітБела паспрабаваў удакладніць беларускі гісторык права С. П. Маргунскі, які з пачатку 50-х гадоў актыўна вывучаў праблемы дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі ў 1917 – 1922 гадах. Са спасылкай на ЦДАКР СССР[166] (Ф. 1318. Воп. 1. Спр. 1493. Л. 23) ён упершыню прывеў дадзеныя аб тым, што "ў склад Літоўска-Беларускай ССР **фактычна** [падкрэслена аўтарамі. – Л. М., У. М.] уваходзілі Мінская, Віленская і невялікая частка Ковенскай губерняў з насельніцтвам звыш 4 млн. Чалавек".[167] Гэтыя дадзеныя ён паўтарыў у новай кнізе[168], а таксама ў аўтарскім раздзеле "Утварэнне адзінай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Літвы і Беларусі" калектыўнай працы беларускіх юрыстаў, праўда, з адным удакладненнем – "у склад ЛітБела было вырашана ўключыць".[169] Дарэчы, такія ж звесткі, і таксама са спасылкамі на тую ж самую крыніцу з ЦДАКР СССР, прывяла ў сваей працы і Н. В. Каменская, адзін з першых айчынных гісторыкаў дзяржаўнага будаўніцтва Савецкай Беларусі.[170]

Дапытлівы чытач, напэўна, заўважыў, што з пераліку беларускіх губерняў, якія па меркаванню даследчыкаў увайшлі ў Літоўска-Беларускую ССР, кудысьці знікла Гродзенская. Знікла цэлая губерня!

Адказаць на "тэрытарыяльнае пытанне" ЛітБела спрабавала Я. Н. Шкляр у сваёй спецыяльнай манаграфіі. Са спасылкамі на Партархіў ЦК КП Літвы (Ф. 77. Воп. 2. Спр. 2. Л. 32, 75) і ЦДАКР БССР (Ф. 809. Воп. 1. Спр. 6. Л. 88) яна абвясціла аб тым, што Літоўска-Беларуская рэспубліка складалася з Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай і часткі Сувалкаўскай губерняў з насельніцтвам звыш 6 млн.

---

Ігнатоўскі У. Вялікі Кастрычнік на Беларусі. – С. 207.

Маюцца на ўвазе Камуністычная партыя Літвы і Заходняй Беларусі, якая дзейнічала ў 1918 - 1919 гг. в акупіраванай нямецкімі войскамі тэрыторыі Літвы і Заходняй Беларусі і затым аб'ядналася з ампартыяй Беларусі ў адзіную Камуністычную партыю (бальшавікоў) Літвы і Беларусі, а таксама ампартыя (бальшавікоў) Беларусі.

Кнорин В. Г. Избранные статьи и речи. – Мн., 1990. – С. 89.

Андреев А. М. Борьба литовского народа за советскую власть 1918 – 1919 гг. – М., 1954. – С. 104.

Цяпер гэты архіў мае назву: Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ).

Маргунский С. П. Государственное строительство Белорусской ССР на первом этапе её развития. – н., 1953. – С. 38.

ры верыфікацыі названай крыніцы ў ДАРФ аказалася, што ў ф. 1318. Воп. 1. Спр. 1493. Л. 23 аходзіцца дакладная запіска аб становішчы ў Марыйскай губерні ў жніўні 1922 г.

Маргунский С. П. Создание и упрочение белорусской государственности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 58. – С. 159.

История государства и права Белорусской ССР – Т. 1 (1917 – 1936 гг.). – Мн., 1970. – С. 74.

Каменская Н. В. Первые социалистические преобразования в Белоруссии (25 октября 1917 г. – июль 19 г.). – Мн., 1957. – С. 200.

чалавек.[171] Гэтыя новыя дадзеныя з яе аўтарскай падачы ўвайшлі ў энцыклапедыю,[172] а таксама са спасылкамі на яе манаграфію ў абагульняючы працы па гісторыі БССР і КПБ,[173] іншыя даследчыцкія публікацыі.[174]

Новыя дадзеныя па гэтаму пытанню, якія істотна адрозніваліся ад папярэдніх у бок павялічэння, прывялі літоўскія навукоўцы. Так, у калектыўнай абагульняючай працы па гісторыі Літвы без якіх-небудзь спасылак на крыніцы сказана: "У аб'яднаную Літоўска-Беларускую ССР увайшлі Віленская, Ковенская, Мінская губерні, частка Гродзенскай і каля ¾ Сувалкаўскай". Пры гэтым адзначалася, што Гродзенская губерня бралася без Беластоцкага, Бельскага і Саколкаўскага паветаў, Сувалкаўская – без Сувалкаўскага і Аўгустоўскага паветаў. Плошча ЛітБела, па іх дадзеным, на 1 студзеня 1914 г. складала 207 тыс. км$^2$ і на той тэрыторыі пражывала 7,5 млн. чалавек.[175]

У навейшых публікацыях гэтае пытанне ні столькі было высветлена і ўдакладнена, сколькі стала больш заблытаным.

Так, акадэмік І. М. Ігнаценка ў манаграфіі аб ролі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў самавызначэнні беларускага народа са спасылкай на ЦДАКР СССР (Ф. 1318. Воп. 1. Спр. 1493. Л. 23) сцвярджаў, што ў склад Літоўска-Беларускай рэспублікі ўваходзілі Мінская, Гродзенская, Віленская, Ковенская і частка Сувалкаўскай губерняў з насельніцтвам больш за 4 млн. чалавек.[176] Але ж трэба адзначыць, што ў свой час, спасылаючыся на гэтую ж архіўную крыніцу, С. П. Маргунскі і Н. В. Каменская вызначалі тэрыторыю ЛітБела ў іншым складзе – без Гродзенскай і часткі Сувалкаўскай губерняў.[177]

В. А. Круталевіч са спасылкай на манаграфію Я. Н. Шкляр, але з уласнымі ўдакладненнямі, тэрыторыю Літоўска-Беларускай ССР вызначаў наступным чынам – Мінская, Гродзенская, Віленская, Ковенская губерні і частка Сувалкаўскай. Пры гэтым даследчык адзначыў, што новаабвешчаная рэспубліка "пагадзілася" перадаць РСФСР два паветы былой Мінскай губерні – Рэчыцкі і Дзісенскі.[178] Праўда, ен не ўдакладніў час, да якога гэтыя звесткі адносяцца.

---

[171] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919 – 1920 гг.). – Мн., 1962. – С. 33.
Колькасць насельніцтва аўтар падлічыла на падставе зборніка "Статистический ежегодник. 1918 – 1919" – Вып. 1. – М., 1921. – С. 7 і статдаведніка "Народное хозяйство Белорусской ССР". – М., 1957. – С. 7.

[172] Советская историческая энциклопедия (СИЭ). – Т. 8. – М., 1965. – С. 736.
Цікава адзначыць, што ў артыкуле аб ЛітБеле, змешчаным у БелСЭ (Т. 8. – Мн., 1972. – С. 396-397) Я. Н. Шкляр сама сябе ўдакладніла і тэрыторыю рэспублікі вызначыла толькі ў складзе Віленскай, Мінскай і неакупіраваных частак Ковенскай і Гродзенскай губерняў з насельніцтвам больш за 4 млн. чалавек.

[173] Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. – Ч. 1. – Изд. 2-е. – Мн., 1961. – С. 440; Гісторыя Беларускай ССР. – Т. 3. – Мн., 1975. – С. 149.

[174] Каменская Н. В. Белорусский народ в борьбе за Советскую власть (1919 – 1920 гг.). – Мн., 1963. – С. 23.

[175] История Литовской ССР (с древнейших времен до наших дней). – Вильнюс, 1978. – С. 321.
Гэтыя дадзеныя са спасылкай на "Историю Литовской ССР", але без указання даты, на якую яны былі прыведзены, паўтарыла ў сваім артыкуле беларуская даследчыца І. П. Ламака. (Гл.: Ломако И. П. Образование Литовско-Белорусской ССР и борьба трудящихся республики за защиту Советской власти // Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов: Матер. межресп. научн. конф., посвящ. 60-летию образ. Литовско-Белорусской ССР. – Мн., 1981. – С. 64).

[176] Игнатенко И. М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. – Мн., 1992. – С. 191.
Такія ж дадзеныя, але без якіх-небудзь спасылак, прывялі ў сваей працы Р. П. Платонаў і М. С. Сташкевіч. (Гл.: Платонов Р., Сташкевич Н. Трудный путь к свободе // Советская Белоруссия. – 1991. – 16 июля. – С. 3). У тым жа артыкуле, які аўтары перадрукавалі ў некалькі перапрацаваным варыянце, гаворыцца аб тым, што "рэспубліка ўключала ў сябе тэрыторыі Віленскай, Мінскай, Ковенскай і Гродзенскай губерняў". Як бачым, частку Сувалкаўскай губерні аўтары недзе "згубілі". (Гл.: Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе...Образование БССР // Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. В 3 ч. – Ч. 2. – Гомель, 1993. – С. 133).

[177] Маргунский С. П. Государственное строительство Белорусской ССР на первом этапе ее развития. – С. 38.

[178] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1999. – С. 102.

У "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" – найбольш аўтарытэтным навуковым выданні – гаворыцца толькі аб тэрыторыі Віленскай, Мінскай, частак Ковенскай і Гродзенскай губерняў, плошча якой складала 207 тыс. км$^2$, а насельніцтва каля 4 млн. чалавек.[179] Як бачым, ізноў супярэчнасць – дадзеныя аб тэрыторыі рэспублікі розныя, а аб колькасці насельніцтва, якое быццам бы пражывала на ей, – аднолькавыя.

Тэрытарыяльнае пытанне ЛітБела вельмі цікава растлумачыў беларускі гісторык дзяржавы і права Я. А. Юхо. У часопісным артыкуле ён літаральна сказаў наступнае: "Літоўска-Беларуская рэспубліка **фактычна** [падкрэслена намі. – Л. М., У. М.] складалася толькі з беларускіх губерняў – Віленскай, Гродзенскай і Мінскай, бо на тэрыторыі этнічнай Літвы ўлада належала Літоўскай Тарыбе".[180] У манаграфіі П. І. Брыгадзіна і У. Ф. Ладысева без спасылак на крыніцы сказана аб тым, што "ў склад ЛітБела, акрамя Мінскай і Гродзенскай губерняў, увайшлі Віленская і часткова Ковенская губерні з больш чым шасцімільённым насельніцтвам".[181] У кнізе беларускага публіцыста М. А. Зеньковіча падкрэслена, што "новая дзяржава была малюсенькай, яна складалася ўсяго з трох губерняў – Мінскай, Гродзенскай і Віленскай".[182] Дадзеныя аб колькасці насельніцтва ЛітБела аўтар не прывеў.

Як паказвае гістарыяграфічны аналіз літаратуры па пытаннях аб складзе тэрыторыі, памерах плошчы і колькасці насельніцтва Літоўска-Беларускай ССР і ў беларускіх, і ў літоўскіх даследчыкаў няма абгрунтаванай і тым больш узгодненай пазіцыі. Дадзеныя, якія ўзгадваюцца ў навуковай літаратуры, вельмі розняцца паміж сабою, а ў асобных выпадках з'яўляюцца ўзаемнавыключнымі. Пры чым даследчыкі блытаюцца не толькі ў тых выпадках, калі называюць розныя дадзеныя аб колькасці губерняў і насельніцтва, якія ўваходзілі ў аб'яднаную рэспубліку, але і тады, калі гавораць аб лічбе беларускіх губерняў у складзе ЛітБела. Так, Я. А. Юхо ўпэўнены ў тым, што ЛітБел ССР была абвешчана з тэрыторыяй толькі беларускіх губерняў – Віленскай, Гродзенскай і Мінскай, таму што на землях этнічнай Літвы ўлада належала буржуазнай Тарыбе.

Далей. Адны даследчыкі гавораць аб складзе тэрыторыі, якая быццам бы фактычна ўваходзіла ў склад абвешчанай рэспублікі, другія называюць губерні (з насельніцтвам і без яго), якія толькі "было вырашана ўключыць" у яе. Пры гэтым у навуковай літаратуры не ўказваецца, калі, у якім дакуменце і які партыйны ці савецкі орган абвяшчаў тэрыторыю і граніцы Літоўска-Беларускай ССР.

---

Дзісенскі павет з 1843 г. да жніўня 1919 г. уваходзіў ў Віленскую, а не ў Мінскую губерню, а затым быў перададзены ў склад Віцебскай губерні.

[179] Ціхаміраў А. В. Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // ЭГБ. – Т. 4. – Мн., 1997. – С. 383.

Са спасылкай на гэты артыкул такія ж дадзеныя прыведзены ў кнізе: Государственность Беларуси: Проблемы формирования в программах политических партий / В. К. Коршук, Р. П. Платонов, И. Ф. Романовский, Е. Г. Богданович. – Мн., 1999. – С. 72.

[180] Юхо Я. Фармаванне тэрыторыі беларусаў // Спадчына. – 1991. – № 6. – С. 9.

Дарэчы думка Я. А. Юхо супадае з вывадам А. Л. Бурбіса, які ен зрабіў яшчэ ў 1919 г., калі ў запісцы «Савецкая ўлада ў Беларусі» пісаў аб тым, што "цэнтр па розных меркаваннях, але пры адсутнасці абгрунтаванага знаёмства з беларускім пытаннем, – стварае Літоўска-Беларускую Савецкую Рэспубліку без літоўскай тэрыторыі...". (Гл.: Ракашэвіч У. Дзеля чаго і кім была створана Літоўска-Беларуская дзяржава? // Звязда. – 1994. – 25 лютага. – С. 2).

[181] Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. На пераломе эпох: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917 – 1920 гг.). – Мн., 1999. – С. 61.

Дадзеныя гэтых аўтараў супадаюць з тымі, якія ў свой час апублікавала Я. Н. Шкляр. (Гл.: Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией. – С. 33).

[182] Зенькович Н. А. Чья Белоруссия? Границы. Споры. Обиды. – М., 2002. – С. 292.

На сеняшні дзень не вядома ці ўвогуле існавалі на самой справе такія дакументы і рашэнні партыйных ці дзяржаўных органаў.

У шэрагу спрэчных момантаў з гісторыі ЛітБел ССР знаходзіцца і пытанне аб суаднясенні колькасці яе тэрыторыі і насельніцтва. Як ужо было паказана, плошчу аб'яднанай рэспублікі літоўскія навукоўцы вызначылі ў памеры 207 тыс. км$^2$ з насельніцтвам 7,5 млн. чалавек. І, па іх меркаванню, яе складалі Віленская, Мінская, Ковенская, часткі Гродзенскай (без Беластоцкага, Бельскага і Саколкаўскага паветаў) і Сувалкаўскай губерняў (без Сувалкаўскага і Аўгустоўскага паветаў). Беларускі гісторык А. В. Ціхаміраў у гэтую ж плошчу "ўключыў" тэрыторыю толькі Віленскай, Мінскай і часткі Ковенскай і Гродзенскай губерняў і "пасяліў" на ёй толькі каля 4 млн. чалавек. Відавочна, што названыя статыстычныя сведчанні не суадносяцца паміж сабой, а з'яўляюцца адвольнымі даследчыцкімі імправізацыямі. І ім цяжка верыць. Асабліва калі іх параўнаць з дадзенымі па Заходняй Беларусі, якая па Рыжскаму дагавору ад 18 сакавіка 1921 г. адыйшла да Польшчы, – 113 тыс. км$^2$ і 4,6 млн. чалавек (на 1931 г.).[183] Літбелаўская ж тэрыторыя вызначана ў памеры амаль у два разы большай, чым тэрыторыя Заходняй Беларусі, а колькасць насельніцтва – ў адваротнай прапорцыі.

Прычын такой "навуковай блытаніны" з граніцамі, тэрыторыяй, колькасцю губерняў і насельніцтва ЛітБела некалькі.

Першая, і напэўна, самая галоўная заключаецца ў тым, што даследчыкі не выявілі ў архівах рэпрэзентатыўных крыніц з дакладнымі звесткамі аб складзе і памерах тэрыторыі ЛітБела і колькасці яго насельніцтва (калі ўвогуле яны існуюць). Такія спасылкі на архіў, як ужо адзначалася, маюцца толькі ў працах С. П. Маргунскага, Н. В. Каменскай, Я. Н. Шкляр і І. М. Ігнаценкі (прозвішчы названы ў храналагічным парадку выдання аўтарскіх манаграфій). Даследчыцкі ці можа рэдактарска-выдавецкі парадокс заключаецца ў тым, што С. П. Маргунскі і Н. В. Каменская, з аднаго боку, і І. М. Ігнаценка, з другога, прыводзяць розныя звесткі аб складзе тэрыторыі ЛіБ ССР, спасылаючыся пры гэтым на адну і тую ж архіўную крыніцу, не раскрываючы яе сутнасці і характару. Першыя два даследчыкі чамусьці не ўключылі ў склад ЛітБела Гродзенскую губерню і частку Сувалкаўскай. А. І. М. Ігнаценка лічыў, што ў Літоўска-Беларускую ССР уваходзілі Мінская, Гродзенская, Віленская, Ковенская і частка Сувалкаўскай губерні. Як бачым, у аўтараў вельмі істотныя разыходжанні па пытанні тэрыторыі ЛітБела. Але пры вызначэнні колькасці насельніцтва Літоўска-Беларускай ССР, яны салідарныя, калі называюць лічбу – звыш 4 млн. чалавек. У сувязі з "глухімі" спасылкамі на архіў, калі невядомыя паходжанне і характар выкарыстанага дакумента і не раскрываецца аўтарская методыка атрымання апублікаваных дадзеных, яны не могуць быць прыняты ў гістарычнай навуцы як дакладныя без паўторнай верыфікацыі крыніц. Гэтая заўвага тычыцца і іншых дадзеных аб складзе і тэрыторыі Літоўска-Беларускай рэспублікі і колькасці яе насельніцтва, якія маюцца ў розных іншых даследчыцкіх публікацыях.

Другая прычына такіх "прынцыпова безпрынцыпных" разыходжанняў бачыцца ў некрытычных, абыякавых адносінах даследчыкаў да фактаў і сведчанняў, якія меліся ў працах іх папярэднікаў. Складваецца ўражанне, што некаторыя навукоўцы не ведаюць гістарыяграфіі пытанняў, якія ўзяліся "паглыбленна" вывучаць, і ўяўляюць сябе ў ролі першаадкрывальнікаў. І тады

[183] Заходняя Беларусь // ЭГБ. – Т. 3. – Мн., 1996. – С. 421.

яны выкарыстоўваюць выпадковыя, а часам і адвольныя, невядома адкуль узятыя, без адпаведных спасылак на крыніцы сведчанні і статыстычныя дадзеныя, якія затым спрабуюць замацаваць у абагульняючых працах і вучэбных дапаможніках рознага ўзроўню. Гэта не садзейнічае высвятленню ісціны.

Трэцяя прычына даследчыцкай блытаніны заключаецца ў тым, што гісторыкі, на жаль, не называюць час, да якога адносяцца тыя ці іншыя сведчанні. А як вядома, тэрыторыя і граніцы Літоўска-Беларускай ССР, а значыць і колькасць насельніцтва на працягу перыяду яе існавання мяняліся. Як на прыклад можна спаслацца на сведчанні В. А. Круталевіча і Я. А. Юхо аб тым, што Народны камісарыят унутраных спраў РСФСР 28 жніўня 1919 г. сваей пастановай далучыў да суседніх губерняў Расійскай федэрацыі – Мазырскі павет і часткі Барысаўскага, Бабруйскага і Ігуменскага – да Гомельскай губерні, частку Дзісенскага павета – да Віцебскай губерні.[184] Дадзеныя аб тэрыторыі і колькасці насельніцтва Літбелаўскай рэспублікі літоўскія даследчыкі прыводзілі па стану на 1914 г.[185]

Такім чынам, нягледзячы на праведзеную пэўную пошукавую працу па названых пытаннях, яны застаюцца актуальнымі ў айчыннай гістарыяграфіі для больш грунтоўнага і дакладнага высвятлення з прыцягненнем новых крыніц і выкарыстаннем новых «празрыстых» методык даследчыцкіх падлікаў.

### § 4. Перыяд існавання Літоўска-Беларускай ССР і прычыны яе ліквідацыі

Да важных пытанняў гісторыі Літоўска-Беларускай ССР, якія працяглы час заставаліся спрэчнымі ў айчынай і замежнай гістарыяграфіі, адносяцца і такія аспекты, як перыяд існавання ЛітБела і прычыны ліквідацыі аб'яднанай рэспублікі. Яны ўзніклі ў навукоўцаў яшчэ ў пачатку 20-х гадоў і сталі прадметам бесперапынных дыскусій. Адназначнага адказу на іх, які быў бы агульнапрынятым у колах беларускіх гісторыкаў, няма і сёння. Між тым, як справядліва заўважыў В. А. Круталевіч, з навукова абгрунтаваным вызначэннем перыяда існавання ЛітБела звязана разгранічэнне этапаў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі і Літве ў 1919 – 1920 гадах, тлумачэнне дыпламатычных акцый РСФСР, накіраваных на ўстанаўленне мірных адносін з Польшчай і Літоўскай рэспублікай.[186] Са свайго боку адзначым, што вызначэнне тэрміну існавання Літоўска-Беларускай ССР мае прынцыпова важнае значэнне не толькі для перыядызацыі гісторыі беларускай рэспублікі на этапе яе дзяржаўнага станаўлення, але і для глыбокага і ўсебаковага яе даследавання і выкладання ў сярэдняй і вышэйшай школе.

Адным з першых гісторыкаў Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі, актыўным яе арганізатарам і ўдзельнікам нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на савецкай аснове быў В. Г. Кнорын. Яго пяру належыць шэраг публікацый па этай тэматыцы, якія былі напісаны па свежых слядах адбыўшыхся падзей. Так, у артыкуле "Восемь месяцев Советской Белоруссии", які быў напісаны ў верасні – кастрычніку 1919 г. і друкаваўся ў газеце "Звязда"[187] і зборніку дакументаў і ўспамінаў [188], кіраўнік беларускіх камуністаў у агульнай форме выказаў свае

[184] Круталевіч В. А., Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.). – С. 59.
[185] История Литовской ССР (с древнейших времен до наших дней). – С. 321.
[186] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1999. – С. 156.
[187] Звезда. – 1919. – 17, 24 сентября; 18, 19 октября.
[188] Кастрычнік на Беларусі: Зборнік дакументаў і ўспамінаў. – Мн., 1927. – С. 280-294. Гэты артыкул надрукаваны і ў кнізе выбраных твораў В. Г. Кнорына. (Гл.: Избранные статьи и речи. – Мн., 1990. – С. 42-63).

меркаванні і аб прычынах аб'яднання Беларусі і Літвы, і аб асноўных этапах існавання адзінай рэспублікі. На яго погляд, ЛітБел у першы, віленскі перыяд свайго існавання меў сапраўдныя прызнакі самастойнага дзяржаўнага жыцця, а ў другім перыядзе, мінскім, Літоўска-Беларуская ССР "падпарадкоўваючы ўсю сваю работу задачам вайны і абароны, у сувязі з абвешчанай цэнтралізацыяй ваеннага камандавання і ваеннага ўпраўлення, **губляла сваю прытворную незалежнасць** [падкрэслена аўарамі. – Л. М., У. М.] і станавілася фактычна часткай РСФСР адміністрацыйна падпарадкаванаю Маскве нароўні з астатнімі губернямі".[189]

З кантэкста разважанняў В. Г. Кнорына выходзіла, што ЛітБел перастала існаваць ужо летам 1919 г. Гэта была першая гістарыяграфічная ацэнка тэрміну існавання савецкай рэспублікі Літвы і Беларусі.

Па сутнасці яна была падтрымана і ў гістарычным нарысе аб БССР, які надрукаваны ў калектыўнай працы, выдадзенай да дзесяцігоддзя Кастрычніцай рэвалюцыі.[190] У ім ўказвалася, што "27 лютага 1919 г. у Вільні на ўрачыстым пасяджэнні ЦВК Літвы і Беларусі была абвешчана Літоўска-Беларуская Савецкая Рэспубліка... Аднак перыяд незалежнай Савецкай Беларусі і аб'яднанай Літоўска-Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі быў вельмі непрацяглы."[191]

Але з сярэдзіны 20-х гадоў у навуковай літаратуры ўсталяваўся новы погляд на тэрмін існавання ЛітБела. Так, аналіз артыкула У. М. Ігнатоўскага – аднаго з вядучых беларускіх гісторыкаў таго часу – дазваляе заключыць, што аўтар звязваў факт ліквідацыі Літоўска-Беларускай рэспублікі з другім абвяшчэннем БССР 31 ліпеня 1920 г.[192]

У каментарыях да рэзалюцый Другой канферэнцыі Кампартыі Літвы і Заходняй Беларусі (2-4 лютага 1919 г.), апублікаваных ў зборніку дакументаў Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі, які выйшаў у свет у 1934 г., адзначалася, што Літоўска-Беларуская ССР існавала да сярэдзіны 1920 г.[193] Такім чынам гэтым каментарыям быў пакладзены пачатак шматгадовай дыскусіі аб тэрміне існавання ЛітБел ССР і прычынах яе ліквідацыі.

Дарэчы памылковае сцвярджэнне аб тым, што ЛітБел ССР была абвешчана 27 лютага 1919 г. сустракаецца ў шмат якіх і нават навейшых публікацыях. У свой час У. М. Ігнатоўскі таксама лічыў, што Цэнтральныя выканаўчыя камітэты Беларусі і Літвы "на ўрачыстым пасяджэнні вынеслі пастанову і абвясцілі Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі".[194] Гэты тэзіс аб часе абвяшчэння ЛітБела падтрымалі С. П. Маргунскі, І. П. Ламака, В. І. Талкачоў А. Ф. Вішнеўскі і І. А. Саракавік, П. І Брыгадзін і У. Ф. Ладысеў і іншыя даследчыкі.[195] Як убачым з далейшага гістарыяграфічнага агляду, такое

[189] Кнорин В. Г. Избранные статьи и речи. – С. 47.

[190] Белорусская Советская Социалистическая республика. – Мн., 1927. – 528 с.

[191] Там жа. – С. 40.

[192] Ігнатоўскі У. Камуністычная партыя Беларусі і беларускае нацыянальнае пытанне // Беларусь Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху. – Мн., 1924. – С. 229-242.

[193] КП(б) Б у рэзалюцыях. – Ч. 1 (1903 – 1921 гг.) / Падрых. да друку Ю. Майзэль; рэдактар А. Зюзькоў – Мн., 1934 – С. 131.

[194] Ігнатоўскі У. Вялікі Кастрычнік на Беларусі (X, 1917 – 11.VII, 1920) // Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху. – Мн., 1924. – С. 206.

[195] Маргунский С. П. Государственное строительство Белорусской ССР на первом этапе ее развития. – Мн., 1953. – С. 161; Ломако И. П. Образование Литовско-Белорусской ССР и борьба трудящихся республики за защиту Советской власти // Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов. – Мн., 1981. – С. 63; Талкачоў В. І. Цяжкі студзень 1919-га... Да пытання аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР // Беларуская думка. – 1994. – № 1. – С. 69; Вішнеўскі А. Ф., Саракавік І. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Некаторыя пытанні і адказы. – Мн., 1997. – С. 70; Ладысеў У. Ф. Брыгадзін П. І. На пераломе эпох: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1999 – С. 61; Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917 – 1939 гг.). – Мн., 2003. – С. 112

заключэнне даследчыкаў з'яўляецца не зусім карэктным і дакладным. У гэтай сувязі адзначым, што правільным уяўляецца сцвярджэнне В. А. Круталевіча.

Другім з навукоўцаў, хто вызначаў час існавання Літоўска-Беларускай ССР да восені 1919 г. і паспрабаваў назваць прычыны яе ліквідацыі, быў М. А. Карнатоўскі.[196] У назве вельмі грунтоўнага па тых часах артыкула пазначаны тэрмін існавання ЛітБела – 1919 г. Але больш дакладнай даты, якая завяршыла не працяглае існаванне адзінай дзяржавы двух народаў, аўтар не назваў. Толькі аналіз тэкста артыкула і тых фактаў і падзей, якія ў ім прыведзены дазваляе канкрэтызаваць тэрмін ліквідацыі Літоўска-Беларускай ССР летам 1919 г. У заключэнні свайго артыкула М. А. Карнатоўскі зрабіў такі вывад: "Літоўска-Беларуская рэспубліка пала пад націскам узброеных сіл буржуазна-памешчыцкай Польшчы, падтрыманай англа-французкім імперыялізмам і ўсімі ўнутранымі контррэвалюцыйнымі элементамі".[197] Такім чынам, прычыну ліквідацыі ЛітБела гісторык бачыў у захопе яе тэрыторыі польскімі акупантамі.

Гэтую хоць і не зусім выразную дацыроўку з цягам часу гісторыкі пачалі ўдакладняць. Так, у рэдакцыйным артыкуле аб Літоўска-Беларускай рэспубліцы, змешчаным у "Большой Советской Энциклопедии" гаварылася наступнае: " З заняццем белапалякамі ў ліпені 1919 г. Мінска і акупацыяй імі тэрыторыі Беларусі, Л.-Б.р. [Літоўска-Беларуская рэспубліка. – Л. М., У. М.] спыніла сваё існаванне".[198]

Цікава адзначыць, што некаторыя гісторыкі, у тым ліку і спецыялісты па гісторыі дзяржавы і права, – А. М. Андрэеў, Н. В. Каменская, С. П. Маргунскі і іншыя – сутыкнуўшыся з супярэчнымі вызначэннямі тэрміна існавання Літоўска-Беларускай ССР і прычынамі яе ліквідацыі, у сваіх працах увогуле абыйшлі гэтыя пытанні.[199] Такая пазіцыя тым больш не зразумелая і дзіўная, таму што даследчыкі ўдзялілі значную ўвагу раскрыццю прычын і механізма абвяшчэння ЛітБела, у навуковы ўжытак увялі новыя фактычныя звесткі і ў цэлым больш поўна аднавілі карціну існавання аб'яднанай рэспублікі.

У пачатку 60-х гадоў беларускія даследчыкі выдалі абагульняючыя працы па гісторыі Беларусі і Камуністычнай партыі рэспублікі, у якіх былі акамуляваны дасягненні айчыннай гістарыяграфіі на той час. У кнізе па гісторыі Кампартыі Беларусі апошняя дата існавання ЛітБела пазначана 19 ліпеня 1919 г., гэта дзень, калі адбылося пасяджэнне ўрада Літвы і Беларусі, на якім было прынята рашэнне "перадаць усю паўнату ўлады на свабоднай ад акупантаў частцы БССР Мінскаму губернскаму ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту."[200]

---

[196] Корнатовский Н. А. Литовско-Белорусская ССР (1919 г.) // Учёные записки ЛГУ. – 1940. – Вып. 7. – № 67. – С. 139-174.

[197] Там жа. – С. 172

[198] БСЭ. – 2-е изд. – М., 1954. – Т. 25. – С. 278.
У энцыклапедычным артыкуле не дакладна ўказана дата захопу польскімі войскамі Мінска. Ён быў акупіраваны палякамі 8 жніўня 1919 г. Таксама была зроблена памылка і ў дацыроўцы аб'яднанага пасяджэння ЦВК Беларусі і Літвы – 28 лютага 1919 г.

[199] Каменская Н. В. Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. – Мн., 1946. – 169 с.; яна ж. Образование Белорусского Советского государства. – Мн., 1948. – 156 с.; яна ж. Вялікая Кастрычніцкая Сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР. – Мн., 1954. – 184 с.; яна ж. Первые социалистические преобразования в Белоруссии (25 октября 1917 г. – июль 1918 г.). – Мн., 1957. – 279 с.; Андреев А. М. Борьба литовского народа за Советскую власть 1918 – 1919 гг. – М., 1954. – 164 с.; Маргунский С. П. Государственное строительство Белорусской ССР на первом этапе её развития. – Мн., 1953. – 113 с.; ён жа. Создание и упрочение белорусской государственности (1917 – 1925 ). – Мн., 1958. – 259 с.; Гісторыя Беларускай ССР. – Т. 2. – Мн., 1958. – 662 с. (аўтар главы Н. В. Каменская).

[200] Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. – Ч. 1 (1883 – 1920 гг.). – Мн., 1961. – С. 370. Гэтае палажэнне аўтэнтычна было замацавана і ў другім выданні першай часткі "Очерков" (Мн., 1968. – С. 456).

У другім томе "Истории Белорусской ССР" (Мн., 1961. С. 141) тэрмін існавання Літоўска-Беларускай рэспублікі абмежаваны 17 ліпеня 1919 г., гэта значыць датай, калі на аб'яднаным пасяджэнні ЦВК ЛітБела і Мінскага Савета было прынята рашэнне аб ліквідацыі Савета Абароны ЛітБел ССР. Зыходзячы з канкрэтнай абстаноўкі (акупацыя польскімі войскамі Літвы і Беларусі), – гаварылася ў главе абагульняючай працы, аўтарам якой з'яўлялася Н. В. Каменская, – урад ЛітБела спыніў сваю дзейнасць. Уся ўлада на свабоднай ад польскіх акупантаў тэрыторыі Беларусі перайшла да Мінскага губернскага ваеннарэвалюцыйнага камітэта.[201] У сумесным нарысе Н. В. Каменскай і М. Я. Шкляра ўдакладняецца, што на тым жа пасяджэнні было разгледжана пытанне "Аб карэнным змяненні ўнутранай арганізацыі кіравання нашай рэспублікі". Адпаведна з ім з 25 ліпеня 1919 г. народныя камісарыяты ЛіБ ССР былі перайменаваны ў адпаведныя аддзелы Мінгубрэўкома. Большая частка супрацоўнікаў апарата ўрада ЛітБела і наркаматаў пайшла на фронт.[202] З гэтага вынікала, што ЦВК практычна існаваць больш не збіраўся.

Такія палажэнні і вывады паспрабавала абвергнуць Я. Н. Шкляр у спецыяльнай манаграфіі, у якой на пачатак 60-х гадоў найбольш грунтоўна і ўсебакова, на значным новым фактычным матэрыяле архіваў раскрывалася гісторыя ЛітБела.[203] Сама назва кнігі вызначала храналогію існавання ЛітБела – 1919 – 1920 гады. Аўтар адзначыла, што ў працах М. А. Карнатоўскага і А. М. Андрэева былі "дапушчаны сур'ёзныя скажэнні гісторыі барацьбы працоўных Літоўска-Беларускай ССР з замежнымі інтэрвентамі і ўнутранай контррэвалюцыяй. У гэтых і іншых работах сцвярджалася, што Літоўска-Беларуская ССР існавала да ліпеня 1919 г."[204] Я. Н. Шкляр пашырыла час існавання ЛітБел ССР да ліпеня 1920 г.[205] У манаграфіі яна прывяла некаторыя факты і аргументы на карысць такога заключэння. На яе думку, існаванне ЛітБела да ліпеня 1920 г. пацвярджаюць такія дакументы, як справаздача ЦК КП(б)Б Трэцяму з'езду Кампартыі Беларусі (22-25 лістапада 1920 г.), кароткая справаздача аб дзейнасці загранічнага бюро ЦК Камуністычнай партыі Літвы і Беларусі і некаторыя іншыя дакументы і матэрыялы, якія яна прывяла ў сваёй манаграфіі. Гэтыя разважанні Я. Н. Шкляр энергічна падтрымаў у разгорнутай і станоўчай рэцэнзіі на яе манаграфію вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС доктар гістарычных навук М. В. Іскраў.[206] Больш таго, паколькі Я. Н. Шкляр не называла "дакладнай даты", то за яе гэта зрабіў рэцэнзент. "Нам здаецца, – пісаў М. В. Іскраў, – што гэтай датай з'яўляецца 31 ліпеня 1920 г., калі была прынята "Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі". Улічваючы тое, – працягваў рэцэнзент, – што існуюць дакументы аб утварэнні Літоўска-Беларускай ССР ад 27 лютага 1919 г.[207], аб другім абвяшчэнні БССР ад 31 ліпеня 1920 г. і адсутнічае дакумент аб ліквідацыі ЛітБела ў ліпені 1919 г. (наадварот, ёсць дакументы аб

[201] История Белорусской ССР. – Мн., 1961. – Т. 2. – С. 141.
[202] Каменская Н. В., Шкляр М. Е. Боевой отряд КПСС. – Мн., 1963. – С. 97.
[203] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней революцией (1919 – 1920 гг.). – Мн., 1962. – 178 с.
[204] Там жа. – С. 9
[205] Там жа.
[206] Искров М. В. Исследование по истории Литовско-Белорусской ССР // Вопросы истории КПСС. – 1962. – № 6. – С. 187-191.
[207] Дакументаў "аб утварэнні ЛітБела" ад 27 лютага 1919 г. не існуе. У той дзень, як вядома, адбылося сумеснае пасяджэнне ЦВК БССР і ЦВК ЛітССР і былі абраны ЦВК Літоўска-Беларускай рэспублікі і яе ўрад – СНК ЛітБел ССР.

несвоечасовасці гэтай ліквідацыі ў ліпені 1919 г.), вынікае адзін вывад: Літоўска-Беларуская рэспубліка існавала з лютага 1919 г. да 31 ліпеня 1920 г.", – заключыў М. В. Іскраў.[208] Такі пункт гледжання быў зафіксаваны ў восьмым томе «Советской исторической энциклопедии» – у артыкуле, аўтарам якога з'яўлялася Я. Н. Шкляр.[209]

Але з довадамі Я. Н. Шкляр і М. В. Іскрава не ўсе даследчыкі літбелаўскай праблематыкі пагадзіліся.

Першым з гісторыкаў, хто ўступіў у публічную палеміку з Я. Н. Шкляр, быў літоўскі даследчык К. Навіцкас. У сваёй доктарскай дысертацыі ён сцвярджаў, што "ЛітБел існавала толькі да канца лета 1919 г., г. зн. да падаўлення пралетарскай рэвалюцыі ў Літве".[210] Моцным і пераканаўчым аргументам, які пацвярджаў яго вывад, з'яўляўся факт прапановы Савецкай Расіі буржуазнаму ўраду Літвы 11 верасня 1919 г. пачаць мірныя перагаворы.[211] На яго думку, гэтая прапанова азначала, што Савецкі ўрад ўжо фактычна прызнаў буржуазную дзяржаўнасць Літвы. "Тым больш не можа быць і гаворкі аб існаванні ЛітБела да канца ліпеня 1920 г., асабліва пасля таго, як 12 ліпеня 1920 г. урад РСФСР падпісаў савецка-літоўскі мірны дагавор і гэтым дакументам юрыдычна прызнаў буржуазную Літву", – пісаў К. Навіцкас.[212]

Да вываду аб тым, што літбелаўская рэспубліка спыніла існаванне ў ліпені 1919 г. прыйшоў і беларускі гісторык дзяржавы і права В. А. Круталевіч у артыкуле, які быў надрукаваны ў маскоўскім гісторыка-прававым часопісе.[213] Гэты факт ён звязваў з тым, што ў той час "большая частка тэрыторыі рэспублікі была занята польскімі войскамі і яна "самаліквідавалася". Цэнтральныя органы былі распушчаны, – адзначыў ён, – улада на неакупаванай тэрыторыі была перададзена Мінскаму губернскаму рэўкому. У верасні быў ліквідаваны і Мінгубрэўком, а яго аддзелы сталі аддзеламі ліквідацыйнай камісіі ЛітБела, якая знаходзілася ў Смаленску[214].

Тэзіс аб тым, што Літоўска-Беларуская ССР спыніла існаванне ў ліпені 1919 г. В. А. Круталевіч пацвердзіў і значна пазней, калі выдаў другую грунтоўную кнігу аб нараджэнні Беларусскай ССР.[215] Як і ў вышэйназваным артыкуле ён паўтарыў свой вывад аб тым, што "ЛітБел самаліквідавалася ў ліпені 1919 г., большая частка тэрыторыі якой была захоплена Польшчай".[216] У адрозненне ад іншых даследчыкаў В. А. Круталевіч свядома акцэнтаваў увагу на

[208] Искров М. В. Исследование по истории Литовско-Белорусской ССР. – С. 190.
[209] Литовско-Белорусская Советская Социалистическая Республика // СИЭ. – Т. 8. – М., 1965. – С. 736.
[210] Навицкас К. Роль Советского Союза в деле защиты жизненно национальных интересов литовского народа в 1917 – 1940 гг.: Автореф. докт. дис. – Вильнюс, 1965. – С. 9.
[211] У аўтарэфераце К. Навіцкаса прапанова ўрада РСФСР буржуазнаму ўраду Літвы пачаць мірныя перагаворы памылкова даціравана 13 верасня 1919 г. (Там жа)
Рашэнне аб прапанове міра Літве і Латвіі Палітбюро ЦК РКП(б) прыняло 6 верасня 1919 г., а 11 верасня яшчэ раз разгледзела гэтае пытанне. (Гл.: Политбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б). Повестки дня заседаний. 1919 – 1952. Каталог. – Т. 1 (1919 – 1929). – М., 2000. – С. 40). Гэтай датай – 13 верасня 1919. – памылкова пазначана нота Савецкага ўрада ўраду Літвы з прапановай пачаць мірныя перагаворы, якая надрукавана ў зборніку дакументаў "Борьба за Советскую власть в Литве (1918 – 1920 гг.)". – С. 329.
[212] Навицкас К. Роль Советского Союза в деле защиты жизненно национальных интересов литовского народа... – С. 9.
[213] Круталевич В. А. Становление национальной государственности белорусского народа // Советское государство и право. – 1967. – № 12. – С. 49-57.
[214] Там жа. – С. 52.
Правільная назва камісіі – "Ліквідацыйная камісія эвакуіраваных устаноў Літоўска-Беларускай ССР".
[215] Круталевич В. А. Рождение Белорусской Советской Республики: Провозглашение республики. Развертывание национально-государственного строительства (Ноябрь 1918 г. – февраль 1919 г.). – Мн., 1979. – 336 с.
[216] Там жа. – С. 326.

"самаліквідацыі" рэспублікі, а не спыненні яе дзейнасці ў ліпені 1919 г. Гэта быў новы аспект у трактоўцы тэрміна і прычын ліквідацыі ЛітБела.

Такім чынам, і М. А. Карнатоўскі, і Н. В. Каменская, і В. А Круталевіч, і К. Навіцкас і іншыя даследчыкі пры вызначэнні тэрміну існавання Літоўска-Беларускай ССР зыходзілі з факта акупацыі яе тэрыторыі. "Аднак падобны вывад не стасуецца з сучаснай міжнароднаправавой тэорыяй і практыкай", – уступіў у палеміку беларускі гісторык права Ю. П. Броўка,[217] які вельмі энергічна падтрымаў пазіцыю Я. Н. Шкляр.

Для таго, каб абвергнуць вывады сваіх апанентаў, ён выкарыстаў наступныя логіку разважанняў і аргументацыю. З'яўляецца агульнапрызнаным – пісаў Ю. П. Броўка, – што акупацыя нават ўсёй тэрыторыі дзяржавы не вядзе аўтаматычна да ліквідацыі самой дзяржавы. Гэтае палажэнне не выклікае сумненняў не толькі ў прадстаўнікоў савецкай дактрыны міжнароднага права але і ў большасці замежных аўтараў. Так, вядомы аўстрыйскі юрыст-міжнароднік А. Фердросс пісаў: "Нават захоп праціўнікам усёй яе [дзяржавы. – Л. М., У. М.] тэрыторыі ("devellatio") сам па сабе не спыняе існавання пераможанай дзяржавы, калі яе працягваюць абараняць саюзнікі ці перамогшая краіна не мае намеру анексіраваць пераможаную".[218]

Народы акупаванай Літоўска-Беларускай ССР, – працягваў свае разважанні Ю. П. Броўка, – вялі гераічную барацьбу з захопнікамі. Паўсюдна на акупіраванай тэрыторыі ўзнікалі партызанскія атрады. Баявыя часці рэспублікі, якія аб'ядналіся з войскамі незалежных савецкіх рэспублік у адзіную Чырвоную Армію, адступілі на тэрыторыю саюзнай РСФСР, "адкуль працягвалі наносіць сакрушальныя ўдары праціўніку". "Пагэтаму акупацыю тэрыторый Беларусі і Літвы, – зрабіў лагічны вывад даследчык, – нельга разглядаць у якасці факта роўназначнага спыненню існавання Літоўска-Беларускай ССР".[219]

Цікавымі і заслугоўваючымі ўвагі ўяўляюцца нам і іншыя разважанні і аргументацыя Ю. П. Броўкі на гэты конт. Што ж тычыцца так званай "самаліквідацыі" ўрада Літоўска-Беларускай ССР, то, – на думку даследчыка, – "разглядаючы яго ў свеце асноўных прынцыпаў канстытуцыйнага права ЛітБел ССР,[220] неабходна прызнаць, што ў ліпені 1919 г. быў ліквідаваны не ўрад Літоўска-Беларускай ССР, а толькі ўрадавы апарат, існаванне якога аказалася немагчымым у сувязі з вострым недахопам кадраў і неабходнасцю сканцэнтраваць усе сілы для абароны рэспублікі".[221] Урадавыя функцыі часова былі перададзены Мінскаму губрэўкаму, які з'яўляўся дзяржаўным органам Літоўска-Беларускай ССР і падпарадкоўваўся ЦК КП(б) ЛіБ. Больш таго, на

---

[217] Бровка Ю. П. Международная правосубъектность БССР. – Мн., 1967. – С. 19.

[218] Фердросс А. Международное право. – М., 1959. – С. 233.

Такую ж думку выказваў і Л. Опенгейм: "Нават захоп усёй непрыяцельскай тэрыторыі не абавязкова азначае пакарэнне, таму што ў вайне, у якой удзельнічаюць больш двух ваюючых дзяржаў, войскі адносна з ваюючых могуць эвакуіравацца з сваей уласнай краіны і далучыцца да арміі саюзніка. Узброеная барацьба, такім чынам, будзе працягвацца, нягледзячы на тое, што тэрыторыя аднаго з саюзнікаў поўнасцю заваёвана". (Оппенгейм Л. Международное право / Под ред. Г. Лаутерпахта. – Т. 2. Полутом. 2. – М., 1950. – С. 138).

[219] Бровка Ю. П. Международная правосубъектность БССР. – С. 20.

[220] Трэба адзначыць, што Літоўска-Беларуская ССР не мела сваёй канстытуцыі. Падрыхтаваны праект яе не быў прыняты. У вельмі складанай ваенна-палітычнай абстаноўцы таго часу аказалася немагчыма склікаць і правесці Надзвычайны з'езд Саветаў Літоўска-Беларускай ССР, які быў прызначаны на 25 мая 1919 г. у Мінску.

Тэкст падрыхтаванага праекта Канстытуцыі рэспублікі захоўваецца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы і апублікаваны ў кнізе. (Гл.: Маргунский С. П. Государственное строительство Белорусской ССР на первом этапе её развития. – Мн., 1953. – С. 98-108).

[221] Бровка Ю. П. Международная правосубъектность БССР. – С. 20.

думку Ю. П. Броўкі, ніякай фармальнай дэкларацыі аб самароспуску ўрада ці аб адстаўцы асобных яго членаў не было зроблена. І старшыня СНК, і асобныя наркамы, знаходзячыся на розных камандных пасадах у дзеючай Чырвонай Арміі, захоўвалі свае паўнамоцтвы. І пры паляпшэнні абстаноўкі на фронце дзейнасць урада магла быць адноўлена без выдання якіх-небудзь асобых канстытуцыйных актаў.[222]

Мы так поўна і падрабязна выклалі погляды і разважанні Ю. П. Броўкі па пытаннях аб часе існавання Літоўска-Беларускай ССР і прычынах яго спынення таму, што ў навуковай літаратуры яны, нягледзячы на сваю фармальна-лагічную і абстрактна-юрыдычную доказнасць і знешнюю пераканаўчасць, большасцю даследчыкаў былі праігнараваны. І перш за ўсё гісторыкамі, некаторыя ж юрысты пагадзіліся з вывадамі свайго калегі.

Так, аўтары фундаментальнай працы па гісторыі савецкай дзяржавы і права ліквідацыю ЛітБела непасрэдна звязвалі з заключэннем расійска-літоўскага дагавора. Урад РСФСР, – пісалі беларускія гісторыкі права Г. І. Літвінава і С. П. Маргунскі, – быў вымушаны пайсці на перагаворы з буржуазным літоўскім урадам. Перагаворы спыніліся падпісаннем 12 ліпеня 1920 г. мірнага дагавора паміж Расіяй і буржуазнай Літвой. Літоўска-Беларуская Рэспубліка **фактычна** [падкрэслена аўтарамі. – Л. М., У. М.] спыніла сваё існаванне".[223]

Факту ліквідацыі ЛітБела С. П. Маргунскі надаваў прынцыпова важнае значэнне ў сувязі з прапанаванай ім перыядызацыяй дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі ў 1918 – 1922 гадах. У станаўленні беларускай савецкай дзяржаўнасці ад яе зараджэння да ўтварэння Саюза ССР ён выдзяліў тры этапы: 1) ад моманту абвяшчэння БССР да зліцця яе з Літоўскай ССР у адзіную рэспубліку; 2) Літбелаўскі перыяд з лютага 1919 г. да другога абвяшчэння БССР у канцы ліпеня 1920 г. і 3) ад аднаўлення Беларускай ССР у жніўні 1920 г. да яе ўступлення ў Саюз ССР у канцы снежня 1922 г.[224]

Прынцыпова іншую пазіцыю па гэтых пытаннях займалі літоўскія гісторыкі. Б. Ю. Вайткявічус, напрыклад, сцвярджаў, што Літоўска-Беларуская рэспубліка спыніла сваё існаванне ў пачатку верасня 1919 г. У якасці аргумента ён спасылаўся як быццам бы на факт, што зварот ЦВК ЛітБел ССР ад 1 верасня 1919 г. да працоўных гарадоў і вёсак рэспублікі, у якім канстатавалася паражэнне Савецкай улады, быў апошнім афіцыйным дакументам рэспублікі.[225] Урад Савецкай Расіі 11 верасня 1919 г. прапанаваў буржуазнаму ўраду Літвы пачаць мірныя перагаворы і тым самым фактычна прызнаў Літоўскую буржуазную дзяржаву. Як бачым, гэтую падзею Б. Ю. Вайткявічус, як і К. Навіцкас, лічыць пацвярджэннем таго, што ЛітБел да таго часу спыніла сваё існаванне.[226]

Літоўскі гісторык П. В. Віткаўскас, які спецыялізаваўся на вывучэнні праблем станаўленння літоўскай нацыянальнай дзяржаўнасці, нават доказваў, што "Літоўска-Беларуская ССР **фактычна** [падкрэслена аўтарамі. – Л. М., У. М.] перастала існаваць ужо 25 ліпеня 1919 г., гэта значыць у дзень самароспуска ўрада рэспублікі, а ў верасні 1919 г. яна спыніла сваё існаванне і юрыдычна".[227]

---

[222] Там жа.
[223] История Советского государства и права (1917 – 1920 гг.). – Кн. 1. – М., 1968. – С. 496.
[224] Маргунский С. П. Создание и развитие белорусской государственности 1917 – 1925 гг.: Автореф. дис. ... док. ист. наук. – Мн., 1969. – С. 7.
[225] Vaitkevičius B. Socialistine revoliucija Lietuvoje 1918 – 1919 metais. – Vilnius, 1967. – P. 657.
[226] Там жа.
[227] Vitkauskas P. Lietuvos Tarybu Respublikos Sukurimas 1918 – 1919 metais. – Vilnius, 1978. – P. 208-214.

Прааналізаваўшы заключэнні і вывады сваіх калег-даследчыкаў аб тэрміне існавання ЛітБел ССР і прычынах яе спынення, літоўскі гістарыёграф М. В. Тамашунас рэзюміраваў: "Пры ўсебаковым уліку наяўнага гістарычнага матэрыялу становіцца ясным, што Літоўска-Беларуская ССР спыніла сваё існаванне не ў 1920 г., а ўжо ў верасні 1919 г."[228] Пры гэтым, як сцвярджаў М. В. Тамашунас, даследаваннямі літоўскіх савецкіх гісторыкаў даказана, што Савецкую ўладу ў Літве ў 1919 г. падавілі натхняемыя імперыялістамі Антанты інтэрвенцыянісцкія войскі Германіі і Польшчы.[229]

Пры аналітычным разглядзе заключэнняў і ацэнак, якія зрабілі літоўскія гісторыкі ў канцы 70-х гадоў адносна тэрміну існавання Літоўска-Беларускай ССР і прычын яе ліквідацыі, нельга не звярнуць увагу і на тое, што ў гістарычную навуку яны ўвялі, ці дакладней – замацавалі, паняцці "фактычнага" і "юрыдычнага" спынення існавання дзяржавы. І як ні парадаксальна, такія "навукова-прававыя" ўдакладненні не дапамаглі даследчыкам канчаткова высвятліць складаныя і заблытаныя пытанні, а наадварот, падлілі масла ў агонь спрэчак, якія выйшлі на новы віток.

Трэба адзначыць, што пазіцыі і ацэнкі аб часе існавання ЛітБел ССР, якія выказалі літоўскія даследчыкі Б. Ю. Вайткявічус, П. В. Віткаўскас, К. Навіцкас і М. В. Тамашунас былі прыняты ў літоўскай гістарыяграфіі і ўвайшлі ў фундаментальныя абагульняючыя працы па гісторыі Літвы і Камуністычнай партыі рэспублікі.[230]

Так, у "Очерках" аўтары пісалі аб тым, што да верасня 1919 г. савецкая ўлада на тэрыторыі ЛіБ ССР была падаўлена. "Восенню 1919 г. у сілу склаўшыхся абставін, – чытаем у першым томе кнігі па гісторыі КПЛ, – Літоўска-Беларуская ССР спыніла існаванне».[231] Спыненне дзейнасці ЛіБ ССР восенню 1919 г. улічвалася і ў міжнародных адносінах. Нота ўрада РСФСР літоўскаму ўраду ад 11 верасня з прапановай пачаць перагаворы аб міры, лічаць аўтары "Очерков", з'явілася дакументам аб прызнанні de facto буржуазнай Літвы.[232]

Як непарушнае заключэнне аб тым, што да восені 1919 г. савецкая ўлада была падаўлена на ўсёй тэрыторыі Літоўска-Беларускай рэспублікі і яна спыніла існаванне, без якіх-небудзь аргументаў і новых фактаў замацавана і ў абагульняючай працы па гісторыі Літвы.[233]

Беларускія гісторыкі, якія ў ацэнцы складаных і супярэчлівых з'яў і падзей заўсёды былі надзвычай асцярожнымі, у калектыўных абагульняючых працах стараліся абыйсці спрэчныя і вострыя пытанні з гісторыі ЛітБела, каб не нанесці якой-небудзь шкоды непарушнай брацкай дружбе суседніх савецкіх народаў. Таму і дакладнага адказу на пытанні аб часе існавання ЛітБела і прычынах яго спынення няма ні ў другім выданні першай часткі нарысаў гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі (аўтар параграфа Н. В. Каменская)[234],

---

[228] Тамашюнас М. В. Исследование проблем по истории социалистической революции 1918 - 1919 гг. в Литве (обзор литературы за 1967 – 1978 гг.) // Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов: Матер. межресп. науч. конф., посвящ. 60-летию образов. Литовско-Белорусской ССР. – Мн., 1981. – С. 87.

[229] Там жа.

[230] Очерки истории Коммунистической партии Литвы. – Т. 1 (1887 – 1920 гг.). – Вильнюс, 1973. – 575 с.; История Литовской ССР (с древнейших времён до наших дней). – Вильнюс, 1978. – 676 с.

[231] Очерки истории Коммунистической партии Литвы. – С. 499-500.

[232] Там жа.

[233] История Литовской ССР. – С. 329.

[234] Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. – Ч. 1 (1883 – 1920 гг.). – Изд. 2-е. – Мн., 1968. – 505 с.; Гісторыя Беларускай ССР. – Т. 3 (1917 – 1937 гг.). – Мн., 1973. – 694 с.

ні ў пяцітомнай працы па гісторыі беларускага народа (аўтар параграфа таксама Н. В. Каменская). Калі ў гісторыка-партыйным выданні пра час існавання ўвогуле не гаворыцца, то ў "Гісторыі Беларускай ССР" на гэтае пытанне дадзены "навукова дыпламатычны" адказ: "Спыніў сваю дзейнасць Савет Абароны Літоўска-Беларускай ССР..., народныя камісарыяты рэспублікі былі перайменаваны ў аддзелы Мінскага губернскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта... Юрыдычна рэспубліка ЛітБел ССР працягвала існаваць".[235] Аўтара раздзела абагульняючай працы трэба разумець так, што **фактычна** [падкрэслена аўтарамі. – Л. М., У. М.] яе гісторыя спынілася летам 1919 г.

У сувязі з гэтым адзначым цікавы гістарыяграфічны факт. Я. Н. Шкляр, якая ў сваіх ранейшых публікацыях так актыўна і настойліва праводзіла думку аб тым, што Літоўска-Беларуская ССР спыніла існаванне летам 1920 г. – пасля падпісання расійска-літоўскага дагавора і другога абвяшчэння Беларускай Савецкай Рэспублікі, – па сутнасці адмовілася ад яе. Аб гэтым сведчыць артыкул даследчыцы ў шостым томе "Беларускай Савецкай Энцыклапедыі", у якім пытанні аб прычынах і часе ліквідацыі ЛітБел ССР абыйдзены.[236]

У кнізе беларускіх дзяржавазнаўцаў С. П. Маргунскага і Л. І. Кукраш гаворыцца аб тым, што падпісанне мірнага дагавора паміж Савецкай Расіяй і буржуазнай Літвой завяршылася "прызнаннем яе дзяржаўных граніц". Далей аўтары зрабілі такі вывад: "Літоўска-Беларуская Савецкая Рэспубліка **фактычна** [падкрэслена аўтарамі. – Л. М., У. М.] спыніла сваё існаванне"[237].

У 1983 г. З. В. Пятраўскас, кандыдат юрыдычных навук, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі, сацыялогіі і права АН Літоўскай ССР, у маскоўскім часопісе "Правоведение" апублікаваў спецыяльны артыкул, у якім паспрабаваў разабрацца з гэтымі няпростымі пытаннямі.[238] Ён катэгарычна не пагадзіўся з вывадамі Б. Ю. Вайткявічуса, П. В. Віткаўскаса, В. А. Круталевіча і К. Навіцкаса, назваўшы іх не аргументаванымі.[239] Логіка яго разважанняў, аргументацыі і доказаў наступная.

Па перакананню З. В. Пятраўскаса, саму па сябе прапанову адной дзяржавы другой "уступіць з ёю ў перагаворы нельга лічыць юрыдычным прызнаннем, хаця бы de facto." Паколькі далейшыя філасофска-юрыдычныя разважанні гісторыка права вельмі напышлівыя і каб не перакруціць яго вывады, прывядзем шматслойную цытату з названага артыкула. "Гісторыкі жа тлумачаць гэты тэрмін [маецца на ўвазе de facto. – Л. М., У. М.] не ў юрыдычным, а ў літаральным сэнсе, – пісаў З. В. Пятраўскас. – Між тым тэорыя і практыка міжнародных адносін прапанову ўступіць у перагаворы, не меўшую ніякіх юрыдычных натупстваў, не лічаць юрыдычным прызнаннем de facto ні дзяржавы, ні ўрада. Такім чынам, няма падставы лічыць гэты факт і адкліканнем з боку Савецкай Расіі прызнання Літоўска-Беларускай ССР de jure, якое заставалася ў сіле аж да падпісання 12 ліпеня 1920 г. мірнага дагавора з буржуазнаю Літвою".[240]

---

Гісторыя Беларускай ССР. – Т. 3. – С. 151.

Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // БелСЭ. – Т. 6. – Мн., 1972. – С. 396-397

Маргунский С. П., Кукреш Л. И. Интернациональное и национальное в государственном строительстве Белоруссии (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1978. – С. 86.

Пятраўскас З. В. О хронологических рамках существования Литовско-Белорусской ССР // Правоведение. – 1983. – № 5. – С. 88-92.

Там жа. – С. 91.

Там жа.

падмацаванне свайго вываду З. В. Пятраўскас спасылаўся на аўтарытэт спецыялістаў па міжнароднаму праву. (Гл.: Фельдман Д. И. Признание правительств в международном праве. – Казань.

Адвяргаючы палажэнне П. В. Віткаўскаса аб тым, што "быццам бы рэспубліка фактычна спыніла існаванне 25 ліпеня 1919 г., але фармальна працягвала існаваць да 11 верасня 1919 г.", З. В. Пятраўскас дэкларыраваў: "Тэорыя дзяржавы і права і міжнароднае права ня ведаюць ніякага "фармальнага" існавання дзяржавы".[241] Да таго ж факты, – пісаў літоўскі гісторык-юрыст, – што ўрад не функцыянуе або не існуе, ці дзяржава поўнасцю страціла тэрыторыю, не азначаюць, быццам дзяржава перастала існаваць юрыдычна. Так, у час другой сусветнай вайны некаторыя дзяржавы страцілі свае тэрыторыі і іх урады нейкі час увогуле не існавалі, аднак ніхто (акрамя Германіі, разумеецца) не сцвярджаў, што гэтыя дзяржавы не існуюць.[242]

На думку З. В. Пятраўскаса той факт, што большая частка тэрыторыі рэспублікі была акупавана Польшчай, з юрыдычнага пункту гледжання "не азначаў перахода суверэнітэта над яе тэрыторыяй да Польшчы."[243] Са спасылкай на курс міжнароднага права ён адзначыў: "Ваенная акупацыя – незаконны прававы акт і яна не змяняе суверэна".[244] Для аргументацыі свайго пункту гледжання З. В. Пятраўскас назваў некаторыя іншыя, але не істотныя факты. Напрыклад, са спасылкай на тагачасны ЦДАКР СССР аўтар прывёў сведчанне аб тым, што 19 мая 1920 г. Усерасійскі ЦВК, а 20 мая Наркамат па справах нацыянальнасцей у сувязі са змяненнямі міжнароднай абстаноўкі прынялі рашэнне ліквідаваць (да 1 ліпеня 1920 г.) Наркамат па справах Літвы і Беларусі. Урэшце-рэшт аўтар рэзюміраваў: "Такім чынам, канчатковым момантам існавання Літоўска-Беларускай ССР можна лічыць толькі ліпень 1920 г. – момант падпісання Маскоўскага дагавора паміж Савецкай Расіяй і буржуазнай Літвой і абвяшчэнне незалежнасці Беларускай ССР".[245] Такое ж сцвярджэнне па сутнасці без якіх-небудзь аргументаў падтрымаў і беларускі гісторык Э. Р. Іофэ.[246] Па меркаванню Я. А. Юхо Савецкая Расія прызнала ўрад буржуазнай Літвы "фактычна і юрыдычна" 19 лістапада 1919 г., калі паміж гэтымі рэспублікамі быў падпісаны дагавор аб абмене заложнікамі.[247]

Але да вываду З. В. Пятраўскаса прыслухаліся не ўсе беларускія, як, напэўна, і літоўскія гісторыкі. У грунтоўнай працы аб дзяржаўным самавызначэнні Беларусі акадэмік І. М. Ігнаценка зрабіў своеасабліва цікавае заключэнне – з падпісаннем расійска-літоўскага дагавора 12 ліпеня 1920 г. адбылося "юрыдычнае афармленне ліквідацыі Літоўска-Беларускай ССР, якая фактычна перастала існаваць у ліпені 1919 г."[248] Па сутнасці гэтая думка, хаця і менш выразна сфармуляваная, прыведзена І. М. Ігнаценкам, як аўтарам раздзела, і ў другой частцы "Нарысаў" па гісторыі Беларусі, падрыхтаваных

1961. – С. 53; Херцег И. Признание государств и правительств // Проблемы международного права. – М., 1961. – С. 320).

241 Там жа.

242 Там жа.

Пры гэтым аўтар спаслаўся на заключэнне спецыяліста па міжнароднаму праву. (Гл.: Chen Ti-Chiang. The International Law of Recognition. – L., 1951. – P. 291).

243 Там жа.

244 Курс международного права. – М., 1969. – Т. 5. – С. 350.

245 Пятраўскас З. В. О хронологических рамках существования Литовско-Белорусской ССР. – С. 91.

246 Иоффе Э. Из истории Литбела // Неман. – 1988. – № 11. – С. 168-169.

247 Юхо Я. Фарміраванне тэрыторыі беларусаў // Спадчына. – 1991. – № 6. – С. 10.

248 Игнатенко И. М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. – Мн., 1992. – С. 199. Гэты вывад падтрымліваюць некаторыя беларускія гісторыкі ў сваіх навейшых публікацыях. (Гл.: Рамановіч П. С. Палітычна-прававы статус ССРБ у 1920 – 1922 гг. // Государственность на Беларуси: Генезис и перспективы: Сб. матер. респуб. научно-практ. конф. 30 января 2002 г. В 2 ч. – Ч. 1 – Брест, 2002. – С. 140-141).

калектывам Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі[249], а таксама ў чацвёртым томе "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (аўтар артыкула А. В. Ціхаміраў).[250]

Аб юрыдычным спыненні існавання Літоўска-Беларускай ССР і аднаўленні незалежнай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі 31 ліпеня 1920 г. гаворыцца і ў калектыўнай працы, якая выйшла ў свет у канцы 90-х гадоў мінулага стагоддзя.[251] Але ў гэтым навуковым даследаванні "юрыдычнае спыненне" дзейнасці Літоўска-Беларускай ССР пазначана толькі датай другога абвяшчэння Беларускай Савецкай Рэспублікі.

У навейшых публікацыях беларускіх гісторыкаў з'явіліся новыя матывы і тлумачэнні факта і часу юрыдычнага спынення існавання Літоўска-Беларускай ССР. Так, Н. Глушакова ў цікавым артыкуле аб знешнепалітычнай арыентацыі партыі беларускіх эсэраў напісала літаральна наступнае: "Пасля падпісання 12 ліпеня 1920 г. дагавора ў сувязі з абвяшчэннем Літоўскай рэспублікі Літоўска-Беларуская Рэспубліка юрыдычна спыніла сваё існаванне".[252]

Спрэчныя пытанні з гісторыі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі ў 1917 – 1922 гадах, у тым ліку і ЛітБела найбольш усебакова і грунтоўна, на ўзроўні апошніх дасягненняў гістарычнай навукі раскрыў доктар юрыдычных навук, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі і права Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі В. А. Круталевіч у свёй капітальнай манаграфіі, за якую атрымаў Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь.[253] Праблемы гісторыі Літоўска-Беларускай ССР ад яе абвяшчэння да ліквідацыі аўтар разгледзіў у чатырох спецыяльных главах, якія, на наш погляд, маюць выразныя назвы – "Паварот у дзяржаўным будаўніцтве. Утварэнне Літоўска-Беларускай Савецкай Рэспублікі" (С. 88 -109), "Абарона Літоўска-Беларускай Рэспублікі" (С. 110-125), "Кіраванне, праватворчасць, палітычная сістэма ў Літоўска-Беларускай Рэспубліцы" (С. 126-144) і "Самаліквідацыя Літоўска-Беларускай Рэспублікі" (С. 145-156).

Дазволім сабе не згадзіцца з фармулёўкай "самаліквідацыя", паколькі роспуск урада быў ініцыяваны ў Маскве. 13 ліпеня 1919 г. І. В. Сталін у тэлеграме ў ЦК РКП(б) паставіў пытанне аб неабходнасці самароспуску Мінскага Савета Абароны і ўрада Літвы і Беларусі, што, на яго думку, павінна было служыць умацаванню фронта, скарачэнню попыта на работнікаў з цэнтру.[254] У каментарыі да гэтага дакумента аўтары публікацыі пісалі аб тым, што ў адказ ЦК РКП(б) паслаў ліст, у якім гаварылася аб мэтазгоднасці ліквідацыі Мінскага (?) Савета Абароны і апарату ЛіБ ССР. У той жа час прызнавалася несвоечасовасць ліквідацыі самога кіраўніцтва ЛітБела.[255] Па невядомай прычыне гэты дакумент не апублікаваны, не ўказваюцца датыроўка і месца яго захавання.

---

[249] Нарысы гісторыі Беларусі. У 2 ч. – Ч. 2 / М. П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. – Мн., 1995. – С. 70.

[250] Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // ЭГБ. – Т. 4. – Мн., 1997. – С. 383.
Цікава адзначыць, што ў энцыклапедычным артыкуле аб дэкларацыі пра другое абвяшчэнне БССР 31 ліпеня 1920 г., аўтарам якога з'яўляецца М. Ф. Шумейка, гаворыцца наступнае: "Прыняцце Дэкларацыі было абумоўлена вызваленнем Беларусі ад польскіх акупантаў і фактычнага (так у тэксце – Л. М., У. М.) скасавання Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі" (ЭГБ. – Т. 3. – Мн., 1996. – С. 336).

[251] Государственность Беларуси: Проблемы формирования в программах политических партий / В. К. Коршук, Р. П. Платонов, И. Ф. Романовский, Е. Г. Богданович. – Мн., 1999. – С. 73.

[252] Глушакова Н. Знешнепалітычныя арыентацыі Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (1918 – 1924 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1998. – № 3. – С. 30.

[253] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1999. – 388 с.

[254] Исторический архив. – 1957. – № 6. – С. 16.

[255] Там жа. – С. 34.

Паколькі ў сваіх папярэдніх працах В. А. Круталевіч па сутнасці дэкларатыўна абвяшчаў тэрмін існавання Літоўска-Беларускай ССР, то ў апошняй абагульняючай манаграфіі ён прывёў сістэму доказаў, пацвярджаючых пункт гледжання, які выказаў даследчык яшчэ больш трыццаці гадоў таму.[256]

У цэлым з пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя ў беларускай гістарычнай навуцы, як і ў літоўскай, з'явіліся першыя публікацыі, у якіх назіраўся адыход ад традыцыйнай схемы, давалася новая інтэрпрэтацыя, нават прынцыпова новая характарыстыка як прычын і мэтаў аб'яднання Беларусі і Літвы ў лютым 1919 г., так і матываў яе ліквідацыі і значэння ў гісторыі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі і ў Літве.[257]

Найбольш арыгінальныя і з некаторымі фактычнымі доказамі палажэнні і ацэнкі выказаў польскі гісторык беларускага паходжання Ю. Туронак. Ён пісаў аб тым, што 16 ліпеня 1919 г. ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі прыняў рашэнне аб роспуску ўрада ЛітБела, "што адпавядала фактычнай ліквідацыі гэтай рэспублікі". Пры гэтым даследчык падкрэсліў, што такое пытанне "вырашала Масква, а не мясцовыя органы Савецкай улады ці тым больш народ".[258] Адначасова ён выказаў меркаванне аб тым, што ўлады РСФСР не мелі магчымасці астанавіць наступленне палякаў і загадзя рыхтаваліся перадаць ім тыя часткі беларускай і літоўскай тэрыторый, якія ўваходзілі ў склад ЛітБела. Больш таго, польскі гісторык перакананы ў тым, што ўключэнне Віцебскай, Смаленскай і Магілеўскай губерняў у склад РСФСР у адпаведнасці з рашэннем ЦК РКП(б) ад 16 студзеня 1919 г. "адлюстроўвала намер Леніна аб раздзеле Беларусі паміж Польшчай і РСФСР".[259] Ліквідацыя ж рэспублікі павінна была аблегчыць перагаворы Ю. Мархлеўскага – прадстаўніка У. І. Леніна – з польскім бокам, якія пачаліся спачатку ў Белавежы, затым у Мікашэвічах.[260]

Калі б знікла з палітычнай карты Еўропы Літоўска-Беларуская рэспубліка, то Ю. Мархлеўскі ад імя ўрада РСФСР мог свабодна дамаўляцца з прадстаўнікамі Польшчы аб лёсе Беларусі і Літвы не як суверэнных дзяржаў ці самастойных рэспублік, а як тэрыторый з неакрэсленым дзяржаўным статусам. 4 красавіка 1920 г., пісаў далей Ю. Туронак, урад РСФСР **юрыдычна** [падкрэслена аўтарамі. – Л. М., У. М.] прызнаў Літоўскую рэспубліку, "такім чынам адмаўляючыся ад канцэпцыі літоўскай савецкай дзяржаўнасці". Пры гэтым ўрад РСФСР, ліквідуючы ЛітБел, прызнаў буржуазную дзяржаўнасць Літвы і не прызнаў беларускую нацыянальную дзяржаўнасць ні ў форме БССР, ні ў форме БНР.[261]

---

[256] Круталевич В. А. Становление национальной государственности белорусского народа // Советское государство и право. – 1967. – № 12. – С. 49-57.

[257] Туронак Ю. Нежаданая рэспубліка // Кантакт – 1990. – № 1. – С. 14-21; Платонов Р. П., Сташкевич Н. С. Тернистый путь к свободе… Образование БССР // Октябрь и судьбы политической оппозиции: совместное российско-белорусское исследование. В 3-х частях. – Ч. 2. – Гомель, 1993. – С. 126-191; Лойка Л., Лойка Т. Сучасны погляд на гісторыю Беларусі // Крыжовы шлях. Дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. – Мн., 1993. – С. 3-56; Талкачоў В. Цяжкі студзень 1919-га... Да пытання аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР // Беларуская думка. – 1994. – № 1. – С. 67-69; Грыцкевіч А. Беларуска-літоўскія дачыненні // Спадчына. – 1994. – № 5. – С. 58-63; Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. На пераломе эпох: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917 – 1920 гг.). – Мн., 1999. – 128 с.; Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. Паміж Усходам і Захадам. Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917 – 1939 гг.). – Мн., 2003. – 307 с.

[258] Туронак Ю. Нежаданая рэспубліка. – С. 15.

[259] Там жа. – С. 16.

[260] Тайныя перагаворы ў Белавежы паміж Ю. Мархлеўскім і прадстаўнікамі Ю. Пілсудскага А. Венцкоўскім, Е. Асмалоўскім і М. Касакоўскім пачаліся 29 ліпеня 1919 г. і з'явіліся працягам сустрэч прадстаўнікоў урадаў Польшчы і Расіі, якія адбыліся ў чэрвені ў Баранавічах. Перагаворы ў Мікашэвічах Ю. Мархлеўскі правёў у кастрычніку – лістападзе 1919 г. (Гл.: Sieradzki J. Bialowieża i Mikaszewiczy – mity i prawdy. – W-wa, 1959; Tajne rokowania polsko-radzieckie. Materialy archiwalne i dokumenty / Oprac. W. Gostyńska. – W-wa, 1986).

[261] Там жа.

Такім чынам, аналіз розных пунктаў гледжання на праблему аб тэрміне існавання Літоўска-Беларускай ССР і прычынах яе ліквідацыі дазваляе іх абагульніць і падвесці некаторыя асноўныя вынікі шматгадовым даследчыцкім дыскусіям.

**Першае.** Вызначэнне тэрміну існавання Літоўска-Беларускай ССР з'яўляецца важнай, прынцыповай метадалагічнай праблемай айчынных і літоўскіх гісторыкаў. Таму што яе навукова абгрунтаванае вырашэнне дазваляе даследчыкам выразна і аргументавана вызначыць этапы гісторыі станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці і беларускага, і літоўскага народаў, а, значыць, і садзейнічае паглыбленаму, грунтоўнаму і ўсебаковаму яе вырашэнню. Менавіта гэтыя абставіны і абумовілі гарачыя, а часам і непрымірымыя навуковыя спрэчкі, якія патрабавалі ад апанентаў выяўлення і аналізу новых фактаў, прывядзення больш дасканалых і пераканаўчых аргументаў і доказаў. Даследчыцкія дыскусіі, дзякуючы канструктыўным навуковым пошукам гісторыкаў, спецыялістаў па гісторыі права і дзяржавы, у цэлым аказаліся плённымі.

**Другое.** Пры вызначэнні тэрміну існавання Літоўска-Беларускай ССР і прычын яе ліквідацыі савецкія беларускія і літоўскія гісторыкі ў сваіх ацэнках і высновах былі абмежаваны ідэалагічнымі ўмовамі свайго часу. Яны не мелі, так сказаць, маральнага права крытыкаваць палітычныя рашэнні і заключэнні вышэйшых органаў Камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы і, у прыватнасці, па пытаннях і абвяшчэння ЛітБел ССР, і тэрміне існавання, і прычынах знікнення яе з палітычнай карты Еўропы. Безумоўнай, неаспрэчнай пасылкай, фундаментам такой пазіцыі гісторыкаў з'яўлялася ідэалагічная і палітычная догма, сутнасць якой заключалася ў тым, што ні рабіла ці тварыла Камуністычная партыя – усё гэта было гістарычна дальнабачным і адпавядала карэнным інтарэсам працоўных, іх інтэрнацыянальнаму згуртаванню ў барацьбе за светлую будучыню.

**Трэцяе.** Даследчыцкія ацэнкі вывучаемых амаль да канца 80-х гадоў праблем былі абмежаваны і магчымасцямі выкарыстання архіўных крыніц. Пагэтаму асноўныя палажэнні і вывады гісторыкаў фармуляваліся ў поўнай адпаведнасці з рашэннямі і пастановамі тагачасных партыйных і савецкіх інстанцый, якія былі апублікаваны ў перыядычным друку.

**Чацвёртае.** Пры агульнасці падыходаў савецкіх і літоўскіх гісторыкаў, абумоўленных патрабаваннем кіравацца прынцыпамі камуністычнай партыйнасці, іх пазіцыі ў ацэнцы тэрміну і прычын ліквідацыі Літоўска-Беларускай рэспублікі былі розныя. Літоўскія даследчыкі ўжо ў сярэдзіне 60-х гадоў прыйшлі да вываду, што ЛітБел спыніла існаванне ў канцы лета – пачатку восені 1919 г. І звязвалі гэты факт з поўнай акупацыяй тэрыторыі Літоўска-Беларускай ССР польскімі захопнікамі і прапановай 11 верасня 1919 г. урада РСФСР ураду буржуазнай Літвы ўступіць у перагаворы аб міры. Гэтае палажэнне стала агульнапрынятым сярод літоўскіх гісторыкаў і было замацавана ў абагульняючых працах па гісторыі Літвы і гістарыяграфічных публікацыях.

Айчынныя даследчыкі доўгі час хісталіся ў вызначэнні тэрміна існавання і прычын ліквідацыі ЛітБел ССР, нягледзячы на тое, што салідарную з літоўскімі гісторыкамі ацэнку гэтых праблем таксама выказаў у сярэдзіне 60-х гадоў і беларускі гісторык нацыянальнай дзяржаўнасці В. А. Круталевіч. Але ж беларускія навукоўцы ў ацэнцы гэтых падзей больш схільныя абапірацца

---

На самой справе ўрад РСФСР афіцыйна прызнаў незалежнасць Літоўскай рэспублікі нотай ад 2 красавіка 1920 г. (Гл.: Документы внешней политики. – М., 1958. – С. 711).

адначасова на дзве пасылкі: ЛітБел спыніла сваё існаванне фактычна летам – у пачатку восені 1919 г., а юрыдычна – пасля заключэння расійска-літоўскага дагавора 12 ліпеня 1920 г. Гэты дуалістычны вывад прыняты ў абагульняючых працах, розных вучэбных дапаможніках для вышэйшай і сярэдняй школы, а таксама ў "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі".

**Пятае і апошняе**. Усебаковы і ўважлівы аналіз айчыннай і даступнай літоўскай гістарыяграфіі, а таксама надрукаваных дакументаў і матэрыялаў дазваляе нам зрабіць адназначны і пераканаўчы вывад аб тым, што Літоўска-Беларуская ССР спыніла сваё існаванне і фактычна і юрыдычна ў пачатку верасня 1919 г. у сувязі з поўнай акупацыяй рэспублікі польскімі легіянерамі і фактычным прызнаннем буржуазнай Літвы з боку РСФСР, якое ўтрымлівалася ў ноце яе Наркамата замежных спраў ад 11 верасня 1919 г. з прапановай літоўскаму ўраду ўступіць у перагаворы аб заключэнні мірнага дагавора.

### § 5. Сацыяльна-эканамічная і культурная палітыка ўрада ЛітБела

Ці састаялася Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі як дзяржава? Даць аргументаваны адказ на гэтае пытанне дапаможа даследаванне дзейнасці ў сацыяльна-эканамічнай і культурнай сферах яе ўрадавых устаноў (ЦВК і Саўнаркама), мясцовых органаў савецкай улады і ЦК КП(б) Літвы і Беларусі ў лютым – верасні 1919 г. На жаль, асвятленне ўнутранай палітыкі ЛітБела, у параўнанні са знешнепалітычным аспектам яе гісторыі, комплексна не аналізавалася гісторыкамі.

На наш погляд, ЛітБел не паспела сфарміравацца як дзяржава з усёй атрыбутыкай сацыяльна-палітычнага інстытута такога кшталту: не былі дакладна вызначаны граніцы, праект Канстытуцыі ЛітБела, які быў падрыхтаваны на грунце Асноўнага закона РСФСР, так і не быў прыняты, Беларуска-літоўская армія праіснавала толькі тры месяцы. І самае галоўнае – тэрыторыя абвешчанай рэспублікі ў хуткім часе стала арэнай баявых дзеянняў польска-савецкай вайны. Гэтым можна растлумачыць тое, што ўнутраная палітыка ўрада ЛіБ ССР застаецца малавывучаным аспектам яе гісторыі.

Найбольшую зацікаўленасць у гісторыкаў і эканамістаў у час панавання марксісцка-ленінскай ідэалогіі выклікалі сацыяльна-эканамічныя новаўвядзенні Савецкай улады ў Літоўска-Беларускай рэспубліцы. Нешматлікія факты з навуковай літаратуры аб эканамічных мерапрыемствах у ЛітБеле сведчаць аб тым, што яны не мелі самастойнага зместу, а ў цэлым адпавядалі палітыцы, якую праводзіў урад Савецкай Расіі.

Так, на падставе дэкрэта СНК РСФСР ад 11 студзеня 1919 г. уводзілася развёрстка дзяржаўнай нарыхтоўкі хлеба і іншых прадуктаў для забяспячэння Чырвонай Арміі, рабочых і служачых дзяржаўнага апарата. І ў ацэнцы толькі гэтага факту гісторыкі разыходзяцца дыяметральна. Толькі гэтая мера магла ўратаваць насельніцтва ад голаду, – упэўнены І. І. Коўкель і Э. С. Ярмусік.[262] "Харчраскладка, якая ігнаравала інтарэсы сялянства, з'явілася прычынай голаду як у гарадах, так і сельскай мясцовасці", – гучыць у дысананс палажэнне І. М. Ігнаценкі ў "Нарысах гісторыі Беларусі".[263]

Прыняты пазней на аснове Канстытуцыі РСФСР 1918 г. Асноўны Закон БССР вызначыў галоўныя задачы на пераходны перыяд ад капіталізма да

---

[262] Ковкель И. И., Ярмусик Э. С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени. – Мн., 2000. – С. 357.

[263] Нарысы гісторыі Беларусі. У 2 ч. – Ч. 2 / М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. – Мн., 1995. – С. 75.

сацыялізму: ліквідацыю сацыяльнай няроўнасці, адмену прыватнай уласнасці на зямлю, лясы, нетры, воды, сродкі вытворчасці, пераход іх ў дзяржаўнае карыстанне. Праца была прызнана галоўным абавязкам грамадзян рэспублікі. Канстытуцыя зацвердзіла раўнапраўе прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, права на правядзенне сходаў і арганізацыю саюзаў, свабоду слова, друку, бясплатнае навучанне і медыцынскае абслугоўванне.

Прадэклараваныя прынцыпы былі ўзяты на ўзбраенне ўрадам і Кампартыяй ССР Літвы і Беларусі. Вялікую каштоўнасць для характарыстыкі іх дзейнасці прадстаўляюць апублікаваныя Я. Н. Шкляр, М. А. Карнатоўскім, А. І. Андрэевым і іншымі даследчыкамі канкрэтныя дадзеныя аб рашучых мерах па ліквідацыі разрухі ў прамысловасці і на транспарце, паляпшэнні ўмоў працы, забеспячэнні працоўных прадуктамі харчавання, арганізацыі медыцынскага і культурнага абслугоўвання, правядзенні фінансава-крэдытнай палітыкі, тавараабмене з Украінай і Савецкай Расіяй. Усе яны рэдка сустракаюцца ў навейшых абагульняючых працах па гісторыі Беларусі, але служаць доказам цеснай эканамічнай сувязі з РСФСР. Напрыклад, як падаюць у сумесным навукова-папулярным выданні І. І. Коўкель і Э. С. Ярмусік, акрамя тых сродкаў, якія былі атрыманы ад нацыяналізацыі прыватных банкаў і прадпрыемстваў, толькі за сакавік – ліпень 1919 г. Наркамфін РСФСР асігнаваў для народнай гаспадаркі ЛітБела 200 млн. рублёў, не ўлічваючы сродкаў іншых камісарыятаў.[264]

Традыцыйны сельскагаспадарчы характар эканомікі краю абумовіў увагу навукоўцаў да аграрных праблем яго гісторыі. Другі Усерасійскі з'езд Саветаў прыняў Дэкрэт аб зямлі і тым самым абвясціў канфіскацыю буйнога прыватнага землеўладання, нацыяналізацыю зямлі і ўраўняльнае яе размеркаванне.

Аграрныя пераўтварэнні Савецкай улады на тэрыторыі былой Мінскай губерні, якая ўваходзіла ў склад ЛітБела, знайшлі адлюстраванне ў даследаваннях А. І. Андрэева і М. А. Карнатоўскага.[265] Яны сцвярджалі, што ў Беларусі не было рэвалюцыйнага падзела зямлі, што дэкрэт аб сацыялізацыі не быў распаўсюджаны на тэрыторыю Беларусі, і таму ўраўняльнага размеркавання зямлі не існавала. Гэтыя заключэнні можна ў поўнай меры аднесці толькі да Мінскай губерні. У ёй значная частка канфіскаваных царкоўных, памешчыцкіх і іншых зямель, якія не ўвайшлі ў дзяржаўны фонд, была размеркавана сярод малазямельных сялян і сельскагаспадарчых рабочых.[266] У артыкуле М. А. Карнатоўскага паказаны галоўным чынам памылкі, якія дапускаліся ў вырашэнні зямельнага пытання. Адзначыўшы вялікую арганізацыйную работу партыйных органаў і Савецкай улады, аўтар разам з тым называў аграрную палітыку антыленінскай і антыбальшавіцкай. "Кіраўніцтва Літоўска-Беларускай рэспублікі, – сцвярджаў гісторык, – узяло абсалютна неправільны, антыленінскі курс пры вырашэнні аграрнага пытання... У выніку антыленінскай практыкі ў аграрным пытанні Савецкая ўлада не была падтрымана шырокімі масамі працоўнага сялянства. Гэта з'явілася адной з самых глыбокіх і сур'ёзных прычын унутранай неўстойлівасці Літоўска-

[264] Ковкель И. И., Ярмусик Э. С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени о наши дни. – С. 357.
[265] Корнатовский Н. А. Литовско-Белорусская ССР (1919). – Учёные зап. Ленинградского госуниверситета. Сер. ист. наук. – 1941. – Вып. 7.; Андреев А. И. Борьба литовского народа за Советскую власть 1918 – 1919. – М., 1954.
[266] Михнюк В. Н. Крестьянство на Беларуси на пути к социализму: Историографический очерк. – Мн., 1979. – С. 46.

Беларускай Савецкай рэспублікі".[267] Даследчык З. Серабранскі, у сваю чаргу, абвінавачваў кіраўніцтва ЦК КП(б) ЛіБ у меншавізме і "левым радзікалізме".[268] Гэтак жа аднабакова – у плане аналіза дапушчаных памылак – разглядаецца аграрная палітыка Кампартыі і ўрада ЛітБел і ў кнізе А. І. Андрэева.

На погляд літоўскага даследчыка Б. Ю. Вайткявічуса, які займаўся вывучэннем сацыялістычных пераўтварэнняў ў Літве ў 1918 – 1919 гадах, прычына гэтых памылак заключалася ў нязжытых да канца сацыял-дэмакратычных поглядах літоўскіх камуністаў. Кіраўніцтва рэспублікі выступала супраць падзелу былой памешчыцкай зямлі сярод бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак. Гэтая памылковая лінія, як сцвярджаў Б. Ю. Вайткявічус, вынікала з недаацэнкі ролі працоўнага сялянства ў пралетарскай рэвалюцыі. Таму ўрад ЛітБела не прытрымліваўся ленінскага палажэння аб неабходнасці пасля перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі перадачы часткі памешчыцкіх зямель у карыстанне сялянам. Гэта паслабіла пазіцыі Савецкай улады ў рэспубліцы.[269]

Улічваючы тыя абставіны, што Б. Ю. Вайткявічус даследаваў гісторыю аграрных пераўтварэнняў у ЛітБеле ў асноўным на матэрыялах Літвы, прадстаўлялася неабходным вывучыць гэтую тэму на матэрыялах Беларусі. Гісторыю здзяйснення зямельных нававядзенняў у Літоўска-Беларускай рэспубліцы праанalізавала ў сваёй грунтоўнай манаграфіі беларуская даследчыца Я. Н. Шкляр.

Я. Н. Шкляр, як і Б. Ю. Вайткявічус, адзначыла, што памылкі ў аграрнай палітыцы выклікалі вядомае незадавальненне сялян, якое выкарысталі ворагі Савецкай улады ў контррэвалюцыйных мэтах. Аднак аўтар непаслядоўна растлумачыла прычыны памылак. У адным выпадку яна гаварыла аб тым, што "многія павятовыя з'езды Саветаў Літоўска-Беларускай ССР, якія адбываліся ў пачатку 1919 г., выказаліся за ўтварэнне ў памешчыцкіх маёнтках саўгасаў", а "некаторыя сяляне нават адмаўляліся атрымаць у карыстанне памешчыцкую зямлю, баючыся новага вяртання памешчыкаў".[270] (Існуе таксама дакументальнае пацверджанне таго, што і да калгасаў, арганізаваных у памешчыцкіх маёнтках, у сялян былі негатыўныя адносіны – у іх бачылі былыя памешчыцкія эканоміі).[271]

У другім месцы сваей работы Я. Н. Шкляр сцвярджала, што ў прынятых рашэннях з'ездаў Саветаў "большасць сялян *патрабавала* [курсіў аўтараў. – Л. М., У. М.] надзялення іх памешчыцкай зямлёю, інвентаром".[272] На наш погляд, дэкларатыўным з'яўляецца і заключэнне аўтара аб тым, што сур'ёзныя памылкі пры вырашэнні аграрнага пытання ЛітБела, у значнай ступені тлумачыліся адсутнасцю дастатковага вопыта. Вядома ж, што ў здзяйсненні аграрных пераўтварэнняў у інтарэсах бедных слаёў насельніцтва вёскі яго не было і ў іншых партыйных арганізацый краіны. Я. Н. Шкляр паказала першыя мерапрыемствы ЦК КП(б) ЛіБ па выпраўленню памылак у аграрным пытанні, якія былі праведзены ў 1920 г.

---

[267] Корнатовский Н. А. Литовско-Беларусская ССР (1919). – С. 153.
[268] Коммунистический Интернационал. – 1932. – № 6. – С. 23.
[269] Вайткявичус Б. Ю. Социалистические преобразования в Литве в 1918 - 1919 гг. // История СССР. – 1958. – № 3. – С. 53-54; ён жа. Мероприятия Советской власти по осуществлению социалистических преобразований в Литве в 1918 – 1919 гг. 40 лет пролетарской революции в Литве. – Вильнюс, 1959. – С. 163-164.
[270] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919 – 1920 гг.). – Мн., 1962. – С. 73.
[271] Эканамічная гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік / Пад агульн. рэд. В. І. Галубовіча. – Мн., 1995. – С. 213.
[272] Там жа. - С. 83.

Вывучэнню аграрных пераўтварэнняў у Мінскай губерні ў 1919 – 1920 гадах значную ўвагу ўдзяліў і Б М Фіх. Пры характарыстыцы аграрнай палітыкі Кампартыі ЛітБела, аўтар таксама падкрэсліваў, што яна ўтрымлівала сур'ёзныя памылкі, была супярэчлівай і непаслядоўнай, але не была антыленінскай, антыбальшавіцкай ці меншавіцкай.[273] Аўтар паказаў самакрытычную ацэнку памылак у зямельным пытанні кіраўнікамі Літоўска-Беларускай рэспублікі. Пачатак афіцыйнаму выпраўленню гэтых памылак – надзяленню сялян зямлёй – быў пакладзены на пасяджэнні ЦК КП(б) ЛіБ 2 сакавіка 1920 г. Новы накірунак ў аграрнай палітыцы быў замацаваны ў "Тэзісах па аграрнаму пытанню", прынятых ЦК КП(б) ЛіБ 24 мая 1920 г. На думку Ф. Ф. Мухіна, менавіта з прыняцця гэтага дакумента пачалося на Беларусі практычнае ажыццяўленне ленінскага Дэкрэта аб зямлі.[274] Але ж лагічна заўважыць – ленінскі дэкрэт аб зямлі пачаў здзейсняцца ў Мінскай губерні адразу пасля Кастрычніцай рэвалюцыі, таму нельга памылкі ў аграрным пытанні, дапушчаныя кіраўніцтвам ССР ЛіБ, пашыраць на тэрыторыю Беларусі далітбелаўскага перыяда. Калі гаворка ішла аб утварэнні ЛітБела, прадстаўнікі БССР прапанавалі зацвердзіць двух народных камісараў па земляробству – асобна па Літве і па Беларусі. Гэта, маўляў, рабілася па той прычыне, што ў БССР ленінскі Дэкрэт аб зямлі праводзіўся ў жыццё больш паслядоўна, з перадачай канфіскаваных зямель сялянам.[275] Як бы там ні было, а насуперак патрабаванням Дэкрэта аб зямлі ўрад ЛітБел не надзяляў сялян канфіскаванай памешчыцкай зямлёй, а ўзяў курс на арганізацыю ў іх калектыўных форм землеўладкавання. І гэты факт з'яўляецца зараз агульнапрызнаным.[276]

Аспект правядзення калектывізацыі ў Літоўска-Беларускай ССР у складаных умовах ваеннага часу 1919 – 1920 гадоў адлюстраваны ў працах М. А. Карнатоўскага, А. І. Андрэева, Б. Ю. Вайткявічуса і Я. Н. Шкляр. Даследчыкі аднадушна прызналі, што першыя саўгасы і калгасы ўтвараліся, як правіла, у былых памешчыцкіх маёнтках, што стала асаблівасцю Беларусі, ў адрозненне ад іншых губерняў Расіі, дзе калектыўныя гаспадаркі былі арганізаваны на надзельнай зямлі. Так, дадзеныя Б. М. Фіха сведчаць, што ў Магілёўскай губерні ў маі 1919 г. з 225 калгасаў 75 % было ўтворана на памешчыцкай зямлі, 10 % – на дзяржаўнай, і толькі 15 % – на надзельнай.[277]

У постсавецкі час стала магчымым адкрыта заявіць, што створаныя калгасы былі нерэнтабельнымі, стратнымі.[278] Паспешна арганізаваныя саўгасы, ТОЗы, камуны і арцелі не апраўдалі надзей ні органаў улады, ні сялянства – не хапала цяглавай сілы, насення, спецыялістаў. Вясной 1919 г. была засеяна толькі палова калгасных зямель. Каб выправіць становішча летам 1919 г. кіраўніцтва ЛітБела пачало здаваць сялянам частку зямель у арэнду на льготных умовах, але вырашыць праблему не ўдалося.

У даследчыкаў існуе ўстойлівае меркаванне, што ўрад ЛітБела дабіўся пэўных поспехаў на ніве культурных пераўтварэнняў. Разрозненыя сведчанні

[273] Фих Б.М. Аграрная революция в Белоруссии (1917 – 1920). – Мн., 1966. – С. 252.
[274] Мухин Ф. Ф. КПБ в борьбе за осуществление в республике ленинского Декрета о земле как важнейшего средства укрепления союза рабочего класса и крестьянства (1921 – 1925): Автореф. дис. канд. ист. наук. – Мн., 1956. – С. 2
[275] Михнюк В. Н. Крестьянство Белоруссии на пути к социализму: Историографический очерк. – Мн., 1979. – С. 49
[276] Ковкель И. И, Ярмусик Э. С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени. – С. 358.
[277] Фих Б. М. Аграрная революция в Белоруссии. – С. 190.
[278] Ковкель И. И., Ярмусик Э. С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени. – С. 358; Эканамічная гісторыя Беларусі. – С. 213.

аб палітыцы ўрада ЛітБел ў сферы культуры сустракаюцца, як правіла, ў манаграфіях аб станаўленні беларускай дзяржаўнасці, даследаваннях культурнага развіцця ў 1917 – 1920 гадах[279], падручніках па гісторыі Беларусі і гісторыі культуры Беларусі.

Першай беларускай даследчыцай архіўных дакументаў і матэрыялаў фонда 804 ЦДАКР БССР Народнага камісарыята асветы ЛітБела стала Я. Н. Шкляр. Шмат увагі даследчыцай удзялялася апісанню прапагандысцкай дзейнасці ўрадавых устаноў, перш за ўсё камуністычных арганізацый. Так, для падрыхтоўкі партработнікаў пры ЦК КП(б) ЛіБ у Вільні была адчынена камуністычная школа (заняткі пачаліся з 15 красавіка 1919 г.), якая пасля акупацыі горада працягвала работу ў Мінске. Лекцыі ў школе чыталі В. С. Міцкявічус-Капсукас па гісторыі рабочага і сялянскага руху, К. Г. Цыхоўскі па зямельнай палітыцы, В. Г. Кнорын па палітэканоміцы і на іншыя. У чэрвені 1919 г. там праходзілі навучанне 130 курсантаў ад Мінскай, Мазырскай, Бабруйскай, Слуцкай, Гродзенскай, Нясвіжскай, Лунінецкай партыйных арганізацый.[280]

Пры партыйных камітэтах працавалі группы лектараў і агітатараў. Толькі пры Мінскім гаркаме партыі ў маі 1919 г. налічвалася да 60 лектараў і дакладчыкаў. Кожны тыдзень, па пятніцам, праводзіліся мітынгі ў рабочых раёнах, у гарнізоне, а кожны дзень – мітынгі на фабрыках, заводах, на чыгунке, у воінскіх часцях. Толькі ў маі 1919-га адбылося 50 мітынгаў на тэмы: "Што нясуць інтэрвенты і белагвардзейцы рабочым і сялянам?", "Абарона Мінска", "Чаму мы праходзім ваеннае навучанне", "Задачы камуністаў ў Чырвонай Арміі", "Барацьба з дзезерцірствам" і іншыя.[281] Арганізатары і прапагандысты ад ЦК КП(б) ЛіБ былі накіраваны ў паветы.

1 мая 1919 г. пачалася падрыхтоўка і правядзенне так званых "ударных" дзён і тыдняў. У сувязі з чым, у чэрвені было ўтворана бюро пад кіраўніцтвам А. Р. Чарвякова для правядзення "Дня савецкай прапаганды", а ў паветах былі арганізаваны камісіі. Сярод насельніцтва гучалі лекцыі "Тякучы момант", "Імперыялізм і грамадзянская вайна", "У плене белых", "Савецкая медыцына", "Задачы Чырвонай арміі", "Фінансавае пытанне" і іншыя. Ішла прапаганда дэкрэтаў урада.[282] Праводзілася работа па палітычнаму і культурнаму асветніцтву жанчын. У складзе ЦК КП(б) дзейнічаў аддзел работніц, а на месцах - камісіі па рабоце сярод работніц і сялянак. Так, 29 чэрвеня 1919 г. адбыўся мітынг работніц г. Мінска ў клубе імя К. Маркса, 30 чэрвеня – сход на тэму аб становішчы работніц у капіталістычным і камуністычным грамацтве, даклады з месцаў, аб ваенным вывучэнні работніц. 6 ліпеня 1919 г. сазваны мітынг работніц на тэму "Работніца ў тыле і на фронце".[283]

Дэкрэты і пастановы, накіраваныя на паляпшэнне культурнага становішча краю, выдаваліся ў адзначаны перыяд ад імя розных дзяржаўных устаноў. У Я. Н. Шкляр не знаходзіцца месца для таго, каб узгадаць той факт, што пытаннямі культуры з лютага 1918 г. да сакавіка 1919 г. займаўся Белнацкам – аддзел народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей РСФСР, які меў аддзяленні ў Віцебску, Смаленску, Саратаве з удзелам некалі выкрэсленых з гісторыі І. С. Дварчаніна, Б. Тарашкевіча, З. Жылуновіча і іншых.[284] Нават сучасная

[279] Беленькая Л. Л. Деятельность революционных комитетов Белоруссии в области народного образования и культурно-просветительской работы (1919 – 1920 гг.): – Автореф. дис. …канд. ист. наук – М., 1988.
[280] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР… – С. 44.
[281] Там жа. – С. 112.
[282] Там жа. – С. 44.
[283] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР… – С. 45.
[284] Парашкоў С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мн., 2003. – С. 256.

датыроўка стварэння Народнага камісарыята асветы БССР толькі прыблізная – студзень 1919 г.,[285] затое Я. Н. Шкляр першая ўводзіць у навуковы ўжытак імя наркама асветы ЛітБел – Ю. М. Ляшчынскага (Ленскага).[286] З 25 чэрвеня 1919 г. Народныя камісарыяты ЛіБ ССР былі перайменаваны ў адпаведныя аддзелы Мінскага губернскага рэвалюцыйнага камітэта.[287]

Агульнапрызнанымі сёння можна было б лічыць кароткія звесткі аб культурнай палітыцы, змешчаныя ў энцыклапедычным артыкуле А. В. Ціхамірава. У ім адзначана, што рэспубліканскія ўлады прынялі дэкрэт пра раўнапраўе ўсіх мясцовых моў. У красавіку 1919 г. царква была аддзелена ад дзяржавы, рэлігія абвешчана прыватнай справай грамадзян. У галіне культуры і адукацыі ўрад ЛітБела выдаў дэкрэты: пра абавязковае бясплатнае навучанне дзяцей і моладзі ва ўзросце **7-18** гадоў (24 сакавіка 1919 г.), адкрыцці Віленскага ўніверсітэта, стварэнне музея прыкладнога мастацтва (26 сакавіка 1919 г.) і гісторыка-этнаграфічнага музея (25 сакавіка 1919 г.). Пры Наркамаце асветы была заснавана археалагічная камісія, якая кіравала цэнтральным кнігасховішчам, бібліятэкай, цэнтральным архівам і гісторыка-этнаграфічным музеем. Выдавалася 6 газет (2 на рускай, па адной на беларускай, літоўскай, польскай і яўрэйскай мовах).[288]

Вось, здаецца, той мінімум, на які можна абапірацца пры выкладанні ці далейшай распрацоўцы культурнага аспекта дзейнасці ўрада ЛітБел. Але ў гэтым цяжка ўпэўніцца, калі пачынаеш супастаўляць факты з розных крыніц.

Па-першае, вядома, што ў граніцах Літоўска-Беларускай рэспублікі цэнтральныя органы КП ЛіБ выдавалі газеты "Звезда" (на рускай мове), "Młot" (на польскай), "Камуністас" (на літоўскай), "Дер Штерн" (яўрэйскай).[289] Аб існаванні ў межах ЛітБел цэнтральных перыядычных выданняў на беларускай мове фактаў не апублікавана.

Па-другое, заўважым, што ёсць разыходжанні ў вызначэнні ўзросту патэнцыяльных навучэнцаў школ. Скажам, даследчыкі гісторыі культуры Беларусі Л. М. Лыч, У. І. Навіцкі ў сваёй манаграфіі паведамілі, што ў Беларусі стварэнне сістэмы народнай адукацыі ажыццяўлялася на аснове "Палажэння аб адзінай працоўнай школе РСФСР" ад 16 кастрычніка 1918 г. 24 сакавіка 1919 г. СНК Літвы і Беларусі прыняў дэкрэт "Аб рэарганізацыі школьнай справы", згодна з якім уводзілася адзіная працоўная школа, якая падзялялася на дзве ступені: I – ад 8 да 13 гадовага ўзросту, II – ад 13 да 17 год[290] (як мы бачым, дадзеныя аб узросце навучэнцаў у ЭГБ і аўтараў манаграфіі адрозніваюцца на 1 год). Да адзінай працоўнай дзевяцігадовай школы далучаўся дзіцячы сад (ад 6 да 8 год). Навучанне ў школах стала сумесным для дзяўчынак і хлопчыкаў.

"Дробязі" з вызначэннем узросту навучэнцаў засланяюцца акцэнтам на фактычным правале намаганняў забяспечыць насельніцтва кваліфікаванымі кадрамі педагогаў. Усе школьныя работнікі павінны былі штогод перавыбірацца згодна з дэкрэтам аб выбарнасці педагагічных пасад. Разам з тым, – лічаць Л. М. Лыч і У. І. Навіцкі, дэкрэт увабраў у сябе з іншых дакументаў памылковыя палажэнні аб адмене ўсіх відаў экзаменаў, дамашніх заданняў.

[285] Гісторыя Беларусі. У 2 ч. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г.: Вучэб. дапамож. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мн., 1998. – С. 103.
[286] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР... – С. 35.
[287] Там жа.
[288] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн., 1997. – Т. 4. – С. 383.
[289] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР... – С. 36.
[290] Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. - Мн., 1996. – С. 230.

Але разгарнуць работу школ не ўдалося, таму што вясной 1919 г. пачалася польская акупацыя тэрыторыі Беларусі.[291]

Станоўчае ўражанне аб палітыцы ў адукацыйнай сферы змяняе і такое ўдакладненне ўжо ад Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. Вясной 1919 г. і сапраўды адбыліся перавыбары настаўнікаў. У выніку многія з іх, якія не падтрымлівалі Савецкую ўладу, былі звольнены з работы. У гэтым ліку апынуліся таленавітыя, творчыя работнікі народнай асветы. Каб забяспечыць школы педагагічнымі кадрамі ўрад быў вымушаны адчыніць кароткатэрміновыя настаўніцкія курсы.[292] С. А. Парашкоў адзначае, што "школа II ступені фактычна не знайшла ў тыя гады правільных шляхоў сувязі з вытворчасцю, гэтаму не спрыяла разруха ў краіне"[293], што было ім падцверджана наступнай статыстыкай: вясной 1919 г. працавала 2 811 школ (у тым ліку I ступені – 2 697, II ступені – толькі 114).[294] І. І. Коўкель і Э. С. Ярмусік спасылаюцца на дадзеныя толькі Мінска – у маі 1919 г. у 80 школах вучыліся 16 тысяч, больш 7 тысяч дзяцей знаходзіліся паза сценамі школы.[295] Не ведаем па якой логіцы, але ў сваю чаргу Я. К. Новік і Г. С. Марцуль прапануюць чытачам дадзеныя ўжо па Віцебскай і Магілёўскай губернях, якія не ўваходзілі ў ЛітБел. У Віцебскай губерні ў ліпені 1919 г. было зарэгістравана 13 668 дзяцей 8-13 гадоў, наведвалі школу толькі 8 423.[296]

Па-трэцяе, не зусім высветленым з'яўляецца і пытанне, калі і якая ўстанова вышэйшай адукацыі была заснавана дэкрэтам Саўнаркама ЛітБела ў Вільні. Так, у энцыклапедычным артыкуле напісана, што 10 сакавіка 1919 г. адчыніўся Віленскі народны ўніверсітэт.[297] Я. Н. Шкляр, са спасылкай на перыядычныя выданні таго часу, даводзіць, што дэкрэтам ад 13 сакавіка 1919 г. у будынку зачыненага царскім урадам Віленскага ўніверсітэта быў утвораны Усеагульны ўніверсітэт працы ў складзе 1) агульнаадукацыйнага, 2) навуковага, 3) спецыяльнага аддзяленняў. На яго арганізацыю быў адпушчаны 1 млн. руб.[298] З гэтым практычна згодны аўтары "Истории Беларуси с древнейших времён до нашего времени", якія засведчылі стварэнне ВНУ з 13 сакавіка 1919 г., але пасвойму інтапрэтуюць назву – Віленскі ўніверсітэт працы.[299] Ці азначаюць дадзеныя ваганні, што афіцыйная назва ўніверсітэту пасля акупацыі Вільні ўжо не спатрэбілася? Магчыма так, і гэта яшчэ адзін аргумент у карысць тэзісу аб тым, што культурная палітыка з тэарэтычнай так і не перайшла ў практычную плоскасць.

У дапаўненне да ўжо вядомых фактаў, у кніге І. І. Коўкеля і Э. С. Ярмусіка паведамляецца аб заснаванні Акадэміі мастацтваў у Вільні; аб тым, што прадоўжылі работу нацыяналізаваныя тэатры, кансерваторыя, дзяржаўны хор і аркестр, педінстытут і абласны музей у Мінску, іншыя культурна-асветніцкія ўстановы. Там жа сустракаецца запазычаная, трэба меркаваць, у Я. Н. Шкляр[300], звестка і аб тым, што **24** лютага 1919 г. на пасяджэнні Прэзідыума УВК Саветаў БССР ішло абмеркаванне адкрыцця ў Мінску дзяржаўнага

[291] Там жа. – С. 226.
[292] Гісторыя Беларусі. У 2 ч. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г. – С. 103.
[293] Парашкоў С. А. Гісторыя культуры Беларусі. – С. 255.
[294] Там жа. – С. 256.
[295] Ковкель И. И., Ярмусик Э. С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени. – С. 359.
[296] Гісторыя Беларусі. У 2 ч. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г. – С. 103.
[297] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн., 1997. – Т. 4. – С. 383.
[298] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР ... – С. 67.
[299] Ковкель И. И., Ярмусик Э. С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени. – С. 359.
[300] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР ... – С. 67.

ўніверсітэта, падрыхтоўку да чаго прыпыніла набліжэнне фронту[301] (Гэтая ідэя, як кажуць, парыла ў паветры – аб арганізацыі Мінскага ўніверсітэта клапаціўся яшчэ ў 1918 г. Народны сакратарыят асветы БНР, які склаў іменітую камісію для яго арганізацыі і адкрыцця). Усе гэтыя факты дазволілі складальнікам нарыса зрабіць вынік, што Кампартыя і кіраўніцтва Літоўска-Беларускай ССР "праводзілі вялікую работу" у галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, якая была прыпынена нападам Польшчы.[302] Дарэчы, і С. А. Парашкоў, у сваю чаргу, аптымістычна паведамляе аб тым, што **25** лютага 1919 г. ЦВК БССР ужо *прыняў пастанову* аб адкрыцці Беларускага Дзяржаўнага ўніверсітэта, якому перашкодзіла акупацыя.[303]

Немалаважна, для разумення патэнцыяльных магчымасцей развіцця вышэйшай школы было і тое, што ў красавіку 1919 г. камісія Наркамасветы прыняла рашэнне аб аднаўленні Горы-Горацкага інстытута на базе землЯробчай школы і рамеснага вучылішча (работа яго пачалася 1 кастрычніка 1919 г.)[304]

С. А. Парашкоў заяўляе: "Калі значная частка тэрыторыі Беларусі была ў зоне ваенных дзеянняў, руйнавалася і разграблялася, Савецкая ўлада рабіла пэўныя намаганні па стварэнні сістэмы народнай адукацыі".[305] Але ў ацэнцы эфектыўнасці праватворчай і выканаўчай дзейнасці літбелаўскага ўрада большасць даследчыкаў займае стрыманую пазіцыю. 22 красавіка 1919 г. сталіца ЛітБел ССР была акупавана польскімі войскамі, а з ліпеня па верасень 1919 г. адбываўся працэс ліквідацыі інстытутаў улады гэтай рэспублікі. Становіцца зразумела, што дзейнасць культурна-асветніцкіх устаноў прыпынілася, ўсе рашэнні па ажыцяўленню планаў сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця так і засталіся благімі намерамі.

Прааналізаваныя ў публікацыях гісторыкаў дакументы адлюстроўваюць тыя напрамкі і характар сацыяльна-эканамічнай і культурнай палітыкі ўрада ЛітБела, якія рэалізоўваліся на практыцы ўжо пасля вызвалення беларускіх тэрыторый ад польскіх акупантаў. Спачатку – рэўкамамі, КП(б) ЛіБ, потым – урадам адноўленай БССР. Аб'яўленыя прынцыпы сацыяльнага ўладкавання сталі лагічным працягам і састаўной часткай палітыкі перш за ўсё ўрада РСФСР, а па другое – тых савецкіх рэспублік, якія нарадзіліся з яе дапамогай, – Літоўскай і Беларускай. Па гэтай прычыне мала што ў той палітыцы змянілася і пасля ліквідацыі ЛітБела.

У сярэдзіне 80-х гадоў ў навуковы ўжытак былі ўведзены новыя архіўныя дадзеныя: аб дзейнасці ў 1919 г. камітэтаў беднаты ў дысертацыі С. Д. Жмуроўскага[306], аб дзейнасці Саветаў і рэвалюцыйных камітэтаў у манаграфіі П. А. Селіванава.[307] Вялікая колькасць апублікаваных у зборніках дакументаў і матэрыялаў, архіўныя фонды па літбелаўскай тэматыцы патрабуюць далейшага вывучэння і асэнсавання. Наспела неабходнасць выдання абагульняючай працы, у якой былі бы выкладзены комплексна і на сучасным узроўні развіцця гістарычнай навукі ўсе праблемы гісторыі Літоўска-Беларускай рэспублікі ад яе абвяшчэння да ліквідацыі.

---

[301] Ковкель И. И., Ярмусик Э. С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени. – С. 360.
[302] Там жа. – С. 360.
[303] Парашкоў С. А. Гісторыя культуры Беларусі. – С. 261.
[304] Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – С. 230; Парашкоў С. А. Гісторыя культуры Беларусі. – С. 261.
[305] Парашкоў С. А. Гісторыя культуры Беларусі. – С. 256.
[306] Жмуровский С. Д. Организация и деятельность комитетов бедноты Белоруссии (июнь 1918 – июнь 1919): Автореф. дис. …канд. ист. наук. – М., 1986.
[307] Селиванов П. А. Укрепление тыла Красной Армии: Деятельность Советов и ревкомов Белоруссии (1918 – 1920 гг.). – Мн., 1987.

# ГЛАВА 4

## ГІСТОРЫЯ ЛІТОЎСКА-БЕЛАРУСКАЙ ССР У ПАДРУЧНІКАХ І ВУЧЭБНЫХ ДАПАМОЖНІКАХ ДЛЯ СЯРЭДНІХ І ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

Гісторыя Літоўска-Беларускай ССР у навейшай навуковай літаратуры па праблемах нацыянальнай дзяржаўнасці, як правіла, не вылучаецца ў асобную даследчыцкую тэму, а ў падручніках і розных дапаможніках для сярэдніх школ і ВНУ яна звычайна змяшчаецца ў двух параграфах, у якіх асвятляецца абвяшчэнне БССР і польска-савецкая вайна. Хаця незайздросны лёс гэтага палітычнага ўтварэння мае прамое дачыненне да станаўлення не толькі беларускай, але і літоўскай дзяржаўнасці. Вывучэнне гісторыі Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі дапамагае вучням і студэнтам авалодаць перыядызацыяй нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва і больш глыбока зразумець характар нацыянальнай палітыкі савецкай улады ў дачыненні да Беларусі.

Як ужо адзначалася, гісторыю ЛітБел айчынныя навукоўцы пачалі больш уважліва вывучаць пасля набыцця Беларуссю незалежнага статуса ў пачатку 90-х гадоў, паколькі ўзнік сацыяльны заказ на падрабязнае і, па-магчымасці, непалітызаванае асвятленне нацыянальнай гісторыі. Сапраўдны "гістарычны бум" перажывала беларуская школа ў канцы 1980-х – 1990-я гады, калі замест урокаў, што праводзіліся па падручніку Л. С. Абэцэдарскага, М. П. Баранавай і Н. Г. Паўлавай, якія на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў з'яўляўся адзіным (і дзе дарэчы ЛітБел прысвячаліся толькі дзесяць радкоў[308]), быў уведзены асобны курс па гісторыі Беларусі з 4 па выпускны клас і вучэбная праграма значна ўзбагацілася.

Пры разглядзе тэмы ўстанаўлення Савецкай улады на Беларусі ў падручніках для 4 класа не ўведзена панацце аб Літоўска-Беларускай ССР.[309] Больш падрабязнае ўяўленне аб працэсе нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. падаецца вучням 9 класа агульнаадукацыйнай школы. Для гэтай аўдыторыі ў пачатку

---

[308] Абецедарский Л. С., Баранова М. П., Павлова Н. Г. История БССР: Учеб. для учащихся сред. шк. / Под ред. чл.-корр. АН БССР П. Т. Петрикова. – 12-е изд. – Мн., 1987. – С. 170-171.

[309] Пляшэвіч У. К., Жытко А. П., Белая В. Л. Беларусь – мая Радзіма: Вучэб. дапамож. для вучняў 4 кл. – Мн., 1993; Мая Радзіма – Беларусь: Падручнік для 4 кл. / В. Л. Белая, А. П. Жытко, У. К. Пляшэвіч, А. П. Траяноўскі; Пад рэд. М. В. Біча і Э. А. Ляўкова. – 2-е выд. – Мн., 1996, 1998

1990-х гадоў прафесары М. В. Біч, У. Н. Сідарцоў і В. М. Фамін падрыхтавалі новы вучэбны дапаможнік. Кожны настаўнік з больш-менш працяглым вопытам работы памятае гэты падручнік. Аднак празмернае багацце фактаў у ім абарочвалася для вучняў цяжкасцямі ва ўспрыняцці шэрагу тэм. Гэтаму садзейнічала і адсутнасць у кнізе карт, схем, іншага вучэбна-метадычнага забеспячэння дапаможніка. Але разам з тым нараджалася пачуццё ўдзячнасці за тое, што групе вучоных першымі ў рэспубліцы ў масавым варыянце ўдалося пераадолець ранейшыя штампы ў выкладанні гісторыі Бацькаўшчыны і абудзіць у душах настаўнікаў і вучняў патрыятызм і нацыянальную самасвядомасць. Зразумела, новая палітычная сітуацыя ў дзяржаве наклала свой адбітак на змест адпаведных параграфаў дапаможніка: шмат увагі аддавалася БНР, факт жа хуткага пераўтварэння БССР у ЛітБел падкрэсліваў вядучую ідэю пра тое, што "суверэнітэт БССР прыносіўся бальшавікамі ў ахвяру ідэі сусветнай рэвалюцыі".[310]

Калі чытаеш гэты дапаможнік, то адчуваецца, што аўтары зрабілі ўсё, каб "звесці да нічога" пракамуністычныя ўстаноўкі па айчыннай гісторыі, у тым ліку і наконт ЛітБела. Рашэнне аб'яднаць урэзаную БССР з Літоўскай ССР яны звязвалі з фактам падзелу БССР 16 студзеня 1919 г. Матыў стварэння новай дзяржавы абрастаў цікавымі падрабязнасцямі: сцвярджалася, што "стваралася буферная дзяржава, якую бальшавікі спрабавалі выкарыстаць для адмежавання РСФСР ад Польшчы з мэтай прадухілення адкрытай вайны з ёй, а таксама як прэцэдэнт для барацьбы супраць БНР і Літоўскай рэспублікі, за ўсталяванне сваёй улады."[311] Аб'яднанне ў адзіную ЛітБел ССР традыцыйна датавалася 27 лютым 1919 г. "1 чэрвеня 1919 г., – як падаюць аўтары, – у Маскве было прынята рашэнне аб перадачы паўнамоцтваў бальшавіцкіх урадаў Украіны, ЛітБела і Латвіі ўраду РСФСР"[312]. Беларуска-Літоўская армія перайменавалася ў 16-ю. Але такія трактоўкі перакручвалі сэнс таго, што адбылося ў сапраўднасці. Тады была прынята пастанова УЦВК "Аб аб'яднанні ваенных сіл Савецкіх Рэспублік: Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы і Беларусі", згодна з якой узброеныя сілы названых краін аб'ядноўваліся "для барацьбы з сусветным імперыялізмам".

Эканамічная палітыка ваеннага камунізма ЛітБела ў дапаможніках ацэньвалася як жорсткая, яе ўрад папракаўся ў адмаўленні ад перадачы былых памешчыцкіх маёнткаў ў карыстанне працоўнага сялянства. Няздольнасць кіраўніцтва КП(б) ЛіБ самастойна вырашыць праблемы краю была падкрэслена імкненнем да супрацоўніцтва з нацыянал-дэмакратычнымі партыямі. Тэрмін існавання гэтай рэспублікі не быў акрэслены: "З наступленнем палякаў ЛітБел таксама хутка памёрла, як і нарадзілася".[313]

Кропку ў аўтарскім абвінавачванні бальшавіцкага кіраўніцтва ў фармальным падыходзе да ажыццяўлення ідэй Дэкларацыі правоў народаў на самавызначэнне ставілі словы: "Прынятая ў Мінску 31 ліпеня 1920 г. Дэкларацыя аб незалежнасці БССР была разлічана на "супакойванне мас".[314]

---

[310] Сідарцоў У. Н., Фамін В. М. Гісторыя Беларусі: 1917 - 1992: Вучэб. дапамож. для 9-га кл. сярэд. шк. – Мн., 1993. – С. 26; Біч М. В., Сідарцоў У. Н., Фамін В. М. Гісторыя Беларусі: XX ст.: Вучэб. дапамож. для 10-11 кл. сярэд. шк. – 2-е выд., перапр. – Мн., 1993. – С. 124.

[311] Сідарцоў У. Н., Фамін В. М. Гісторыя Беларусі: 1917 – 1992. – С. 26, Біч М. В., Сідарцоў У. Н., Фамін В. М. Гісторыя Беларусі: XX ст. – С. 123.

[312] Сідарцоў У. Н., Фамін В. М. Гісторыя Беларусі: 1917 – 1992. – С. 29.

[313] Там жа. – С. 27; Біч М. В., Сідарцоў У. Н., Фамін В. М. Гісторыя Беларусі: XX ст. – С. 124.

[314] Сідарцоў У. Н., Фамін В. М. Гісторыя Беларусі: 1917 – 1992. – С. 34; Біч М. В., Сідарцоў У. Н., Фамін В. М. Гісторыя Беларусі: XX ст. – С. 132.

"Нацыяналістычная афарбоўка", як бы зараз ацанілі такую падачу тэмы, не была ўласціва ўсім вучэбным выданням па гісторыі, якія выйшлі ў пачатку 90-х гадоў. У прыклад можна прывесці вучэбныя дапаможнікі, якія створаны калектывам пад кіраўніцтвам А. П. Ігнаценкі і Я. Ю. Несцяровіча для вучняў сярэдніх школ і абітурыентаў. У іх спрошчвалася праблема захавання этнічнай цэласнасці тэрыторыі Беларусі: рашэнне аб уключэнні Віцебскай, Смаленскай і Магілёўскай губерняў у склад РСФСР прадстаўлялася як пастанова Першага Усебеларускага з'езда Саветаў[315], а 27 лютага 1919 г. на аб'яднаным пасяджэнні ЦВК Літоўскай і Беларускай Савецкіх Рэспублік быццам бы было прынята рашэнне аб стварэнні Сацыялістычнай Рэспублікі Літвы і Беларусі.[316] Так, у абітурыентаў неспадзявана ўзніклі новыя храналагічныя арыенціры існавання ЛітБела, аб якіх раней не ўзгадвалася ў падручніках. Дэкрэт ад 1 чэрвеня 1919 г. аб ваенна-палітычным саюзе савецкіх рэспублік, на думку аўтараў дапаможніка, меў "вялікае значэнне для абароны Літоўска-Беларускай ССР".[317] Апошні раз урад і Савет Абароны ЛіБ ССР узгадваліся ў сувязі з вымушаным пераездам з Вільні ў Мінск. Пра далейшы лёс ў дапаможніку нічога не гаворыцца. Да станоўчых заслуг аўтарскага калектыва можна аднесці багаты фактычны матэрыял аб сацыяльна-эканамічным і культурным становішчы Літоўска-Беларускай ССР. Аб скасаванні ўрада і тэрміне існавання гэтай рэспублікі аўтары палічылі за лепшае не пісаць.

У дапаможніках для сярэдніх навучальных установаў і абітурыентаў узгадваецца праславутае рашэнне ЦК РКП(б) ад 16 студзеня 1919 г., якім па прапанове У. І. Леніна Смаленская, Віцебская і Магілёўская губерні вылучаліся са складу БССР, а Мінскай і Гродзенскай губерням належала аб'яднацца з Літоўскай Савецкай Рэспублікай. "Галоўным матывам (аб якім адкрыта не гаварылася) гэтага рашэння лаканічна называлася толькі стварэнне [...] буфера паміж Расіяй і Польшчай".[318]

Грамадска-палітычныя ўмовы, якія склаліся ў Рэспубліцы ў другой палове 90-х гадоў, паўплывалі на змест школьных падручнікаў па гісторыі Беларусі. Гэта можна заўважыць і ў падручніку У. Н. Сідарцова, В. М. Фаміна і С. В. Панова пад рэдакцыяй М. С. Сташкевіча. Так, вучэбны дапаможнік для 9-га класа гэтых навукоўцаў у новай рэдакцыі не толькі значна зменшыўся па аб'ёму з 319 да 192 старонак, але іншым стаў і сам характар выкладання гістарычных падзей. У лепшы бок змянілася форма падачы матэрыялу – з'явіліся біяграфічныя даведкі аб палітычных дзеячах, карты, выняткі з дакументаў і каментарыі да іх. Стварэнне ж ЛітБела матывіравалася толькі жаданнем "адмежавацца РСФСР ад Польшчы з мэтай прадухілення адкрытай вайны з ёю".[319] І ў пацвярджэнне гэтага намеру давалася недакладнае і нават блытанае тлумачэнне тэрміну "буферная дзяржава" як "дзяржаўнай тэрыторыі, якая выкарыстоўваецца ў якасці пагранічнай зоны паміж супрацьлеглымі адна адной краінамі ў мэтах недапушчэння вырашэння іх канфлікту ўзброеным

[315] Гісторыя Беларусі: Вучэб. дапамож. / А. Л. Абэцэдарская, Л. А. Жылуновіч, А. П. Ігнаценка і інш., Пад рэд. А. П. Ігнаценкі, Я. Ю. Несцяровіча. – Мн., 1994. – С. 117.
[316] Там жа.
[317] Там жа. – С. 119.
[318] Дапаможнік па гісторыі Беларусі для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы / А. Л. Абецэдарская, П. І. Брыгадзін, Л. А. Жылуновіч і інш.; Пад рэд. А. Г. Каханоўскага і інш. – Мн., 1996. – С. 202; История Беларуси. Учебное пособие для ВУЗов, колледжей, лицеев, гимназий и школ / Науч. ред. А. Г. Кохановский, О. А. Яновский. – Мн., 1997. – С. 281-282.
[319] Сідарцоў У. Н., Фамін В. М., Паноў С. В. Гісторыя Беларусі. 1917 – 1996: Вучэб. дапамож. для 9-га кл. / Пад рэд. М. С. Сташкевіча. – Мн., 1997. – С. 26.

шляхам".[320] Застаецца незразумелым, чаму ўзброены канфлікт паміж Польшчай і РСФСР нягледзячы на тое, што існавала буферная дзяржава – Літоўска-Беларуская рэспубліка – усё ж адбыўся.

У дапаможніку змешчана карта тэрыторыі ЛітБела ў 1919 г., але маленькага памеру і з ёю практычна нельга працаваць. Наяўнасць яе ў кнізе не зусім зразумелая, пакольки пра тэрыторыю і насельніцтва Літоўска-Беларускай ССР аўтары нічога не сказалі. Рашэнне пра аб'яднанне Савецкіх Сацыялістычных рэспублік Літвы і Беларусі аўтары звязалі з Дэкларацыяй Першага Усебеларускага з'езда Саветаў ад 3 лютага 1919 г. Тэрмін існавання гэтага новаўтвора аўтары акрэслівалі так: "Ужо праз паўгода гэтая дзяржава перастала існаваць".[321] З кантэкста зместу падручніка можна здагадацца, што ЛітБел спыніла існаванне ў жніўні 1919 г.[322] Агульная ж ацэнка дзяржавы двух народаў, дадзеная ў дапаможніку, жорсткая і такая ж катэгарычная: "ЛітБел з'яўлялася штучным дзяржаўным утварэннем, а суверэнітэт Беларусі прыносіўся ў ахвяру ідэям сусветнай пралетарскай рэвалюцыі".[323]

З дапаможніка, прапанаванага гэтым жа аўтарскім калектывам для 11 класа, у якім акамуліруюцца веды аб гісторыі Беларусі для падрыхтоўкі да дзяржаўных экзаменаў, вынікае, што фактычна ЛітБел была абвешчана 16 студзеня 1919 г., а "юрыдычны характар гэтым рашэнням надаў І Усебеларускі з'езд Саветаў"[324], што, зразумела, заблытвае выпускнікоў у датыроўцы ўтварэння ЛітБела. Дату ж ліквідацыі Літоўска-Беларускай рэспублікі аўтары вызначылі наступным чынам – "жнівень 1919 г., калі палякі захапілі яе тэрыторыю". У склад яе, на іх думку, уваходзілі Мінская, Гродзенская, Ковенская і Віленская губерні.[325] Трэба сказаць, што вызначэнне тэрыторыі ЛітБела ў такім фармаце не прымаецца большасцю айчынных гісторыкаў.

Сведчанні аб тэрыторыі ЛітБела ў школьным падручніку ўпершыню дадзены яшчэ Л. С. Абэцэдарскім. У складзе рэспублікі былі названы Віленская, Мінская, Ковенская, Гродзенская і частка Сувалкаўскай губерняў.[326] Паўтараючы гэта, дапаможнікі выкладчыкаў гістфака БДУ называюць і колькасць жыхароў рэспублікі – больш 6 млн. чалавек.[327] І ў падручніку, якім карыстаюцца 11-класнікі з 2000 г., даецца такі ж пашыраны пералік губерняў, але ЛітБел ССР насяляецца толькі больш як 4 млн. людзей.[328] Так, спрэчныя і супярэчлівыя фактычныя дадзеныя, на якія яшчэ не існуе адзінага погляду ў навукоўцаў, сталі аб'ектам самастойнага вывучэння для настаўнікаў і школьнікаў.

---

[320] Там жа.
[321] Там жа.
[322] Як мага болей спрошчаныя, а таму папулярныя ў школьнікаў "матэрыялы" да экзамену С. В. Панова выкладаюць гісторыю ЛітБела менавіта зыходзячы з названых вышэй тэзісаў. (Гл.: Паноў С. В. Матэрыялы па гісторыі Беларусі. – 2-е выд., дапрац. – Мн., 2001. – С. 228).
[323] Сідарцоў У. Н., Фамін В. М., Паноў С. В. Гісторыя Беларусі. 1917 – 1996: Вучэб. дапамож. для 9-га кл. – С. 28.
[324] Сідарцоў У.Н. і інш. Гісторыя Беларусі. 1919 – 1997: Вучэб. дапамож. для 11-га кл. У 2-х кн. – Кн. 1. – Мн., 1997. – С. 18; Паноў С. В., Сідарцоў У. Н., Фамін В. М. Гісторыя Беларусі XIX-XX ст.ст.: Вучэб. дапамож. для 11 кл. агульнаадукац. школы з бел. і рус. мовамі навуч. / Пад рэд. М. С. Сташкевіча. – Мн., 2001. – С. 90.
[325] Сідарцоў У. Н. і інш. Гісторыя Беларусі. 1919 – 1997: Вучэб. дапамож. для 11-га кл. – С. 18.
[326] Абэцедарский Л. С. и др. История БССР. – Мн., 1987. – С. 170
[327] Гісторыя Беларусі: Вучэб. дапамож. / А. Л. Абэцэдарская, Л. А. Жылуновіч, А. П. Ігнаценка і інш. – С. 117; Дапаможнік па гісторыі Беларусі для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы / А. Л. Абэцэдарская, П. І. Брыгадзін, Л. А. Жылуновіч і інш. – С. 203.
[328] Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 1999 г.: Вучэб. дапамож. для 11-га кл. агульнаадукац. школы з бел. і рус. мовамі навуч. / І. Л. Качалаў, Г. С. Марцуль, Н. Я. Новік і інш. Пад рэд. Я. К. Новіка. – Мн., 2000. – С. 104.

Навейшую версію гісторыі Бацькаўшчыны для вучняў агульнаадукацыйных школ прадставілі І. Л. Качалаў, Г. С. Марцуль, Н. Я. Новік і іншыя вучоныя. Канцэптуальны падыход аўтарскага калектыва заключаўся ў згладжванні вострых вуглоў ва ўзаемаадносінах беларускага і рускага народаў (вось калі асабліва адчуваецца, што "гісторыя – гэта палітыка павернутая ў мінулае"!). Так, у кнізе сустракаюцца дыпламатычныя фармулёўкі аб тым, што "16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне *пакінуць* [курсіў аўтараў. – Л. М., У. М.] Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні ў РСФСР', і абвясціць Літоўска-Беларускую ССР у складзе Мінскай, Гродзенскай, Ковенскай і Віленскай губерняў."[329] У падручніку ёсць і гіпатэтычнае сцвярджэнне пра тое, што быццам бы "планавалася, што ўключаныя ў склад РСФСР Магілёўская і Віцебская губерні, калі іншыя тэрыторыі Беларусі будуць захоплены Польшчай, у будучым могуць стаць асновай для аднаўлення беларускай дзяржаўнасці".[330] Гэтае палажэнне даўно прагучала ў друку, але пакуль што гісторыкі не знайшлі якіх-небудзь дакументальных доказаў таго, што савецкі ўрад Расіі меў такія далёкаідучыя планы адносна перспектыў беларускай дзяржаўнасці.

Можна меркаваць, што школьная літаратура па гісторыі больш за іншую адлюстроўвае палітычныя і ідэалагічныя настроі і кан'юнктуру ў навуковым асяроддзі. Змяненні ў ацэнках таго ж ЛітБела адбываюцца амаль кожны раз, калі выходзяць у свет новыя падручнікі і дапаможнікі.

Аднак ў фарміраванні ўяўленняў аб ЛітБеле з не меншымі цяжкасцямі сустракаюцца і студэнты. Асабліва калі яны знаёмяцца з навуковай і вучэбнай літаратурай, якая змяшчае разнастайныя, спрэчныя і супярэчлівыя фактычныя сведчанні і супрацьлеглыя яго ацэнкі. Звернемся спачатку да тых выданняў, што з'яўляюцца асноўнымі дапаможнікамі для студэнтаў па гісторыі Беларусі.

Раздзел другой часткі "Нарысаў гісторыі Беларусі", які напісаны доктарам гістарычных навук, акадэмікам І. М. Ігнаценкам і называецца "Беларусь напярэдадні і ў першыя гады Савецкай улады", нягледзячы на карэннае папаўненне курса айчыннай гісторыі новым матэрыялам, мае, на наш погляд, няўдалую структуру выкладання асноўных праблем Літоўска-Беларускай ССР. Магчыма, што жаданне адыйсці ад усталяваўшыхся ў савецкі час канонаў, прывяло да таго, што ў кнізе спачатку размяшчаецца параграф аб грамадзянскай вайне і замежнай інтэрвенцыі (падзеі якой цягнуліся да падпісання Рыжскага мірнага дагавора ў 1921 г.), а толькі потым – аб нацыянальна-дзяржаўным ўладкаванні Беларусі на савецкай аснове. Таму студэнтам спачатку даводзіцца прачытаць пра ўдзел ЛітБел ССР у ваенных кампаніях і аб яе матэрыяльна-тэхнічным становішчы ў той час, а пасля гэтага даведацца аб тым, у якіх умовах адбылося аб'яднанне савецкіх Літвы і Беларусі.[331] Аб своеасаблівай увазе рэдкалегіі "Нарысаў" да літбелаўскай праблематыкі сведчыць такі факт, што ў іх яна "раскрыта" на амаль двух старонках у параграфе з сімвалічнай назвай "Самавызначэнне беларускага народа".[332]

Сама назва падраздзела "Тэрміновае ўтварэнне БССР", на думку аўтара, адлюстроўвае непаслядоўны характар дзяржаўнага будаўніцтва на Беларусі, які быў абумоўлены (як вынікае з навукова-папулярнага выдання), знешнепалітычнымі манеўрамі Савецкай Расіі. "Ваенна-палітычнае становішча, –

[329] Там жа.
[330] Там жа. – С. 104-105.
[331] Па той жа схеме пайшоў і П. Г. Чыгрынаў у сваім дапаможніку.
[332] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. – Ч. 2 / М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. – Мн., 1995. – С. 68-70.

чытаем у "Нарысах", – патрабавала ўтварэння БССР, каб зачыніць тым самым акно для пранікнення імперыялістычных сіл непасрэдна на тэрыторыю Расіі".[333] Памылка друку, якую сустракае ў тэксце ўважлівы чытач, збівае яго з панталыку: "Аднак без папярэдняга абмеркавання пытання з урадам БССР, ЦБ КП(б)Б *16 лютага 1919 г.* [трэба 16 студзеня. – Л. М., У. М.] ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб выдзяленні з БССР Віцебскай, Смаленскай і Магілёўскай губерняў. На з'ездзе Саветаў Беларусі было прапанавана вынесці рашэнне аб аб'яднанні Беларусі з Літвой".[334]

З падачы "Нарысаў" у наступных выданнях для студэнтаў падкрэслівалася тое, што ЦБ КП(б)Б (група А. Мяснікова) і ўрад БССР (група Дз. Жылуновіча) не пагадзіліся з рашэннямі аб падзеле Беларусі, паколькі гэтая ідэя "несумяшчальная з ідэалогіяй і палітыкай партыі" і "супярэчыць разумнаму сэнсу".[335] А ў "Гісторыі Беларусі" пад рэдакцыяй Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля ўзгадваецца нават пра тое, што супраць такога падзелу ССРБ выступаў нарком замежных спраў РСФСР Г. Чычэрын.[336]

Але ў "Нарысах" атрымалася блытаніна з адвольнай рэдакцыяй адказу У. І. Леніна беларускім дэлегатам, якія па даручэнню ЦБ КП(б)Б прасілі яго адмяніць рашэнне ЦК РКП(б): "Рэспубліка патрэбна пастольки, паколькі мяжуецца з іншымі краінамі. Смаленская, Віцебская, і Магілёўская губерні з іншымі краінамі не мяжуюцца, таму іх можна выключыць".[337] Такія словы можна зразумець дваяка – і як каментарый да абвяшчэння ССРБ, і як тлумачэнне матываў аб'яднання ў ЛітБел. Невялічкае, але істотнае, дапаўненне – "Рэспубліка *буферная,* [курсіў аўтараў. – Л. М., У. М.] і патрэбна настолькі, паколькі..." – да прыведзеных ленінскіх слоў у курсе лекцый, падрыхтаваным П. І. Брыгадзіным, У. Ф. Ладысевым, П. І. Зялінскім і інш., змяняла іх сэнс. Гаворка старшыні СНК РСФСР ішла ўсё ж аб ролі Літоўска-Беларускай рэспублікі ва ўмовах замежнай інтэрвенцыі.[338] (Што і гаворыцца адкрыта ў курсе лекцый І. І. Коўкеля і Э. С. Ярмусіка).[339] І гэтае ўдакладненне гучыць прынцыпова, паколькі дае зразумець, што да фіктыўнага прызнання з боку РСФСР, Часовы ўрад ССРБ быў вымушаны пагадзіцца з прапановамі ЦК РКП(б) аб яе падзеле і аб'яднанні з Літвой.

Асобна хочацца сказаць аб пазіцыі гісторыкаў з Гродна І. І. Коўкеля і Э. С. Ярмусіка, якая адлюстравана ў іх сумеснай працы. Гэта адзіны такі курс лекцый, у якім тэматыка Літоўска-Беларускай ССР так падрабязна распрацавана і ахарактарызаваны яе розныя аспекты: палітыка ўрадавых устаноў і палітычных арганізацый на тэрыторыі ЛіБ ССР, культурнае і сацыяльна-эканамічнае становішча краю і інш. Абыйшоўшы спрэчныя пытанні аб прычынах утварэння ЛітБела, яе тэрыторыі, тэрміне існавання, аўтары

---

[333] Там жа. – С. 67.
[334] Там жа. – С. 68.
[335] Там жа; Чигринов П. Г. Очерки истории Беларуси: Учеб. пособие для вузов. – Мн., 2000. – С. 324; Гісторыя Беларусі. У 2 ч. – Ч. 2. XIX-XX стагоддзі: Курс лекцый / П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў, П. І. Зялінскі і інш. – Мн., 2002. – С. 309-310; Гісторыя Беларусі: У 2 ч. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. – Мн., 1998. – С. 69.
[336] Гісторыя Беларусі. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г. – С. 70.
[337] Нарысы гісторыі Беларусі. – Ч. 2. – С. 68 (спасылка на НАРБ. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 5. Арк. 43).
У гэтым жа выглядзе цытата была перапісана П. Г. Чыгрынавым. (Гл.: Чигринов П. Г. Очерки истории Беларуси. – С. 324).
[338] Гісторыя Беларусі. – Ч. 2. XIX-XX стагоддзі. – С. 309.
[339] Ковкель И. И., Ярмусик Э. С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени. – Мн., 1998. – С. 352.

раскрылі іншыя старонкі гісторыі Беларусі за 1919 – 1920 гады, што прымушае па-новаму глядзець на гэтае дзяржаўнае ўтварэнне. Аўтарская канцэпцыя пытанняў ЛітБела прыцягвае ўвагу лагічнай даказальнасцю. У прыватнасці, у кнізе раскрыта прадгісторыя аб'яднання Літвы і Беларусі і зроблены вывад аб тым, што «ідэя ўтварэння адзінай літоўска-беларускай дзяржаўнасці ўжо была шырока вядома грамадскасці, і ЦК РКП(б) яе падтрымаў, прыняўшы адпаведнае рашэнне, *што не сустрэла супраціўлення* [курсіў аўтараў. – Л. М., У. М.] ні з беларускага, ні з літоўскага боку".[340] Пры блізкім разглядзе аргументацыі аўтараў аб шырокай распаўсюджанасці ідэі аб'яднання Літвы і Беларусі яе можна прыняць толькі з вялікай нацяжкай. У І. І. Коўкеля і Э. С. Ярмусіка свой погляд і на падзел БССР у сярэдзіне 1919 г. Ён тлумачыцца "сепаратызмам" партыйнага і савецкага кіраўніцтва Магілёўскай і Віцебскай губерняў, які "падаграваўся" рашэннем ЦК РКП(б) ад 16 студзеня 1919 г. аб граніцах БССР.[341]

Каб лягчэй разабрацца з **прычынамі абвяшчэння ЛітБела** можна падзяліць іх на тры групы. Першая – гэта тыя матывы, што былі названы ў афіцыйным друку, рэзалюцыях і пратаколах партыйных органаў і з'ездаў Саветаў Беларусі і Літвы. Другая – тыя, што матывіравалі гэтае рашэнне як аб'ектыўнае і былі зафіксаваны ва ўспамінах і артыкулах кіраўнікоў РСФСР, БССР і ЛітБел ССР і г. д. Трэцяя група прычын – гіпатэтычныя, з разраду тых, якія называць было не прынята, каб не прынізіць аўтарытэт РКП(б) і савецкіх органаў улады РСФСР у ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі, ці тыя, што ўвогуле з'яўляюцца неверагоднымі.

Што тычыцца першай групы прычын. Аўтар раздзела "Нарысаў" лічыў, што важнейшай задачай ЛітБела "ў суровыя гады грамадзянскай вайны" было "падаўленне супраціўлення звергнутых класаў і арганізацыя абароны рэспублікі ад іншаземных інтэрвентаў, барацьба з разрухай у народнай гаспадарцы і ўмацаванне на гэтай падставе савецкай улады".[342] Пагроза вайны з боку буржуазна-памешчыцкай Польшчы, а таксама неабходнасць "засцерагчы гэтыя рэспублікі ад магчымага праяўлення ў іх нацыянальна-шавіністычных імкненняў", як галоўныя фактары аб'яднання часткі БССР з Літоўскай ССР, называюцца ў вучэбным дапаможніку пад рэдакцыяй Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля, а таксама ў "Нарысах" і П. Г. Чыгрынавым.[343] Называючы толькі гэтыя прычыны без спасылак на дакументы, аўтары паўтарылі ідэалагічныя штампы, якія сталі гістарыяграфічнай традыцыяй.

Да другой групы матываў можна аднесці, па-сутнасці, правільнае заяўленне У. І. Леніна аб жаданні стварыць буфер, каб абараніць Савецкую ўладу.[344] Абгрунтаванне неабходнасці аб'яднання ССРБ і ЛССР гэтай прычынай у большасці школьных падручнікаў і дапаможнікаў для ВНУ, на наш погляд, з'яўляецца метадалагічна верным. Але, на жаль, у вучэбнай літаратуры не гаворыцца аб неэфектыўнасці гэтага буфера, што неабходна ўлічваць пры выкладанні праблем гісторыі станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці.

---

[340] Там жа. – С. 353.
[341] Там жа. – С. 351.
[342] Нарысы гісторыі Беларусі. – Ч. 2. – С. 69.
[343] Гісторыя Беларусі. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г. – С. 71, Чигринов П. Г. Очерки истории Беларуси. – С. 325.
Як адзначыў П. Г. Чыгрынаў, гэтая традыцыя была запазычана ім з кнігі "История Белорусской ССР" (Мн., 1977. – С 255).
[344] Гісторыя Беларусі. – Ч. 2. XIX-XX стагоддзі. – С. 309.

Да гіпатэтычных матываў можна аднесці наступныя: "Стварэннем ЛітБела як бы здымалася пытанне аб правамернасці далучэння ўсходніх этнічных беларускіх зямель да РСФСР".[345] Да гэтых прычын адносіцца сцвярджэнне і аб тым, што ўключаныя ў склад РСФСР Магілёўская і Віцебская губерні, калі іншыя тэрыторыі Беларусі будуць захоплены Польшчай, у будучым могуць стаць асновай для аднаўлення беларускай дзяржаўнасці.[346] Ідэя не новая, але нічога не даказвае, што савецкая ўлада і бальшавіцкае кіраўніцтва РСФСР мелі такія далёкаідучыя планы адносна перспектыў беларускай дзяржаўнасці.

Для падручнікаў, прызначаных даць больш глыбокія веды аб сутнасці гістарычных з'яў, мала назваць афіцыйную матывацыю, крытычнае вывучэнне курса павінна выклікаць самастойныя разважанні ў студэнтаў. Але ж выкладаць гіпотэзы, якія мяжуюць з даследчыцкімі імправізацыямі і не падмацоўваюцца аргументамі, справа не ўдзячная.

Па праблеме **тэрыторыі** Літоўска-Беларускай ССР у навуковай літаратуры таксама няма адзінай думкі, што звязана з адсутнасцю дакумента, у якім бы дакладна вызначаліся яе межы. Магчыма таму ў большасці вучэбных дапаможнікаў гэтае пытанне прадбачліва абыйдзена, як быццам бы яно не прынцыповае. Гэтае, на першы погляд, бяскрыўднае ўпушчэнне ў непадрыхтаванага чытача стварае памылковае ўяўленне аб тым, што пасля адыходу да РСФСР трох губерняў астатнія этнічна беларускія землі[347] і літоўскія ўвайшлі ў літоўска-беларускі дзяржаўны новаўтвор. Але такое ўяўленне не адпавядае рэчаіснасці: частка Літвы знаходзілася пад кантролем буржуазнай літоўскай Тарыбы, частка беларускіх зямель ужо ў канцы лютага 1919 г. была акупіравана польскімі войскамі.

Але тыя нешматлікія падручнікі, аўтары якіх усё ж адважваюцца пералічыць губерні літоўска-беларускай дзяржавы не адрозніваюцца ўзгодненасцю пазіцый. Так, у дапаможніках П. Г. Чыгрынава тэрыторыя ЛітБела акрэсліваецца ў межах Мінскай, Віленскай і часткі Ковенскай губерняў з насельніцтвам больш як 4 млн. чалавек.[348] (Гродзеншчына магла быць не названа ім у сувязі з тым, што яе частка ў студзені – лютым 1919 г. была захоплена польскімі войскамі).

У "Гісторыі Беларусі" пад рэдакцыяй Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля ў склад ЛітБела ўключаны Мінская, Гродзенская, Віленская, Ковенская і частка Сувалкаўскай губерняў. Пры гэтым, колькасць насельніцтва называецца такая

---

[345] Там жа.

[346] Упершыню падобную гіпатэтычную ідэю выказаў М. І. Кулічэнка. Яе ж падтрымалі Р. П. Платонаў і М. С. Сташкевіч. (Гл.: Куличенко М. И. Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса в 1918 – 1920 гг. – Харьков, 1963. – С. 248; Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе. Образование БССР // Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. В 3 ч. – Ч. 2. У истоков политического противостояния. Материалы и документы из истории общественных движений и политических партий Республики Беларусь. – Гомель, 1993. – С. 132).

[347] З "Постановления I съезда КП(б) Б о границах Белорусской Советской Социалистической Республики" ад 30 снежня 1918 г. вынікала, што ў ССРБ павінны былі ўвайсці Мінская, Магілёўская, Смаленская, Віцебская, Гродзенская губерні з часткамі прылеглых да іх зямель, населеных у большасці беларусамі – у Ковенскай губерні – гэта частка Нова-Александраўскага павета, у Віленскай – Вілейскі і часткі Свянцянскага і Ашмянскага паветаў, у Чарнігаўскай – Суражскі, Мглінскі, Навазыбкаўскі паветы, у Сувалкаўскай губерні – Аўгустоўскі павет. (Гл.: История Беларуси в документах и материалах / Авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Мн., 2000. – С. 339)

[348] Чигринов П. Г. Очерки истории Беларуси. – С. 325; ён жа. История Беларуси: (в помощь абитуриенту). – Мн., 2001. – С. 299; ён жа. История Беларуси: Пособие для абитуриентов. – Мн., 2003. – С. 299.
Гэтыя дадзеныя П. Г. Чыгрынаў не крытычна запазычыў з аднатомніка "История Белорусской ССР" (С. 255), які выйшаў у свет у 1977 г. і быў падрыхтаваны на аснове пяцітомнага выдання "Гісторыя Беларускай ССР" (Мн., 1971 – 1975).

жа.[349] У курсе лекцый для студэнтаў гістфакаў, падрыхтаваным кафедрай гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ, які выйшаў у свет у канцы 2002 г., прыведзены іншыя, новыя для вучэбнай літаратуры дадзеныя па гэтых пытаннях. У раздзеле аб Літоўска-Беларускай ССР сказана, што ў склад яе ўваходзілі Мінская, Гродзенская, Віленская і часткова Ковенская губерні з больш чым шасцімільенным насельніцтвам.[350]

Але калі звернемся да "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі", то ўпэўнімся ў тым, што ў склад ЛітБела ўваходзіла тэрыторыя Віленскай, Мінскай, часткі Ковенскай і Гродзенскай губерняў "з насельніцтвам каля 4 млн. чал."[351] Хутчэй за ўсё частка (дакладней Аўгустоўскі павет) Сувалкаўскай губерні не заўсёды называецца ў сувязі з ліквідацыяй гэтай адзінкі. Добра, што аўтары хоць Гродзеншчыну не забылі ўключыць у склад ЛітБел ССР, як гэта зрабіў П. Г. Чыгрынаў!

У навейшых вучэбных дапаможніках для студэнтаў юрыдычных і гістарычных спецыяльнасцей пытанне аб тэрыторыі Літоўска-Беларускай ССР трактуецца па-рознаму. Так, гісторык-правазнаўца А. Ф. Вішнеўскі ў вучэбнай кнізе для студэнтаў юрыдычных і гістарычных спецыяльнасцей называе звесткі,[352] якія супадаюць з тымі, што маюцца ў вучэбным дапаможніку для вышэйшых навучальных устаноў пад рэдакцыяй Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. А ў кнізе В. А. Круталевіча і Я. А. Юхо чытаем наступнае: "У склад рэспублікі *збіраліся* [курсіў аўтараў. – Л. М., У. М.] уключыць пяць губерняў: Мінскую, Гродзенскую, Віленскую, Ковенскую і Сувалкаўскую. Пры вызначэнні граніц з РСФСР ЦВК і ўрад ЛітБела згадзіліся на перадачу РСФСР Дзісенскага павета Віленскай губерні і Рэчыцкага павета Мінскай губерні".[353] Праўда, аўтары не ўдакладнілі, да якога часу адносіцца такая "перадача" тэрыторыі, але сам гэты факт гістарыяграфічна паказальны і сведчыць аб заблытанасці пытання. І яшчэ звернем увагу на тое, што дасведчаныя гісторыкі дзяржавы і права, калі пішуць пра тэрыторыю ЛітБела, то гавораць аб гэтым як намеры савецкага ўрада, а не як пра здзейснены факт.

Як бачым, і пытанне аб тэрыторыі і межах Літоўска-Беларускай ССР, і колькасці яе насельніцтва ў вучэбнай, як увогулле і ў навуковай, літаратуры пакінута на адвольныя інтэрпрэтацыі навучэнцаў.

Дарэчы, у вучэбнай літаратуры па рознаму падаецца і **пытанне аб часе ліквідацыі ЛітБел ССР**. Да канчатковага вырашэння праблемы перыядызацыі нацыянальна-дзяржаўнага працэсу на Беларусі (а ўзгодненай датыроўкі няма і па БНР, і па БССР) яно выкладаецца "эзопавай моваю".

У прыватнасці, акадэмічныя "Нарысы" паведамляюць аб тым, што "16 ліпеня 1919 г. СНК ЛітБела спыніў сваю дзейнасць, кіраванне свабоднымі паветамі перадаў Мінскаму губрэўкому".[354] Кадры СНК былі накіраваны на фронт і ў тыл ворага для падпольнай работы. Паколькі Літоўска-Беларускай

---

[349] Гісторыя Беларусі. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г. – С. 71.
[350] Гісторыя Беларусі. – Ч. 2. XIX-XX стагоддзі. – С. 311-312.
Аўтарам раздзела курса лекцый з'яўляецца У. Ф. Ладысеў. Ен паўтарыў дадзеныя па ЛітБелу, якія прыводзіліся ў раней згаданай манаграфіі, падрыхтаванай ім разам з П. І. Брыгадзіным.
[351] Ціхаміраў А. Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. –Т. 4. – Мн., 1997. – С. 383.
[352] Вішнеўскі А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. – Мн., 2000. – С. 181.
[353] Круталевіч В. А., Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.). – 2-е выд. – Мн., 2000. – С. 46.
[354] Нарысы гісторыі Беларусі. – Ч. 2. – С. 69-70. Такая ж фармулёўка сустракаецца ў П. Г. Чыгрынава. (Гл.: История Беларуси (в помощь абитуриенту). – С. 300).

ССР ужо не існавала Цэнтральны Камітэт КП(б) ЛіБ, ЦК Беларускай Камуністычнай арганізацыі, ЦК Бунда, ЦБ прафсаюзаў г. Мінска і Мінскай губерні 31 ліпеня 1920 г. на ўрачыстым пасяджэнні прынялі Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі.[355] Але такая інтэрпрэтацыя фактаў не азначае, што ўрад быў распушчаны да жніўня 1919 г. поўнасцю – не ўзгадваецца лёс Савета абароны і ЦВК ЛіБ ССР.

У некаторых новых падручніках працэс ліквідацыі рэспублікі ўдакладнены новымі падрабязнасцямі – праз два дні, 19 ліпеня 1919 г., ЦВК ЛітБела скасаваў Савет абароны рэспублікі[356] і перадаў яго функцыі Рэўваенсавету Заходняга фронту.[357] Чытачам падручнікаў даецца паняць, што ўрад рэспублікі летам 1919 г. фактычна быў разфарміраваны. Але "юрыдычным канцом" ЛітБела называюць усё ж 12 ліпеня 1920 г., дзень заключэння дагавора паміж РСФСР і Літвой.[358] У вучэбных дапаможніках, аўтарамі якіх з'яўляюцца А. Ф. Вішнеўскі і Т. І. Доўнар, сцвярджаецца, што Літоўска-Беларуская ССР "фармальна" праіснавала да ліпеня 1920 г., калі "адбылося другое абвяшчэнне БССР".[359] А "фактычна", на іх думку, ЛітБел перастала існаваць у жніўні 1919 г., калі яна "была поўнасцю акупіравана польскімі войскамі". У вучэбнай літаратуры сустракаюцца і зусім адвольныя імправізацыі ў вызначэнні тэрміна існавання Літоўска-Беларускай ССР. Так, У. І. Маліноўскі ўпэўнены і пераконвае ў гэтым студэнтаў, што "як самастойная рэспубліка ЛітБел праіснавала ўсяго адзін месяц".[360]

Утварэнне ЛітБела сапраўды трэба вывучаць у кантэксце нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на Беларусі ў 1918 – 1922 гг. Пры ўважлівым разглядзе гэтага пытання аказваецца, што аб'ектыўная ацэнка Літоўска-Беларускай ССР карэнным чынам змяняе ўяўленне аб першым абвяшчэнні БССР. Калі мы прымаем за аснову канцэпцыю М. В. Біча, У. Н. Сідарцова, В. М. Фаміна і інш., то аб'яднанне Літвы і Беларусі прадстаўляецца палітычным манеўрам бальшавіцкага ўрада ў адносінах да беларускай дзяржаўнасці. Калі арыентуем моладзь на довады Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля, І. І. Коўкеля, М. С. Сташкевіча, то ва ўтварэнні ЛітБела бачыцца толькі адзін аб'ектыўны матыў – стварэнне буферу. Калі адкінуць ідэалагічныя ўстаноўкі і розныя ўсхваленні савецкіх часоў аб мудрай нацыянальнай палітыцы бальшавіцкай партыі, то атрымоўваецца, што першае абвяшчэнне БССР, як правільна называецца яно ў "Нарысах" – "тэрміновае", было заўчасным нараджэннем суверэннай дзяржавы. Канстытуцыйнае зацвярджэнне БССР адбылося толькі пасля падзелу этнічнай тэрыторыі беларусаў – адну частку перадалі РСФСР, а другую ўключылі у новую дзяржаву з назвай Літоўска-Беларуская ССР, у якой нічога беларускага не было – ні мовы, ні газет, ні нават членаў урада.

---

[355] Нарысы гісторыі Беларусі. – Ч. 2. – С. 69-70.

[356] 19 красавіка 1919 г. ЦВК і СНК ЛіБ стварылі Савет абароны (старшыня – В. Міцкявічус-Капсукас), які ажыцяўляў ваенную і цывільную ўладу.

[357] Гісторыя Беларусі. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г. – С. 74; Гісторыя Беларусі. – Ч. 2. XIX-XX стагоддзі. – С. 315.

[358] Гісторыя Беларусі. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г. – С. 96; Гісторыя Беларусі. – Ч. 2. XIX-XX стагоддзі. – С. 324.

[359] Вишневский А. Ф., Довнар Т. И. История государства и права Беларуси (1917 – 1996 гг.) Курс лекций. – Мн., 1996. – С. 23; Вішнеўскі А.. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. – Мн., 2000. – С. 181.

[360] Малиновский В. И. История белорусской государственности: Учеб. пособие для студентов вузов, слушателей системы последипломного образования. – Мн., 2003. – С. 158.
Праўда, у другім месцы вучэбнага дапаможніка, ён напісаў наступнае: "Аднак у ліпені [1919 г. – Л. М., У. М.] тэрыторыя абедзвюх рэспублік была акупіравана польскімі войскамі і новае дзяржаўнае ўтварэнне спыніло сваё існаванне". (Гл.: Малиновский В. И. История белорусской государственности: Учеб. пособие для студентов вузов, слушателей системы последипломного образования. – С. 180)

Зразумела, што студэнцкая моладзь карыстаецца не толькі навейшымі выданнямі падручнікаў, якія рэкамендаваны Міністэрствам адукацыі РБ. Як правіла, вывучэнне гістарычнага курса вядзецца па ўсёй даступнай літаратуры. І ў адрозненне ад школьнага вывучэння, якое жорстка кантралюецца вучэбнымі праграмамі, выкладанне ў вышэйшых навучальных установах вядзецца больш дэмакратычна – у адпаведнасці з асабістымі навуковымі напрацоўкамі і ідэалагічным вопытам выкладчыка. Менавіта ад яго пераважна залежыць узровень падрыхтоўкі студэнтаў па курсу гісторыі Беларусі. Менавіта ён мае магчымасць дапамагчы зарыентавацца ў вялікай колькасці падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, і разабрацца з гістарыяграфічнай чахардой і акрэсліць найбольш узважаную і абгрунтаваную пазіцыю ў адносінах да складаных гістарычных падзеяў і з'яў.

Такім чынам, адзначым, што практычна ні на адно з асноўных пытанняў па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР няма адназначнага, пэўнага і дакладнага адказа як у навукова-даследчыцкай літаратуры, так і ў падручніках і вучэбных дапаможніках па гісторыі Беларусі для сярэдняй і вышэйшай школы. Прычын, якія абумовілі такое становішча, шмат, але галоўнымі з іх з'яўляюцца наступныя: слабая вывучанасць гісторыі Літоўска-Беларускай ССР і не крытычныя адносіны навукоўцаў да архіўных і апублікаваных крыніц і прац сваіх папярэднікаў. У вучэбную літаратуру часта пападаюць выпадковыя дадзеныя і сведчанні з выпадковых гістарыяграфічных і архіўных крыніц, якія затым тыражыруюцца. У сувязі з гэтым ў аўтараў манаграфіі ўзнікла сваё бачанне супярэчлівых і спрэчных пытанняў, а часам і навуковаабразных імправізацый і гіпатэтычных меркаванняў, якія маюцца ў вучэбнай літаратуры і перакачавалі ў яе з даследчыцкіх прац. Думаем, што палажэнні, якія выкладзены ў заключэнні нашага даследавання, ў пэўнай меры могуць быць выкарыстаны ці ўлічаны настаўнікамі і выкладчыкамі – гісторыкамі навучальных устаноў.

# ГЛАВА 5

## РАСІЙСКА-ЛІТОЎСКІ ДАГАВОР 12 ЛІПЕНЯ 1920 Г.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

Адным з істотных хібаў савецкай і айчыннай гістарычнай навукі пры вывучэнні гісторыі Беларусі з'яўляецца тое, што яна да сённяшняга часу разглядаецца як ізаляваны аб'ект. Гэта свайго роду "самадастатковасць" стала прычынай няпоўнага, аднабаковага асвятлення шэрага важнейшых аспектаў айчыннай гісторыі.

Такая гістарыяграфічная традыцыя склалася пад уплывам камуністычнай монаідэалогіі, калі рэгіянальныя навуковыя і навучальныя ўстановы даследавалі лакальныя тэмы, а ў цэнтры распрацоўваліся буйныя, міжнароднага характару праблемы. Што тычылася пытанняў міжнацыянальных адносін, этнічнай кансалідацыі савецкіх народаў, іх тэрытарыяльнага размежавання і ўсталявання дзяржаўных граніц, то яны знаходзіліся пад асаблівым палітыка-ідэалагічным наглядам. На некаторыя з іх было накладзена табу, бо "вольная" іх інтэрпрэтацыя магла нанесці шкоду "непарушнаму брацтву згуртаваных савецкіх народаў". У сувязі з распадам СССР і знікненнем ідэалагічнага дыктату КПСС у пачатку 1990-х гадоў гэтыя аспекты пачалі актыўна вывучацца ў гістарычнай навуцы дзяржаў постсавецкай прасторы. У гэтым упэўніваешся, калі знаёмішся з манаграфічнымі даследаваннямі, зборнікамі матэрыялаў, з праграмамі і апублікаванымі ў гістарычнай перыёдыцы справаздачамі пра міжнародныя, рэгіянальныя, рэспубліканскія і іншыя навуковыя канферэнцыі, якія былі праведзены за апошнія 10 гадоў у Беларусі, Расіі, Польшчы, Літве, Украіне.

Гісторыя Беларусі новага і найноўшага часу фарміравалася не толькі, а можа, і не столькі пад уплывам унутраных працэсаў і фактараў, колькі пад уздзеяннем знешнепалітычных сіл як суседніх дзяржаў — Расіі, Польшчы, Украіны, Літвы, Латвіі, так і Германіі, Францыі, Англіі і ЗША. У пераломныя моманты айчыннай і сусветнай гісторыі ўплыў гэтых дзяржаў на лёс Беларусі і іх роля перш за ўсё ў фарміраванні нацыянальнай дзяржаўнасці былі значныя, а ў шэрагу выпадкаў і вызначальныя. Таму паказ гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў геапалітычным кантэксце ўяўляецца не толькі актуальным, але і практычна значным для сучаснай палітыкі.

Адным з малавывучаных пытанняў айчыннай гістарыяграфіі з'яўляецца расійска-літоўскі дагавор, які быў падпісаны ў Маскве 12 ліпеня 1920 г. На наш

погляд, гэты дагавор па свайму значэнню знаходзіцца ў адным шэрагу такі актаў, як Брэсцкі (1918 г.) і Рыжскі (1921 г.) мірныя дагаворы, што был заключаны без удзелу прадстаўнікоў беларускага народа і адыгралі істотнук негатыўную ролю ў яго лёсе. Глыбокія адмоўныя наступствы гэтага дагавора асабліва адбіліся на тэрытарыяльнай і этнічнай кансалідацыі беларускай нацыі, фарміраванні яе дзяржаўных граніц у XX ст.

Нягледзячы на актуальную неабходнасць усебаковага і дакладнага аналізу расійска-літоўскага дагавора, ацэнкі яго месца і значэння ў гісторыі Беларусі Расіі, Літвы і Польшчы, уплыву яго на еўрапейскі палітычны клімат 1920 - 1930-х гадоў, ён да нядаўняга часу заставаўся на перыферыі даследчыцкага поля беларускай і літоўскай гістарыяграфій. У савецкай гістарычнай літаратуры, уключаючы беларускую і літоўскую, гэты дагавор часцей за ўсё без грунтоўнага аналізу прычын і ўмоў яго заключэння ацэньваўся толькі станоўча падкрэслівалася вялікае яго значэнне для лёсу літоўскай дзяржавы. З тымі ц іншымі акцэнтамі даследчыкі адзначалі наступныя яго пазітыўныя аспекты.

**Першы.** Заключаючы мірны дагавор з Літвой, Савецкая Расія, кіравалася ленінскімі прынцыпамі нацыянальнай палітыкі. Яна першай юрыдычна прызнала факт існавання незалежнай літоўскай дзяржавы, чаго не зрабілі н Англія, ні Францыя, ні ЗША, да якіх Літва не раз звярталася. Гэты дагавор значна ўмацаваў міжнароднае становішча літоўскай дзяржавы.

**Другі.** Расія "па добрай волі і на вечныя часы" адмовілася ад усі суверэнных правоў "над літоўскім народам і яго тэрыторыяй" (арт. 1 дагавора). У адпаведнасці з дагаворам Літве перадаваўся Віленскі край з горадам Вільня. Такім чынам, была створана юрыдычная база для барацьбы літоўскага народа за Вільню на міжнароднай арэне. Дагавор з'явіўся важнай перашкодай для кіраўнікоў імперыялістычных дзяржаў вырашыць спрэчку паміж Літвой Польшчай на карысць апошняй.

**Трэці.** Мірны дагавор сарваў задумы імперыялістаў уключыць Літву ў барацьбу супраць Савецкай Расіі і тым самым умацаваў самастойнасць літоўскай дзяржавы.

**Чацвёрты**. Дагавор перашкодзіў заходнім дзяржавам вырашаць лёс літоўскай дзяржавы, сарваў іх намеры падпарадкаваць Літву інтарэсам буржуазна-памешчыцкай Польшчы.

**Пяты.** На аснове мірнага дагавора з РСФСР і актыўнай дыпламатычнай падтрымкі савецкага ўрада Літва не прызнала рашэння канферэнцыі паслоў краін Антанты ад 15 сакавіка 1923 г., адпаведна з якім былі вызначаны граніцы Польшчы і Літвы на аснове status gvo, а Віленшчына і Вільня пакідаліся за Польшчай.

Такія ацэнкі расійска-літоўскага мірнага дагавора ад 12 ліпеня 1920 г., па сутнасці, былі афіцыйнымі ў савецкай гістарыяграфіі. Яны пачалі складвацца ў знешнепалітычнай прапагандзе адразу ж пасля падпісання дагавора. Потым у розных варыяцыях трапілі ў навуковыя публікацыі і да сярэдзіны 1960-х гадоў сфарміраваліся ва ўстойлівую гістарыяграфічную традыцыю[361]. Асабліва шмат для яе ўмацавання зрабілі літоўскія гісторыкі падчас так званай хрушчоўскай адлігі ў грамадска-палітычным і ідэалагічным жыцці Савецкага Саюза. Першымі з гісторыкаў, хто пачаў вывучаць расійска-літоўскі дагавор у

[361] Александров Б. Виленский вопрос // Международная жизнь. – 1926. – № 11. – С. 3-16; Бах М. Г. Политико-экономические взаимоотношения между СССР и Прибалтикой за десять лет (1917 – 1927 гг.). – М., 1928. – С. 36-37; Иванов Л. Польско-литовский конфликт // Мировое хозяйство и мировая политика. – 1938. – № 5. – С. 115-120.

кантэксце літоўска-польскіх узаемаадносін і віленскага канфлікту, пазіцыю ў адносінах да іх савецкай краіны, былі Ю. Жугжда, Р. Жэпкайтэ і К. Навіцкас. Яны надрукавалі на літоўскай мове некалькі манаграфій[362] і грунтоўных артыкулаў у навуковай перыёдыцы.[363] Некалькі пазней працы К. Навіцкаса і Р. Жэпкайтэ выйшлі ў свет і на рускай мове.[364] У іх з рознай ступенню паўнаты выкладзены шэраг пытанняў па гісторыі перагавораў аб падрыхтоўцы мірнага трактата – ад прапановы савецкага ўрада 11 верасня 1919 г., іх пачаткам 7 мая 1920 г. да яго заключэння 12 ліпеня 1920 г. У цікавай і змястоўнай манаграфіі К. Навіцкаса "Литва и Антанта" паказаны прычыны, па якіх літоўская дэлегацыя на чале з Ф. Нарушавічусам адкладвала пачатак перагавораў, а потым зацягвала іх. Аўтар пераканаўча паказаў, што дынаміка перагавораў была абумоўлена поспехамі і паражэннямі савецкіх войскаў і сіл краін Антанты на франтах грамадзянскай вайны. К. Навіцкас зрабіў абгрунтаваную выснову, што літоўская дыпламатыя ішла ў фарватэры англійскай палітыкі, і савецка-літоўскі дагавор быў падпісаны з "велікадушнай згоды" Англіі, кіраўнікі якой убачылі, што спробы трэцяга ўзброенага паходу супраць Расіі пацярпелі паражэнне. Дагавор, як заключыў аўтар, адпавядаў інтарэсам Англіі, якая імкнулася да аддзялення ад Расіі Прыбалтыйскіх краін, якія па дамоўленасці з дзяржавамі Антанты ўваходзілі ў сферу яе палітычнага і эканамічнага ўплыву. Р. Жэпкайтэ акцэнтавала ўвагу на тым, што згодна дагавору ад 12 ліпеня 1920 г. савецкі ўрад прызнаў суверэнітэт Літвы над Вільняй Віленскім краем. Палажэннямі, якія выкладзены ў ім, ён паслядоўна кіраваўся да канчатковага вырашэння Віленскага канфлікту ў 1939 г. Найбольш яскрава пазіцыя Савецкага Саюза ў віленскім пытанні, паводле меркавання даследчыцы, праявілася ў кастрычніку 1939 г., калі, улічваючы нацыянальныя пажаданні літоўскага народа і яго барацьбу за Вільню, савецкая дзяржава аддала Літве горад і Віленскі край і "паклала канец так званаму Віленскаму канфлікту".

Літоўскія гісторыкі абаранілі шэраг доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па праблемах станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці, літоўска-польскіх і літоўска-расійскіх адносін, палітыкі дзяржаў Антанты ў адносінах да літоўскай дзяржавы.[365] Да іх тэматычна далучаецца і кандыдацкае даследаванне А. Рубцова, у якім разгледжаны французска-літоўскія адносіны ў пачатку 1920-х гадоў.[366] Па выніках дысертацый апублікаваны манаграфічныя работы.[367]

---

[362] Žiugžda J. Kataliku baznycios ekspansija i pabaltiji ir Rytu Europa. – Vilnius, 1962; ён жа. Lietuviu ir rusu tautu santykiai istorinio vystymosi eigoje. – Kaunas, 1964; Navickas K. TSRS vaidmuo, ginant Lietuva, nuo imperialistines agresijos.1920 – 1940 metais. – Vilnius, 1966.

[363] Žepkaite R. Lietuvos – tarubu rusijos taikos sutartis ir Vilnias klausimas // Труды Академии наук Литовской ССР. – Сер. А., 1963. – Т. 2 (15). – С. 107-120.

[364] Навицкас К. Литва и Антанта. – Вильнюс, 1970; Жепкайте Р. К вопросу о позиции советского государства в польско-литовском конфликте // Труды Академии наук Литовской ССР. – Сер. А. – 1971. – Т. 2 (36). – С. 147-160.

[365] Жепкайте Р. С. Борьба литовского народа за Вильнюс в 1918 – 1928 гг. Дис. ...канд. ист. наук. – Вильнюс, 1965. Навицкас К. Роль Советского Союза в деле защиты жизненных национальных интересов литовского народа в 1917 – 1940 гг.: Дис. ... докт. ист. наук. – Вильнюс, 1965; Жюгжда Р. Буржуазная Литва в планах империалистических государств (1919 – 1940 гг.) Дис. ... док. ист. наук. – Вильнюс, 1980; Жепкайте Р. С. Литовско-польские отношения 1919 – 1939 гг. и их место в политической констелляции северо-восточной Европы. Дис. ...докт. наук. – Вильнюс, 1983

[366] Рубцов А. Ф. Литва в восточноевропейской политике Франции 1918 – 1924 гг. – Томск, 1972.

[367] Žepkaite R. Lietuva tarptautines politikos labirintuose (1918 – 1922 m.). – Vilnius, 1973; яна ж. Diplomatija imperializmo tarnyboje. Lietuvos ir Lenkijos santykiai 1919 – 1939. – Wilno, 1980; Рубцов А.Ф. Литва в политике французского империализма. – Томск, 1988

Шэраг цікавых звестак, вывадаў і ацэнак, якія адносяцца да падрыхтоўкі і заключэння расійска-літоўскага дагавора, утрымліваецца ў манаграфіях эстонскіх і латышскіх гісторыкаў Х. Арумяэ, А. Варславана і В. Сіполса, якія прааналізавалі палітыку краін Антанты і Польшчы ў адносінах да Прыбалтыйскіх рэспублік і іх спробы стварыць антысавецкі "Балтыйскі саюз", падрыхтоўку і заключэнне мірных дагавораў Расіі з Эстоніяй (2 лютага 1920 г.) і Латвіяй (11 жніўня 1920 г.).[368]

Аднак патрэбна адзначыць, што ў абагульняючых працах па гісторыі Беларусі і Літвы, савецкай знешняй палітыкі і дыпламатыі, міжнародных адносін, якія выйшлі ў свет у 1970 – 1980 гадах, факт заключэння расійска-літоўскага дагавора толькі згадваўся, як кажуць, без каментарыяў. Пры гэтым пра яго гаварылася ў адным шэрагу з дагаворамі, якія былі падпісаны Савецкай Расіяй з Эстоніяй і Латвіяй.[369] Такая канстатацыя нязменна суправаджалася ідэалагізаванымі размовамі пра "буйную перамогу знешняй палітыкі савецкай дзяржавы", пра тое, што на аснове гэтых дагавораў "былі ўстаноўлены нармальныя дыпламатычныя адносіны паміж Савецкай Расіяй і суседнімі буржуазнымі дзяржавамі Еўропы", што "савецкая дыпламатыя паспяхова разбурыла кола санітарнага кардона, які быў створаны Антантай вакол Савецкай краіны".[370]

Спашлёмся на такі цікавы гістарыяграфічны факт. Да 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў рэспубліках Савецкага Саюза былі выдадзены капітальныя работы пра ўсталяванне Савецкай улады ў нацыянальных рэгіёнах. У манаграфіі беларускіх гісторыкаў "Борьба за Советскую власть в Белоруссии" пра расійска-літоўскі дагавор ад 12 ліпеня 1920 г., які меў для рэспублікі лёсавызначальнае значэнне, не гаворыцца ні слова. У працы гісторыкаў Прыбалтыйскіх дзяржаў "Борьба за Советскую власть в Прибалтике" ёсць спецыяльны раздзел "Армия Литовско-Белорусской советской республики в боях против интервентов и белогвардейцев. Московский мир". Аднак пра гэты дагавор у раздзеле гаворыцца наступнае: "Урад буржуазнай Літвы заявіў пра сваю згоду прыняць прапанову Савецкай Расіі аб міры. 12 ліпеня 1920 г. у Маскве быў падпісаны мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй і Літвой".[371]

Пра расійска-літоўскі дагавор нічога не гаворыцца ў трэцім томе пяцітомнай "Гісторыі Беларускай ССР". У абагульняючай працы па гісторыі Літоўскай ССР дагавору адведзена некалькі радкоў. Яго ацэнка зведзена да наступнага: "Мірны дагавор у прынцыпе перашкаджаў задумам імперыялістаў уцягнуць Літву ў палітычныя інтрыгі супраць Краіны Саветаў і тым самым значна ўмацаваў міжнароднае становішча Літоўскай дзяржавы".[372]

Становішча ў савецкай гістарычнай навуцы, у тым ліку і ў саюзных рэспубліках, пачало прынцыпова мяняцца ў другой палове 1980-х гадоў. Новая ідэалагічная сітуацыя спрыяльна паўплывала і на вывучэнне ўмоў падрыхтоўкі і заключэння савецка-літоўскага мірнага дагавора. Яна асабліва плённа адбілася на

---

[368] Арумяэ Х. За кулисами "Балтийского союза". – Таллин, 1966; Варславан А. Политика английского империализма в отношении буржуазной Латвии (1920 – 1923 гг.). – Рига, 1966; Сиполс В. Тайная дипломатия: буржуазная Латвия в антисоветских планах империалистических держав 1919 – 1940 гг. – Рига, 1968.

[369] История внешней политики СССР. – Т. 1 (1917 – 1945 гг.). – Изд. 5-е, переработ. и доп. / Под ред. А. А. Громыко и Б.Н. Пономарева. – М., 1986; История международных отношений и внешней политики СССР (1917 – 1987 гг.). В 3 т. – Т. 1 (1917 – 1945 гг.). – М., 1986.

[370] История внешней политики СССР. – Т. 1 (1917 – 1945 гг.). – С. 110.

[371] Борьба за советскую власть в Прибалтике. – М., 1967. – С. 536.

[372] История Литовской ССР (с древнейших времен до наших дней). – Вильнюс, 1978. – С. 343.

даследаваннях літоўскіх гісторыкаў і ў меншай ступені яе выкарыстала беларуская гістарычная навука ў выніку традыцыйнага кансерватызму.

Так, да 70-годдзя пачатку замежнай узброенай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны ў Савецкай Расіі ў Маскве было выдадзена грунтоўнае абагульняючае даследаванне "Иностранная военная интервенция в Прибалтике. 1917 – 1922 гг." У гэтай калектыўнай працы літоўскіх, латышскіх і эстонскіх гісторыкаў маецца спецыяльны параграф – "Заключение советско-литовского мирного договора". На новых матэрыялах з Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літоўскай ССР і Архіва знешняй палітыкі СССР, з розных зборнікаў дакументаў, а таксама ўспамінаў, перыядычнага друку і навуковых прац у параграфе найбольш поўна на той час паказаны ўмовы і прычыны перагавораў аб міры, дыпламатычныя намаганні савецкага ўрада, якія былі накіраваны на хутчэйшы іх пачатак, а таксама ціск на Літву краін Антанты з тым, каб утрымаць яе на антысавецкіх пазіцыях і падпарадкаваць яе буржуазна-памешчыцкай Польшчы. Пра дзяржаўную граніцу паміж Савецкай Расіяй і Літвой у манаграфіі гаворыцца: "Ідучы насустрач пажаданням літоўскага боку, савецкі ўрад згадзіўся з устанаўленнем граніцы, пакідаючы за Літвой, акрамя Вільнюса, таксама важныя пункты Ашмяны, Ліду і Гродна, хоць там большасць насельніцтва былі не літоўцы, а беларусы".[373] Агульная характарыстыка дагавора з'яўляецца панегірычнай. Ён разглядаецца як адзін "з першых прыкладаў здзяйснення на практыцы мірнага суіснавання краін з розным сацыяльным ладам", яго заключэнне "азначала сур'ёзную перамогу міралюбівай ленінскай знешняй палітыкі савецкай дзяржавы".[374]

Беларускія даследчыкі ў грунтоўнай калектыўнай манаграфіі "Иностранная военная интервенция в Белоруссии. 1917 – 1920 гг." нават не згадалі пра гэты факт айчыннай гісторыі.[375] У "Нарысах гісторыі Беларусі", якія былі рэкамендаваны Міністэрствам адукацыі для студэнтаў ВНУ як вучэбны дапаможнік, пра гэтую падзею сказана вельмі коратка і заблытана. "У мэтах хутчэйшага завяршэння вайны, – адзначаецца ў нарысах, – пераходу працоўных да мірнага жыцця ўрад РСФСР 12 ліпеня 1920 г. падпісаў з буржуазнай Літвой мірны дагавор. Перамога літоўскай буржуазіі, падтрыманая германскімі і польскімі войскамі, белагвардзейцамі, узбраеннем Антанты, атрымала юрыдычнае прызнанне".[376] Аднак вядома, што пасля падпісання дагавора з Літвой вайна Савецкай Расіі не спынілася, а толькі дасягнула апагея – Чырвоная Армія мела тады найбольшы поспех у стратэгічным наступленні на Польшчу. Да гэтага патрэбна дадаць, што ў 16-м артыкуле расійска-літоўскага дагавора адзначалася: "Абодва бакі, якія дамаўляюцца, лічыліся з тымі абставінамі, што яны ніколі не знаходзіліся паміж сабой у становішчы вайны".[377]

Такая ж "заблытаная лаканічнасць" у ацэнцы дагавора характэрна і для вучэбнага дапаможніка для ВНУ "Гісторыя Беларусі"[378], які выйшаў у 1998 г. пад рэдакцыяй Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. Канстатуючы факт падпісання трактата, аўтары параграфа "Аднаўленне Беларускай ССР" пракаменціравалі яго наступным чынам: "Разлічваючы на перамогу савецкай улады ў Літве і яе магчымыя сутыкненні з Польшчай, урад РСФСР пайшоў на тое, каб уключыць частку тэрыторыі з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, Браслаў у

[373] Иностранная военная интервенция в Прибалтике. 1917 – 1922 гг. – М., 1988. – С. 270.
[374] Там жа. – С. 270, 273.
[375] Иностранная военная интервенция в Белоруссии. 1917 – 1920 гг. – Мн., 1990.
[376] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. – Ч. 2 / Касцюк М., Ігнаценка І., Вышынскі У. і інш. – Мн., 1995. – С. 70.
[377] Документы внешней политики СССР. – Т. 3. – М., 1959. – С. 39.
[378] Гісторыя Беларусі: У 2 ч. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г. – С. 95.

граніцы Літвы. Віленскі край з Вільняй таксама быў прызнаны часткаю Літвы".[379] Лагічна ўзнікае пытанне – навошта ўсё ж такі беларускія (а не нічыйныя, як вынікае з тэксту вучэбнага дапаможніка) тэрыторыі былі перададзены трэцяй краінай іншай дзяржаве? Які ж будзе фарміравацца менталітэт і мараль выкладчыкаў беларускай вышэйшай школы і студэнтаў, калі нават асобныя драматычныя і трагічныя падзеі ў гісторыі Айчыны паказваюцца як добрыя для яе?

Расійска-літоўскі дагавор прыкладна такім жа чынам прадстаўлены і ў іншых вучэбных дапаможніках і курсах лекцый для вышэйшай школы, у якіх яму адведзена некалькі радкоў. Так, у "Истории Беларуси с древнейших времен до нашего времени" І. І. Коўкеля і Э. С. Ярмусіка, адзначаецца наступнае: "Калі беларускія землі практычна былі вызвалены, на павестку дня паўстала пытанне аб аднаўленні савецкай дзяржаўнасці ў Беларусі. Яго ўзнікненне было выклікана тым, што ў Літве да ўлады прыйшлі буржуазія і памешчыкі, і ўрад РСФСР прызнаў незалежнасць Літоўскай рэспублікі, заключыўшы з ёй 12 ліпеня 1920 г. мірны дагавор. У сувязі з гэтым неабходнасць у далейшым захаванні ЛітБела адпала, і паўстала пытанне аб узнаўленні БССР як самастойнай Савецкай рэспублікі".[380]

Думаем, што чытачу не вельмі зразумела, што тут да чаго, а таму зробім некалькі каментарыяў.

**Па-першае**. "Пытанне аб аднаўленні савецкай дзяржаўнасці ў Беларусі ўзнікла не тады, калі "беларускія землі практычна былі вызвалены", а значна раней. Яшчэ ў маі 1920 г. па ініцыятыве А.Чарвякова, які ўзначальваў тады аддзел Рэўваенсавета Заходняга фронту праходзілі нарады камуністаў-беларусаў з абмеркаваннем аднаго пытання: "Аб аднаўленні савецкай улады і самавызначэнні Беларусі".[381] Таму другое абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі напрамую не было звязана з заключэннем дагавора.

**Па-другое**. Пытанне аб адраджэнні беларускай савецкай дзяржаўнасці не было выклікана тым, што "ў Літве да ўлады прыйшлі буржуазія і памешчыкі". Вядома, што літоўская буржуазія аказалася ва ўладзе значна раней. І дагавор аб міры РСФСР і Літва заключылі не таму, што буржуазія прыйшла да ўлады, бо менавіта гэтага і не хацелі бальшавікі, а для таго, каб Літва, як і іншыя Прыбалтыйскія дзяржавы, не была ўцягнута ва ўзброеную барацьбу супраць Савецкай Расіі.

**Па-трэцяе**. "Неабходнасць у далейшым захаванні ЛітБела адпала". Не летам 1920 г. Літоўска-Беларуская ССР спыніла сваё існаванне, а "фактычна і юрыдычна ў пачатку верасня 1919 г. у сувязі з захопам тэрыторыі рэспублікі польскімі войскамі і фактычным прызнаннем Літвы ўрадам РСФСР, якое ўтрымлівалася ў ноце яе наркамата замежных спраў ад 11 верасня 1919 г., у якой была прапанова літоўскаму ўраду ўступіць у перамовы аб заключэнні мірнага дагавору".[382]

**Па-чацвёртае**. Што хацелі сказаць аўтары дапаможніка пра расійска-літоўскі дагавор ад 12 ліпеня 1920 г.? Ні студэнты, ні іншыя чытачы так і не даведаюцца пра сутнасць дагавора і пра тое, якую драматычную ролю адыграў ён у гісторыі Беларусі.

---

[379] Там жа.
[380] Ковкель И. И., Ярмусик Э. С. История Беларуси с древнейших времен до нашего времени. – Мн., 1998. – С. 381.
[381] Гісторыя Беларусі. У 2 ч. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г. – С. 96.
[382] Малыхіна Л. Перыяд існавання і прычыны ліквідацыі Літоўска-Беларускай ССР: дыскусійныя пытанні // Гістарычны альманах. – 2003. – Т. 8. – С. 187.

У курсе лекцый "Гісторыя Беларусі", падрыхтаваным выкладчыкамі БДУ, таксама ёсць толькі канстатацыя таго, што "частка этнічнай беларускай тэрыторыі з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, а таксама Віленскі край і Вільня былі прызнаны часткай Літвы". Праўда, тут адзначаецца што "дагавор вырашаў на карысць Літвы пытанні аб прыналежнасці гістарычнай сталіцы Вялікага княства Літоўскага – Вільні, што з'яўлялася аб'ектам вострага супрацьстаяння паміж польскім і літоўскім кіраўніцтвам".[383] А якія ж былі наступствы для Беларусі?

Асобныя аспекты падрыхтоўкі і заключэння расійска-літоўскага дагавора ў апошні час атрымалі асвятленне ў манаграфіях беларускіх гісторыкаў. Гаворка ідзе перш за ўсё пра працу па гісторыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці перыяду яе станаўлення, аўтарам якой з'яўляецца вядомы даследчык гісторыі дзяржавы і права В. Круталевіч.[384] Разглядаючы праблему другога абвяшчэння Беларускай Савецкай Рэспублікі, аўтар у параграфе "Территориальный аспект национально-государственного самоопределения" адзначыў, што "вызначэнне граніц ССРБ у адпаведнасці з этнічным прынцыпам ускладніў падпісаны ў Маскве 12 ліпеня 1920 г. расійска-літоўскі мірны дагавор". Адпаведна з прыкладзенай да яго картай дзяржаўная граніца шчыльна падыходзіла да Валожына, Мядзела, Маладзечна, Вілейкі, пакідаючы за Літвой знакамітыя Браслаўскія азёры і жамчужыну беларускай прыроды – возера Нарач. Гэта толькі частка таго, як адзначыў гісторык, на што прэтэндавала літоўская дэлегацыя на перагаворах. Яна настойвала на ўключэнні ў склад Літвы не толькі Ковенскай, Сувалкаўскай, Віленскай і Гродзенскай губерняў, але таксама часткі Мінскай губерні. Упартасць літоўскіх дыпламатаў, на думку даследчыка, мела поспех. Напрыканцы перагавораў, як адзначае В. Круталевіч, Расія згадзілася на далучэнне да Літвы значнай беларускай этнічнай тэрыторыі.[385]

На нашу думку, у гэтым выпадку маюць рацыю аўтары вучэбнага дапаможніка пад рэдакцыяй Я. Новіка і Г. Марцуля, якія зрабілі вывад пра тое, што перадача беларускай тэрыторыі Літве была зроблена па ініцыятыве РСФСР.[386] Сведчаннем гэтага з'яўляецца і той факт, што амбіцыёзныя патрабаванні літоўскай дэлегацыі на перагаворах у пачатку рашуча былі адхілены савецкім бокам. Савецкая дэлегацыя магла не лічыцца з патрабаваннямі літоўцаў, у якой бы яны форме ні падаваліся. У той час Чырвоная Армія ўжо ўступіла ў Мінск і знаходзілася каля Вільні (як вядома, самы галоўны фактар рашэння палітычных, тэрытарыяльных і іншых пытанняў – "калі пушкі гавораць – дыпламаты маўчаць"). Не пагадзіліся б літоўская дэлегацыя і ўрад на заключэнне міру, адклалі б ці адхілілі яго, Вільня і ўся тэрыторыя Літвы аказаліся бы занятымі Чырвонай Арміяй. Гэта вельмі добра разумелі літоўцы. У тым становішчы такі дарагі тэрытарыяльны падарунак Літве мог паднесці больш моцны бок, які дыктаваў умовы мірнага дагавора. І ім была Савецкая Расія.

Перадачу Літве Віленшчыны і Гродзеншчыны В. Круталевіч назваў "відавочным адступленнем ад прынцыпу свабоднага самавызначэння нацыі",

[383] Гісторыя Беларусі. У 2 ч. Ч. 2. / П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў, П. І. Зялінскі і інш. – Мн., 2002. – С. 324

[384] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – 2-е изд. доп. – Мн., 2003.

[385] Там жа. – С. 375.

[386] Гісторыя Беларусі: У 2 ч. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г. – С. 96.

якi быў пакладзены ў аснову канцэпцыі савецка-літоўскага дагавора (арт. 1). Даследчык зазначыў, што "гэты зыходны пачатак не быў адпаведным чынам выкананы ў адносінах да Беларусі".[387] Ён прывёў пераканаўчыя дадзеныя Усерасійскага перапісу насельніцтва 1897 г., якія сведчаць, што ў перададзеных раёнах літоўцы складалі толькі ад 1,4 да 8 %.[388] Застаецца толькі дадаць, што нават у 1939 г. у Вільні пражывала не больш за 2 % літоўцаў. На наш погляд, В. Круталевіч правільна разгледзеў падатлівасць савецкага боку ў тэрытарыяльным пытанні, і была яна звязана "з планамі ўстанаўлення ў Літве ўлады Саветаў".[389] Расійскім падарункам літоўцам за кошт беларусаў адным з першых назваў тэрытарыяльную саступку па дагавору і А. К. Цітоў.[390]

З публікацый 1999 – 2003 гадоў, у якіх закранаюцца тыя ці іншыя аспекты падрыхтоўкі і заключэння расійска-літоўскага дагавора, яго наступстваў для Беларусі, неабходна назваць і працы А. В. Ціхамірава.[391] У артыкуле, які надрукаваны ў "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі", упершыню ў беларускай гістарычнай навуцы была вызначана негатыўная пазіцыя БНР у стаўленні да савецка-літоўскага дагавора, якая восенню 1920 г. аказалася прынцыпова супрацьлеглай: 11 лістапада 1920 г. урад БНР заключыў сакрэтнае пагадненне з урадам Літвы, па якому "ён абавязваўся падтрымліваць барацьбу літоўцаў за далучэнне зямель у граніцах, вызначаных дагаворам ад 12 ліпеня 1920 г."[392] У манаграфіі А. Ціхаміраа агульная характарыстыка дагавора дадзена на ўзроўні тых уяўленняў, якія склаліся ў савецкай і айчыннай гістарыяграфіі. Аднак адну новую ідэю аўтара варта вылучыць асобна. А. Ціхаміраў вельмі слушна заўважыў, што расійска-літоўскі дагавор "не толькі юрыдычна замацаваў факт адлучэння Літвы ад Расіі (хоць бы і Савецкай), аднак і стварыў юрыдычную аснову для яе прэтэнзій на Вільню і частку беларускіх зямель".[393]

Наш гістарыяграфічны аналіз будзе няпоўны, калі мы не скажам пра ацэнкі і характарыстыкі дагавора ад 12 ліпеня 1920 г. у даследаваннях сучасных літоўскіх гісторыкаў.

Найбольш змястоўным сярод іх з'яўляецца манаграфія літоўскага гісторыка Ч. Лаўрынавічуса.[394] Аўтар намагаўся прасачыць, якім чынам мірныя перагаворы і дагавор паміж Літвой і Савецкай Расіяй паўплывалі на працэс станаўлення літоўскай дзяржаўнасці. Ён сканцэнтраваў увагу толькі на трох пытаннях маскоўскіх перагавораў, якія, паводле яго меркаванняў, мелі "канстытуцыйнае значэнне для Літвы" – дзяржаўнае прызнанне Літвы, тэрытарыяльнае размежаванне і забеспячэнне яе бяспекі.

Манаграфія Ч. Лаўрынавічуса складаецца з дзвюх частак. У першай даецца кароткая палітычная характарыстыка Літвы і Савецкай Расіі і паказваюцца ўмовы, якія спрыялі абодвум бакам перайсці ад ваеннага супрацьстаяння да мірных перагавораў. У другой расказваецца пра ход мірных перагавораў, а таксама падрабязна разглядаецца абмеркаванне гэтых трох важных пытанняў

[387] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности. – 2-е изд. доп. – С. 376.
[388] Там жа. – С. 377.
[389] Там жа. – С. 376.
[390] Цітоў А. На поўнач ад Мінска // Казлоў Л., Цітоў А. Беларусь на сямі рубяжах. – Мн., 1993. – С. 31.
[391] Ціхаміраў А. В. Мірны дагавор паміж Літвой і РСФСР 1920 // ЭГБ. – Т. 5. Мн., 1999. – С. 206-207; ён жа. Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918 – 1921 гг.). – Мн., 2003.
[392] Ціхаміраў А. Мірны дагавор паміж Літвой і РСФСР 1920. – С. 207.
[393] Ціхаміраў А. В. Беларусь у сістэме міжнародных адносін. – С. 240.
[394] Laurinavicius C. Lietuvos – Sovietu Rusijos Taikos sutartis: (1920 m liepos 12 d. sutarties problema). – Vilnius, 1992.

Аўтар зрабіў вывад, што савецкая дэлегацыя на перагаворах кіравалася ўстаноўкай: як мага менш даваць Літве юрыдычных абавязацельстваў і як мага больш зрабіць яе залежнай ад Расіі. Разглядаючы тэрытарыяльную праграму літоўскай дэлегацыі, аўтар сцвярджаў, што яна "грунтавалася галоўным чынам на этнічным прынцыпе" і нібы ўлічвала "патрэбы беларускага, а таксама яўрэйскага насельніцтва".[395]

Ч. Лаўрынавічус зрабіў вывад, што расійска-літоўскі дагавор ад 12 ліпеня 1920 г. "адыграў супярэчлівую ролю ў працэсе станаўлення літоўскай дзяржавы". З аднаго боку, ён стварыў перадумовы для прыняцця Літвы ў міжнародную супольнасць. З другога – гэты дагавор паўплываў на арыентацыю літоўскай палітыкі, "што пацягнула за сабой драматычныя наступствы і для самой літоўскай дзяржавы".[396]

Такім чынам, аналіз гістарыяграфіі расійска-літоўскага дагавора паказвае, што ён атрымаў значнае асвятленне ў савецкай і сучаснай беларускай і літоўскай гістарычнай навуцы. Разам з тым, патрэбна канстатаваць, што яго даследаванне ў большай ступені праведзена аднабакова. Гэты дагавор у асноўным разглядаўся з пазіцый Масквы і Вільні, г. зн. гісторыкі паказвалі, наколькі ён адпавядаў жыццёвым дзяржаўным інтарэсам Расіі і Літвы. Пры гэтым рабіўся выгляд, што Беларусі як геапалітычнага фактару і яе дзяржаўных інтарэсаў не існавала. Больш таго, у сучаснай літоўскай гістарыяграфіі нетактоўна, з відавочным адступленнем ад гістарычнай праўды, фарміруецца міфічны вобраз "вялікай Літвы", культывуецца ідэя пра яе цывілізатарскую ролю ў 1910 – 1930-я гады ў гісторыі беларускага народа і яго дзяржаўнасці. Пра гэта яскрава сведчыць кандыдацкая дысертацыя Э. Гімжаўскаса "Белорусский фактор в формировании территории современного литовского государства: этнополитический, политический и геополитический аспекты (1915 – 1923 гг.)", якая была абаронена ў чэрвені 2001 г. у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Літвы.[397] Прывядзём яе асноўныя вывады.

**Першы.** На геапалітычнае і этнапалітычнае самавызначэнне літоўскай дзяржавы мелі ўплыў беларусы. Аднак, адзначае аўтар, "беларускі фактар" адыграў другарадную ролю. Урад Літвы выкарыстаў Беларусь як палітыка-дыпламатычны інструмент для рэалізацыі сваіх тэрытарыяльных праектаў.

**Другі.** Пасля прызнання літоўскай дзяржаўнасці Германіяй у 1917 г. беларусам быў прапанаваны статус нацыянальнай меншасці. Аднак яны не згадзіліся. З другога боку, літоўскае намаганне да "этнічнай дзяржавы" і дэмакратызацыя Расіі пасля Лютаўскай рэвалюцыі сталі штуршком для нараджэння ідэі беларускай дзяржавы на этнічнай аснове.

**Трэці.** Аўтар сцвярджае, што "міжваенная Рэспубліка Літва аказала ўплыў на фарміраванне этнапалітычнай і этнацэнтрысцкай беларускай нацыі. На жаль, спрыяльныя ўмовы для фарміравання беларускай дзяржаўнасці адсутнічалі".

**Чацвёрты.** "Беларускі фактар не адыграў істотнай ролі пры фарміраванні ўсходняй граніцы Літвы", рэзюмуе сваё кандыдацкае даследаванне Э. Гімжаўскас.

Скажоная трактоўка "беларускага фактару" ў фарміраванні літоўскай дзяржаўнасці і беларуска-літоўскіх узаемаадносін, нацыянал-суб'ектывісцкія

[395] Там жа. – С. 197, 199.
[396] Там жа. – С. 202
[397] Гімжаўскас Э. Рэзюмэ // Гістарычны альманах. – Т. 6. – 2002. – С. 206-208.

ацэнкі расійска-літоўскага дагавора і дэманстратыўнае ігнараванне інтарэсаў Беларусі і беларускай пазіцыі пры яго характарыстыцы ў гістарыяграфіі Літвы павінны стымуляваць навуковыя пошукі ў гэтым кірунку беларускіх гісторыкаў.

У публікацыях В. Круталевіча і А. Ціхамірава, як ужо адзначалася, асцярожна вызначаны і беларускі аспект праблемы расійска-літоўскага дагавора ад 12 ліпеня 1920 г.

Дзеля справядлівасці патрэбна сказаць і пра тое, што існуе і пункт погляду польскіх даследчыкаў на дагавор паміж Расіяй і Літвой, які вельмі змястоўна асветлены ў працах П. Вандыча, К. Гамулкі, В. Гастынскай, А. Дзяругі, П. Ласоўскага і Е. Ахманьскага.[398] У іх грунтоўна паказана значэнне дагавора не толькі для Літвы, але і Польшчы. Пры гэтым Е. Ахманьскі акцэнтаваў увагу на супярэчлівасці палітыкі Савецкай Расіі, а потым і СССР, якую яны праводзілі адносна віленскага канфлікту. Ён сцвярджаў, што Рыжскі мірны дагавор паміж Расіяй і Польшчай ад 18 сакавіка 1921 г. адмяніў асноўныя рашэнні расійска-літоўскага дагавора ад 12 ліпеня 1920 г., а дагавор аб узаемным ненападзе і нейтралітэце паміж СССР і Літвой ад 28 верасня 1926 г., які пацвярджаў асноўныя палажэнні папярэдняга дагавора, супярэчыў Рыжскаму трактату. У цэлым дагаворы паміж савецкай дзяржавай і Літвой, з аднаго боку, і дагаворы паміж савецкай дзяржавай і Польшчай, з другога, Е. Ахманьскі характарызаваў як акты, якія супярэчылі "трактатам у пытаннях аб польска-літоўскай мяжы" і не адпавядалі фактычнаму становішчу. Больш таго, ён адзначаў, што гэтыя дагаворы стварылі аснову для далейшага паглыблення супярэчнасцей паміж Літвой і Польшчай.[399]

Нашым даследчыкам неабходна больш дакладна вызначыць беларускую пазіцыю пры аналізе расійска-літоўскага дагавора 1920 г. У сувязі з гэтым уяўляецца важным грунтоўнае высвятленне наступных аспектаў праблемы.

**Першы.** Віленшчына, Віленскі край – гэта этнічна беларуская тэрыторыя. У пачатку XX ст. Віленская губерня з'яўлялася адной з пяці беларускіх губерняў, і яе гісторыя – арганічная частка гісторыі Беларусі. У сувязі з гэтым з'яўляецца цікавым высвятленне такіх аспектаў, як фарміраванне ў літоўскіх грамадска-палітычных колах у пачатку XX ст. прэтэнзій на Вільню і Віленскі край. Таксама неабходна адказаць на пытанне, якое месца займалі этнічна беларускія землі ў палітычных планах Польшчы, Літвы, Латвіі і Расіі, а таксама краін Антанты ў гады першай сусветнай вайны і пасляваеннага ўладкавання Еўропы.

**Другі.** Беларускім гісторыкам патрэбна раскрыць у адзіным кантэксце абмеркаванне на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919 г. беларускага, польскага, рускага і літоўскага пытанняў. Бо менавіта на Парыжскай мірнай канферэнцыі літоўская дэлегацыя вылучыла патрабаванне "аднаўлення літоўскай дзяржавы" ў граніцах Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Сувалкаўскай губерняў, а таксама асобных раёнаў Курляндыі і Усходняй Прусіі.

**Трэці.** У айчыннай гістарычнай навуцы ўжо пастаўлены і ў нейкай ступені асветлены пытанні фарміравання граніц БНР, ССРБ, Літоўска-Беларускай ССР, Беларускай Савецкай Рэспублікі пасля другога абвяшчэння 31 ліпеня 1920 г.

---

[398] Lossowski P. Stosunki polsko-litewskie w latach 1918 – 1920. – W-wa, 1966; ён жа. Stosunki polsko-litewskie w latach 1921 – 1939. – W-wa, 1997; Ochmanski J, Historia Litwy. – Wroclaw – Warszawa – Krakow, 1967; Deruga A. Polityka wschodnia Polski wobec ziem Litwy, Bialorusi i Ukrainy (1918 – 1919). – W-wa, 1968; Gostynska W. Stosunki polsko-radzieckie w 1919 r. – W-wa, 1969; Wandycz P. Soviet-Polish Relation, 1917 – 1921. – Gambridge, 1969; Gomolka K. Polskie ugrupowania polityczne wobec kwestii bialoruskiej. 1918 – 1922. – W-wa, 1989.

[399] Ochmanski j. Historia Litwy. – S. 264.

Аднак гэтыя пытанні поўна і ўсебакова можна разгледзець толькі ў гістарычным кантэксце вызначэння і ўсталявання граніц суседніх дзяржаў – Польшчы, Літвы, Латвіі, Расіі і Украіны. Аднаўленне гэтага гістарычнага фону дазволіць дэталёва і яскрава высветліць тэрытарыяльны акпект расійска-літоўскага дагавора.

**Чацвёрты.** У савецкай, польскай і літоўскай гістарычнай навуцы расійска-літоўскі дагавор і Віленскі канфлікт паказваліся і да сённяшняга часу трактуюцца як спрэчка Польшчы і Літвы з-за Віленшчыны і Вільні. Беларусь як трэці зацікаўлены ў гэтай гістарычнай спрэчцы бок, да таго ж і пацярпелы, часцей нават не згадваецца. Літоўскія і польскія гісторыкі ўпарта працягваюць не заўважаць або робяць выгляд, што савецка-літоўскі дагавор быў несправядлівы ў адносінах да Беларусі і беларусаў. У апошніх публікацыях беларускіх гісторыкаў прыведзены некаторыя факты, якія паказваюць стаўленне Рады БНР і кіраўніцтва БССР да ўмоў дагавора паміж Расіяй і Літвой. Гэтыя сюжэты патрабуюць больш глыбокай навуковай характарыстыкі. Для гэтага неабходна выяўленне новых гістарычных крыніц у рэспубліканскіх і замежных архівах, а таксама ўважлівы аналіз тых, якія надрукаваны ў Беларусі і за мяжой.[400]

**Пяты.** Уяўляецца важным усебаковае высвятленне такіх узаемазвязаных пытанняў, як расійска-літоўскі дагавор і лёс ЛітБела, час яго ліквідацыі, уплыў умоў дагавора на вызначэнне граніц і тэрыторыі БССР пасля другога абвяшчэння. Пазітыўнае навуковае вырашэнне гэтых пытанняў будзе спрыяць устанаўленню ў айчыннай гістарыяграфіі абгрунтаванай перыядызацыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

**Шосты.** Вядома, што савецкая прапанова Літве пачаць мірныя перагаворы і іх правядзенне былі здзейснены адначасова з неаднаразовымі спробамі РСФСР адкрыць перагаворны працэс з Польшчай з тым, каб закончыць польска-савецкую вайну 1919 – 1920 гадоў. Паводле сведчання Ч. Лаўрынавічуса, на савецка-польскіх мірных перагаворах, якія пачаліся ў жніўні 1920 г., польская дэлегацыя настойвала на тым, каб Савецкая Расія адмовілася ад дагавора з Літвой. "Савецкі бок пасля некаторых ваганняў пайшоў на правакацыйны кампраміс, – сцвярджае літоўскі даследчык, – ён даў сваю нягласную згоду на агрэсію Польшчы супраць Літвы".[401]

На наш погляд, гэтае эпатажнае сцвярджэнне патрабуе дадатковай верыфікацыі і аргументацыі або абвяржэння. Адно бясспрэчна — мірныя перагаворы РСФСР з Літвой і Польшчай і заключэнне адпаведных дагавораў і іх умовы патрэбна аналізаваць ва ўзаемасувязі і ва ўзаемаабумоўленасці, таксама як і Сувалкаўскі дагавор паміж Польшчай і Літвой, падпісаны 7 кастрычніка 1920 г., па якому Вільня і Віленскі край пакідаўся Літве. Іншымі словамі, пытанне аб ролі расійска-літоўскага дагавора ў складванні Віленскага канфлікту, у фарміраванні ўзаемаадносін СССР і Літвы, Савецкага Саюза і

---

[400] Документы внешней политики СССР. – Т. 2-3. – М., 1958-1959; Революционные комитеты БССР (июль – декабрь 1920 г.). – Мн., 1957; Документы и материалы по истории советско-польских отношений. – Т. 2-3. – М., 1964 – 1965; Борьба за советскую власть в Литве. Сборник документов. – Вильнюс, 1967; Борьба за Советскую власть в Белоруссии (1918 – 1920 гг.). – Т. 1-2. – Мн., 1968 – 1971; За дзяржаўную незалежнасць Беларусі. – Лёндан, 1960, Знешняя палітыка Беларусі / Зборнік дакументаў і матэрыялаў. – Т. 1 (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1997; Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. – Т. 1. – Кн. 1-2. Вільня – Нью-Ёрк – Менск – Прага, 1998; Антон Луцкевич: Материалы следственного дела НКВД БССР / Подгот. к печати, введение и комментарии В. Н. Михнюка, Н. М. Климовича и А. Н. Гесь. – Мн., 1998; Тарашкевіч Б. Аўтабіяграфія // Спадчына. – 1996. – № 4. – С. 92-132.

[401] Laurinavicius Č. Lietuvos-Sovietu Rusijos Taikos sutartis. – S. 202.

Польшчы, БССР з Літвой і Польшчай у 1920 – 1930-я гады, а таксама з тымі вялікімі дзяржавамі, якія са сваімі інтарэсамі стаялі за спінай Польшчы і Літвы, застаецца актуальным для айчыннай гістарычнай навукі.

Грунтоўны і ўсебаковы аналіз усіх гэтых праблем дазволіць стварыць аб'ектыўную гісторыю Віленскага краю – этнічнай беларускай тэрыторыі, якая ў выніку геапалітычных калізій была канчаткова страчана Беларуссю ў пачатку другой сусветнай вайны ў адпаведнасці з савецка-літоўскім дагаворам ад 10 кастрычніка 1939 г. Расійска-літоўскі дагавор, заключаны ў Маскве 12 ліпеня 1920 г., шмат у чым паспрыяў вырашэнню праблемы Віленскага краю на карысць Літвы.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Даследаванне гісторыі Літоўска-Беларускай ССР у савецкай і айчыннай гістарычнай навуцы праводзілася ў кантэксце яе супярэчлівага развіцця. У 20-80-гады XX стагоддзя яна знаходзілася пад ідэйна-палітычным і метадалагічным уздзеяннем Камуністычнай партыі. З пачатку 90-х гадоў пачаўся новы этап у развіцці айчыннай гістарыяграфіі. Савецая эпоха развіцця гістарычнай навукі падзяляецца на два перыяды – 20-50-я і 60-80-я гады. Першы з іх характарызуецца тым, што былі абазначаны асноўныя пытанні даследавання гісторыі ЛітБел ССР. Але іх вывучэнне ажыцяўлялася на вузкім коле архіўных крыніц, большасць з якіх была недаступная даследчыкам. З сярэдзіны 50-х гадоў пачалася дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця савецкай краіны, якая станоўча і плённа паўплывала і на развіццё гістарычнай навукі, у тым ліку і вывучэнне праблем гісторыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Даследчыкі пачалі вывучаць раней закрытыя архівы, публікаваць зборнікі дакументаў і матэрыялаў, манаграфічныя працы. Значна пашырыўся спектр даследчыцкай тэматыкі па гісторыі ЛітБел ССР. У навуковай літаратуры разгарнулася актыўная палеміка аб прычынах ліквідацыі, значэнні яе ў гісторыі станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці беларускага і літоўскага народаў.

Новыя ацэнкі месца і ролі ЛітБела ў дзяржаўным будаўніцтве з'явіліся ў навуковых публікацыях 90-х гадоў. Але, на жаль, яны зроблены апрыёрна, без уключэння ў навуковы ўжытак новых дакументальных сведчанняў і матэрыялаў.

Тым не менш у гістарычнай навуцы маюцца значныя і плённыя вынікі і дасягненні ў вывучэнні розных аспектаў Літоўска-Беларускай ССР. Галоўныя з іх мы паспрабуем сінтэзіраваць і абагульніць у храналагічнай і тэматычнай паслядоўнасці.

**Першае.** Дакументальных сведчанняў аб тым, каму належыць прыярытэт ў ініцыіраванні ўтварэння ЛітБела гісторыкі на бягучы момант не выявілі. Большасць даследчыкаў схіляецца да думкі, што аўтарамі ідэі быў У. І. Ленін (С. П. Маргунскі, Я. Н. Шкляр, Р. П. Платонаў і М. С. Сташкевіч, П. І. Брыгадзін і У. Ф. Ладысеў). Іншыя даследчыкі сярод ініцыятараў таксама апрыёрна называюць імёны Л. Д. Троцкага, Я. М. Свярдлова, І. В. Сталіна і нават А. А. Іофэ.

**Другое.** Рашэнне аб выдзяленні з БССР трох этнічна беларускіх губерняў і зліцці застаўшайся часткі Савецкай Беларусі з Літоўскай ССР на думку П. І. Брыгадзіна і У. Ф. Ладысева, І. М. Ігнаценкі, М. І. Кулічэнкі, Р. П. Платонава і М. С. Сташкевіча было прынята 16 студзеня 1919 г. А. М. Андрэеў, С. П. Маргунскі, Я. М. Шкляр, В. А. Круталевіч лічаць, што гэта адбылося ў канцы студзеня. На цяперашні час можна лічыць устаноўленым у навуковай літаратуры па гісторыі (як айчыннай, так і замежнай), што прынцыповае, лесавызначальнае рашэнне аб выдзяленні з БССР і далучэнні да РСФСР Віцебскай, Смаленскай і Магілёўскай губерняў было прынята ЦК РКП(б) 16 студзеня 1919 г. Тады ж, адной і той жа пастановай, была аформлена ідэя аб аб'яднанні застаўшайся часткі БССР – Гродзенскай і Мінскай губерняў – з Літоўскай ССР. Пры гэтым даследчыкі гавораць аб гэтых рашэннях як

узаемазвязаных і ўзаемаабумоўленых. Важна падкрэсліць, што адначасовасць рашэння ЦК РКП(б) аб выдзяленні з БССР трох губерняў і аб'яднанні яе часткі з Літоўскай ССР прызнаецца як неабвержаны факт, які пацверджаны дакументальна[402] не толькі ў навукова-даследчыцкай літаратуры, але і ў вучэбных дапаможніках для вышэйшай і сярэдняй школы.

**Трэцяе.** Сярод прычын выдзялення з БССР трох губерняў у студзені 1919 г. даследчыкі называюць: 1) перспектыву для адраджэння беларускай дзяржаўнасці на іх аснове пасля верагоднай акупацыі Польшчай астатняй тэрыторыі Беларусі (Р. П. Платонаў, М. С. Сташкевіч); 2) урад РСФСР вырашыў ахвяраваць беларускімі землямі для таго, каб пазбегнуць вайны з Польшчай і аслабіць нацыяналістычныя тэндэнцыі (С. М. Хоміч). Даследчыкі зыходзяцца ў тым, што галоўнай прычынай падзелу БССР стаў міжнародны фактар – пагроза захопу БССР Польшчай і неабходнасць абвяшчэння ў сувязі з гэтым буфернай дзяржавы.

**Чацвёртае.** Галоўнай, вызначальнай прычынай такога кроку вышэйшага палітычнага кіраўніцтва РСФСР была рэальная пагроза агрэсіі Польшчы супраць Савецкай Расіі. Для таго каб пазбегнуць адкрытага ўзброенага канфлікта паміж імі, адмежавацца адна ад другой і тым самым захаваць Савецкую Расію і савецкую ўладу, як аплот сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі, і была створана буферная дзяржава з назвай Літоўска-Беларуская ССР. У гэтай "дзяржаве двух народаў" нічога нацыянальна-беларускага не было – ні дзяржаўнай мовы, ні перыядычных выданняў, ні нават саміх беларусаў у яе кіруючых органах.

Тыя прычыны абвяшчэння ЛітБела, якія былі афіцыйна сфармуляваны ў пастановах і рашэннях ЦК РКП(б), Першага Усебеларускага з'езда Саветаў і Першага з'езда Саветаў Літвы, а таксама ў выступленнях і прамовах кіраўнікоў РСФСР і Літоўска-Беларускай рэспублікі і замацаваны ў партыйнай гістарыяграфіі, у большасці мелі прапагандысцкія, ідэалагічныя мэты і не вытрымліваюць крытыкі з навуковага пункту гледжання. Пералічым асноўныя з тых прычын.

Галоўнай з іх называлася неабходнасць умацавання абараназдольнасці рэспублік ва ўмовах навісшай пагрозы вайны з Польшчай, а таксама аб'яднання намаганняў у барацьбе з "унутранай буржуазна-нацыяналістычнай контррэвалюцыяй" і за абарону заваёў сацыялістычнай рэвалюцыі. Быццам бы такое аб'яднанне дыктавалася агульнасцю гістарычнага мінулага, эканамічных умоў і інтарэсаў абедзвюх рэспублік, іх геаграфічнага палажэння. Па словах старшыні Усерасійскага ЦВК Я. М. Свярдлова, "матывам утварэння адзінай Беларуска-Літоўскай Рэспублікі з'яўлялася імкненне ЦК засцерагчы гэтыя рэспублікі ад магчымасці праяўлення ў іх нацыянальна-шавіністычных намераў".[403] У навейшых даследаваннях айчынных гісторыкаў зроблены вывад аб тым, што ўнутраных, так сказаць, іманентных прычын для аб'яднання часткі Беларускай ССР і Літоўскай ССР у студзені – лютым 1919 г. не было.[404]

**Пятае.** Калі была абвешчана Літоўска-Беларуская рэспубліка? Гэтае пытанне прынцыповае ў гісторыі станаўлення беларускай дзяржаўнасці і яе

---

[402] Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. – Т. 1 (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1997. – С. 91-92; Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. Паміж Усходам і Захадам... – С. 278-279.

[403] По воле народа: Из истории образования Белорусской ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии: Документы и материалы. – Мн., 1988. – С. 130.

[404] Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1999. – С. 95-97, 156.

перыядызацыі. Дыяпазон думак аб даце абвяшчэння ЛітБела дастаткова шырокі: 16 студзеня 1919 г. – 2 лютага – 17 лютага – 27 лютага 1919 г. З названымі датамі даследчыкі звязваюць адпаведныя рашэнні – пастанову ЦК РКП(б) аб выдзяленні трох губерняў з Беларускай ССР, абвешчанай крыху больш за два тыдні раней, і неабходнасці аб'яднання Гродзенскай і Мінскай губерняў з Літоўскай ССР; пастанову Першага Усебеларускага з'езда Саветаў аб аб'яднанні застаўшайся часткі БССР з Літоўскай савецкай рэспублікай; аналагічную пастанову Першага з'езда Саветаў Літвы; і, урэшце, сумеснае пасяджэнне ЦВК Беларускай ССР і Літоўскай ССР, на якім былі выбраны вышэйшыя кіруючыя органы новай рэспублікі.

Асноўнымі юрыдычнымі дакументамі, якія з'яўляліся падставай для абвяшчэння новай рэспублікі, сталі рашэнні Першага Усебеларускага з'езда Саветаў (2-3 лютага 1919 г.) і Першага з'езда Саветаў рабочых, беззямельных, малазямельных і чырвонаармейскіх дэпутатаў Літвы (17-21 лютага 1919 г.). Частка даследчыкаў працягвае гістарыяграфічную традыцыю ад У. М. Ігнатоўскага, які яшчэ ў першай палове 20-х гадоў заявіў, што 27 лютага 1919 г. ЦВК Беларусі і ЦВК Літвы "на ўрачыстым пасяджэнні вынеслі пастанову і абвясцілі Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі" (С. П. Маргунскі, В. І. Талкачоў, А. Ф. Вішнеўскі і І. А. Саракавік, П. І. Брыгадзін і У. Ф. Ладысеў і інш.).

Нам уяўляецца, што ёсць падставы для таго, каб прызнаць датай абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР **17 лютага 1919 г.**, гэта дзень, калі ў адпаведнасці з рашэннямі Першага Усебеларускага з'езда Саветаў была прынята пастанова Першага з'езда Саветаў Літвы аб аб'яднанні літоўскай і беларускай Савецкіх рэспублік.

**Шостае.** З вырашэннем пытання аб даце абвяшчэння Літоўска-Беларускай рэспублікі непасрэдна звязаны адказ і на пытанне аб часе спынення існавання Беларускай ССР. У навукова-даследчыцкай і вучэбнай літаратуры па розных меркаваннях такой датай называецца 27 лютага 1919 г., калі адбылося сумеснае пасяджэнне ЦВК БССР і ЛССР і на якім былі створаны ЦВК і СНК ЛітБел ССР. Некаторыя з навукоўцаў нават сцвярджаюць, што тады ЦВК БССР і ЦВК ЛССР "на ўрачыстым пасяджэнні" вынеслі адпаведную пастанову і абвясцілі Літоўска-Беларускую ССР. Але гэта адвольныя заключэнні. Дас-ледчыкам гісторыі ЛітБела добра вядома, што на тым сумесным рабочым пасяджэнні ніякіх дакументаў – маніфеста, дэкларацыі, граматы, мемарыяла, пастановы ці рэзалюцыі, якія прэзентавалі бы беларускаму і літоўскаму на-родам, а таксама сусветнай супольнасці новую дзяржаву з прапановай прызнаць яе і ўстанавіць з ёю дыпламатычныя адносіны, не было прынята. Такія дакументы не з'явіліся на свет і пазней.

У сувязі са сказаным, будзе лагічна і юрыдычна правільна лічыць, што абмежаваная БССР, як і ЛССР, перастала існаваць, як самастойная, суверэнная дзяржаўная адзінка з таго моманту, калі была абвешчана Літоўска-Беларуская ССР.

**Сёмае.** Важным, але вельмі заблытаным у навуковай і вучэбнай літаратуры, з'яўляецца пытанне аб граніцах, тэрыторыі і колькасці насельніцтва ЛітБела. Даследчыкі з рознай ступенню варыяцый (ад двух губерняў і больш) у склад тэрыторыі рэспублікі ўключаюць Мінскую, Гродзенскую, Віленскую, Ковенскую і частку Сувалкаўскай губерняў. Колькасць насельніцтва, якая прыводзіцца ў навуковай літаратуры, хістаецца ад 4 да 7,5 млн. чалавек. Пакуль што не знойдзены дакументы з неабходнай інфармацыяй, "глухія" спасылкі на

матэрыялы архіва ёсць толькі ў работах І. М. Ігнаценкі, Н. В. Каменскай, С. П. Маргунскага, Я. Н. Шкляр. Дадзеныя аб тэрыторыі і колькасці насельніцтва ЛітБел ССР не могуць быць прыняты ў гістарычнай навуцы без паўторнай верыфікацыі.

І гэтае пытанне патрабуе далейшага паглыбленага вывучэння і больш дакладнага высвятлення даследчыкамі. У гэтым выпадку для ўзгодненай пазіцыі ў вучэбнай літаратуры і выкладанні гісторыі ЛітБел ССР у школах і ВНУ можна было бы кіравацца дадзенымі, якія прыведзены ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (Т. 4. С. 382).

**Восьмае.** Калі спыніла існаванне Літоўска-Беларуская ССР і па якіх прычынах, у сувязі з чым? Упэўнены адказ на гэтае пытанне дапамагае дакладней высветліць праблему перыядызацыі беларускай савецкай дзяржаўнасці.

Літоўскія гісторыкі (Б. Ю. Вайткявічус, П. В. Віткаўскас, М. В. Тамашунас) ўжо ў сярэдзіне 60-х гадоў мінулага стагоддзя прыйшлі да вываду, што ЛітБел ССР спыніла існаванне фактычна ў ліпені 1919 г., а юрыдычна – напачатку восені 1919 г. І гэты факт яны звязвалі з поўнай акупацыяй яе тэрыторыі польскімі войскамі і прапановай 11 верасня 1919 г. урада РСФСР ураду буржуазнай, тарыбаўскай Літвы ўступіць у перагаворы аб падрыхтоўцы і падпісанні паміж імі мірнага дагавора. Гэтае палажэнне стала агульнапрынятым сярод літоўскіх гісторыкаў і было замацавана ў абагульняючых працах па гісторыі Літвы і гістарыяграфічных публікацыях.

Пазіцыю, салідарную з літоўскімі гісторыкамі, выказаў яшчэ ў сярэдзіне 60-х гадоў беларускі гісторык права В. А. Круталевіч. У публікацыях Н. В. Каменскай, М. А. Карнатоўскага, В. Г. Кнорына, К. Навіцкаса таксама сцвярджаецца, што ЛітБел ССР спыніла сваё існаванне ў ліпені 1919 г., пасля акупацыі тэрыторыі Польшчай. Ю. П. Броўка, У. М. Ігнатоўскі, Э. Р. Іофэ, М. В. Іскраў, С. П. Маргунскі, Я. Н. Шкляр, З. В. Пятраўскас прыйшлі да вываду аб тым, што ЛітБел перастала існаваць 31 ліпеня 1920 г., у сувязі з другім абвяшчэннем БССР.

Іншыя беларускія навукоўцы ў ацэнцы гэтых падзей часцей абапіраюцца на два палажэнні: ЛітБел спыніла сваё існаванне **фактычна** летам – напачатку восені 1919 г., а **юрыдычна** – пасля заключэння расійска-літоўскага дагавора 12 ліпеня 1920 г. і другога абвяшчэння БССР 31 ліпеня 1920 г. Гэтая дуалістычная пазіцыя замацавана ў абагульняючых працах, вучэбных дапаможніках для вышэйшай і сярэдняй школы, а таксама ў "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі".

Гістарыяграфічны ж аналіз прац айчынных і літоўскіх гісторыкаў, а таксама апублікаваных дакументаў і матэрыялаў дазваляе зрабіць адназначны вывад аб тым, што Літоўска-Беларуская ССР спыніла сваё існаванне **і фактычна, і юрыдычна** напачатку верасня 1919 г. у сувязі з захопам яе тэрыторыі польскімі войскамі і фактычным прызнаннем буржуазнай Літвы ўрадам РСФСР. Яно ўтрымлівалася ў ноце наркама замежных спраў Расіі ад 11 верасня 1919 г. у сувязі з прапановай літоўскай Тарыбе ўступіць у перагаворы аб падрыхтоўцы і падпісанні мірнага дагавора паміж буржуазнай Літвой і Савецкай Расіяй.

Пры гэтым трэба падкрэсліць, што Літоўска-Беларуская ССР спыніла сваё існаванне, а не "самаліквідавалася", як аб гэтым настойліва сцвярджае

В. А. Круталевіч.[405] Яна была створана па пастанове ЦК РКП(б), фактычна перастала існаваць пасля захопу яе тэрыторыі польскімі легіянерамі, а юрыдычна – у сувязі з рашэннямі вышэйшых палітычных інстанцый РСФСР пачаць мірныя перагаворы з буржуазнай Літвой. Той факт, што ЛітБел не была адроджана пасля выгнання з яе тэрыторыі польскіх акупантаў у ліпені 1920 г., з'яўляецца найлепшым пацвярджэннем і доказам таго, што раней быў створаны не жыццяздольны дзяржаўны арганізм.

**Дзевятае.** З пачатку 90-х гадоў у айчыннай гістарыяграфіі ацэнкі Літоўска-Беларускай ССР рэзка памяняліся. Некаторыя даследчыкі падкрэсліваюць, што сама ідэя і тым больш практыка падзелу Беларускай ССР і аб'яднання яе часткі з Літоўскай Савецкай рэспублікай не адпавядалі і не маглі адпавядаць карэнным інтарэсам ні беларускага, ні літоўскага народаў. Прывядзем толькі некаторыя з такіх выказванняў і заключэнняў. "Абвешчаная ў лютым 1919 г. Літоўска-Беларуская рэспубліка была штучным утварэннем без уліку інтарэсаў як беларускага, так і літоўскага народаў", – першым з айчынных даследчыкаў канстатаваў Я. А. Юхо.[406] "Літоўска-Беларуская ССР, альбо ЛітБел, створаная па волі знешнепалітычных сіл, не была і не магла быць беларускай дзяржаўнасцю", – сцвярджалі Л. В. Лойка і Т. В. Лойка ў сваім артыкуле.[407] В. І. Талкачоў у артыкуле, прысвечаным 75-годдзю Літоўска-Беларусай ССР, назваў яе "штучным дзяржаўным утварэннем" і, нават, "сур'ёзнай памылкай" бальшавіцкай партыі.[408] В. А. Круталевіч і Я. А. Юхо ў вучэбным дапаможніку для студэнтаў юрыдычных і гістарычных спецыяльнасцей ВНУ утварэнне Літоўска-Беларускай ССР назвалі "яшчэ адным эксперыментам, праведзеным савецкімі ўладамі над беларусамі і іх дзяржаўнасцю".[409] Але такія вывады і ацэнкі, на жаль, не маюць пад сабою фактalагічнага фундаменту.

---

[405] Круталевич В. А. Становление национальной государственности белоруского народа // Советское государство и право. – 1967. – № 12. – С. 52; ён жа. Рождение Белорусской Советской Республики: Провозглашение республики. Развёртывание национально-государственного строительства. (Ноябрь 1919 г. – февраль 1919 г.). – Мн., 1979. – С. 326.

[406] Юхо Я. Фарміраванне тэрыторыі беларусаў // Спадчына. – 1991. – № 6. – С. 9.

[407] Лойка Л., Лойка Т. Сучасны погляд на гісторыю Беларусі // Крыжовы шлях. – Мн., 1993. – С. 34.

[408] Талкачоў В. Цяжкі студзень 1919-га... // Беларуская думка. – 1994. – № 1. – С. 69.

[409] Круталевич В. А., Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.). – 2-е выд. – С. 45.

## БІБЛІЯГРАФІЯ

1. Александров Б. Виленский вопрос // Междунардная жизнь. – 1926. – № 11 – С. 3-16.
2. Альшэўская С. І., Касовіч В. Ф., Шульга Л. А. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва на Беларусі (1917 – 1927 гг.). Вуч. дапамож. – Мн., 2000
3. Антон Луцкевич: Материалы следственного дела НКВД БССР / Подгот. к печати, введение и комментарии В. Н. Михнюка, Н. М. Климовича и А. Н. Гесь – Мн., 1997.
4. Астрога В. А. Беларуская гістарыяграфія найноўшага часу: праблемы перыядызацыі // Гістарычны альманах. – 2002. – Т. 7. – С. 11-19.
5. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. – Т. 1. – Кн. 1. – Вільня – Нью-Йорк – Менск – Прага, 1998.
6. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. – Т. 1. – Кн. 2. – Вільня – Нью-Йорк – Менск – Прага, 1998.
7. Арумяэ Х. За кулисами "Балтийского союза". – Таллин, 1966.
8. Андреев А. М. Борьба литовского народа за советскую власть 1918 – 1919 гг. – М., 1954.
9. Арутюнян В. М. Военно-организаторская деятельность А. Ф. Мясникова (Мясникяна), 1917 – 1925 гг.: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – М., 1989.
10. Багдановіч А. Г. Праблема нацыянальнай дзяржаўнасці ў грамадска-палітычным руху Беларусі (сакавік 1917 – студзень 1919 гг.) : Аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. – Мн., 1995.
11. Бах М. Г. Политико-экономические взаимоотношения между СССР и Прибалтикой за десять лет (1917 – 1927). – М., 1928.
12. Беларускі рух і беларуская дзяржава // Беларускі сцяг. – 1922. – № 1. – С. 19-24.
13. Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху. Зб арт. / Пад рэд. А. Сташэўскага. – Мн., 1924.
14. Беленькая Л. Л. Деятельность революционных комитетов Белоруссии в области народного образования и культурно-просветительской работы (1919 – 1920 гг.). Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – Мн., 1988.
15. Белоруссия // Развитие советской исторической науки. 1970 – 1974. – М. 1975. – С. 369-374.
16. Белорусская Советская Социалистическая Республика. – Мн., 1927.
17. Белявцев В. И. В. И. Ленин и Белоруссия. – Мн., 1978.
18. Бержинскайте А. Неисчерпаемая тема // Коммунист (Вильнюс). – 1979. – № 2. – С. 87-90.
19. Біч М. У якіх межах былі абвешчаны БНР і БССР? // Звязда. – 1994. – № 107. – С. 2.
20. Біч М. В., Сідарцоў У. Н., Фамін В. М. Гісторыя Беларусі: XX ст.: Вучэб. дапамож. для 10-11 кл. сярэд. шк. – 2-е выд., перапр. – Мн., 1993.
21. Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918 – 1920: Сб. документов и материалов. В 2-х т. – Мн.: Беларусь, 1968-1971. – Т. 1 (февраль 1918 г. – февраль 1919 г.) / Ред.: А. И. Азаров, С. З. Почанин. – Мн., 1968; Т. 2 (февраль 1919 г. – 1920 г.). – Мн., 1971.
22. Борьба за Советскую власть в Литве в 1918 – 1920 гг. Сборник документов. – Вильнюс, 1967.
23. Борьба за Советскую власть в Прибалтике. – М., 1967.

24. Бровка Ю. П. Белорусская ССР – суверенный участник международного общения. – Мн., 1974.
25. Бровка Ю. П. Международная правосубьектность БССР. – Мн., 1967.
26. Бродко И. А. Критика буржуазной фальсификации истории образования БССР: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – Мн., 1983.
27. Бродко И. А. Критика буржуазной фальсификации истории образования БССР / Под ред. И. М. Игнатенко. – Мн., 1987.
28. Брыгадзін П. І., Мацяс І. Д. Усевалад Ігнатоўскі: Палітычны дзеяч, вучоны. – Мн., 1998.
29. Буферное государство // Словарь иностранных слов. – 16-е изд. исправл. – М., 1988.
30. Вайткявичус Б. Ю. Борьба трудящихся Литвы за победу социалистической революции (1918 – 1919 гг.). Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – М., 1958.
31. Вайткявичус Б. Год 1919-й: забота о духовной культуре // Коммунист (Вильнюс). – 1998. – № 11. – С. 17-23.
32. Варонко Я. Беларуская справа ў час міравой нарады ў Версалі: Гіст.-паліт. нарыс. – Коўна, 1919.
33. Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: Кароткі агляд. – Коўна, 1920; Рэпрынт. – Мн., 1991.
34. Варславан А. Политика английского империализма в отношении буржуазной Латвии (1920 – 1923 гг.). – Рига, 1966.
35. В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте: Воспоминания активных участников Октябрьской революции. – Мн., 1957.
36. Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов: (Материалы межресп. науч. конфер., посвящ. 60-летию образования Литовско-Белорусской ССР) / Редкол. Б. Ю. Вайткявичус и др. – Мн., 1981.
37. Великий Октябрь и национально-государственное строительство в Белоруссии / С. Ф. Сокол, М. А. Шафир, Р. Н. Белоголовко. Предис. В. А. Круталевича. Под ред. В. И. Семенкова. – Мн., 1987.
38. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. – Т. 1-2. – Мн., 1957.
39. Весялкоўскі Ю. Беларусь у Першай сусветнай вайне. – Беласток – Лёндан, 1996.
40. Ветры революции. Сборник воспоминаний о пролетарской революции 1918 – 1919 гг. в Литве. – Вильнюс, 1968.
41. Вішнеўскі А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Вучэб. дапам. для студ. юрыдыч. і гіст. спец. ВНУ. – Мн., 2000.
42. Вішнеўскі А. Ф., Саракавік І. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Некаторыя пытанні і адказы. – Мн., 1997. – 108 с.
43. Вишневский А. Ф., Довнар Т. И. История государства и права Беларуси. Курс лекций. – Мн., 1996.
44. Виткаўскас П. Национальная политика Коммунистической партии Литвы в годы социалистической революции и Советской власти в Литве (1918 – 1919 гг.). – Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – Вильнюс, 1971.
45. Виткаўскас П. Создание Советской Социалистической Республики Литвы в 1918 – 1919 г. – Вильнюс, 1978.
46. Воробьев А. В. Протоколы заседаний Совета Народных Комиссаров Литовско-Белорусской Советской Социалистической Республики (1919 г.) // Археографический ежегодник за 1966 год. – М., 1968. – С. 276-288.
47. Воронко И. Я. Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конференции: Историко-политический очерк. – Ковна, 1919.
48. Гісторыя Беларускай ССР. – Т. 2. – Мн., 1958.
49. Гісторыя Беларускай ССР у пяці тамах. 1972 – 1975. – Т. 3. – Мн., 1973.
50. Гісторыя Беларусі: Вучэб. дапамож. / А. Л. Абэцэдарская, Л. А. Жылуновіч, А. П. Ігнаценка і інш.; Пад рэд. А. П. Ігнаценкі, Я. Ю. Несцяровіча. – Мн., 1994.

51. Гісторыя Беларусі 1917 – 1996 гг.: Вучэб. дапамож. для 9-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання / У. Н. Сідарцоў, В. М. Фамін, С. В. Паноў. – 2-е выд. – Мн., 1999.
52. Гісторыя Беларусі. У 2 ч. – Ч. 2. XIX-XX стагоддзі: Курс лекцый / П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў, П. І. Зялінскі і інш. – Мн., 2002.
53. Гісторыя Беларусі: Падручнік. У 2 ч. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 2002 г. / Я. К. Новік, Г. С. Марцуль, Э. А. Забродскі і інш.; Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мн., 2003.
54. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 1999 г. Вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання / І. Л. Качалаў, Г. С. Марцуль, Н. Я. Новік і інш.; Пад рэд. Я. К. Новіка. – Мн., 2000.
55. Гімжаўскас Э. Рэзюмэ // Гістарычны альманах. – Т. 6. – 2002. – С. 206-208.
56. Глушакова Н. Знешнепалітычныя арыентацыі Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (1918 – 1924 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1998. – № 3. – С. 28-34.
57. Государственность Беларуси: Проблемы формирования в программах политических партий / В. К. Коршук, Р. П. Платонов, И. Ф. Романовский, Е. Г. Богданович. – Мн., 1999.
58. Грицкевич А. П. Провал антисоветских планов литовских и белоруских националистов в годы гражданской войны // Из истории Советской Белоруссии. – Мн., 1969. – С. 90-108.
59. Грыцкевіч А. Беларуска-літоўскія дачыненні // Спадчына. – 1994. – № 5. – С. 58-63.
60. Гудов М.В. Антисоветское подполье в Беларуси в 1919 – 1925 гг.: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – Мн., 1999.
61. Давідовіч А. В. Грамадска-палітычная дзейнасць З. Х. Жылуновіча (1905 – 1937 гг.): Аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. – Мінск, 1995.
62. Давтян Р. С. Англо-американский империализм в Литве (1919 – июль 1940 гг.): Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – Л., 1951.
63. Дапаможнік па гісторыі Беларусі для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы / А. Л. Абэцэдарская, П. І. Брыгадзін, Л. А. Жылуновіч і інш.; Пад рэд. А. Г. Каханоўскага і інш. – Мн., 1996.
64. Документы внешней политики СССР: В 21 т. / Под общ. ред. А. А. Громыко. – М., 1957 – 1977. – Т. 2. – М., 1958; Т. 3. – М., 1959.
65. Документы и материалы по истории советско-польских отношений. – Т. 2 (ноябрь 1918 г. – апрель 1920 г.). – М., 1964.
66. Довнар-Запольский М. В. Основы государственности Белоруссии. – Городно, 1919.
67. Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі / Пер. з рус. Т. М. Бутэвіч, Т. М. Кароткая, Е. П. Фешчанка. – Мн., 1994.
68. Дубік С. Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1918 – 1924 гг. // Гісторыя Беларусі ў еўрапейскім кантэксце: Матэрыялы гістарычных семінараў, якія адбыліся ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры ў 2001 г. – Мн., 2002. – С. 53-82.
69. Езовитов К. Белоруссы и поляки: Документы и факты из истории оккупации Белорусии поляками в 1918 и 1919 годах: Пер. с бел. – Ковна, 1919.
70. Жепкайте Р. С. Борьба литовского народа за Вильнюс в 1918 – 1928 гг. Автор. дис. ...канд. ист. наук. – Вильнюс, 1965.
71. Жепкайте Р. К вопросу о позиции советского государства в польско-литовском конфликте // Труды Академии наук Литовской ССР. – Сер. А. 1971. – Т. 2 (36). – С. 147-160.
72. Жепкайте Р. С. Литовско-польские отношения 1919 – 1939 гг. и их место в политической констелляции северо-восточной Европы. Дис. ...докт. наук. – Вильнюс, 1983.

73. Жмуровский С.Д. Организация и деятельность комитетов бедноты Белоруссии (июнь 1918 – июнь 1919): Автореферат диссертации ... канд. ист. наук. – М., 1986
74. Жылуновіч З. Х. Беларускія сэкцыі РКП і стварэньне Беларускай Савецкай Рэспублікі // Полымя. – 1928. – № 10.
75. Жылуновіч З. Х. Будаванне Савецкай Беларусі // Маладняк. – 1925. – № 6.
76. Жылуновіч З. Х. 1-е студзеня – рэвалюцыйна-гістарычнае свята Савецкай Беларусі // Полымя. – 1922. – № 1.
77. Жылуновіч З. Х. За дваццаць лет: (Успаміны) // Полымя. – 1929. – № 5.
78. Жюгжда Ю. Буржуазная Литва в планах империалистических государств (1919 – 1940 гг.) Автор. дис. ... док. наук. – Вильнюс, 1980.
79. За дзяржаўную незалежнасць Беларусі. – Лендан, 1960.
80. Заходняя Беларусь // ЭГБ. – Т. 3. – Мн., 1996. – С. 421.
81. Зевелев А. И. Историографическое исследование: методологические аспекты. – М., 1987.
82. Зенькович Н. Чья Белоруссия? Границы. Споры. Обиды. – М., 2002.
83. Зимионко А. Оккупация и интервенция в Белоруссии. – Мн., 1932.
84. Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў / Рэдкал.: І. І. Антановіч, У. М. Міхнюк, В. К. Ракашэвіч. – Т. 1 (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1997.
85. Зюзькоў А. Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі. – Мінск, 1931.
86. Иванов Н. Л. Создание Литовско-Белорусской ССР и современная буржуазная историография // Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов.: Матер. межресп. науч. конф., посвящ. 60-летию образ. Литовско-Белорусской ССР. – Мн., 1981. – С. 105-116.
87. Іваноў М. Рыжскі мір і эмігранцкі ўрад БНР // Беларусіка=Albaruthenica. – Мн., 1997. – Т. 6. – Ч. 2.
88. Иванов Л. Польско-литовский конфликт // Мировое хозяйство и мировая политика. – 1938. – № 5. – С. 115-120.
89. Игнатенко И. М. Великий Октябрь в судьбах белорусского народа. – Мн., 1987.
90. Ігнаценка І., Кароль А. Усевалад Ігнатоўскі і яго час. – Мн., 1991.
91. Игнатенко И. М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. – Мн., 1992.
92. Ігнатоўскі У. Камуністычная партыя Беларусі і беларускае пытанне // Полымя. – 1922. – № 1. – С. 3-16.
93. Ігнатоўскі У. Вялікі Кастрычнік на Беларусі // Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху. – Мн., 1924. – С. 195-214.
94. Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. – 5-е выд. – Мн., 1992.
95. Ігнатоўскі Усевалад Макаравіч (да 110-годдзя з дня нараджэння). – Брэст, 1992.
96. Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии, 1918 – 1945. Сборник документов. В 2-х ч. – Ч. 1 (1918 – 1928 гг.). – Мн., 1990.
97. Из истории борьбы белорусского народа за Советскую власть и победу социализма. Сб. статей. – Мн., 1957.
98. Из истории борьбы Компартии Белоруссии за упрочение Советской власти и социалистическое строительство. Сб. статей. – Мн., 1959.
99. Из истории Великого Октября и гражданской войны (1917 – 1920). Межвуз. сб. / М-во высш. и сред. спец. образ-я РСФСР; Под ред. В. А. Смышляева и др. – Л., 1990.
100. Из истории гражданской войны в СССР: Сб. док. и материалов, 1918 – 1922 гг. В 3-х т. – Т. 1 (май 1918 г. – март 1919 г.). – М., 1960; Т. 2 (март 1919 г. – февраль 1920 г.). – М., 1961.
101. Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР: Документы и материалы по истории Белоруссии. – Т. 4 (март 1917 – февраль 1919). – Мн., 1954.
102. Иностранная военная интервенция в Белоруссии, 1917 - 1920 гг. / И. М. Игнатенко, И. П. Ломако, Е. К. Прыгунова и др. – Мн., 1990.

103. Иностранная военная интервенция в Прибалтике. 1917 – 1922 гг. – М., 1988.
104. Иоффе Э. Из истории Литбела // Неман. – 1988. – № 11. – С. 168-169.
105. Ісачанка С. М. Правал амерыкана-англійскіх агрэсіўных планаў у Беларусі ў 1917 – 1920 гг. – Мінск, 1954.
106. Искров М. В. Исследование по истории Литовско-Белорусской ССР // Вопросы истории КПСС. – 1962. – № 6. – С. 187-191.
107. История Беларуси в документах и материалах / Авт.-сост. И.Н. Кузнецов. В.Г. Мазец. – Мн., 2000.
108. История Белорусской ССР: В 2 т. / Ред. кол.: Т. С. Горбунов, Н. В. Каменская, И. С. Кравченко. – 2-е изд., доп. – Т. 1. – Мн., 1961.
109. Гісторыя Беларусі. 1917 – 1996: Вучэб. дапамож. для 9-га кл. / Пад рэд. М. С. Сташкевіча. – Мн., 1997. – С. 26.
110. История внешней политики СССР. – Т. 1 (1917 – 1945 гг.). – Изд. 5-е, переработ. и доп. / Под ред. А. А. Громыко и Б. Н. Пономарева. – М., 1986.
111. История международных отношений и внешней политики СССР (1917 – 1987 гг.). В 3 т. – Т. 1 (1917 – 1945 гг.). – М., 1986.
112. История государства и права Белорусской ССР: В 2 т. / Ред. кол. С. П. Маргунский и др. – Т. 1 (1917 – 1936 гг.). – Мн., 1970.
113. История Литовской ССР (с древнейших времен до наших дней) / А. Таутавичус, Ю. Юргинис, М. Ючас и др. Ред. Б. Вайткявичус. – Вильнюс, 1978.
114. Казбярук У. Чаму бальшавікі пайшлі на стварэнне БССР? // Звязда. – 1994. – № 107.
115. Калубовіч А. "Айцы" БССР і іхні лес // Спадчына. – 1991. – № 4. – С. 85-98. № 5. – С. 62-75.
116. Калубовіч А. Крокі гісторыі: Дасьледаваньні, артыкулы, успаміны. – Беласток – Вільня – Менск, 1993.
117. Калубовіч А. На крыжаванай дарозе: Творы з эміграцыі. Уклад. і прадм. Я. Лецкі. – Мн., 1994.
118. Каменская Н. В. Образование Белорусской Советской Социалистической Республики: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – М., 1945.
119. Каменская Н. В. Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі / Пад рэд. Г. М. Панкратавай. – Мн., 1946.
120. Каменская Н. В. Образование Белорусского советского государства. – 2-е доп. и исправл. изд. – Мн., 1948.
121. Каменская Н. В. Победа Великой Октябрьской социалистической революции и установление Советской власти в Белоруссии. – Мн., 1951.
122. Каменская Н. В. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР. – Мн., 1954.
123. Каменская Н. В. Участие белорусского народа в разгроме третьего похода Антанты и освобождение Белоруссии от интервентов (1920 г.) // Из истории борьбы белорусского народа за Советскую власть и победу социализма. Сб. статей. – Мн., 1957. – С. 47-76.
124. Каменская Н. В. Первые социалистические преобразования в Белоруссии (25 октября 1917 г. – июль 1919 г.). – Мн., 1957.
125. Каменская Н. В. Участие белорусского народа в разгроме интервентов и белогвардейцев и социалистическое строительство в Белоруссии в годы гражданской войны: Автореф. дис. ... док. ист. наук. – Мн., 1958.
126. Каменская Н. В. Белорусский народ в борьбе за Советскую власть (1919 – 1920 гг.). – Мн., 1963.
127. Каменская Н. В., Шкляр М. Е. Боевой отряд КПСС. – Мн., 1963.
128. Каменская Н. В. Образование Белорусской Советской Социалистической Республики. – Мн., 1968.
129. Кастрычнік на Беларусі. Зборнік дакументаў і ўспамінаў. – Мн., 1927.
130. Карнейчык Я. У. І. Ленін і І. В. Сталін – арганізатары Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі / Пад рэд. канд. філасоф. навук І. Чымбурга. – Мн., 1949.

131. Карнейчык Я. І. Беларуская нацыя. Гістарычны нарыс / АН БССР. Ін-т гісторыі. – Мн., 1969.
132. Карніенка В. Клясавая барацьба на гістарычным фронце Беларусі. – Мн., 1932.
133. Кіраўнікі вышэйшых органаў савецкай улады на Беларусі (1917 – 2000 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. – № 2. – С. 77-78.
134. Кнорин В. Революция и контрреволюция в Белоруссии. – Ч. 1. – Смоленск, 1920.
135. Кнорин В. Г. Пять лет: Краткий конспект истории КП(б)Б. – Мн., 1922.
136. Кнорын В. Камуністычная партыя на Беларусі // Беларусь. Нарысы гісторыі экаміі, культуры і рэвалюцыйнага руху. – Мн., 1924.
137. Кнорин В. 1917 год в Белоруссии и на Западном фронте. – Мн., 1925.
138. Кнорын В. Да гісторыі дыктатуры пралетарыяту ў Беларусі. – Мінск, 1930.
139. Кнорын В. Избранные статьи и речи. – Мн., 1990.
140. Ковалёва Л. А. Внешнеполитическая деятельность Советской Белоруссии в 1919 – 1929 гг.: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – Мн., 1993.
141. Кавалёва Л. А. Утварэнне і дзейнасць Наркамата замежных спраў БССР у 1919 – 1922 гг. // Весці АНБ. Сер. гум. навук. – 1993. – № 1. – С. 43-48.
142. Ковкель И. И. Политическое банкротство националистической контрреволюции в Белоруссии (1919 – 1925).: Автореф. дис. ...канд. ист. наук. – Мн., 1979.
143. Коўкель І. І. «Беларускае пытанне» ў палітыцы Польшчы (1918 – 1920 гг.) // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы): Усебеларус. канф. гісторыкаў. Мінск, 3-5 лютага 1993 г. – Мн., 1994.
144. Коўкель І. Польска-літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх палітычных партый і арганізацый (1920 – 1923 гг.) // Беларусіка = Albaruthenica. – Мн., 1993. – Кн. 3.
145. Ковкель И. И., Сташкевич Н. С. Почему не состоялась БНР? – Мн., 1980.
146. Ковкель И. И., Ярмусик Э. С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени. – Мн., 1998.
147. Корнатовский Н. А. Литовско-Белорусская ССР (1919) // Учёные зап. ЛГУ. – 1940. – Вып. 7. – № 67. – С. 139-174.
148. Корнеў П. І., Коршак М. А. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917 – 1920 гг.) // Сб. мат. респуб. научно-практич. конф. 30 января 2002 г. В 2-х ч. – Ч. 1. Брест, 2002. – С. 131-132.
149. Корнеў П. І. Этапы фарміравання беларускай дзяржаўнасці (1917 – 1920 гг.) // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: Матэр. рэспуб. навук. канф., 3-4 мая 2002: У 4-х ч. – Ч. 4 / Пад рэд. І. П. Крэня і інш. – Гродна, 2003. – С. 142-145.
150. КП(б) у рэзалюцыях (1903 - 1921 гг.). – Ч. 1 / Падрыхт. да друку Ю. Майзэль, рэд. А. Зюзькоў. – Мн., 1934.
151. Красная книга: Сборник дипломатических документов о русско-польских отношениях 1918 – 1920 гг. – М., 1920.
152. «Красный архив». Исторический журнал главного архивного управления НКВД СССР. – 1940. – Т. 5. – С. 3-44.
153. Круталевич В. А. Административно-территориальное устройство БССР. – Мн., 1966.
154. Круталевіч В. Пасля абвяшчэння рэспублікі // Полымя. – 1966. – № 9. – С. 136-152.
155. Круталевич В. А. Становление национальной государственности белорусского народа // Советское государство и право. – 1967. – № 12. – С. 49-64.
156. Круталевич В. А. Провал контрреволюционных планов создания белорусского буржуазного государства и образование БССР (октябрь 1917 г. – февраль 1919 г.). – Мн., 1973.
157. Круталевич В. А. Рождение Белорусской Советской Республики: На пути к провозглашению республики. (Октябрь 1917 г. – декабрь 1918 г.) / Под ред. А. Ф. Хацкевича, И. А. Юхо. – Мн., 1975.

158. Круталевич В. А. Рождение Белорусской Советской Республики: Провозглашение республики. Развёртывание национально-государственного строительства. (Ноябрь 1918 г. – февраль 1919 г.) / Под ред. А. Ф. Хацкевича, И. А. Юхо. – Мн., 1979.

159. Круталевіч В. Абвяшчэнне рэспублікі // Полымя. – 1986. – № 9. – С. 177-183.

160. Круталевич В. А. На путях национального самоопределения (БНР – БССР – РБ). – Мн., 1995.

161. Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1999.

162. Круталевич В. А. История Беларуси: Становление национальной державности ( 1917 – 1922 гг.). – 2-е изд., доп. – Мн., 2003.

163. Круталевіч В. А., Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917-1945 гг.). Вучэб. дапамож. для студ. юрыдыч. і гістар. спец. ВНУ. – 2-е выд – Мн., 2000.

164. Крылов Ю. Свидетели исторических событий // Коммунист (Вильнюс). – 1988. – № 10. – С. 8-12.

165. Крэчэўскі П. Матэрыялы і дакументы // Замежная Беларусь. – Прага. – 1926. – Кн. 1. – С. 26-51.

166. Кузнецов И. Н., Шелкопляс В. А. История государства и права Беларуси. – Мн., 1999.

167. Кузнецов Н. В. Революционная, партийная и научно-публицистическая деятельность В. Г. Кнорина (1915 – 1937 гг.): Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – Мн., 1978.

168. Кузнецов Н. В. В. Г. Кнорин: Страницы биографии. – Мн., 1979.

169. Куличенко М. И. Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса в 1918 – 1920 гг. – Харьков, 1963.

170. Кушнер В. Цяжкі шлях адраджэння дзяржаўнасці // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 2. – С. 3-6.

171. Ладысеў У., Брыгадзін П. На пераломе эпох: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917 – 1920 гг.). – Мн., 1999.

172. Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917 – 1939 гг.). – Мн., 2003.

173. Ладысеў У. Ф. Праблемы станаўлення беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: Матэр. рэспуб. навук. канф., 3-4 мая 2002 г. У 4 ч. – Ч.1 / Пад рэд. І. П. Крэня і інш. – Гродна, 2003. – С. 59-65.

174. Ладысеў У. Ф. Праблемы станаўлення беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове ва ўмовах курсу кіраўнцтва Савецкай Расіі на сусветную пралетарскую рэвалюцыю (снежань 1918 – 1919 гг.) // Bialoruskie Zeszyty Historycznie. – 2001. – № 15. – S. 197-203.

175. Ласоўскі П. Беларуская карта ў якасці літоўскага козыра 1918 – 1924 гг. // Беларуская мінуўшчына. – 1994. – № 4. – С. 3-6.

176. Ленин В. И. Неизвестные документы. 1891 – 1922 гг. – М., 1999.

177. Ленинские сборники. – Т. 1-40. – М. – Л., 1924 – 1985.

178. Літвіновіч Я. Шлях да дзяржаўнасці // ЛіМ. – 1999. – 23 крас. – С. 3.

179. Литовско-Белорусская Советская Социалистическая Республика // Советская историческая энциклопедия. – Т. 8. – М., 1965. – С. 736-737.

180. Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // БелСЭ. – Т. 6. – Мн., 1972. – С. 396-397.

181. Літоўская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // БелСЭ. – Т. 6. – Мн., 1972. – С. 398-407.

182. Лобанок А. К. Проблемы образования белорусской государственности в XX в. // Материалы республиканской научно-практической конференции, 27 марта 1999 г. – Мн., 1999. – С. 28-32.

183. Лойка Л., Лойка Т. Сучасны погляд на гісторыю Беларусі // Крыжовы шлях. – Мн., 1993. – С. 3-56.
184. Ломако И. П. Образование Литовско-Белорусской ССР и борьба трудящихся республики за защиту Советской власти // Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов (Матер. межресп. научн. конф., посвящ. 60-летию образ. Литовско-Белорусской ССР. – Мн., 1981. – С. 56-75.
185. Лочмель И. Ф. Освобождение Белоруссии от бело-польских оккупантов 11 июля 1920 г. – Мн., 1939.
186. Лочмель И. Ф. Очерки истории борьбы белорусского народа против польских панов. – М., 1940.
187. Лочмель І. Ф. Барацьба беларускага народа супраць інтэрвентаў. (Да 20-й гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў). – Мн., 1940.
188. Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў (1903 – 1928): Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацыяў: Беларуская Рэвалюцыйная Грамада, Беларуская Сацыялістычная Грамада / Пасляслі. А. М. Сідарэвіча. – Мн., 1991.
189. Луцкевіч А. І. Польская акупацыя ў Беларусі. Рэпрынт. выд. – Мн., 1992.
190. Ляхоўскі Ул. Беларуская справа падчас польскай акупацыі 1919 – 1920 гг. // Спадчына. – 1994. – № 6. – С. 50-61.
191. Мазец В. Уступны артыкул // Спадчына. – 1993. – № 3. – С. 11.
192. Мазец В. Г. Беларуская Народная Рэспубліка: абвяшчэнне і дзейнасць (1918 год): Аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. – Мн., 1995.
193. Малиновский В. И. История белорусской государственности: Учеб. пособие для студентов вузов, слушателей системы последипломного образования. – Мн., 2003.
194. Малыхіна Л. Ю. Праблема першага абвяшчэння БССР у літаратуры савецкага перыяда (1920-я – 1970-я гг.) // Вестник БГТУ (Брест). – 2002. – № 6. – С. 55-59.
195. Малыхіна Л. Ю. Перыяд існавання і прычыны ліквідацыі Літоўска-Беларускай ССР: дыскусійныя пытанні // Гістарычны альманах (Гродна). – 2003. – Т. 8. – С. 174-187.
196. Малыхіна Л. Ю. Прычыны абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР у лютым 1919 г. (гістарыяграфія праблемы) // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2003. – № 1. – С. 64-68.
197. Малыхіна Л. Ю. Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Літвы і Беларусі: асноўныя праблемы гістарыяграфіі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 4. – С. 43-49; № 5. – С. 24-32.
198. Малыхіна Л. Ю. Канцэпцыя беларускай дзяржаўнасці ў даследаваннях савецкіх эмігрантаў Германіі ў другой палове XX ст. // Актуальныя праблемы германскай гісторыі, палітыкі, эканомікі, культуры (17-18 красавіка 2003 г. Брэст). – Брэст, 2003. – С. 55-60.
199. Малыхіна Л. Ю. Гістарыяграфія праблем беларускай дзяржаўнасці ў студзені 1919 г. // Беларусь і свет / Пад рэд. Л. Лойкі. – Мн., 2003. – Т. 5. – С. 39-53.
200. Малыхіна Л. Ю. Апублікаваныя дакументы і матэрыялы па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Мн., 2003. – Вып. 4. – С. 36-46.
201. Малыхіна Л. Ю. Праблемы гістарыяграфіі Літоўска-Беларускай ССР // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2003. – № 20. – S. 137-159.
202. Малыхіна Л. Ю. Праблема станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў даследаваннях беларускай эміграцыі // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. Матэр. рэспуб. навук. канф., 3-4 мая 2002 г. / Пад рэд. І. П. Крэня і інш. У 4-х ч. – Ч. 4. – Гродна, 2003. – С. 148-155.
203. Малыхіна Л. Ю. Літоўска-Беларуская ССР (тэрыторыя, граніцы, і насельніцтва): гістарыяграфічныя нататкі // Беларуска-польскія архівалії: стан і

перспектывы. Матэр. другой беларуска-польскай міжнарод. канф. Мінск, 10-11 кастрычніка 2001 г. – Мн., 2003. – С. 101-108.

204. Малыхіна Л. Ю. Літоўска-Беларуская ССР: прычыны абвяшчэння ў студзені – лютым 1919 г. (гістарыяграфія) // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя: Матэр. міжнарод. навук.-тэарэт. канф. Мінск, 18-19 красавіка 2003 г. – Мн., 2004. – С. 39-46.

205. Маргунский С. П. Образование Белорусской Советской Социалистической Республики и её первая Конституция: Автореф. дис.... канд. юрид. наук. – Мн., 1951.

206. Маргунский С. П. Государственное строительство Белорусской ССР на первом этапе её развития. – Мн., 1953.

207. Маргунский С. П. Создание и упрочение белорусской государственности (1917 – 1922 гг.). – Мн., 1958.

208. Маргунский С. П. Создание и развитие белорусской государственности (1917 – 1925 гг.): Автореф. дис.... док-ра юрид. наук. – М., 1963

209. Маргунский С. П. Становление и развитие белорусской советской государственности (1917 – 1925 гг.). – Мн., 1969.

210. Маргунский С. П., Кукреш Л. И. Интернациональное и национальное в государственном строительстве Белоруссии: 1917 – 1922 гг. – Мн., 1978.

211. Маргунскі С. П. З гісторыі ўтварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1957. – № 1. – С. 3-12.

212. Менскі Я. Чаму ды як была ўтворана Беларуская ССР // Беларускі зборнік. – 1955. – Кн. 1. – С. 5-33.

213. Методология // Социологический энциклопедический словарь. На русском, английском, немецком, французком и чешском языках. Редактор-координатор – академик РАН Г. В. Осипов. – М., 1998. – С. 180.

214. Мікніс Р. Літва і Беларусь: супольная аўтаномія // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 3. – С. 5-7.

215. Мікніс Р. Літва і Беларусь: перыпетыі дзяржаўнасці ў пачатку XX ст. // Беларусіка = Albaruthenica. – Мінск, 1997. – Т. 6. – Ч. 2. – С. 249-256.

216. Мирный договор между Россией и Литвой (12 июля 1920 г.) // Спадчына. – 1993. – № 5. – С. 48-55.

217. Михнюк В. Н. Крестьянство Беларуси на пути к социализму: Историографический очерк. – Мн., 1979.

218. Михнюк В. Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919 – 1941 гг.). – Мн., 1985.

219. Михнюк В. Н., Петриков П. Т. Историческая наука Белорусской ССР, 80-е годы. – Мн., 1987.

220. Міхнюк У. З кандыдацкай дысертацыяй у навуку ўваходзяць, а з доктарскай – выходзяць // Беларуская думка. – 2000. – № 3. – С. 102.

221. Міхнюк У. М., Малыхіна Л. Ю. Гісторыя Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі ў падручніках і вучэбных дапаможніках Рэспублікі Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 7. – С. 3-12.

222. Мясников А. Ф. Избранные произведения. – М., 1985.

223. Мухин Ф. Ф. КПБ в борьбе за осуществление в республике ленинского Декрета о земле как важнейшего средства укрепления союза рабочего класса и крестьянства (1921 – 1925). Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – Мн., 1956. – С. 2.

224. На скрыжаванні думак: Вучоныя аб "белых плямах" гісторыі Беларусі / Склад. Я. І. Бараноўскі. – Мн., 1990.

225. Навицкас К. Роль Советского Союза в деле защиты жизненно национальных интересов литовского народа в 1917 – 1940 гг.: Автореф. дис. ... д-ра ист. наук. – Вильнюс, 1965.

226. Навицкас К. Вклад в советскую историографию // Коммунист (Вильнюс). – 1968. – № 2. – С. 56-57.

227. Навицкас К. Литва и Антанта (1918 – 1920 гг.). – Вильнюс, 1970
228. Навицкас К. Советско-литовские отношения в 1919 – 1938 годах // Коммунист (Вильнюс). – 1988. – № 6. – С. 33-41.
229. "Навука" на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі. – Мн., 1931. – Т. 1.
230. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. – Ч. 2 / М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. – Мн., 1995.
231. Нестерович Я. Ю. Движение трудящихся Белоруссии за образование Союза ССР в 1917 – 1924 гг.: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – Мн., 1976.
232. Образование и развитие Союза Советских Социалистических Республик (в документах). – М., 1973.
233. Оппенгейм Л. Международное право / Под ред. Г. Лаутерпахта. – Т. 2. – Полутом 2. – М., 1950.
234. Осмоловский В. П. Советское строительство в Белоруссии. (Окт. 1917 – янв. 1919 гг.): Автореф. дис...канд. ист. наук. – Мн., 1975.
235. Очерки истории Беларуси 1917 – 2000 гг. Книга для учителей истории общеобразовательной школы / А. А. Филимонов, Н. А. Богушевич, А. Т. Арбузов и др.; Ред А. А. Филимонов. – Мн., 2000.
236. Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. – Ч. 1. – Изд. 2-е. – Мн., 1961; 2-е изд. – Мн., 1968.
237. Очерки истории Коммунистической партии Литвы. – Т. 1 (1887 – 1920). – Вильнюс, 1973.
238. Палецкис Ю. Международная интервенция в Литве в 1918 –1919 гг. // 40 лет пролетарской революции в Литве. Сб. ст. – Вильнюс, 1959. – С. 110-119.
239. Парашкоў С. А. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн., 2003.
240. Парэчын Г. Ідэя беларускай дзяржаўнасці перад утварэннем Савецкай Беларусі // Запіскі аддзела гуманітарных навук БАН. Працы кафедры сучаснага права. – Т. 1. – Мн., 1929. – С. 1-35.
241. Пачанін С. З. Фарміраванне і развіццё беларускай сацыялістычнай нацыі. – Мн., 1958.
242. Петриков П. Ревкомы Белоруссии. – Мн., 1975.
243. Петрыкаў П. Ц. Перыядызацыя гісторыі гістарычнай навукі ў БССР // Весці АН БССР. – Сер. грамад. навук. – 1990. – № 6. – С. 64-65.
244. Петрыкаў П. Ц. Гісторыя Беларусі: 1917 – 2001 гг. Вучэб. дапам. для 9-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання. – Мн., 2002.
245. Петрыкаў П. Ц. Асноўныя этапы гістарыяграфіі Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 4. – С. 34-42.
246. Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе: К вопросу о становлении белорусской национальной государственности // Неман. – 1992. – № 10. – С. 129-155.
247. Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе... Образование БССР // Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. В 3-х ч. – Ч. 2. – Гомель, 1993. – С. 73-106.
248. Платонов Р., Сташкевіч Н. Так вырашаўся лёс Беларусі // Маладосць. – 1993. – № 4. – С. 194-205; № 5. – С. 199-214.
249. Платонаў Р. П. Старонкі гісторыі Беларусі: Архівы сведчаць. З навуковай спадчыны. – Мн., 2002.
250. Победа Советской власти в Белоруссии / Под ред. И. И. Минца, Н. В. Каменской, И. С. Кравченко. – Мн., 1967.
251. По воле народа: Из истории образования Белорусской ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии. Документы и материалы. – Мн., 1988.
252. Политбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б). Повестки дня заседаний. – Т. 1 (1919 – 1929 гг.). Каталог. – М., 2000.

253. Польско-советская война 1919 – 1920 гг.: Ранее не опубликованные документы и материалы. – М., 1994. – Ч. 1-2.
254. Почанин С. З. Борьба Коммунистической партии за установление и упрочение Советской власти в Белоруссии: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – М., 1953.
255. Почанин С. На службе у интервентов [О бел. буржуаз. националистах в годы становления сов. власти в Бел.] // Неман. – 1966. – № 4. – С. 142-152.
256. Пратакол I з'езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. – Мн., 1934.
257. Прыбытка Г. Абвяшчэнне БССР і Масква // Роднае слова. –1992. – №1. – С. 3-10.
258. Пятраўскас З. В. Юридический статус Литвы в конце 1918 г. – первой половине 1919 г. // Труды АН Литовской ССР. – Сер. А. – 1982. – Т. 2 (79). – С. 13-24.
259. Пятраўскас З. В. О хронологических рамках существования Литовско-Белорусской ССР // Правоведение. – 1983. – № 5. – С. 88-92.
260. Ракашэвіч У. Дзеля чаго і кім была створана Літоўска-Беларуская дзяржава? // Звязда. – 1994. – 25 лютага. – С. 2.
261. Рамановіч П. С. Палітычна-прававы статус ССРБ у 1920 – 1922 гг. // Государственность на Беларуси: Генезис и перспективы. Сб. матер. респуб. науч.-практ. конф., 30 января 2002 г. В 2-х ч. – Ч. 1. – Брест, 2002. – С. 140 –141.
262. Рамановіч П. С. Тэрыторыя і палітычна-прававы статус ССРБ у 1919 – 1922 гг. // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: Матэр. рэспуб. навук. канф., 3-4 мая 2002: У 4-х ч. – Ч. 4 / Пад рэд. І. П. Крэня і інш. – Гродна, 2003. – С. 145-148.
263. Революционные комитеты БССР (июль – декабрь 1920 г.). – Мн., 1957.
264. Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г. – июль 1920 г.). Сборник документов и материалов. – Мн., 1961.
265. Рубцов А. Ф. Литва в политике французкого империализма. – Томск, 1988.
266. Рубцов А. Ф. Политика Франции и Великобритании по вопросу о юридическом признании буржуазного Литовского государства (1919 – 1920 гг.) // Труды Томского гос. ун-та. – Сер. ист. – 1972. – Т. 215.
267. Рубцов А. Ф. Литва в восточноевропейской политике Франции 1918 – 1924 гг. – Томск, 1972.
268. Сафонов Н. В. Критика буржуазной фальсификации истории иностранной военной интервенции и гражданской войны в Белоруссии: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – Мн., 1989.
269. Свердлов Я. М. Избранные произведения. – М., 1960. – Т. 3.
270. Селиванов П. А. Военная деятельность Советов Белоруссии, 1917 – 1920 гг. / Науч. ред. П. Т. Петриков. – Мн., 1980.
271. Селиванов П. А. Укрепление тыла Красной Армии: Деятельность Советов и ревкомов Белоруссии (1918 – 1920 гг.) / Под ред. И. М. Игнатенко. – Мн., 1987.
272. Семенникова Л. И. Россия в мировом сообществе цивилизаций. – Брянск, 1996.
273. Сиполс В. Тайная дипломатия: буржуазная Латвия в антисоветских планах империалистических держав 1919 – 1940 гг. – Рига, 1968.
274. Сідарцоў У. Н., Фамін В. М. Гісторыя Беларусі: 1917 – 1992: Вучэб. дапамож. для 9-га кл. сярэд. шк. – Мн., 1993.
275. Скалабан В. В. Белорусский национальный комиссариат (янв. 1918 – март 1919 гг.): Автореф. дис. ... канд. ист. наук. – Мн., 1987.
276. Скалабан В. У. Дакументы па гісторыі Беларусі ў Расійскім цэнтры захоўвання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі // Вяртанне – 6. – Мн., 1999. – С. 288-298.
277. Солодков Т. Е., Марцуль Г. С. Образование БССР – торжество ленинских принципов национально-государственного устройства. – Мн., 1978.
278. Сталин И. В. Политика правительства по национальному вопросу // Сочинения. В 13 томах. – Т. 4 (ноябрь 1917 – 1920 гг.). – М., 1954. – С. 225-229.

279. Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. – Вільня, 1935.
280. Станкевіч С. Нацыянальная палітыка Крэмля на Беларусі // Беларускі зборнік. – 1955. – Кн. 1. – С. 34-47.
281. Сташкевіч М. С. Непазбежнае банкруцтва: (З гісторыі палітычнага краху нацыянальных партый ў Беларусі. 1917 – 1925 гг.). – Мн., 1974.
282. Сташкевич Н. С. На защите идей Октября: Из истории идейно-политической борьбы в Белоруссии в годы гражданской войны (1919 – 1920 гг.). – Мн., 1978.
283. Сташкевич Н. С. Приговор революции: крушение антисоветского движения в Белоруссии. 1917 – 1925. – Мн., 1985.
284. Сташкевич Н. С. У истоков создания БССР и Компартии Белоруссии // 70 лет БССР и КПБ / Сост. В. В. Шарпило. – Мн., 1988. – С. 32-42.
285. Сташкевич Н. На грани возможного: Идейно-политическая борьба вокруг создания белорусской советской государственности: «белые пятна» // Неман. – 1989. – № 10. – С. 138; № 12. – С. 137-152.
286. Сташкевич Н. С., Шумейко М. Ф. У истоков создания // Страницы истории Компартии Белоруссии. – Мн., 1990. – С. 46-70.
287. Сташкевич Н. С. К вопросу формирования государственной идеологии в Белоруссии // Славянский мир и славянские культуры в европейском мире: место и значимость в развитии цивилизаций и культур (история, уроки, опыт, современность). Матер. междунар. науч.-теорет. конф., 31 октября – 1 ноября 2002 г. – Ч. 2. – Витебск, 2002. – С. 213-217.
288. Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты / Сост. Р. П. Платонов. – Мн., 1990.
289. Съезды Советов Союза ССР, союзных и автономных Советских Социалистических Республик. Сборник документов 1917 – 1936 гг. В 3-х т. – Т. 2 (1917 – 1922 гг.). – М., 1960.
290. Тарашкевіч Б. Аўтабіяграфія // Спадчына. – 1996. – № 4. – С. 92-132.
291. Талкачоў В. Цяжкі студзень 1919-га...: Да пытання аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР // Беларуская думка. – 1994. – № 1. – С. 67-69.
292. Тамашюнас М. В. Исследование проблем по истории социалистической революции 1918 – 1919 гг. в Литве (обзор литературы за 1967 – 1978 гг.) // Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов: Матер. межресп. науч. конф., посвящ. 60-летию образ. Литовско-Белорусской ССР. – Мн., 1981. – С. 85-92.
293. Туронак Ю. Нежаданая рэспубліка // Кантакты. – 1990. – № 1. – С. 14-22.
294. Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. – Мн., 1993.
295. Турук Ф. Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов. – М., 1921; [Воспр. изд. 1921]. – Мн., 1994.
296. У. І. Ленін – арганізатар СССР // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1972. – № 6. – С. 5-15.
297. Участие БССР в создании союзного государства // Советы национальных районов России. 1917 – 1922. – Рига, 1985. – С. 261-271.
298. Фердросс А. Международное право. – М., 1959.
299. Фельдман Д. И. Признание правительств в международном праве. – Казань, 1961.
300. Фих Б. М. Аграрная революция в Белоруссии (1917 – 1920). – Мн., 1966.
301. Херцег И. Признание государств и правительств // Проблемы международного права. – М., 1961. – С. 320-341.
302. Хоміч С. Фарміраванне тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі (канец 1918 – 1926 гг.): Аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. – Мн., 2000.
303. Хоміч С. Асноўныя этапы фарміравання тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі (канец 1918 – 1926 гг.) // Беларускі гістарычны агляд. – 2000. – Т. 7. – Сш. 2. – С. 351 -363.

304. Хоміч С. Савецкая і беларуская пстарыяграфія пра фарміраванне тэрыторыі БССР у 1919 – 1926 гг. // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця. Матэр. нав. канф., Мінск, 6-7 кастр. 1999. – Мн., 2000. – С. 218-221.
305. Хоміч С. Фарміраванне тэрыторыі БССР (1919 – 1926 гг.) // Гісторыя праблемы выкладання. – 2000. – № 4. – С. 18-30.
306. Цвикевич А. Беларусь: Полит. очерк: Пер. с белорус. – Берлин, 1919.
307. Цвікевіч А. Адраджэньне Беларусі і Польшча. – Мінск – Вільня – Берлін, 1921.
308. Ціхаміраў А. В. Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // ЭГБ. – Т. 4. – Мн., 1997. – С. 382-384.
309. Ціхаміраў А. В. БССР: прамень дзяржаўнасці і знешняй палітыкі ў 1920 – 1922 гг. // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя. – Мн., 1999. – С. 136-138.
310. Ціхаміраў А. В. Беларусь ў сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918 – 1921 гг.). – Мн., 2003.
311. Ціхаміраў А. В. Мірны дагавор паміж Літвой і РСФСР 1920 // ЭГБ. – Т. 5. Мн., 1999. – С. 206-207.
312. Цітоў А. На поўнач ад Мінска // Казлоў Л., Цітоў А. Беларусь на сямі рубяжах. – Мн., 1993. – С. 31.
313. Чарвякоў А.Р. За Савецкую Беларусь. – Мн., 1927.
314. Чарвякоў А. Беларусь да X гадавіны Кастрычніка. – Мн., 1927.
315. Чистяков О. И. Взаимоотношения советских республик до образования СССР. – М., 1955.
316. Чистяков О. И. Национально-государственное строительство в РСФСР в годы гражданской войны (1918 – 1920 гг.). – М., 1964.
317. Чигринов П. Г. Очерки истории Беларуси: Учеб. пособие для вузов. – Мн., 2000.
318. Чигринов П. Г. История Беларуси: (в помощь абитуриенту). – Мн., 2001.
319. Чигринов П. Г. История Беларуси: Пособие для абитуриентов. – Мн., 2003.
320. Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919 – 1920 гг.). – Мн., 1962.
321. Шкляр Я. Старонкі гераічнай гісторыі // Полымя. – 1966. – № 3. – С. 86-104.
322. Шчарбакоў В. К. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі і белапольская акупацыя. – Мн., 1930.
323. Шчарбакоў В. К. Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі. – Мн., 1934.
324. Шыбнеў А. Першы Усебеларускі з'езд Саветаў // Беларусь. – 1968. – № 12. – С. 16-18.
325. Эканамічная гісторыя Беларусі: Вучэб. дапамож. / Пад агуль. Рэд. В. І. Галубовіча. – Мн., 1996.
326. Юхо Я. Беларускія ўрады 1918 – 1921 гг. і іх паўнамоцтвы // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 4. – С. 63-68.
327. Юхо Я. Фармаванне тэрыторыі беларусаў // Спадчына. – 1991. – № 6. – С. 3-11.
328. Якубовская С. И. Обьединительное движение за образование СССР. – М., 1947.
329. Якутов В. Д. А. Г. Червяков: страницы биографии. – Мн., 1978.
330. Deruga A. Polityka wschodnia Polski wobec ziem Litwy, Bialorusi i Ukrainy (1918 – 1919). – W-wa, 1968.
331. Dokumenty z dziejow polskiej polityki zagranicznej. 1918 – 1939. –T. 1. – W-wa, 1989.
332. Gimžauskas E. Baltarusiu veiksnys tormuojantis Lietuvos valstybei, 1915 – 1923. – Vilnius, 2003. – 192 p.
333. Gostyńska W. Stosunki polsko-radzieckie w 1919 r. – W-wa, 1969.
334. Gomolka K. Polskie ugrupowania polityczne wobec kwestii bialoruskiej. 1918 – 1922. – W-wa, 1989.

335. Filderbaum A. Charakter walk na froncie litewsko-białoruskim na wiosne 1919 r. – Bellona, 1919. – Z. 8. – S. 619-623
336. Ochmanski J. Historia Litwy. – Wroclaw – Warszawa – Krakow, 1967.
337. Pipes R. The Formation of the Soviet Union: Communism and Nationalism. 1917 – 1923. – New York, 1968.
338. Sieradzki J. Bialowieża i Mikaszewiczy – mity i prawdy. – W-wa, 1959.
339. Laptos J. Francuska opinia publiczna wobec spraw polskich w latach 1919 – 1925. – Wroclaw, 1983.
340. Laurinavičius Č. Tarybinio valstybingumo Steigimas Lietuovje. 1918 m. pabaiga – 1919 m. pirmoji puse // Iš Lietuvos istoriyos tyrinejimu. – Vilnius, 1991. – P. 87-105.
341. Laurinavičius Č. Lietuvos – Sovietu Rusijos Taikos sutartis: (1920 m liepos 12 d. sutarties problema). – Vilnius, 1992.
342. Lewandowski J. Federalizm: Litwa i Bialoruś w polityce obozu belwederskiego. – W-wa, 1962.
343. Lopata R. Lietuvos valstybingumo Klausimas 1914 – 1918 m. – Vilnius, 1994. Машинопись диссертации. – Институт истории Литвы.
344. Lossowski P. Stosunki polsko-litewskie w latach 1918 – 1920. – W-wa, 1966.
345. Lossowski P. Stosunki polsko-litewskie w latach 1921 – 1939. – W-wa, 1997.
346. Najdus W. Polacy we wladzach Republiki Litewsko-Bialoruskiej (1919 r.) // Kwartalnik historyczny. – 1967. – R. 74. – Z. 3.
347. Navickas K. TSRS vaidmuo, ginant Lietuva, nuo imperialistines agresijos 1920 – 1940 metais. – Vilnius, 1966.
348. Nowak-Kielbikowa M. Polska-Wielka Brytania w latach 1918 – 1923: Ksztaltowanie się stosunków politycznych. – W-wa, 1975.
349. Vaitkevičus B. Socialistine revoliucija Lietuvoje 1918 – 1919 metais. – Vilnius, 1967.
350. Vitkauskas P. Lietuvos Tarybu Respublikos Sukurimas 1918 – 1919 metais. – Vilnius, 1978.
351. Tajne rokowania polsko-radzieckie w 1919 r. Materialy archiwalne i dokumenty/ Oprac. W. Gostyńska. – W-wa, 1986.
352. Wandycz P. Soviet-Polish Relation, 1917 – 1921. – Gambridge, 1969.
353. Žiugžda J. Kataliku baznycios ekspansija i pabaltiji ir Rytu Europa. – Vilnius, 1962.
354. Žiugžda J. Lietuviu ir rusu tautu santykiai istorinio vystymosi eigoje. – Kaunas, 1964.
355. Žepkaite R. Lietuvos – tarubu rusijos taikos sutartis ir Vilnias klausimas // Труды Академии наук Литовской ССР. – Сер. А., 1963. – Т. 2 (15). – С. 107-120.
356. Žepkaite R. Lietuva tarptautines politikos labirintuose (1918 – 1922 m.). – Vilnius, 1973.
357. Žepkaite R. Diplomatija imperializmo tarnyboje. Lietuvos ir Lenkijos santykiai 1919 – 1939. – Wilno, 1980.

## ПАКАЗАЛЬНІК ІМЁНАЎ

Абэцэдарскі Л. С. – 74, 77
Абэцэдарская А. Л. – 76, 77, 103, 104
Азараў А. І. – 102
Альшэўская С. І. – 102
Аляксандраў Б. – 86, 102
Ангарэціс З. І. – 18, 20
Андрэеў А. М. – 8, 9, 34, 43, 47, 49, 55, 56, 67, 68, 69, 97, 102
Антановіч І. І. – 105
Арбузаў А. Т. – 111
Арумяэ Х. – 88, 102
Арутюнян В. М. – 102
Асмалоўскі Е. – 64, 111
Астрога В. А. – 6, 102
Ахманьскі Е. – 94, 114
Багдановіч А. Г. – 48, 51, 63, 102, 104
Багушэвіч Н. А. – 111
Баранава М. П. – 74
Бараноўскі Я. І. – 110
Бах М. Г. – 86, 102
Белагалоўка Р. Н. – 103
Белая В. Л. – 74
Беленькая Л. Л. – 70, 102
Беляўцаў У. І. – 23,102
Бержыніскайтэ А. – 102
Біч М. В. – 74, 75, 83, 102
Бродка І. А. – 103
Броўка Ю. П. – 58, 59, 100, 103
Брыгадзін П. І. – 14, 27, 33, 42, 48, 51, 54, 64, 76, 77, 79, 82, 91, 97, 98, 99, 103, 104, 108
Бурбіс А. – 44, 51
Бутэвіч Т. М. – 104
Вандыч П. – 94, 115
Варонка Я. Я. – 42, 103
Варславан А. – 88, 103
Вайткявічус Б. Ю. – 11, 13, 37, 38, 39, 40, 42, 59, 60, 61, 68, 69, 100, 103, 106, 115
Венцкоўскі А. – 64
Вераб'ёў А. В. – 22, 103
Весялкоўскі Ю. – 103
Вішнеўскі А. Ф. – 48, 54, 82, 83, 99, 103
Віткаўскас П. В. – 59, 60, 61, 62, 100, 103, 115
Вышынскі У. І. – 63, 66, 78, 89, 110
Галубовіч В. І. – 68, 114
Гамулка К. – 94, 114
Гарбуноў Т. С. – 106
Гастынска В. – 64, 94, 114
Гесь А. Н. – 95, 102
Гімжаўскас Э. – 13, 93, 94, 104, 114
Глушакова Н. – 63, 104
Грамыка А. А. – 88, 104,106
Грыцкевіч А. П. – 64, 104
Гудаў М. В. – 104
Далецкі Я. Г. – 18, 21
Давідовіч А. В. – 104
Давтян А. В. – 104
Дварчанін І. С. – 71
Дзяруга А. – 94, 114
Доўнар-Запольскі М. В. – 104
Доўнар Т. І. – 83, 103
Дубік С. В. – 42, 104
Езавітаў К. – 104
Жмуроўскі С. Д. – 73
Жугжда Ю. – 87, 105, 115
Жылуновіч Дз.Ф. – 7, 9, 20, 24, 28, 43, 71, 79, 104, 105
Жылуновіч Л. А. – 76, 77, 103, 104
Жытко А. П. – 74
Жэпкайтэ Р. С. – 87, 88, 104, 115
Забродскі Э. А. – 104
Зевелеў А. І. – 13, 105
Зеньковіч М. А. – 29, 32, 48, 51, 105
Зіміонка А. – 105
Зюзкоў А. – 54, 105, 107
Зялінскі П. І. – 79, 91, 104
Іваноў М. Л. – 9, 38, 42, 105
Іваноў Л. – 86, 105
Ігнатоўскі У. М. – 7, 14, 31, 48, 49, 54, 99, 100, 103, 105
Ігнаценка А. П. – 76, 77, 103
Ігнаценка І. М. – 9, 34, 50, 52, 62, 63, 66, 76, 78, 89, 97, 100, 103, 105, 110, 112
Іофе А. А. – 24, 25, 28, 30, 35, 36, 40, 43, 97
Іофэ Э. Р. – 62, 100, 105
Ісачанка С. М. – 105
Іскраў М. В. – 14, 56, 57, 100, 106
Кавалёва Л. А. – 107
Казбярук У. – 106
Казлоў Л. – 114
Калубовіч А. – 106
Каменская Н. В. – 8, 9, 30, 38, 49, 50, 52, 55, 56, 58, 60, 61, 100, 106, 111
Карнатоўскі М. А. – 7, 8, 55, 56, 58, 67, 68, 69, 100, 107

Карнейчык Я. І. – 106
Карніенка В. – 106
Кароль А. – 105
Кароткая Т. М. – 104
Касакоўскі М. – 64
Касовіч В. Ф. – 102
Касцюк М. П. – 63, 66, 78, 89, 110
Каханоўскі А. Г. – 76, 104
Качалаў І. Л. – 77, 78, 104
Клімовіч Н. М. – 95, 102
Кнорын В. Г. – 7, 14, 32, 34, 36, 39, 43, 44, 48, 49, 53, 54, 70, 100, 106, 107, 108
Корнеў П. І. – 35, 107
Коршак М. А. – 35, 107
Коршук У. К. – 48, 51, 63, 104
Коўкель І. І. – 66, 67, 69, 72, 79, 80, 83, 90, 104, 107
Красцінскі М. М. – 21
Краўчанка І. С. – 106, 111
Круталевіч В. А. – 9, 14, 23, 27, 28, 29, 31, 32, 33, 34, 35, 36, 41, 42, 43, 44, 47, 48, 50, 53, 55, 57, 58, 61, 63, 64, 82, 91, 92, 94, 97, 100, 101, 103, 107, 108
Крылоў Ю. – 12, 23, 108
Крэнь І. П. – 14, 107, 108, 109, 112
Крэчэўскі П. – 108
Кузняцоў І. Н. – 81, 106, 108
Кузняцоў Н. В. – 108
Кукраш Л. І. – 61, 110
Кулічэнка М. І. – 27, 31, 32, 34, 38, 40, 43, 47, 81, 97, 108
Кушнер У. – 108
Лабанок А. К. – 108
Ладысеў У. Ф. – 14, 27, 33, 42, 48, 51, 54, 64, 79, 82, 91, 97, 98, 99, 104, 108
Ламака І. П. – 28, 29, 50, 54, 105, 108
Лапата П. – 115
Лаптас Ю. – 114
Ласоўскі П. – 94, 108, 115
Лаўрынавічус Ч. – 42, 92, 93, 95, 114, 115
Лаўтэрпахт Г. – 58, 111
Левандоўскі Ю. – 115
Ленін У. І. – 7, 8, 23, 24, 25, 26, 27, 28, 30, 34, 35, 40, 64, 76, 79, 80, 97, 106, 108, 113
Літвінава Г. І. – 59
Літвіновіч Я. – 108
Лойка Л. В. – 41, 64, 101, 108, 109
Лойка Т. В. – 41, 64, 101, 108
Лочмель І. Ф. – 108, 109
Луцкевіч А. І. – 95, 102, 109
Лыч Л. – 71, 72
Ляўкоў Э. А. – 74
Ляхоўскі У. – 109
Ляшчынскі Ю. М. – 71
Мазец В. Г. – 81, 109
Майзэль Ю. – 54, 107
Маліноўскі У. І. – 83, 109
Малыхіна Л. Ю. – 10, 90, 109, 110
Маргунскі С. П. – 8, 9, 13, 27, 28, 34, 47, 48, 49, 50, 52, 54, 55, 58, 59, 61, 97, 99, 100, 106, 109, 110
Мархлеўскі Ю. – 64
Марцуль Г. С. – 71, 72, 77, 78, 79, 80, 81, 82, 83, 89, 91, 104, 112
Мацяс І. Д. – 103
Менскі Я. – 110
Мікніс Р. – 42, 110
Мінц І. І. – 111
Міхнюк У. М. – 7, 10, 46, 67, 69, 95, 102, 105, 110
Міцкявічус-Капсукас В. С. – 7, 20, 21, 24, 36, 45, 70, 83
Мухін Ф. Ф. – 69, 110
Мяснікоў А. Ф. – 24, 25, 29, 43, 79, 102, 110
Навіцкас К. – 13, 39, 57, 58, 59, 60, 61, 87, 100, 110, 115
Навіцкі У. – 71, 72
Найдзюк В. – 115
Нарушавічус Ф. – 87
Недзялкоўскі М. – 44
Несцяровіч Я. Ю. – 76, 103, 110
Новак-Келбікава М. – 115
Новік Н. Я. – 77, 78
Новік Я. К. – 71, 72, 77, 79, 80, 81, 82, 83, 89, 91, 104
Опенгейм Л. – 58, 111
Осіпаў Г. В. – 15, 110
Пайпс Р. – 114
Палецкіс Ю. – 38, 111
Панамароў Б. Н. – 88, 106
Панкратава Г. М. – 106
Паноў С. В. – 76, 77, 104
Парашкоў С. А. – 71, 72, 73, 111
Парэчын Г. – 111
Паўлава Н. Г. – 74
Пачанін С. З. – 102, 111
Петрыкаў П. Ц. – 6, 10, 74, 110, 111, 112
Пікель Р. В. – 30
Пілсудскі Ю. – 33, 64
Платонаў Р. П. – 20, 27, 28, 29, 30, 31, 32, 34, 35, 36, 40, 43, 48, 50, 51, 63, 64, 81, 97, 98, 104, 111, 113

Пляшэвіч У. К. – 74
Прыбытка Г. – 111
Прыгунова Е. К. – 105
Пятраўскас З. В. – 9, 61, 62, 100, 112
Пястоўскі С. І. – 35
**Р**акашэвіч У. К. – 44, 46, 51, 105, 112
Рамановіч П. С. – 62, 112
Раманоўскі І. Ф. – 48, 51, 63, 104
Рубцоў А. Ф. – 87, 88, 112
Рэйнгольд І. І. – 7, 18, 30
**С**аладкоў Т. Е. – 112
Саракавік І. А. – 48, 54, 99, 103
Сафонаў Н. В. – 112
Свярдлоў Я. М. – 7, 19, 20, 23, 25, 28, 33, 36, 37, 40, 97, 98, 112
Селіванаў П. А. – 40, 73, 112
Семянкоў В. І. – 103
Серабранскі З. – 68
Серадскі Ю. – 64, 114
Сідарцоў У. Н. – 75, 76, 77, 83, 102, 104, 112
Сідарэвіч А. М. – 109
Сіполс В. – 88, 112
Сокал С. Ф. – 103
Сталін І. В. – 7, 8, 9, 24, 26, 28, 29, 37, 43, 63, 97, 106, 112
Станкевіч А. – 112
Станкевіч С. – 113
Сташкевіч М. С. –20, 27, 28, 29, 31, 32, 33, 34, 35, 36, 40, 43, 50, 64, 76, 77, 83, 97, 98, 107, 111, 112, 113
Сташэўскі А. – 102
Скалабан В. У. – 24, 25, 112
Смышляеў В. А. – 105
**Т**алкачоў В. І. – 42, 48, 54, 64, 99, 101, 113
Тамашунас М. В. – 9, 60, 100, 113
Тарашкевіч Б. А. – 71, 95, 113
Таўтавічус А. – 106
Траяноўскі А. П. – 74
Троцкі Л. Д. – 28, 97
Турук Ф. Ф. – 113
Туронак Ю. – 64, 113
**У**ншліхт І. С. – 33
**Ф**алей Я. С. – 46
Фамін В. М. – 75, 76, 77, 83, 102, 104, 112
Фельдман Д. І. – 61, 113
Фердрос А. – 58, 113
Фешчанка Е. П. – 104
Філімонаў А. А. – 111
Фільдэбаум А. – 114
Фіх Б. М. – 69, 113
**Х**ацкевіч А. Ф. – 107
Херцег І. – 62, 113
Хоміч С. М. – 32, 33, 98, 113
**Ц**вікевіч А. І. – 113
Ціхамiраў А. В. – 14, 51, 52, 63, 71, 82, 92, 94, 113, 114
Цітоў А. К. – 92, 114
Цыхоўскі К. Г. – 70
**Ч**арвякоў А. Р. – 7, 44, 70, 90, 114
Чымбург І. – 106
Чысцякоў А. І. – 37, 114
Чычэрын Г. В. – 22, 79
Чыгрынаў П. Г. – 78, 79, 80, 81, 82, 114
**Ш**арапа А. В. – 46
Шарпіла В. В. – 113
Шафір М. А. – 103
Шелкопляс В. А. – 108
Шкляр М. Е. – 56, 106
Шкляр Я. Н. – 9, 27, 28, 34, 38, 46, 47, 49, 50, 52, 56, 57, 58, 61, 67, 68, 69, 70, 71, 72, 97, 100, 114
Шульга Л. А. – 102
Шумейка М. Ф. – 63, 113
Шупа С. А. – 46
Шчарбакоў В. К. – 7, 114
Шыбнеў А. – 114
**Ю**ргініс Ю. – 106
Юхо Я. А. – 41, 42, 51, 53, 62, 82, 101, 107, 108, 114
Ючас М. – 106
Якубоўская – 114
Якутаў В. Д. – 114
**Я**лугін Э. В. – 28
Яноўскі А. А. – 76, 106
Ярмусік Э. С. – 66, 67, 69, 72, 79, 80, 90, 107

# ЗМЕСТ

**Уводзіны** ... 3
**Глава 1.** Гістарыяграфія, крыніцы, метадалогія і метады даследавання ... 6
§ 1. Гістарыяграфія гістарыяграфіі праблемы ... 6
§ 2. Гістарыяграфічныя крыніцы ... 12
§ 3. Метадалогія і метады даследавання ... 15
**Глава 2.** Гістарыяграфічна-крыніцазнаўчы агляд апублікаваных дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Літоўска-Беларускай ССР ... 18
**Глава 3.** Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Літвы і Беларусі: праблемы гістарыяграфіі ... 26
§ 1. Прычыны падзелу БССР і аб'яднання яе з Літоўскай ССР ... 26
§ 2. Калі была абвешчана ЛіБ ССР? ... 45
§ 3. Тэрыторыя, граніцы і насельніцтва ЛітБела ... 48
§ 4. Перыяд існавання Літоўска-Беларускай ССР і матывы яе ліквідацыі ... 53
§ 5. Сацыяльна-эканамічная і культурная палітыка ўрада ЛітБела ... 66
**Глава 4.** Гісторыя Літоўска-Беларускай ССР ў падручніках і вучэбных дапаможніках для сярэдніх і вышэйшых навучальных установ ... 74
**Глава 5.** Расійска-Літоўскі дагавор 12 ліпеня 1920 г.: гістарыяграфія праблемы ... 85
**Заключэнне** ... 97
**Бібліяграфія** ... 102
**Паказальнік імёнаў** ... 116

Навуковае выданне

***Малыхіна Людміла Юр'еўна,***

***Міхнюк Уладзімір Мікалаевіч***

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ЛІТОЎСКА-БЕЛАРУСКАЙ ССР

ISBN 985-493-029-7

9 789854 930299

Ответственный за выпуск: ***Малыхина Л. Ю.***

Редактор: ***Строкач Т. В.***

Компьютерная вёрстка: ***Боровикова Е. А.***

Корректор: ***Никитчик Е. В.***

Лицензия № 02330/0148711 от 30.04.2004 г.
Лицензия № 02330/0133017 от 30.04.2004 г.
Подписано к печати 10.12.2005 г. Бумага "Снегурочка". Усл. п. л. 7,0.
Уч.-изд. л. 7,5. Формат 60x84 $^{1}/_{16}$. Гарнитура Arial. Тираж 100 экз. Заказ № 1212.
Отпечатано на ризографе учреждения образования "Брестский государственный технический университет".
224017, г. Брест, ул. Московская, 267.